*Памяці*
*брата Аляксандра*

# Прадмова

*...І няма ў людзей больш простага спосабу ўдасканальвацца, як праз веданне дзеяў мінулых.*
Палібій

*Нарыс гісторыі Беларусі* з'яўляецца спробай сціслага сінтэтычнага выкладу гісторыі Беларусі ад найдаўнейшых часоў да ўключэння краю ў склад Расійскай імперыі. Ранейшыя сінтэзы нашага мінулага састарэлі, і выданне канцэптуальна новых прац даўно стала відавочнай патрэбай. Зрэшты, абагульняльных кніг па гісторыі ў нас заўжды не хапала. Пасля Вацлава Ластоўскага, які ў 1910 г. выдаў «Кароткую гісторыю Беларусі», упершыню папулярна падаўшы мінулае краю з нацыянальных пазіцый і паклаўшы пачатак сінтэтычнаму выкладу ўласна беларускай гісторыі, да II сусветнай вайны выйшлі адно танюткі «нацыяналістычны» «Кароткі нарыс гісторыі Беларусі» Ўсевалада Ігнатоўскага (Менск, 1922) і «пралетарскі» «Нарыс гісторыі Беларусі» Васіля Шчарбакова (Менск, 1934) як яго антытэза. Пасля таго, як названыя аўтары трапілі ў апалу і іх кнігі былі забароненыя, дапаможнікаў па айчыннай гісторыі наогул не засталося[1]. Больш высокі навуковы ўзровень мела «Гісторыя Беларусі» патрыярха беларускай гістарыяграфіі Мітрафана Доўнара–Запольскага, пісаная, праўда, паспешліва, адразу пасля ўтварэння БССР, і не даведзеная да ладу, але свет яна змагла пабачыць толькі нядаўна (Мінск, 1994).

[1] У часе вайны быў укладзены зусім папулярны нарыс Язэпа Найдзюка «Беларусь учора і сяньня» (Менск, 1943), аднак яго выкарыстанне абмежавалася тэрыторыяй і перыядам нямецкага кантролю.

З 1954 г.[2] і да канца 1980-х выйшла некалькі пакаленняў сінтэтычных выданняў савецкага ўзору, асноўныя палажэнні якіх наследаваў неўзабаве створаны першы школьны падручнік, што таксама без істотнага карэктавання зместу дажыў да абвяшчэння дзяржаўнага суверэнітэту Рэспублікі Беларусь. З настойлівай паслядоўнасцю ў гэтых сінтэзах праводзіўся комплекс ідэй, якія на павер не вытрымлівалі навуковай крытыкі. У прыватнасці, у іх цалкам ігнаравалася роля балцкага субстрата ў этнагенэзе беларусаў, як аксіёма ўводзіўся тэзіс пра адзіную старажытнарускую народнасць, з якой выводзілася адвечнае імкненне беларусаў да ўз'яднання з Расіяй, маляванай выключна станоўча, а ўсё, звязанае з Польшчай, падавалася толькі ў чорных фарбах, асабліва дзяржаўная і царкоўная уніі. З нешматлікіх калектыўных выданняў савецкай эпохі лепшым застаўся першы том «Гісторыі Беларускай ССР» у 5 тамах (Мінск, 1972), у якім выразная тэндэнцыйнасць падыходаў кампенсавана грунтоўнасцю выкладзенага матэрыялу.

Першай сінтэзай, створанай у Беларусі пасля развалу СССР, стаў першы том «Нарысаў гісторыі Беларусі» (Мінск, 1994), які выгодна адрозніваецца адыходам ад старых трактовак і асвятляе мінулае з нацыянальна–дзяржаўных пазіцый, але вартасць кнігі змяншаюць фрагментарнасць і павярхоўнасць многіх раздзелаў. Падобных недахопаў мае пазбавіцца новая акадэмічная «Гісторыя Беларусі» ў 6 тамах, аднак на момант пісання гэтых радкоў у свет выйшаў пакуль толькі першы том калектыўнай працы («Старажытная Беларусь: Ад першапачатковага засялення да сярэдзіны XIII ст.)». Затое за апошнія гады паспела з'явіцца некалькі дапаможнікаў, у якіх зноў рэанімуюцца штампы «западно–руссизма» і ўзнаўляюцца штучныя вобразы суседа–сваяка з Усходу і суседа–ворага з Захаду[3].

У адрозненне ад гісторый суседніх народаў, беларускае мінулае дасюль мала вабіла і замежных вучоных. Іх сур'ёзным даробкам пакуль застаюца толькі «Беларусь: стварэнне нацыі» Нікаласа Вакара[4] і «Гісторыя Беларусі» Марцэлія Космана[5], якія да апошняга часу былі адзінымі агульнымі выданнямі па нашай гісторыі, даступнымі замежнаму чытачу, хоць мінула не адно дзесяцігоддзе пасля іх напісання. Свежая ж аўтарская сінтэза эміграцыйнага даследчыка Янкі Запрудніка «Беларусь на гістарычных скрыжаваннях» (Мінск, 1997) прысвечана галоўным чынам падзеям найноўшых часоў.

[2] История Белорусской ССР. Т.1. Под ред. В.Н.Перцева, К.И.Шабуни, Л.С.Абецедарского. Минск, 1954.

[3] Найбольш яскравы прыклад — Гісторыя Беларусі: У 2 ч. Частка 1. Ад старажытных часоў — па люты 1917 г. / Пад рэд. Я.Новіка, Г.Марцуля. Мінск, 1998.

[4] Vakar N. Byelorussia. The Making of Nation. Cambridge, Massachusetts, 1956.

[5] Kosman M. Historia Białorusi. Wrocław, 1979.



*Нарыс гісторыі Беларусі* напісаны на аснове даступнага корпуса айчынных і замежных даследаванняў (гл. бібліяграфію). Кнігу склалі дзесяць раздзелаў, у якіх асвятляюцца адпаведна працэс першапачатковага засялення тэрыторыі Беларусі (І), з'яўленне першых дзяржаў і хрысціянізацыя (ІІ), утварэнне Вялікага Княства Літоўскага і шляхі ўваходжання ў яго Беларусі (ІІІ), кансалідацыя зямель вакол Вільні (IV), палітычныя і грамадскія структуры ВКЛ (V), асноўныя тэндэнцыі культурнага развіцця ў сярэдневяковай Беларусі (VI), шляхецкая дэмакратызацыя і забяспечаная ёю унія (VII), Рэфармацыя, наступ каталіцкай рэакцыі і культурны раскол (VIII), войны і заняпад XVII ст. (IX), анархія XVIII ст., усталяванне расійскай гегемоніі і катастрофа рэспублікі (X). Частка неабходнай інфармацыі пададзена ў дадатку (дыяграмы, табліцы, карты).

Прапорцыі размеркавання тэксту па раздзелах і тэмах нераўнамерныя, што невыпадкова. Сярод многіх цяжкасцяў, якія чакаюць кожнага, хто возьмецца пісаць даўнюю гісторыю Беларусі, першай жа будзе недаследаванасць яе цэлых перыядаў і пластоў, а таксама недахоп падстававай літаратуры. Сутыкнуўшыся з імі і разумеючы, што ў выкладанні гісторыі тысячагоддзя ў невялікай кнізе немагчыма ўнікнуць адбору матэрыялу, многіх пропускаў і спрашчэнняў, я палічыў мэтазгодным звярнуць больш увагі на дзяржаўна–палітычнае і грамадскае жыццё краю ў XVI—XVII ст. — у найважнейшыя часы даўняй гісторыі Беларусі, з якімі звязана і найбольш ідэалагічных міфалагізацый старой гістарыяграфіі. Часы, што трывала лучылі нас з суседнімі народамі цывілізаванага свету Еўропы — хоць бы праз супольныя цэнтры ўлады і адкрытасць.

Спалучаючы папулярную форму падачы матэрыялу з навуковай дакладнасцю, аўтар паспрабаваў збалансавана паказаць падзеі палітычнага і грамадска–культурнага жыцця, аб'ектыўна асвятліць найбольш спрэчныя моманты айчыннай гісторыі, праводзячы па меры магчымасці ўласны погляд на іх сутнасць.

Добра ўсведамляю, што многія беларускія вучоныя ведаюць нашмат больш за мяне. Суцяшае, аднак, вядомае выказванне Нормана Дэвіса: «Укладам гісторыка ў гісторыю не ёсць выключна веды па прадмеце...». Ведаю, што кніга можа (і павінна!) выклікаць спрэчкі. Сённяшні гісторык разумее, што колькі б ён ні падпарадкоўваўся імператыву аб'ектыўнасці, быць дарэшты бесстароннім не зможа. Мне важна было звярнуць увагу на традыцыйна незаўважаныя ў папярэдніх сінтэзах аспекты нашага мінулага, паспрабаваць

зірнуць на яго з перспектывы правоў чалавека, адцяніць ганьбаваны феномен шляхецкай дэмакратыі і самакіраванне магдэбургскіх гарадоў, першыя формы грамадзянскай супольнасці і еўрапейскі кантэкст мінулага Беларусі наогул.

Прыкладзеная бібліяграфія не прэтэндуе на паўнату, аднак уяўлялася немэтазгодным абмяжоўваць яе толькі класічнымі, падставовымі і найноўшымі выданнямі. Паколькі сучаснай гістарычнай бібліяграфіі ў Беларусі проста няма, з практычна-навуковых інтарэсаў у прыкладзены спіс уключана максімальная колькасць кніжных пазіцый, якія дагэтуль не страцілі значэння.

Аддаючы на суд чытачоў *Нарыс гісторыі Беларусі*, спяшаюся падкрэсліць, што гэтай кнігі не было б без дапамогі вялікага кола добразычліўцаў. Перадусім дзякую акадэміку Яраславу Ісаевічу, праф. Ежаму Клачоўскаму, праф. Анджэю Каміньскаму і праф. Адаму Мальдзісу за прапанову ўвайсці ў калектыў аўтараў сінтэтычных прац па гісторыі Беларусі, Літвы, Польшчы і Украіны (1992). За каштоўныя парады і падказкі шчыра абавязаны маім рэдактарам Алегу Трусаву і праф. Анатолю Грыцкевічу. Найглыбейшую ўдзячнасць выказваю рэцэнзентам акад. Юліушу Бардаху і праф. Анджэю Каміньскаму, чыя крытыка была для мяне асабліва дарагой. На сустрэчах згаданага калектыва канцэпцыя кнігі неаднаразова была прадметам супольнага абмеркавання, за ўдзел у якім і падтрымку хацеў бы падзякаваць Адомасу Бутрымасу, Яраславу Грыцаку, Ганне Дылёнговай, Губэрту Лашкевічу, Антанасу Кулакаўскасу, Браніславу Макоўскаму, Яну Скарбку, Юозасу Тумялісу, Захару Шыбеку і Наталлі Якавенка. Урэшце самую глыбокую ўдзячнасць выказваю маім сябрам, якія заўжды дапамагалі ў пошуку літаратуры — Моніцы Банькоўскай ды Лявону Юрэвічу, а таксама маім родным, што натхнялі і падтрымлівалі духоўна.

Выданне адрасуецца шырокай аўдыторыі. Як канцэнтраваны выклад гісторыі Беларусі яно можа выкарыстоўвацца ў якасці дапаможніка на адпаведных курсах ВНУ, а таксама быць прыдатнай для чытання кожнаму, хто знаёміцца з беларускай гісторыяй самастойна. Спадзяюся, кніга часткова задаволіць патрэбу суайчыннікаў у ведах па няпростай гісторыі нашай краіны і паспрыяе стварэнню больш праўдзівага вобраза беларускага мінулага.

# Уступ

## Назва краю і народа

Сярод вядомых аўтэнтычных крыніц, якія непасрэдна тычацца гісторыі земляў сучаснай Беларусі, назва «Белая Русь» упершыню згадана ў ананімным лацінамоўным рукапісе другой паловы XIII ст., які быў параўнальна нядаўна выяўлены ў Дубліне амерыканскім гісторыкам Марвінам Л. Колкерам. Аўтар тэксту каталіцкі місіянер, паміж іншага, запісаў, што яго калега Вайслан (Vaislanum) «прапаведуе слова Божае на Белай Русі». Праз стагоддзе «Белую Русь» неаднаразова згадваў у вершах паўднёванямецкі паэт Пётр Зухэнвірт, які апісваў ваенныя прыгоды братоў–рыцараў, што ваявалі з Вялікім Княствам Літоўскім, Ноўгарадам і Псковам. З Інфлянтаў яны траплялі на тэрыторыю «Белай Русі», якую можна лакалізаваць у раёне Полацка і Пскова. У паведамленні польскага храніста Яна Чарнкоўскага (1300—1387) за 1382 г. гэтая назва ўпершыню звязана з канкрэтным горадам: літоўскі князь Кейстут, паланіўшы Ягайлу, загадаў пасадзіць яго разам з маці ў «castro Albae Russiae, Polock dicto». Гэтыя лацінамоўныя тэксты і з'яўляюцца самымі раннімі крыніцамі, у якіх сустракаецца першапачатковая форма цяперашняй назвы Беларусі. Заўважым, што тэрмін «Белая Русь» упершыню сустракаецца ў помніках лацінскага пісьменства і ўжываецца ў іх як іншаназва.

У крыніцах, створаных на тэрыторыі Вялікага Княства Літоўскага, першыя прыклады выкарыстання назвы «Белая Русь» фіксуюцца ў XV ст. У прыватнасці, яна згадваецца ў вядомым пасланні мітрапаліта Місаіла да папы, датаваным 1476 г. Аднак

пастаяннай геаграфічнай прывязкі гэтая назва яшчэ не мела. У нямецкай хроніцы Ульрыха Рыхенталя, напісанай у 1420-я г., гарадамі Белай Русі названы Полацк, Віцебск, Смаленск і Берасце. Праўда, у лістах Прускага ордэна да чэшскага караля Вацлава IV (1378—1419) за 1412—1413 г., у якіх таксама згадваецца «Weissen Rewsen», пад ёю разумелі землі па–за межамі дзяржавы Вітаўта. На некаторых еўрапейскіх картах XV — пачатку XVI ст. подпісам «Белая Русь» пазначана тэрыторыя Маскоўскага княства. Так часам называлі Маскоўскую дзяржаву ў сваіх апісаннях заходнееўрапейскія аўтары пасля захопу Іванам III (1462—1505) Ноўгарада Вялікага. Аднак выкарыстанне гэтай назвы ў дачыненні да Маскоўскай Русі мела чыста палітычны сэнс. Як этнаграфічна–тэрытарыяльнае вызначэнне яна ніколі там не ўжывалася.

У другой палове XVI ст. «Белая Русь» у многіх крыніцах мела ўжо больш дакладную геаграфічную лакалізацыю. Польскія гісторыкі Марцін Кромер (1512—1589) і Аляксандр Гвагнін (1534—1614) лічылі ёю Падзвінне і Падняпроўе. І ў дзяржаўных дакументах Вялікага Княства Літоўскага (напрыклад, у прывілеі караля Стэфана Баторыя (1576—1586) рыжскім купцам ад 1581 г.) «Белая Русь» фігуруе як назва адной з правінцый гэтай дзяржавы (побач з Літвой, Жамойцю, Інфлянтамі). Прыкладна з 1620-х г. колькасць выпадкаў выкарыстання гэтага тэрміна ў крыніцах рэзка ўзрасла, а яго геаграфічны змест выразна акрэсліўся. Гэта была найперш паўночна–ўсходняя частка этнічна беларускай тэрыторыі, Падзвінне і Падняпроўе — Віцебскае, Полацкае, Мсціслаўскае, Смаленскае і часткова Менскае ваяводствы. З'явілася і вытворная назва «беларусцы». Так называлі сябе жыхары этнічнай Беларусі з канца XVI ст.: «родам ліцвін беларусец Ашмянскага павету», «літоўка беларуска Мсціслаўскага павету», «беларусец Лідскага павету», «віцебчанін беларусец пасадскі чалавек» і г.д. Слова «ліцвін», «літоўскі» азначала тут прыналежнасць да дзяржавы, а «беларусец» — этнічна–рэлігійную самаакрэсленасць. Адначасова ў дачыненні да тэрыторыі Беларусі (за выняткам заходняй) у якасці вызначэння, якое дамінавала да XVII ст., выступаў старадаўні ўсходнеславянскі этнонім і канфесіонім «Русь» ды яго вытворныя «русіны», «рускі народ». Апошнія ў роўнай ступені тычыліся і Ўкраіны.

Так этнанімічная назва «Белая Русь», якая не ахапіла яшчэ ўсёй этнічнай тэрыторыі беларусаў, ужо ў XVII ст. трывала замацавалася за большай часткай краю і стала пераносіцца на яго жыхароў. Паказальна, што тады і ў Заходняй Еўропе ўяўленні пра Белую Русь



набывалі большую дакладнасць. Напрыклад, на карце Гільёма дэ Баплана сярэдзіны XVII ст. да яе аднесены Полацкае, Віцебскае, часткі Менскага і Мсціслаўскага ваяводстваў, на іншых тагачасных картах — увесь абшар паміж Дзвіной і Прыпяццю. А габсбургскі пасол Аўгустын Маерберг, які ездзіў праз Вялікае Княства ў Маскву, у апісанні падарожжа (1661) аднёс да Белай Русі землі «паміж Прыпяццю, Дняпром і Дзвіною з гарадамі Навагрудкам, Менскам, Мсціславам, Смаленскам, Віцебскам і Полацкам ды іх акругамі».

Цяперашняя форма назвы Беларусь стала ўжывацца ў канцы XVIII—XIX ст., а яе пашырэнне на ўсю сучасную тэрыторыю краіны адбывалася яшчэ пазней і было звязана з развіццём нацыянальнага руху ды працэсамі фармавання беларускай нацыі. Аднак, нягледзячы на позняе замацаванне тэрміна «Беларусь», яго выкарыстанне ў тэрытарыяльным плане ўяўляецца апраўданым і для асвятлення папярэдняй гісторыі краіны. Пісаць пра сярэднявечную тэрыторыю нашай зямлі як пра Беларусь, думаю, не менш правамерна, чым называць Расіяй абшары Паўночна–Ўсходняй Русі X—XV ст., што робяць расійскія гісторыкі, або гаварыць пра палеаліт Польшчы. Рэтраспектыўнае выкарыстанне азначэнняў «Беларусь», «беларускі» ў дачыненні да часоў, якія папярэднічалі з'яўленню выразных этнаграфічна–культурных асаблівасцяў краіны, неабходнае для фіксавання кантынуітэту яе гісторыі.

## Тэрыторыя і прыродныя ўмовы

Беларусь знаходзіцца на захадзе старажытнай Усходне–Еўрапейскай раўніны, на водападзеле Чорнага і Балтыйскага мораў. Яе цяперашняя плошча 207,6 тыс. кв. км, а насельніцтва на 2000 г. складала 10,3 млн. чалавек.

Краіна не мае выхаду ні да мора, ні да гораў. Межы Беларусі з Літвой, Латвіяй, Расіяй, Украінай і Польшчай не звязаны з істотнымі прыроднымі рубяжамі ці перашкодамі. Большую частку яе паверхні ўтвараюць раўніны і нізіны, а ўзвышшы не займаюць і трэцяй часткі плошчы краіны. Асноўныя формы рэльефу сфармаваліся яшчэ ў ледавіковы перыяд. Выгляд тэрыторыі і сетка рэк атрымалі блізкія да цяперашніх рысы яшчэ каля дзевяці—пяці тысячагоддзяў назад. Марэнныя ўзгоркі чаргуюцца тут з раўнінамі ды азёрна–балотнымі нізінамі, асабліва на поўдні, дзе прырода захавала больш

старажытнае аблічча. Галоўныя рэкі — Дзвіна, Дняпро, Нёман і Прыпяць, прытокі якіх густой сеткай пакрываюць тэрыторыю ўсяго краю ды звязваюць яе ў адно цэлае. Водасістэмы Дзвіны і Нёмана, якія ўпадаюць у Балтыйскае мора, аддзелены ад Дняпроўскага басейна шырокай чарадой узвышшаў, працягнутай з паўднёвага захаду на паўночны ўсход Беларусі. На поўначы, у Паазер'і рэльеф мае выразна марэнна–ледавіковыя формы. Сярод забалочаных нізін і раўнін тут засталася найбольшая колькасць азёр, пакінутых апошнім ледавіком. Цэнтральная частка тэрыторыі Беларусі ўзвышана, таму яна заселена шчыльней за іншыя раёны і лепш гаспадарча асвоена. Поўдзень краіны ахапіла вялікая прыледавіковая раўніна, значную частку якой займае Беларускае Палессе — моцна забалочаная нізіна ў басейне Прыпяці, нахіленая на ўсход.

Клімат Беларусі ўмерана–кантынентальны і вільготны, які фармуецца пераважна пад уплывам палярна–марскога паветра. Глебы малаўрадлівыя, пясчана–глiністыя ці пясчаныя, толькі зрэдку — дзярнова–падзолістыя, а на поўдні — тарфяністыя. Галоўным прыродным багаццем краю здаўна былі лясы, якія густым масівам пакрывалі ўсю яго паверхню. З XVIII ст. іх высечка набыла знішчальны характар, але ў XIX ст. лясы ахаплялі яшчэ больш за палову тэрыторыі Беларусі, і нават цяпер лясное покрыва займае каля 1/3 плошчы краіны. Асабліва багатыя лесам Падзвінне ды басейн Бярэзіны. Беларускі лес змешаны, але ў цэлым на сухіх землях дамінуюць хваёвыя, а ў забалочаных раёнах — вольха і бяроза.

Ландшафт Беларусі, вядома ж, на працягу стагоддзяў мяняўся ў выніку як прыродных працэсаў, так і людскога гаспадарання. Аднак у асноўных рысах выгляд мясцовасцяў нашага краю з эпохі Сярэднявечча да гэтага часу не зведаў асабліва значных трансфармацый. Як сведчаць рэвізіі пушчаў сярэдзіны XVI ст., праведзеныя ў сувязі з аграрнай рэформай, вялізныя гушчары і багны аддзялялі адзін заселены абшар ад другога, сярод якіх найбольшай шчыльнасцю насельніцтва і гаспадарчай асвоенасцю вылучаліся заходнія і цэнтральныя землі — Панямонне, Падляшша, басейн Вяллі ды яшчэ паветы Менскі, Слуцкі і Клецкі. Асобнымі выспамі жыхарства канцэнтравалася таксама ў Полацкай, Віцебскай ды Смаленскай землях, у раёнах Пінска ды Турава. Астатнія абшары, асабліва на поўдзень ад пінскіх балотаў, якія аддзялялі Беларусь ад Украіны, былі зусім малалюдныя.

# I. Вытокі

## I.1. Першабытныя людзі

Пачатак гісторыі Беларусі сягае каменнага веку, перыяду станаўлення старажытнага чалавечага грамадства. Першыя людзі маглі прыйсці на абшары нашай краіны ўжо ў эпоху мусцье, г.зн. у сярэднім палеаліце. Пра гэта сведчаць выяўленыя археолагамі на паўднёвым усходзе цяперашняй Беларусі архаічныя крамянёвыя прылады для палявання і апрацоўкі скуры, якія, мяркуючы па іх характэрных рысах, маглі належаць неандэртальскаму чалавеку, г.зн. іх можна адносіць да перыяду 100 — 40 тыс. гадоў да н.э. Праўда, падобнае датаванне не мае надзейных геалагічных, археалагічных і палеанталагічных падставаў, таму шэраг вучоных аспрэчвае мусцьерскае паходжанне гэтых знаходак. Больш пэўным будзе звязваць пачатак асваення нашай зямлі чалавекам з эпохай позняга палеаліту (ад 40 да 11 тыс. гадоў да н.э.), якой датуюцца добра захаваныя стаянкі людзей, выяўленыя каля вёсак Бердыж і Юравічы. Людзі, што пакінулі тут паўзямлянкі, ужо ўмелі выкарыстоўваць агонь, валодалі пласцінкавай тэхнікай апрацоўкі каменя. Гэта былі краманьёнцы.

Прыкладна 15 — 14 тысяч гадоў назад з Беларусі сышоў апошні ледавік. Пачалася эпоха мезаліту, якая доўжылася да канца V тыс. да н.э. Рэльеф, раслінны і жывёльны свет паступова набывалі цяперашні выгляд. Прыходзячы з поўдня або захаду, першабытныя людзі рухаліся ўздоўж рэк і паволі засялялі ўсю цяперашнюю тэрыторыю нашай краіны. Яны жылі ў паўзямлянках родавымі

абшчынамі (аснову абшчыны, якая налічвала 25—30 чалавек, складалі родзічы па маці), займаліся паляваннем, рыбалоўствам ды збіральніцтвам. З родавых абшчын утварылася новая форма сацыяльнай арганізацыі людзей — племя, якое паклала пачатак фармаванню першых этнічных супольнасцяў. Колькасць усяго насельніцтва ў сённяшніх межах Беларусі магла сягаць тады прыкладна 6 тысячаў.

На апошнім этапе каменнага веку, у нэаліце, які настаў на нашых землях напрыканцы V тысячагоддзя да н.э., у жыцці першабытных насельнікаў адбыліся важныя перамены. Пачалася так званая тэхналагічная рэвалюцыя: чалавек авалодаў новай тэхнікай апрацоўкі крэменю, пачаў шліфаваць каменныя прылады працы, навучыўся выраблюць гліняны посуд і інш. Дзякуючы гэтым дасягненням людзі сталі пераходзіць да аседлага ладу жыцця, асвойваць земляробства ды жывёлагадоўлю. Пацяпленне клімата і пераход да інтэнсіўных формаў гаспадарання абумовілі хуткі рост колькасці насельніцтва: на абшарах Беларусі археолагі выявілі больш за 600 пасяленняў новага каменнага веку.



*Крэмнездабывальныя шахты каля пасёлка Краснасельскі пад Ваўкавыскам.*

У III тысячагоддзі да н.э., калі ад сфармаванай у Балкана–Карпацкім рэгіёне індаеўрапейскай этнамоўнай супольнасці пачалі аддзяляцца асобныя дыялектныя групы, плямёны інда-еўрапейцаў — далёкіх продкаў сучасных еўрапейскіх народаў — дасягнулі і Беларусі. Гэта былі носьбіты культуры шарападобных амфараў, якія прыходзілі праз Панямонне і басейн Дняпра. Аднак сапраўды вялікія этнічныя перамены насталі толькі ў канцы III і пачатку II тысячагоддзяў, калі пачаўся перыяд бронзавага веку. Індаеўрапейскія плямёны вялікай этнакультурнай групоўкі, вядомай у навуцы як культура шнуравой керамікі, рассяліліся па ўсёй Еўропе, ад Рэйна да Волгі. У Беларусь яны прыйшлі праз басейны Нёмана і Дняпра. Прышлыя насельнікі ўжо карысталіся бронзавымі прыладамі працы (з чым звязаны пачатак бронзавага веку і на нашай тэрыторыі), займаліся больш прадукцыйнымі формамі гаспадарання — матычным земляробствам і жывёлагадоўляй, жылі ў наземных пабудовах слупавой канструкцыі. Выкарыстанне металічных прылад працы зрабіла пераварот у развіцці прадукцыйных сіл. Паўсюдна адбываўся пераход да вытворчай гаспадаркі, якая павялічвала ролю мужчынскай працы. Археалагічныя матэрыялы з тагачасных пахаванняў сведчаць, што сярод насельніцтва была ўжо сацыяльная няроўнасць. Жывёлагадоўля і земляробства дазвалялі людзям пакідаць нешта ў запас, ствараць багацце. Гэта падрывала асновы мацярынскага роду і ставіла на першае месца вялікую патрыярхальную сям'ю, праца якой была больш прадукцыйнай. Так нараджалася прыватная ўласнасць, якая пазней і пахавала першабытнае грамадства.



*Выгляд чалавека эпохі бронзы. Рэканструкцыя па чэрапе.*

Значным этапам у этнічнай гісторыі нашай краіны стала яе засяленне індаеўрапейскімі плямёнамі ў II тыс. да н.э. Тэрыторыя Беларусі зрабілася часткай прарадзімы балтаў і славян. У яе межах найбольш даследаваны старажытнасці сярэднедняпроўскай культуры, якая ўвасабляла тут этнакультурную групоўку індаеўрапейцаў. Яе носьбіты доўга суіснавалі з карэнным насельніцтвам, паступова асімілюючы тубільцаў. У сярэдзіне II тыс. да н.э. плямёны культуры шнуравой

керамікі зліліся з ранейшым жыхарствам Беларусі, у выніку чаго паўстала протабалта–славянская супольнасць — сталае насельніцтва, якое было ўжо пастаянным дэмаграфічным фонам на тэрыторыі краю.

## I.2. Балты

Балцкая этнамоўная супольнасць фармавалася на велізарных лясных абшарах паміж Балтыйскім морам на захадзе і вярхоўямі Акі на ўсходзе, між Дзвіной на поўначы і Прыпяццю на поўдні. З агульнага балта–славянскага масіву яна магла выдзеліцца на пачатку I тыс. да н.э. У эпоху жалезнага веку (VIII ст. да н.э. — VIII ст. н.э.) на тэрыторыі Беларусі ўжо існавалі паасобныя племянныя групоўкі носьбітаў балцкіх моў. У якасці іх эквівалентаў даследчыкі вылучаюць некалькі роднасных археалагічных культур: днепрадзвінскую, якая ахоплівала Полацка–Віцебскае Падзвінне ды вярхоўі Дняпра, і штрыхаванай керамікі, плямёны якой засялялі тэрыторыю ўсёй цэнтральнай Беларусі і землі ў сучаснай Літве ды Латвіі. Няма адзінай думкі наконт мілаградскай культуры, археалагічныя помнікі якой знаходзяцца ў басейне Прыпяці і Сярэдняга Дняпра: адны археолагі адносяць яе да славян, другія — да балтаў. А вось этнічная прыналежнасць зарубінецкіх плямёнаў, што ў канцы I тыс. да н.э. з'явіліся на тэрыторыі, займанай раней мілаградцамі, большасцю беларускіх вучоных вызначаецца як славянская.

Такім чынам, амаль на ўсёй тэрыторыі Беларусі ў далёкай старажытнасці дамінавалі ўсходнія балты. Балтамоўнае насельніцтва было расселена невялікімі калектывамі па родавых гарадзішчах, займалася земляробствам і жывёлагадоўляй, будавала заглыбленыя ў зямлю жытлы з вогнішчам у куце і ўжо выкарыстоўвала жалезныя прылады працы.

Прыкладна ў сярэдзіне I тыс. н.э. адбылася уніфікацыя культур жалезнага веку. На іх аснове склалася новая культура, межы распаўсюджання якой максімальна блізкія да пазнейшых этнаграфічных межаў рассялення беларусаў. Паводле найбольш характэрных помнікаў, што з'явіліся на тэрыторыі амаль усёй Беларусі ў трэцяй чвэрці I тысячагоддзя, вучоныя называюць яе Банцараўска–Калочынска–Тушамлянскай, або проста Банцараўскай. Пасяленні гэтай культуры пакінула таксама даславянскае, г.зн. балцкае насельніцтва.



Лакальныя варыянты Банцараўскай культуры сталі той асновай, на якой з прыходам славян пачалі фармавацца новыя этнічныя супольнасці. Такім чынам, балтамоўныя племянныя групоўкі з'явіліся субстратам (падасновай) беларускага этнагенэзу.

## I.3. Рассяленне славян

Славяне вылучыліся з індаеўрапейскай моўна–этнічнай супольнасці ў самастойную групоўку прыкладна да сярэдзіны I тысячагоддзя да н.э. Масавыя міграцыі людзей у эпоху Вялікага перасялення народаў (III — VII ст. н.э.) уплывалі і на рухомасць славян. У V—VI ст. н.э. яны з'явіліся на Балканах, адкуль пачалі рухацца ў бок багатых рымскіх правінцый і на ўсход. Прынята лічыць, што менавіта з гэтым працэсам звязана з'яўленне ў Цэнтральнай і Ўсходняй Еўропе першых бясспрэчна славянскіх археалагічных помнікаў, вядомых як культура пражскага тыпу.

На тэрыторыю Беларусі першыя славяне прыйшлі з поўдня прыкладна ў VI—VII ст., калі ўзрост балцкіх старажытнасцяў тут сягаў ужо двух тысячагоддзяў. Храналагічна гэта супала з пачаткам распаду агульнаславянскай мовы. Моцная славянская групоўка з'явілася тады на Ўкраіне і на поўдні Беларусі, ніжэй Прыпяці. Але абшары на поўнач ад гэтай ракі славяне пачалі асвойваць толькі ў VIII ст. Што ж да паўночных і заходніх зямель краіны, дык іх тут не было да IX ст.

Рухаючыся па рэках, славяне сяліліся побач з балтамі, нярэдка падпарадкоўваючы іх, займалі гарадзішчы абарыгенаў. Яны пераўзыходзілі балтаў па ўзроўні сацыяльнай арганізацыі, мелі больш развітую гаспадарку: займаліся ворыўным земляробствам, ведалі двухполле, карысталіся ралам з жалезным наканечнікам, чараслом. Аб паступовым рассяленні ўсходніх славян па тэрыторыі ўсёй Беларусі ў IX ст. (за выняткам Панямоння, дзе яны з'явіліся на век пазней) сведчаць пашыраныя тут тыпова славянскія старажытнасці — акруглыя курганы з пахаваннямі паводле абраду трупаспальвання, паўзямлянкі з печамі–каменкамі ў куце, спецыфічная кераміка, асаблівыя ўпрыгожванні і інш.

Невядома, наколькі мірным было суіснаванне двух этнасаў на тэрыторыі Беларусі. На шэрагу балцкіх гарадзішчаў мяжы VII — VIII ст. зафіксаваны сляды пажараў, што сведчыць пра ваенныя канфлікты. Агульны заняпад Банцараўскай культуры археолагі звязваюць з каланізацыйнай экспансіяй славян.

Вынікам працяглых і актыўных міжэтнічных кантактаў, паступовага змешвання славян з карэнным балцкім насельніцтвам ды яго метысацыі стала ўтварэнне новых міжплемянных супольнасцяў — сімбіёз балцкай і славянскай культуры. Сведчаннем такога сімбіёзу можна лічыць прысутнасць балцкіх элементаў у славянскіх старажытнасцях, спалучэнне ў адных помніках і славянскіх, і балцкіх этнавызначальных рысаў. Прыкладам, на занятай усходнімі славянамі тэрыторыі з'явіліся курганы з усходняй арыентацыяй (па балцкай традыцыі), хоць славяне хавалі нябожчыкаў галавой на захад. Тыпова балцкімі лічацца таксама многія іншыя элементы пахавальнага абраду, выяўленыя ў курганах упрыгожанні. Такія помнікі належалі, відаць, ужо славянізаваным балтам.

Пералічваючы ўсходнеславянскія плямёны, Географ Баварскі ў IX і Канстанцін Парфірародны ў X ст., а таксама «Аповесць мінулых гадоў», створаная на пачатку XII ст., называюць вяцічаў, дрыгавічоў, драўлянаў, крывічоў, палачанаў, палянаў, радзімічаў, севяранаў, славенаў, ціверцаў, улічаў, ды бужанаў і дулебаў, якіх звалі яшчэ валынянамі. Тэрыторыю Беларусі займалі дрыгавічы, крывічы і радзімічы. Яны з'явіліся тут, відаць, у VIII—IX ст., хоць працэс актыўнай асіміляцыі балтаў цягнуўся яшчэ некалькі стагоддзяў. Палачане былі хутчэй не этнічнай, а тэрытарыяльна–палітычнай супольнасцю.

Пры агульным усходнеславянскім абліччы новыя племянныя аб'яднанні набылі шэраг спецыфічных рысаў — у залежнасці ад удзельнай вагі аўтахтонаў ды рэгіянальных асаблівасцяў. Праз тысячагоддзе найбольш паказальнымі аказаліся адрозненні ў жаночых упрыгожваннях і пахавальным абрадзе, картаграфаванне якіх і дазволіла археолагам вызначыць тэрыторыю рассялення кожнага з трох летапісных аб'яднанняў, што засялялі тэрыторыю сучаснай Беларусі. Крывічы займалі абшары Падзвіння і Верхняга Падняпроўя. Іх племянным цэнтрам быў Полацк. Дрыгавічы засялялі землі ад Прыпяці да лініі Заслаўе — Лагойск — Барысаў. На ўсходзе яны былі абмежаваныя Дняпром, на захадзе — Выганаўскімі балотамі, а цэнтрам мелі Тураў. На поўначы Беларускага Палесся славянскія рысы дрыгавіцкіх старажытнасцяў малазаўважныя, паколькі дрыгавічы пераймалі тут усю матэрыяльную культуру балцкага насельніцтва. Радзімічы ж займалі басейн Сожа да левага берага Дняпра. Самым значным пасяленнем на радзіміцкай тэрыторыі быў Гомель, магчыма, іх племянны цэнтр.



Прыкладна з X ст. крывічы і дрыгавічы распачалі каланізацыю Панямоння, заселенага плямёнамі яцвягаў па левы і літвы па правы бераг Нёмана. Туды ж памкнуліся валыняне і драўляне. Аднак асіміляцыя балтаў тут праходзіла надта марудна, таму Панямонне яшчэ стагоддзямі заставалася змяшанай балта–славянская зонай.

Вядомы знаўца балта–славянскіх старажытнасцяў археолаг Валянцін Сядоў лічыць, што менавіта карэннае балтамоўнае насельніцтва стала кансалідуючай асновай, якая дала пачатак фармаванню новай, асобнай этнічнай супольнасці. Гэты працэс адбываўся менавіта на тэрыторыі, акрэсленай балцкімі гідронімамі, г.зн. там, дзе да прыходу славян жылі балты. Праўда, у Беларускім Паазер'і, паміж Дзвіной і Верхнім Дняпром, ёсць і фіна–угорскія гідронімы, аднак шэраг вучоных мяркуе, што славяне маглі атрымаць іх у спадчыну ад балтаў, а непасрэднага кантакту з фіна–уграмі хутчэй за ўсё не мелі.

Выглядае, што абшары этнагенэзу вызначалі не рубяжы старых племянных саюзаў ці будучых дзяржаў, а этнічны субстрат. Менавіта пад уплывам балцкіх дыялектаў на вялікай тэрыторыі паміж вярхоўямі Дняпра і Нёманам, ад Дзвіны да Прыпяці сталі выпрацоўвацца фанетычныя асаблівасці беларускай мовы — аканне, дзеканне, цеканне, цвёрдае «р» і інш. Значнае ўздзеянне балцкіх дыялектаў зазнала мова крывічоў, дрыгавічоў і радзімічаў таксама на ўзроўні марфалогіі і лексікі. Мноства сведчанняў пра генетычныя сувязі і колішняе супольнае жыццё засталося ў беларускіх этнаграфічных матэрыялах і фальклоры. Гэта вядомыя толькі на этнічна беларускіх ды літоўскіх землях агульныя культы (прыкладам, культ змяі і каменя), старажытныя песні з агульным матывам і мастацкім зместам, слупавая тэхніка ўзвядзення сцэнаў, адмысловы, характэрны толькі для гэтых абшараў тып лапцяў ды шмат чаго іншага.

Крывічы, дрыгавічы і радзімічы былі не родаплемяннымі, а тэрытарыяльна–палітычнымі ўтварэннямі. Каланізацыя зя-

мель, раней абжытых іншым насельніцтвам, патрабавала ад іх моцнай ваеннай арганізацыі, узвядзення сваіх апорных пунктаў — гарадоў, што выконвалі ролю і адміністрацыйных цэнтраў, і фарпостаў асваення новай тэрыторыі. Гэтыя ўсходнеславянскія групоўкі былі ўжо моцнымі міжплемяннымі саюзамі з уласнымі патэстарнымі інстытутамі, вядомымі ў спецыяльнай літаратуры як племянныя княжанні.

## І.4. Русь і варагі

Сярод плямёнаў, якія насялялі Ўсходнюю Еўропу задоўга да ўтварэння дзяржавы Русь, «Аповесць мінулых гадоў» — першы ўсходнеславянскі летапісны звод, які ўвабраў найбольш раннія крыніцы — асобна вылучае палянаў, дрыгавічоў, палачанаў ды ільменьскіх славенаў. Іх княжанні (перадддзяржаўныя формы арганізацыі грамадства), размешчаныя ўздоўж шляху «з варагаў у грэкі» — старажытнай рачной трасы з Балтыйскага мора ў Чорнае, былі самымі значнымі. Дрыгавічоў і палачанаў, якія займалі тэрыторыю сучаснай Беларусі (а таксама палянаў, драўлянаў ды ільменьскіх славенаў) летапіс назваў славянамі паводле паходжання («словенск язык») і аднёс да мігрантаў («пришедше», «седоша»). Мова ж крывічоў, радзімічаў і вяцічаў у помніку не акрэслена. Радзімічы, як і вяцічы ды севяране, відаць, таксама мелі свае княжанні, але плацілі даніну хазарам. Магутнаму хазарскаму каганату, што валодаў нізоўямі Дняпра, Дона і Волгі, у сярэдзіне VIII ст. мусілі падпарадкавацца прыдняпроўскія славяне.

Пагроза з боку азіяцкіх качэўнікаў, а ў IX ст. і рабаўнічыя наезды варажскіх дружын падштурхоўвалі славянскія плямёны да кансалідацыі, да стварэння сваіх надплемянных дзяржаўных інстытутаў. Арганізацыйныя ўзоры маглі быць запазычаныя ў суседніх Візантыйскай імперыі і Хазарскага каганату. Пра значны хазарскі ўплыў сведчыць, у прыватнасці, хазарскае паходжанне тытула ўладара вядомых з першай паловы IX ст. русаў — «хакан», або «каган», які толькі ў XI ст. быў заменены старажытнарускім эквівалентам «вялікі князь».



У летапіснай традыцыі ўтварэнне ўсходнеславянскай дзяржавы звязана з варагамі (ва Ўсходняй Еўропе так называлі скандынаваў, якія ў IX—XI ст. ажыццяўлялі паходы ў землі амаль усёй Еўропы). Аднак гісторыкі сцвярджаюць, што пэўны тып дзяржаўнасці ў усходніх славян склаўся ўжо ў даваражскі перыяд. Першапачаткова Русь уяўляла з сябе, відаць, няўстойлівую канфедэрацыю племянных саюзаў ды іх княжанняў. Яе галоўнымі вобласцямі былі землі вакол Кіева, Ноўгарада і Полацка — канкурэнтавых дзяржаватворчых цэнтраў. Менавіта вакол іх аб’ядноўваліся іншыя ўсходнеславянскія плямёны, а таксама іхнія даннікі — весь, земгала, лівы, літва, мардва, мера, мурама, чудзь і інш. У сярэдзіне IX ст. усходнеславянскае дзяржаўнае аб’яднанне распалася на «Рускую зямлю», размешчаную ў басейне Сярэдняга Дняпра (Кіеў, Чарнігаў, Пераяслаў), і «Верхнюю Русь» — рознаэтнічную (славяне, балты і фіны) канфедэрацыю на паўночным захадзе Ўсходняй Еўропы.

Да сярэдзіны IX ст. варажскія конунгі бралі даніну з ільменьскіх славен, чудзі, меры і ўсіх крывічоў. Некаторыя вучоныя лічаць, што пасля спробы сілай падпарадкаваць гэтыя плямёны варагі былі прагнаныя. Але неўзабаве (летапіс дае дакладную дату — 862 г.) ільменьскіе славены, крывічы, чудзь і весь звярнуліся да конунга Рурыка з просьбай прыйсці і валадарыць. Мэтай гэтага запрашэння магло быць жаданне спыніць міжусобіцы, глыбокі ўнутраны разлад. Рурык прыйшоў з братамі і дружынай, заклаў Ладагу і Ноўгарад, «роздая мужем своим волости и городы рубити: овому Полтеск, овому Ростов, другому Белоозеро».

Пасля 862 г. адносіны ўсходніх славян з варагамі стабілізаваліся. Аб прысутнасці найманых воінаў або купцоў са Скандынавіі на тэрыторыі Беларусі сведчаць шматлікія археалагічныя знаходкі, сканцэнтраваныя ў асноўным уздоўж Дзвіны і Дняпра — аднаго з асноўных шляхоў «з варагаў у грэкі». Гэта рэчы скандынаўскага паходжання — зброя, упрыгожванні, рунічныя надпісы на вырабах ды інш. У апошнія гады такія знаходкі археолагі ўсё часцей выяўляюць таксама на помніках Беларускага Палесся і Панямоння, а гэта сведчыць, што варагі выкарыстоўвалі і нёманска–прыпяцкі водны шлях.

Не ўдаючыся ў даўнюю дыскусію нарманістаў і антынарманістаў вакол паходжання старажытнарускай дзяржавы, нельга не прызнаць важнай ролі варажскага элемента ў станаўленні Кіеўс-

кай Русі. І Рурыкавічы, і сама назва «Русь» — скандынаўскага паходжання, што даўно прызнана большасцю спецыялістаў. Аднак і перабольшваць гэтай ролі не варта: дзяржаўнасць не можа быць навязанай грамадству, якое жыло родавым ладам. Дзяржаватворчыя працэсы ў усходніх славян пачаліся задоўга да прыходу скандынаваў.

У 882 г. пераемнік Рурыка конунг Алег з вялікай дружынай вырушыў з Ноўгарада ўніз па водным шляху «з варагаў у грэкі». У Кіеве ён перамог варагаў Аскольда і Дзіра ды зрабіў гэты горад сваёй сталай рэзідэнцыяй. Так была канчаткова аб'яднана Русь Верхняя (паўночная) з Кіеўскай (паўднёвай). Пасля Алег заняў Смаленск і Любеч, хутка падначаліў Кіеву драўлян, севяран і радзімічаў. У залежнасць ад Кіева на нейкі час трапіў і Полацк. Прынамсі, на пачатак X ст. Русь была аб'яднанай. У 907 г. кіеўскі князь арганізаваў удалы паход на Канстанцінопаль, але не змог падпарадкаваць імперскай сталіцы і ў 912 г. падпісаў з ім дагавор аб гандлі — першы вядомы мірны дагавор Русі з Візантыйскай імперыяй.

У гады княжання Ігара (912—945) і Вольгі (945—957) Русь не перажывала значных палітычных падзей, якія б зафіксаваў летапісец, а вось сын Вольгі князь Святаслаў (957—972) узяўся актыўна пашыраць ўладанні. Ён падпарадкаваў вяцічаў і разграміў Хазарскі каганат, перамог плямёны ясаў і касогаў, захапіў Балгар — сталіцу камскіх балгараў, пасля чаго Русь стала галоўнай сілай усходнееўрапейскага рэгіёна. Святаслаў заваяваў і Балгарыю ў Падунаўі. Але трагічная смерць князя падарвала моц яго дзяржавы. Паміж сынамі Святаслава пачалася барацьба за галоўны стол. Некаторыя плямёны адразу адпалі ад Русі. Гэтым скончыўся першы перыяд Старажытнарускай дзяржавы.

Толькі ноўгарадскі князь Уладзімір, перамогшы братоў, сеў у 980 г. у Кіеве і рэфармаваў усходнеславянскую канфедэрацыю, ператварыўшы яе ў адну дзяржаву. Ён зліквідаваў мясцовыя княжанні і пасадзіў у палітычных цэнтрах Русі сваіх сыноў. Так Рурыкавічы сталі адзінай дынастыяй, якой па праву належала ўся ўлада на Русі.

Паводле некаторых іншамоўных крыніц IX—XI ст. назва «Русь» можа лакалізавацца амаль на ўсёй усходнеславянскай тэрыторыі. Гэта аднак не азначае, што яна была этнонімам усіх усходніх славян. Наадварот, этнічна гэтае слова спачатку азначала, відаць, толькі варагаў, ды і яго паходжанне, як адзначалася, скандынаўскае. Летапісец адназначна сведчыў: «И от тех варяг прозвася Руская земля». У летапісах гэты полісемантычны тэрмін да другой паловы XIII ст. сустракаецца сотні разоў і азначае то войска, то тэрыторыю, то мову, то веравызнанне. Першапачаткова ў сацыяльным плане «русь» — гэта толькі дружына князя, яго «рыцарства» і адміністрацыя, а «Руская зямля», «Русь» — гэта падуладная ім тэрыторыя, дзяржава. У геаграфічным сэнсе з X ст. так называлі землі Сярэдняга Падняпроўя з гарадамі Кіеў, Чарнігаў і Пераяслаў. Арабскія і грэцкія аўтары часта выкарыстоўвалі гэты тэрмін у дачыненні да ўсіх усходніх славян дзеля таго, каб адрозніваць іх ад іншага славянства. Да таго ж, для іх увесь усходнеславянскі свет атаясамліваўся з самым моцным княствам — Кіеўскім, якое і называлася «Руссю». У летапісах XII ст. Полацк, Смаленск і Ноўгарад (як і шэраг іншых усходнеславянскіх гарадоў) яшчэ не лічыліся ні «Руссю», ні «Рускай зямлёй». Напрыклад, «Аповесць мінулых гадоў» выразна супрацьпастаўляе «Рускай зямлі» Полацкую ды Смаленскую. Як вядома, асноўнае насельніцтва тагачаснай Беларусі да сярэдзіны — другой паловы XII ст. выступала ў пісьмовых крыніцах пад старымі племяннымі назвамі: найменне дрыгавічы ў летапісах выкарыстоўвалася да 1149, крывічы — да 1162, радзімічы — да 1169 г. Больш за тое, канкрэтны аналіз зместу летапіснага тэрміна «Руская зямля» пераконвае, што большая частка тэрыторыі ўсходніх славян не належала да яе. Напрыклад, у «Слове пра паход Ігараў» аўтар выкарыстаў гэтае азначэнне дзесяткі разоў, але ніводнага разу ім не маюцца на ўвазе ўсе ўсходнеславянскія княствы. Так што формула «ўся Руская зямля» ніяк не можа лічыцца тоеснай усім усходнім славянам.

Гэты факт пярэчыць даўнім сцвярджэнням, быццам славяне ўсёй Русі ўсведамлялі сябе адзіным народам. Агульнапрынятая раней у савецкай гістарыяграфіі тэорыя старажытнарускай народнасці, згодна з якой у Кіеўскай Русі сфармаваўся адзіны ўсходнеславянскі народ, раздзелены пазней палітычнымі межамі на ўкраінцаў, беларусаў і вялікарусаў, адпавядала не столькі інтарэсам навукі, колькі ідэалагічнай кан'юнктуры часу. Цяперашняя навука дастаткова скептычна ставіцца да самой магчымасці існавання такой народнасці. Факты пераконваюць хутчэй у адваротным, у тым, што адзінай этнакультуры на Русі XI—XII ст. не было. У кожным разе, наяўнасць такой гамагеннай супольнасці немагчыма даказаць. Тэзісы пра адзіную мову, культуру, самасвядомасць і тэрыторыю нічым сур'ёзна не абгрунтаваны. Як вядома, у этнічным плане імперыя Рурыкавічаў была вельмі неадна

родная. Апрача ўсходніх славян і скандынаўскага элемента, яе тэрыторыю насялялі балты, угра–фіны і народы цюркскага паходжання. Жыхароў вялізнай дзяржавы, раздзеленых яшчэ межамі племянных саюзаў, нішто не лучыла ў адну супольнасць. Агульную пісьмовую мову ніяк не выпадае лічыць этнакансалідуючым фактарам. Яе ролю хутчэй можна было б параўнаць з роляю лаціны ў каталіцкай Еўропе. Простая ж мова жыхароў Ноўгарада, напрыклад, мяркуючы па берасцяных граматах, у XI ст. істотна адрознівалася ад мовы кіяўлян, і гэтае адрозненне з цягам часу ўзрастала. У культурным сэнсе Русь уключала ў сябе шмат роднасных, але відавочна асобных этнамоўных кампанентаў, вялікі комплекс лакальных культур. Агульная для цэлай Русі гарадская культура ахоплівала ў той час зусім нязначную частку насельніцтва — ад 2 да 5 %, тады як абсалютную большасць жыхароў складаў кансерватыўны вясковы люд, прычым сярод жыхароў тут пераважалі яшчэ аўтахтоны, нават не славяне. «Не можа быць і размовы пра нейкую супольную народную культуру Старажытнай Русі», — падкрэсліў у спецыяльным даследаванні сучасны гісторык Вадзім Вілінбахаў.

Больш–менш адзінай Русь была толькі ў дзяржаўна–палітычным плане, але дзяржава не магла ліквідаваць племян-ных межаў. Ды і яе адзінства нельга перабольшваць. Пра гэта ў свой час аб'ектыўна выказваўся расійскі гісторык права Васіль Сергеевіч: «Наша старажытнасць не ведае адзінай дзяржавы Расійскай; яна мае справу з мноствам невялікіх дзяржаў, якія суіснавалі адначасова». Такімі невялікімі дзяржавамі былі і старажытныя княствы на тэрыторыі сучаснай Беларусі.

# II. Першыя дзяржавы Беларусі

## II.1. Полацкае княства

Кансалідацыя групоўкі крывічоў у Беларускім Падзвінні ўжо ў канцы VIII—IX ст. завяршылася ўтварэннем іх асобнага, згаданага ў летапісе «княжання», цэнтрам якога стаў Полацк. Пра Полацк упершыню гаворыцца ў «Аповесці мінулых гадоў» пад 862 г. у паведамленні аб «прызванні» варагаў Рурыка, Сінявуса і Трувора ў Паўночную Русь. Летапісец адзначыў, што Полацк, як і Смаленск, пра «княжанне» якога ў той жа крыніцы яшчэ нічога не гаворыцца, быў заснаваны крывічамі. Беларускія археолагі даказалі, што горад паўстаў прынамсі на стагоддзе раней за яго першую згадку ў летапісе. Да апошняй трэці IX ст. полацкія крывічы не залежалі ні ад Кіева, ні ад Ноўгарада. Тэзіс пра яго раннюю падпарадкаванасць гэтым цэнтрам не пацвярджаецца крыніцамі. Толькі ў 870-х г. варажскія князі Аскольд і Дзір, што сядзелі ў Кіеве, ажыццявілі паход на Полацк і «воеваша полочан» (пад летапіснымі палачанамі трэба разумець не толькі крывічоў, але ўсё насельніцтва княжання). Не выключана, што яны і ўключылі цэнтр полацкіх крывічоў у арбіту ўплываў Кіева, але гэта не больш чым дапушчэнне. У кожным разе, пры князі Алегу, які аб'яднаў дзяржаву, Полацк зноў не падначальваўся Кіеву.

У другой палове X ст. на тэрыторыі Беларусі было ўжо два княжанні: летапіс паведамляе, што ў Полацк прыйшоў «з–за мора» княжыць Рагвалод, а ў Тураве сядзеў Тур. Скандынаўскія сагі гавораць аб прыбыцці Рагвалода (Рохвальда) з Паўночнай Нарвегіі. Ёсць таксама звесткі, што Тур быў яго братам. З'яўленне

асобнага князя ў Полацку можа сведчыць калі не пра яго незалежнасць ад Кіева, дык пра ўзрастанне самастойнасці гэтага дзвінскага горада–дзяржавы. Археолагі вызначылі, што ў межах уладанняў Полацка жылі не толькі яго заснавальнікі крывічы, але і дрыгавічы, а таксама рэшткі балтамоўнага насельніцтва. Крывічы і дрыгавічы сталі асновай этнагенэзу беларусаў, таму Полацкае княства па праву лічыцца першым прабеларускім дзяржаўным утварэннем.

Міжусобная барацьба, якую распачалі за кіеўскі стол Святаславічы, была асабліва трагічнай для Полацка. У 975 г. ноўгарадскі князь Уладзімір і Дабрыня прыйшлі з дружынай да горада, захапілі і спалілі яго, знішчылі ўсю сям'ю полацкіх князёў, пакінуўшы толькі Рагвалодаву дачку Рагнеду, якую Ўладзімір сілай зрабіў сваёй жонкай. Так Полацк страціў самастойнасць і быў уключаны ў склад Кіеўскай дзяржавы. Аднак ужо ў 988 г. Уладзімір вярнуў Рагнеду з малалетнім сынам Ізяславам у яе вотчыну, на Полаччыну, збудаваўшы для іх горад Ізяслаўль (цяпер Заслаўе) на паўднёвай мяжы Полацкага ўдзелу. Лаўрэнцеўскі летапіс тлумачыць, што кіеўскі князь зрабіў гэта замест пакарання Рагнеды за няўдалы замах на яго жыццё.

Малады Ізяслаў Уладзіміравіч — унук Рагвалода — неўзабаве заняў полацкі пасад, чым аднавілася полацкая княская дынастыя і Полацкая дзяржаўнасць. Так Полацкая зямля першай выдзелілася з агульнадынастычных уладанняў Рурыкавічаў — у ёй сцвердзілася мясцовая княская дынастыя Рагвалодавічаў. Пра Ізяслава на полацкім стале вядома вельмі мала. У Ніканаўскім летапісным зводзе знаходзім, што ён быў «ціхі і лагодны, паслухмяны і літасцівы», «шматцярплівы і старанны ў чытанні боскіх пісанняў». Ізяслаў памёр у 1001 г., яшчэ пры жыцці свайго бацькі Ўладзіміра, таму, згодна з традыцыяй Кіеўскай Русі, яго нашчадкі не атрымалі права дамагацца кіеўскага стала.



*Пячатка полацкага князя Ізяслава.*

Пасля смерці Ізяслава полацкі пасад перайшоў да Брачыслава Ізяслававіча (?—1044), а пасля — да Брачыслававага сына. Падкрэсліваючы, што полацкія князі чужыя астатнім Рурыкавічам, летапісцы называлі іх «Рагвалодавымі ўнукамі» («Рогволожи», а ўсе іншыя — «Ярославли»). Аўтар «Слова пра паход Ігараў» таксама асобна вылучаў полацкую дынастыю: «Яраслававы ўсе ўнукі і Ўсяслававы». Гэтая традыцыя супрацьпастаўлення Полацка ўсёй астатняй Русі мела за аснову яго рэальныя адносіны з Кіевам і Ноўгарадам. Вядомы расійскі гісторык Аляксандр Праснякоў справядліва адзначаў, што Полацкае княства «жыло сваім асобным жыццём з першага свайго з'яўлення на гістарычнай сцэне».



Размешчаны на важным шляху «з варагаў у грэкі», Полацк рана пачаў супернічаць з Кіевам і Ноўгарадам. Полацкія князі намагаліся пашырыць свае ўладанні, авалодаць важнымі гандлёвымі шляхамі. Характэрна, што на адасобленасць Полацка нават у часы крывавай міжусобнай барацьбы за кіеўскі стол не замахваліся сыны Ўладзіміра. Наадварот, сам Брачыслаў Ізяслававіч, намагаючыся далучыць да Полацкай воласці міжрэчча Дзвіны і Ловаці, дзе былі волакі, пайшоў на канфлікт з ноўгарадцамі. У 1021 г. ён ажыццявіў паход на Ноўгарад, у якім удзельнічалі і варагі, заняў горад і выйшаў з вялікай здабычай, але на зваротным шляху быў разбіты кіеўскім князем Яраславам Мудрым. Тым не менш, Яраслаў Мудры заключыў з Брачыславам мірны дагавор «на роўных» і аддаў яму гарады Віцебск ды Ўсвят. Гэтым усталяваўся саюз паміж Полацкам і Кіевам. Брачыслаў дапамагаў Яраславу Мудраму ў барацьбе супраць Тмутаракані. А ў 1021—24 г. полацкі князь знаходзіўся ў Кіеве, дзе замяняў на галоўным стале Яраслава Ўладзіміравіча. У сталіцы Русі з'явіўся асобны «двор Брачыслава». У 1024 г. саюз паміж Яраславам Мудрым і Брачыславам мог быць падмацаваны перадачай у склад Полацкай зямлі Менскай воласці. Тады ж з Кіева ў Полацк перайшоў служыць варажскі конунг Эймунд з дружынай.

Першыя дзесяцігоддзі княжання Ўсяслава Брачыслававіча (1044—1101) таксама прайшлі ў мірных дачыненнях з Кіевам. Пасля смерці Яраслава Мудрага ў 1054 г. канчаткова пацвердзілася, што ўладанні полацкіх князёў Рагвалодавічаў утвараюць асобную зямлю, вылучаную з астатняй Русі — вотчыны Яраславічаў. У 1060 г. Усяслаў яшчэ ўдзельнічаў у супольным паходзе Яраславічаў супраць торкаў, але пасля гэтага стаў іх ворагам. Ён далучыў да сваіх уладанняў Копысь і Оршу, а ў Полацку ўзвёў велічны Сафійскі сабор — трэці на Русі пасля кіеўскага і ноўгарадскага. Храм мусіў сімвалізаваць, што Полацк паводле статусу роўны з Кіевам і Ноўгарадам. Іншымі словамі, сваёй Сафіяй полацкі князь супрацьпастаўляў сябе Кіеву і Ноўгараду.

Умацаваўшыся, князь Усяслаў перайшоў да актыўнай знешняй палітыкі. Ужо ў 1065 г. ён напаў на Пскоў, а праз год захапіў і



*Сафійскі сабор у Полацку. XI ст. Рэканструкцыя.*

абрабаваў Ноўгарад. У адказ на гэта сыны Яраслава Мудрага Ізяслаў, Святаслаў і Ўсевалад прывялі дружыны ў Полацкую зямлю ды знішчылі размешчаны на яе паўднёвых межах Менск. У сакавіку 1067 г. на берагах Нямігі, на месцы, якое цяпер знаходзіцца ў цэнтры беларускай сталіцы, з сіламі Яраславічаў сустрэлася войска Ўсяслава і адбылася адна з самых крывавых у нашай гісторыі бітваў, ярка апісаная ў «Слове пра паход Ігаравы»: «На Немизе снопы стелют головами, молотят чепи харалужными, на тоце живот кладут, веют душу от тела...».

Пасля бітвы палачане адступілі, а пераможцы неўзабаве падманам захапілі полацкага князя ў палон. Запрасіўшы Ўсяслава з сынамі на перамовы і пакляўшыся на крыжы, што не зробяць ніякай шкоды, яны заняволілі яго і пасадзілі ў вязніцу ў Кіеве. Але ў 1068 г., калі на Русь напалі полаўцы, а Ізяслаў не здолеў арганізаваць абароны, кіяўляне ўзнялі бунт і прагналі свайго князя. Гарадскія нізы вызвалілі Ўсяслава і абвясцілі кіеўскім князем яго. На працягу сямі месяцаў нашчадак Рагвалода займаў галоўны стол Русі. Аднак, калі Ізяслаў прыйшоў адбіраць кіеўскі пасад з польскім войскам, ён пакінуў сталіцу ды вярнуўся на Полаччыну. Ізяслаў жа, усталяваўшыся ў Кіеве, павёў войска на Полацк і пасадзіў полацкім князем свайго сына Мсціслава, а потым — Святаполка.

Прагнаны Ўсяслаў знайшоў прытулак у фінскіх плямёнаў водзі. З іх дапамогаю ён зноў нападаў на Ноўгарад, а ў 1071 г. пры актыўнай падтрымцы полацкай абшчыны выгнаў з Полацка князя Святаполка і аднавіў сваё княжанне. Супраць неўтаймоўнага Гарыславіча чарговы раз выступіў Кіеў. Полацкае войска было разбіта, але сам Полацк выстаяў. У 1077 г. Полаччыну ваяваў ужо Ўладзімір Манамах, а ў 1078 ён жа прывёў з сабой і полаўцаў, спаліў Друцк, спустошыў зямлю «ад Лукамля да Лагожска» (цяпер Лагойск). Усяслаў, у сваю чаргу, напаў на Смаленск. Асабліва аслабіў



Полацкае княства нечаканы паход Уладзіміра Манамаха ў 1084 г., калі яго войска было ўмацавана полаўцамі. Захапіўшы Менск, смаленскі князь цалкам знішчыў горад, не пакінуўшы ў ім, як потым сам падкрэсліў, «ні чэлядзіна, ні скаціны». На гэтым барацьба паміж Полацкам і іншымі княствамі Русі часова перапынілася. Але і праз стагоддзе летапісец адзначаў: «І ад таго меч уздымаюць Рагвалодавы ўнукі супраць Яраслававых унукаў».

У 1097 г. шэсць князёў Рурыкавічаў з кіеўскіх, чарнігаўскіх, пераяслаўскіх і валынскіх зямель — усе акрамя полацкага князя Ўсяслава, які проста не быў запрошаны, правялі ў Любечы свой з'езд, паводле пастаноў якога «Руская зямля» — вотчына нашчадкаў



*Пераправа Ўсяслава Чарадзея праз Дняпро. Мініяцюра Радзівілаўскага летапісу.*

Яраслава Мудрага — канчаткова раздзялілася на абасобленыя ўладанні трох старэйшых ліній — Ізяславічаў, Святаславічаў і Ўсеваладавічаў. Гэты падзел не тычыўся толькі Полацкай зямлі і Ноўгарада. Вотчынныя правы на Кіеў перайшлі толькі да нашчадкаў Ізяслава. Так быў пахаваны родавы сюзерэнітэт як форма ўлады на Русі.

Цяпер да смерці Ўсяслава Полацкая зямля не ведала спусташэнняў. За гады яго княжання Полаччына дасягнула апагею магутнасці і стала значнай усходнееўрапейскай дзяржавай. На поўначы княства Ўсяслава межавала з Ноўгарадскай зямлёй, на ўсходзе — са Смаленскай, на поўдні — з Тураўскай, а на захадзе — з Літвою, земгаламі ды іншымі балцкімі народамі, якія плацілі даніну Полацку. Уладанні полацкага князя цягнуліся далёка ўніз

па Дзвіне, сягаючы амаль узбярэжжа Балтыйскага мора. Дзякуючы зручнаму месцазнаходжанню (Полацк быў асноўным пасярэднікам у гандлі паміж Прыбалтыкай і ўсходнеславянскім светам) Полацкая зямля мела найлепшыя ўмовы для сацыяльна–эканамічнага развіцця, таму спробы скінуць палітычную залежнасць ад Кіева, мясцовы сепаратызм былі натуральным імкненнем полацкіх баяраў і веча.



*Палачанка. Рэканструкцыя па чэрапе.*

Пасля смерці Ўсяслава Чарадзея, які меў 6 сыноў, тэрыторыя Полацкай зямлі пачала драбіцца на ўдзелы. Да сярэдзіны XII ст. у яе межах з'явілася 8 удзельных княстваў — Полацкае, Віцебскае, Друцкае, Менскае, Ізяслаўскае, Лагойскае, а таксама Герцыке і Кукенойс на Ніжняй Дзвіне, якія знаходзіліся ў васальнай залежнасці ад полацкага князя. Прыгарады Полацка набывалі ўсё большую самастойнасць у адносінах да цэнтра зямлі.

Па–рознаму складваліся ўзаемадачыненні раздробленых княстваў Беларусі з Кіевам. Найбольш выразнай па–ранейшаму заставалася пазіцыя Полацка, які ад пачатку імкнуўся да асобнага жыцця. І калі Кіеў сілай садзіў на полацкі стол свайго князя — Усяславічы выганялі яго пры актыўнай падтрымцы насельніцтва ды аднаўлялі ўласнае княжанне. У XII ст. апрача самога Полацка барацьбу супраць залежнасці ад Кіева вялі таксама воласці, якія выдзеліліся з Полацкай зямлі — Менск, Ізяслаўль (Заслаўе), Барысаў, Друцк, Лагойск. Кіеўскія ж князі, у сваю чаргу, каб націснуць на Полацк, звычайна нападалі на яго прыгарады. Менскі князь Глеб, сын Усяслава Чарадзея, пачаў адваёўваць падпарадкаваныя Кіеву дрыгавіцкія землі — і быў за гэта жорстка пакараны. Уладзімір Манамах з Кіева двойчы, у 1116 і 1119 г., пасылаў на Глеба кааліцыйнае войска, пакуль менскага князя не паланілі і не вывезлі ў сталіцу Русі, дзе ён і памёр. Падобныя метады барацьбы з непакорнымі Ўсяславічамі кіеўскія ўладары выкарыстоўвалі неаднаразова: то яны перасялялі на поўдзень жыхароў знішчанага Друцка, то вывозілі далёка ў Візантыю ўсіх князёў полацкай



дынастыі. Апошняга ў 1129 г. дамогся сын Манамаха Мсціслаў Уладзіміравіч пасля таго, як нават праведзены на два гады раней супольны паход амаль усіх княстваў Русі супраць Полаччыны не ўтаймаваў полацкіх князёў. Тады пяцёра Ўсяславічаў былі высланы з Полацка да візантыйскага імператара ваяваць супраць арабаў, а на полацкі пасад пераможцы зноў пасадзілі нашчадка Ўладзіміра Манамаха. Так, нават непазбежна распадаючыся, «імперыя Рурыкавічаў» імкнулася захаваць падпарадкаванне адасобленых зямель Русі былому адзінаму цэнтру.

Смерць кіеўскага князя Мсціслава Ўладзіміравіча (Манамахавіча) у 1132 г. стала пачаткам поўнага развалу вялізнай дзяржавы. Даўно адасобленыя землі–воласці Русі пачалі хутка выдзяляцца ў самастойныя княствы. Сагнаўшы з пасада кіеўскага стаўленіка, палачане ў тым жа годзе пасадзілі сабе князя Васілька, унука Ўсяслава Чарадзея, і самастойнасць Полацка аднавілася. А праз колькі гадоў, пасля вяртання з Візантыі двух з пяці сасланых Ўсяславічаў (вярнуліся толькі друцкі княжыч Рагвалод і, магчыма, князь віцебскі), а таксама вяртання Полацку адабраных раней зямель (апрача Копысі ды Оршы), палітычная барацьба Полацка з Кіевам фактычна скончылася. Кіеўскім князям было не да Полацка. Смерць кіеўскага князя Ўсевалада Вольгавіча ў 1146 г. паклала пачатак дзесяцігадовай барацьбе за галоўны стол Русі, якая яшчэ больш аслабіла і раздрабніла Кіеўскую дзяржаву.

Тым часам усобіцы ахапілі і Полацкую зямлю, дзе працэс феадальнай раздробленасці пачаўся пры нашчадках Усяслава Чарадзея. Адным з першых з яе вылучыўся Віцебскі ўдзел, рана



*Умацаванні старажытнага Менска. XII ст. Рэканструкцыя Э. Загарульскага.*

стаў узвышацца Менск, князі якога Глебавічы імкнуліся заняць полацкі пасад — агульную спадчыну Ўсяславічаў. Полацкае веча ў 1151 г. выслала свайго князя Рагвалода ў Менск, а княжыць у Полацку паклікала Расціслава Глебавіча з Менска. Але той жа

сход вольных палачанаў у 1158 г. прагнаў яго і пасадзіў сабе Ўсяслава Васількавіча з Віцебска. Не дамогшыся полацкага стала, менскія князі ўзяліся падпарадкоўваць суседнія ўдзелы — Ізяслаўль, Лагойск, а таксама далучалі землі ў заходнім напрамку.

Характэрна, што хоць Полацк і намагаўся захаваць гегемонію, пачынаючы з 1160-х г. яго князі мяняліся не воляю палачанаў, а галоўным чынам з ініцыятывы ўдзелаў Полаччыны, якія змагаліся за дамінаванне ў цэлай зямлі. Даходзіла да вострага разладу паміж імі, што асабліва яскрава выявілася ў паходзе крывіцкіх князёў на Слуцк у 1162 г.

Толькі ў канцы XII ст. вызначылася тэндэнцыя да кансалідацыі Полацкай зямлі, чаму паспрыяла, відаць, знешняя небяспека. Удзелы Полаччыны аб'ядноўваліся ў імя супольных інтарэсаў. У 1180 г. у паходзе на Друцк удзельнічалі шэсць полацкіх князёў. Яны ж разам выступілі ў 1195 г. на баку Чарнігава ў вайне са Смаленскам. Аднак акурат тады Полацкая зямля амаль зусім знікае са старонак летапісаў, на нейкі час губляючыся ў цемры гісторыі.

## II.2. Тураўскае княства і іншыя землі Беларусі

На поўдні Беларусі, у нізінах Прыпяцкага Палесся, на аснове племяннога саюза дрыгавічоў не пазней чым у IX ст. утварылася іх княства з цэнтрам у Тураве. Тураў упершыню згаданы ў «Аповесці мінулых гадоў», у паведамленні пра тое, што Рагвалод прыйшоў з–за мора ў Полацк, «а Тури в Турове, и от него же и туровцы прозвашася». Гэта адбылося прыкладна ў 960—970-х г. Відаць, у тыя часы дрыгавіцкае княства, як і Полацкае, заставалася яшчэ самастойным. Яно ахоплівала вялізныя абшары, першапачаткова нават землі цэнтральнай Беларусі (раён Менска), якія пазней перайшлі да Полацка. У XI—XII ст. у склад Тураўскай зямлі ўваходзілі вядомыя па летапісах гарады Пінск, Берасце, Слуцк, Клецк, Чартарыйск і Дубровіца.

Падпарадкаванне Тураўскага княства Кіеву адбылося ў 980-х г., пры Ўладзіміры Святаславічы, які пааддаваў былыя племянныя цэнтры сваім сынам–намеснікам. У 988 г. у Тураве быў пасаджаны Святаполк. З таго часу Тураўшчына як валасць



уваходзіла ў склад Кіеўскай зямлі, аднак яна ніколі не станавілася яе арганічнай часткай.

Ужо князь Святаполк, сеўшы ў Тураве, ажаніўся з дачкой польскага караля Баляслава Харобрага і ў змове з цесцем, на вайсковую дапамогу якога мог разлічваць, хацеў сам заняць кіеўскі стол. Аднак пра гэты план стала вядома Ўладзіміру, і тураўскі князь трапіў у няволю ў Кіеў. Толькі па просьбе кіеўскіх баяр ды перад пагрозай вайны з Баляславам яго вызвалілі.

Застаючыся князем тураўскім, Святаполк пасля смерці Ўладзіміра Святаславіча ў 1015 г. заняў і кіеўскі вялікакняскі стол. Малодшыя яго браты Барыс і Глеб, што ўяўляліся супернікамі, былі забітыя падасланымі наймітамі, таму летапісцы празвалі Святаполка «Акаянным». Супраць братазабойцы выступіў ноўгарадскі князь Яраслаў, які праз чатыры гады крывавай барацьбы, пасля бітваў пад Берасцем у 1018 і на Альце ў 1019 г. прагнаў Святаполка ды сам сеў на кіеўскім стале. Пры Яраславе Мудрым Тураў падпарад-



*Старажытны Тураў.*
*Рэканструкцыя П. Лысенкі.*

коўваўся непасрэдна Кіеву, а потым кіеўскі князь прыслаў сюды свайго сына Ізяслава, якому ў 1054 г. дастаўся і вялікакняскі пасад па бацьку.

Да пачатку XII ст. Тураўскай зямлёй валодалі нашчадкі з роду Ізяслава, многія з якіх былі і кіеўскімі князямі. Так, з 1078 г. у Тура-

ве сядзеў сын кіеўскага князя Яраполк, з 1088 г. — ягоны брат Святаполк, які таксама адначасова займаў вялікакняскі стол, а потым Яраслаў Святаполчыч. Але ў 1113 г. у Кіеве сеў Уладзімір Манамах, які адабраў Тураў у Ізяславічаў.

І пры Манамахавічах, і пазней, пры Вольгавічах, Кіеў глядзеў на Тураў як на сваю воласць. Гэты палескі горад даставаўся звычайна каму–небудзь з блізкіх родзічаў вялікага князя. У 1142 г. кіеўскі князь Усевалад Вольгавіч парушыў тэрытарыяльную цэласць Тураўшчыны і раздаў сваякам пяць тураўскіх гарадоў — Берасце, Драгічын, Клецк, Рагачоў і Чартарыйск. У XII ст. Тураў страціў яшчэ частку сваіх воласцяў: да Кіева і Чарнігава адышлі адпаведна Брагін і Рэчыца, а землі Пабужжа трапілі пад уладу галіцка–валынскіх князёў. Праўда, пасля смерці Вольгавіча, у 1146 г. тураўскі стол зноў заняў сын Уладзіміра Манамаха Вячаслаў, які самастойна вярнуў у склад Тураўскай зямлі і адабраныя раней гарады, і нават захапіў для сваяка Ўладзімір–Валынскі. Гэта выклікала неадкладную расправу, арганізаваную Кіевам. Дараднікаў Вячаслава Ўладзіміравіча зняволілі і вывезлі ў Кіеў, а самога князя перавялі ў правінцыйную Перасопніцу. У Тураве ж зноў сеў сын кіеўскага князя Яраслаў Ізяславіч.

На працягу 1150-х г. на тураўскім, як і на галоўным кіеўскім стале ажно чатыры разы мяняліся прадстаўнікі розных княскіх родаў. Шкода з прычыны адсутнасці сваёй дынастыі была відавочнай. Часовыя ўладары не лічыліся з мясцовымі інтарэсамі, і Тураўшчына па–ранейшаму губляла землі. Прыкладам, у 1155 г. Мазыр перайшоў у склад Кіеўшчыны.

Гэтак было да 1158 г., пакуль тураўскі стол самастойна не заняў князь Юры Яраславіч — унук Святаполка Ізяславіча, які княжыў у Тураве ў канцы XI ст. Кіеў запатрабаваў ад яго пакоры, і калі князь не паслухаўся — вырашыў утаймаваць таго сілай. Да Турава на расправу прыйшлі велізарныя войскі кааліцыі, у якой апрача кіеўскіх дружын былі смаленская, галіцкая і луцкая раці, а таксама палачане. Здавалася, што маленькаму Тураву ніяк не выстаяць перад гэтакай арміяй. Аднак тураўцы ператварылі свой горад у непрыступную цвярдыню. Дзесяць тыдняў доўжылася аблога, пад час якой абаронцы не толькі добра адбіваліся на гарадскіх сценах, але нават рабілі вылазкі. І калі ў кааліцыйным войску пачаўся паморак коняў, яно мусіла зняць аблогу і сысці. Пінск, другі па важнасці горад Тураўскай зямлі, у той год паспяхова адбіваўся ад плямёнаў берандзеічаў.



Абараніўшы свайго князя, Тураў гэтым самым адстаяў уласную незалежнасць. Юры Яраславіч стаў першым князем мясцовай, тураўскай дынастыі. У 1160 г. тураўцы яшчэ раз вытрымалі аблогу кааліцыі валынскіх князёў. Вядома, што ў 1162 г. Кіеў падпісаў з тураўскім князем Юрыем Яраславічам пагадненне аб міры, і самастойнасць Турава атрымала такім чынам афіцыйнае і законнае прызнанне.

У другой палове XII ст. Тураўская зямля таксама перажывала працэс драблення. Сыны Юрыя Яраславіча князі Святаполк, Іван і Глеб падзялілі яе на некалькі ўдзелаў, сярод якіх асабліва значэнне пачаў набываць Пінск. Калі да апошняй чвэрці стагоддзя захоўвалася адзіная дынастыя мясцовых князёў, вядомая па летапісах як «князі тураўскія», або «з Турава Святаполчычы», дык у 1180-х г. вылучылася асобная дынастыя пінскіх князёў.



*Галаўныя ўборы дзяўчат. XI—XII ст. Рэканструкцыя Л. Дучыц.*

Не дзіўна, што пры раздробленасці і аслабленасці Турава–Пінская зямля хутка зноў трапіла пад уплыў больш моцнага суседняга палітычнага цэнтра. Ужо на пачатку XIII ст. турава–пінскія князі знаходзіліся ў залежнасці ад галіцка–валынскіх. Каб вызваліцца з–пад улады Данілы Галіцкага, яны пазней нават ішлі на саюз з паганскай Літвою, якая хутка ўмацоўвалася ў Панямонні. Прыкладам, пінскі князь Міхаіл дапамагаў Літве ў супрацьстаянні з Данілам Галіцкім і папярэджваў яе пра паход апошняга ў 1243 г. Аднак летапісных звестак пра турава–пінскія землі гэтага часу вельмі мала.

Смаленскае княства ўтварылася на аснове аб’яднання смаленскай групоўкі крывічоў у VIII—IX ст. у вярхоўях Дняпра і Дзвіны. Калі ў культурна–этнаграфічным сэнсе гэтая зямля была вельмі блізкая да Полаччыны, то яе гістарычныя шляхі мелі сваю адметнасць. Смаленскае княства з’явілася на гістарычнай арэне амаль на стагоддзе пазней за Полацкае, але ў XII ст. яно пачало паступова выходзіць у лік найбольш моцных дзяржаўных утварэнняў Русі. У адрозненне ад Полацка Смаленск, падпарадкаваны Алегам яшчэ ў 885 г., фактычна ніколі не ваяваў супраць Кіева. Калі ў 1120-х г. тут усталявалася

самастойная дынастыя на чале з Расціславам Мсціславічам, Смаленшчына вылучылася ў самастойную зямлю–княства. Аберагаючы свае ўладанні ад спусташэнняў, Расціслаў Мсціславіч хутчэй мог пайсці на кампрамісы дзеля прадухілення ўварванняў чужога войска ў яго зямлю, чым на адкрыты канфлікт, як Рагвалодавічы. Не ведала Смаленшчына і ўнутраных разладаў. Таму, калі Полацкае княства, знясіленае войнамі з Кіевам ды міжусобіцамі, няўхільна слабела, Смаленскае, наадварот, убіралася ў сілу.



*Радзімічанка. Рэканструкцыя па чэрапе.*

У другой палове XII ст., удала выкарыстоўваючы ўнутраны разлад у суседніх княствах, Смаленск пашырыў свой уплыў на Полацкую ды Ноўгарадскую землі і за іх кошт павялічыў уласную тэрыторыю. На захадзе ва ўладанні смаленскіх князёў увайшлі Крычаў, Прапошаск (цяпер Слаўгарад) ды Мсціслаў (у 1180 г. вылучыўся ў удзельнае княства), а з 1116 г. — і адабраныя ў Глеба Менскага гарады Копысь ды Орша.

Калі ў 1150—60 г. Полацк і Менск захапіліся ўпартай барацьбой за лідэрства ў Полацкай зямлі, а палачане звярнуліся па дапамогу да смаленскага князя Давыда Расціславіча, той умела выкарыстаў гэта для ўмяшання ва ўнутраныя справы Полаччыны. Расплатай за падмогу была страта Полацкай зямлёй новых тэрыторый. У 1165 г. у Віцебску пачаў княжыць Давыд Расціславіч са Смаленска. Часова ў залежнасць ад Смаленска трапіў і Друцк, які ўдалося вярнуць у склад Полацкай зямлі толькі аб'яднанымі сіламі князёў полацкіх, чарнігаўскіх і ноўгарадскіх. Толькі пасля таго, як у 1195 г. у выніку ваеннага канфлікту Расціславічы страцілі і Віцебск, Смаленск перастаў прэтэндаваць на Полаччыну.



На паўднёвым усходзе Беларусі радзіміцкія гарады Гомель і Чачэрск на Сажы, а таксама Рэчыца і Рагачоў на Дняпры ў XII — пачатку XIII ст. уваходзілі ў Чарнігаўскае княства. Дрыгавіцкія ж гарады Мазыр і Брагін залежалі ад Кіева.

Паабапал Заходняга Буга ў XI—XII ст. сфармавалася Берасцейская зямля з гарадамі Берасце, Драгічын, Камянец, Кобрын і Мельнік. Аб'яднаная вакол свайго цэнтра, аддзеленая ад Валыні багнамі ды лясамі, яна была дастаткова адзінай у сацыяльна–палітычных адносінах вобласцю, хоць этнічны склад насельніцтва гэтай тэрыторыі вызначаўся вялікай разнастайнасцю. Відаць, да X ст. на Берасцейскім Пабужжы дамінавалі валыняне, а пазней яго пачалі каланізаваць дрыгавічы. Акрамя таго, археолагам тут трапляюцца старажытнасці заходніх славян і заходнебалцкай племяннай групоўкі яцвягаў, якія займалі галоўным чынам землі Падляшша і Верхняга Панямоння.



*Яцвяг. Рэканструкцыя па чэрапе.*

Амаль да сярэдзіны XII ст. Берасцейшчына ўваходзіла ў склад Тураўскай зямлі. Па дамоўленасці тураўскага князя Святаполка з польскім каралём Баляславам I Харобрым у час міжусобнай вайны з 1019 да 1022 ці нават да 1031 г. Берасце займаў польскі гарнізон. З сярэдзіны XII ст. за ўплыў над Берасцем пачалася барацьба суседніх Русі і Польшчы. Упартае змаганне за яе вялі князі кіеўскія, турава–пінскія і галіцка–валынскія, пакуль да пачатку XIII ст. апошнія канчаткова не сцвердзілі сваёй улады над Берасцейскай зямлёй.

У Верхнім Панямонні асобную вобласць утварала Чорная Русь. Як вядома, ужо ў XIV ст. так зваліся землі па левых прытоках і часткова па правым беразе Нёмана з паўсталымі тут яшчэ ў X—XI ст. усходнеславянскімі гарадамі Горадня, Ваўкавыск, Наваградак, Слонім і Здзітаў. Гэтыя абшары, заселеныя балтамі, актыўна каланізавалі дрыгавічы і крывічы, а таксама валыняне і драўляне.

І хоць сельскае насельніцтва тут яшчэ доўга заставалася балцкім, у гарадах, як сведчаць матэрыялы археалагічных раскопак, уся матэрыяльная культура (у прыватнасці, прадметы побыту і рамёстваў) ад іх заснавання мела чыста славянскі характар. У летапісах панямонскія гарады пачалі фігураваць параўнальна позна, толькі ў XII—XIII ст., калі яны ўжо дасягнулі ў сваім развіцці сапраўднага росквіту, а Горадня і Наваградак сталі цэнтрамі ўдзельных княстваў, прычым апошні быў адным з найбагацейшых гарадоў рэгіёна.

На пачатак XIII ст. Верхняе Панямонне ў палітычным сэнсе належала таксама да сістэмы Галіцка–Валынскага княства. Аднак ужо ў першай трэці XIII ст. у барацьбу за дамінаванне ў землях Чорнай Русі пачалі ўключацца і аб'яднаныя літоўскія плямёны. Яшчэ праз колькі дзесяцігоддзяў гэтай беларускай зямлі выпала быць адным з тэрытарыяльных ядраў новай дзяржавы, якая стала аб'ядноўваць вакол сябе раздробленыя і аслабленыя землі Русі на шырокіх прасторах ад Нёмана да вярхоўяў Дняпра.

## II.3. Паміж Ордэнам і Ардою

Раздзеленыя на мноства дробных удзелаў і аслабленыя Полацкая і Тураўская землі з канца XII ст. ужо амаль не траплялі ў поле зроку летапісцаў. Літоўскія плямёны паступова пазбавіліся ўсялякай залежнасці ад Полацка ды пачыналі самі ціснуць на беларускія землі, ажыццяўляючы адзін рабаўнічы набег за другім. Гаворачы пра барацьбу «грозных палачанаў» з літоўцамі, аўтар «Слова пра паход Ігараў» называе князя Ізяслава Васількавіча, які «позвони своими острыми мечами о шеломы литовския, притрепав славу деду своему Всеславу». Перад знешняй небяспекай Полаччына спрабавала пераадольваць унутраны крызіс. Пра пэўную палітычную стабілізацыю ў ёй можа сведчыць ужо само трыццацігадовае княжанне аднаго князя Валодшы — Уладзіміра Ўсяславіча, які займаў полацкі пасад з 1180-х да 1216 г. Пад кантролем Полацка тады заставаўся яшчэ ўвесь басейн Дзвіны ад Земгальскай затокі да Смаленшчыны. Археалагічныя даследаванні пацвярджаюць, што зямля перажывала і бурнае гаспадарчае развіццё. Аднак менавіта тады на захадзе полацкіх уладанняў з'явілася сіла, якая ўжо ў XIII ст. стала адным з найважнейшых фактараў палітычнага жыцця паўночнай часткі Ўсходняй Еўропы.



Яшчэ ў 1184 г. у вусці Дзвіны на бераг сышлі першыя нямецкія місіянеры на чале з манахам Майнгардам. Яны папрасілі дазволу ў князя Валодшы на хрышчэнне залежных ад Полацка ліваў і, атрымаўшы яго, збудавалі першы ў Прыбалтыцы каталіцкі храм. Так лацінская місія ў вусці Дзвіны пачалася ў поўным паразуменні з Полацкам. У 1198 г. наступны нямецкі місіянер Бертольд высадзіўся ў Земгальскай гавані ўжо разам з войскам, а яшчэ праз год новапрызначаны інфлянцкі біскуп Альберт Буксгёўдэн падрыхтаваў канчатковы захоп Падзвіння. У 1201 г. ён заклаў у вусці Дзвіны крэпасць Рыгу, а ў 1202 разам з цыстэрыянскім абатам Тэадорыкам заснаваў Ордэн Братоў рыцарства Хрыстовага, больш вядомы як Ордэн Братоў па мячы, якому і даручылі справу хрышчэння ліваў. Калі полацкія князі былі абыякавыя да веравызнання падуладнага насельніцтва Прыбалтыкі (дзякуючы чаму захоўваўся непарушным грамадска–палітычны лад гэтых плямёнаў), дык нямецкія каланізатары, што з'явіліся на хвалі місіянерскага руху, надавалі веры асаблівае значэнне.




*Пячатка рыжскага біскупа Альберта.*

Замацаванне нямецкіх каланістаў на Дзвіне адрэзала Полаччыну ад мора, перакрыла яе галоўны гандлёвы шлях. Па першым часе, праўда, палачане добра ладзілі з Рыгай. Пачаўшы каланізаваць землі ліваў і латгалаў, рыцары збіралі з гэтых народаў даніну, якую раней атрымлівалў Полацк, гаспадарылі на залежных ад Полацка тэрыторыях. Але непасрэдна полацкія землі яны не кранапі. Полаччына была адной з тых сілаў рэгіёна, што магла рэальна супрацьстаяць нямецкай калоніі. Біскуп Альберт прысылаў полацкаму князю падарункі, накіроўваў паслоў для ўсталявання добрых дачыненняў. Ён імкнуўся да супрацоўніцтва з Полацкам і не парушаў яго «добрых старых правоў», каб не дапусціць небяспечнай кааліцыі старажытнага беларускага княства з паганай Літвой. Дамагаючыся правінцый Русі, Альберт выкарыстоўваў не ваенную сілу, а такія формы залежнасці, як васалітэт, шлюбныя дараванні і інш.

Пры падтрымцы ліваў ды эстаў полацкі князь Валодша спрабаваў спыніць насоўванне рыцараў, адкінуць іх з вусця Дзвіны. Па словах нямецкага храніста Генрыха Латыша, ён «заўсёды імкнуўся разбурыць лівонскую царкву». Да адкрытых канфліктаў дайшло ў 1203 і зімою 1206/07 г., калі полацкі князь спрабаваў здабыць ордэнскія ўмацаванні ў вусці Дзвіны. Аднак гэтыя паходы не прынеслі ніякага поспеху. Між тым, сітуацыя паступова мянялася. У 1207 г. кукенойскі князь Вячка папрасіў у Рызе падтрымкі супраць літоўцаў, а праз год рыцары зусім падпарадкавалі Кукенойс, пакінуты без дапамогі Полацка (магчыма, Вячка і не звяртаўся да князя Валодшы). У 1214 г. яны цалкам авалодалі і другім удзельным цэнтрам полацкіх уладанняў у нізоўях Дзвіны — горадам Герцыке. Князь Уладзімір Усяславіч пайшоў на кампраміс.

У 1210 г. паміж Полацкам і біскупам Альбертам быў падпісаны «вечны мір», на ўмовах якога Полацк фактычна адмовіўся ад сваіх інтарэсаў у Ніжнім Падзвінні і дазволіў нямецкім купцам з'яўляцца ў Полаччыне, а сам атрымліваў за гэта частку даніны з ліваў і «адкрыты шлях» у Рыгу для полацкіх купцоў. Саюз прадугледжваў і супольную барацьбу супраць літоўцаў. Аднак праз два гады Альберт перастаў перадаваць Полацку дань за ліваў. Адноўленае ў 1212 г. полацка–ордэнскае мірнае пагадненне зафіксавала ўзрослыя ўплывы немцаў у Падзвінні і абумоўленыя гэтым супярэчнасці з Полацкам. Але мір быў нетрывалы. Падначаліўшы ліваў ды латгалаў, рыцары ўзяліся за хрышчэнне эстаў. Калі тыя папрасілі заступніцтва ў Полацка, Валодша пачаў рыхтаваць вялікі паход на Рыгу. У 1216 г. было ўжо сабрана вялізнае войска з палачанаў, ліваў, эстаў, літоўцаў, але полацкі князь раптоўна памёр (магчыма, быў атручаны), і паход сарваўся.

Адносіны Полацкай зямлі з Інфлянцкім ордэнам і потым часам абвастраліся, але яна ніводнага разу не была пад ударам рыцараў, як і сам Полацк не ажыццявіў ніводнага агульнага паходу на Рыгу. Гаспадарчыя інтарэсы бралі верх, і Дзвіна стала трасай узаемавыгаднага актыўнага гандлю. У 1223 г. з ініцыятывы Полацка зноў дайшло да спробы ўпарадкаваць узаемадачыненні пісьмовым пагадненнем. У 1229 г. паміж Смаленскам, Полацкам і Віцебскам, з аднаго боку, ды Рыгай і шэрагам нямецкіх гарадоў (Любекам, Мюнстэрам, Брэменам, Дортмундам і інш.), з другога, была падпісана новая, даволі раўнапраўная дамова аб гандлі, вядомая ў гістарычнай



літаратуры як «смаленская гандлёвая праўда». Яна адкрывала «чысты шлях» купцам гэтых гарадоў у абодва бакі і нічым не абмяжоўвала іх гандаль.

У гэты час у Холмскай зямлі ўсталяваліся браты другога, яшчэ больш моцнага каталіцкага духоўна–рыцарскага ордэна — Ордэна святой дзевы Марыі, пазней празванага ў польскай гістарычнай традыцыі Крыжацкім. Пакліканыя мазавецкім князем Конрадам для барацьбы супраць прусаў, рыцары нямецкага Ордэна храмоўнікаў (тэўтонцы) на чале з ландмайстрам Германам Бальке ў 1230 г. з'явіліся на Вісле, дзе сталі ўзводзіць замкі, і ўзяліся падпарадкоўваць Прусію. У 1237 г. два нямецкія ордэны ў Прыбалтыцы аб'ядналіся. Цяпер яны ўяўлялі сур'ёзную небяспеку для ўсіх балцкіх плямёнаў. Узрастала пагроза і для Русі. Праўда, Інфлянцкі ордэн і пасля аб'яднання з тэўтонамі не ставіў на мэце заваявання тэрыторыі Полаччыны. Хоць на мяжы з ёю рыцары неўзабаве ўзвялі сваю цвярдыню Дынабург, непасрэдна беларускія землі Падзвіння яны не займалі.

Неўзабаве пасля гэтага дайшло да саюзу Полацка з Ноўгарадам. У 1239 г. ноўгарадскі князь Аляксандр Яраславіч ажаніўся з дачкой полацкага князя Брачыслава — апошняга з вядомых Рагвалодавічаў. Палачане дапамагалі Ноўгараду абараняцца ад шведскай агрэсіі. Вядома, што ў 1240 г. адным з герояў вядомай бітвы на Няве, у якой наўгародцы разграмілі кантынгент шведскіх рыцараў, стаў лоўчы князя Аляксандра полацкі баярын Якаў Палачанін, які, па словах летапісца, «наехав на полк с мечем, и мужествова...»

Крыху пазней дайшло да ўсталявання самых прыязных адносін Полацка з інфлянцкімі немцамі. У сярэдзіне XIII ст. у горадзе з'явіўся каталіцкі храм і была заснавана лацінская дыяцэзія. У сталіцы старажытнага беларускага княства пасяліліся лацінскія клірыкі, немцы. Але з пераходам Полацка пад уладу неталерантнага літоўскага князя (праўдападобна, Гердзеня) каталіцкі асяродак тут быў зліквідаваны.

У час, калі немцы ўмацоўваліся на Балтыйскім узбярэжжы, з мангольскіх стэпаў на Ўсходнюю Еўропу рухалася арда Чынгісідаў. У 1236 г. манголы разграмілі Балгарскую дзяржаву на Волзе, а з 1237 пачалі заваяванне Русі. Блізу 30—50 тысяч наезнікаў на чале з Бату–ханам спустошылі Разанскае, Уладзімірскае ды Чарнігаўскае

княствы, спалілі не менш за 15 гарадоў і вывелі ў палон тысячы жыхароў Усходняй Русі. У канцы 1240 г. азіяцкія ваяўнікі захапілі Кіеў і праз поўнач Украіны напалі на Галіцка–Валынскае княства. Пазней мангольскія тумены ад Уладзіміра–Валынскага рушылі на Польшчу, Венгрыю, Чэхію і далей, сягаючы Адрыятыкі. Вяртаючыся з пераможнага еўрапейскага паходу, у канцы 1241 — пачатку 1242 г. яны прайшлі далёка на поўдзень ад тэрыторыі сучаснай Беларусі. Такім чынам, мангола–татары проста абмінулі Беларусь, хоць прынамсі двойчы праходзілі зусім блізка, з усходу і поўдня. Адсутнасць хоць якіх–небудзь паведамленняў у дастаткова верагодных пісьмовых крыніцах (звесткі беларуска–літоўскіх летапісаў XVI ст. пра бітвы з татарамі каля Койданава, пад Мазыром і ў нізоўях Прыпяці, аб чым пісаў і Мацей Стрыйкоўскі, грунтуюцца на пазнейшых паданнях), з аднаго боку, і недахоп матэрыялаў з раскопак беларускіх гарадоў, якія б ясна сведчылі пра паходы качэўнікаў і спусташэнні, з другога, дазваляюць канстатаваць, што асноўная тэрыторыя Беларусі засталася практычна некранутай наезнікамі Бату–хана.

Што паслужыла сапраўднай прычынай таго, што пад час мангола–татарскага наезду на Ўсходнюю Еўропу Беларусь была абмінутая імі? Пытанне застаецца адкрытым. Між тым, сама па сабе гэтая акалічнасць мела прынцыповае значэнне для гістарычных лёсаў беларусаў. Важна ўлічваць яе і пры інтэрпрэтацыі многіх падзей таго часу. Ролю знешняга фактара, асабліва пагрозу мангола–татарскага заваявання, разглядаючы ўтварэнне манархіі Міндоўга, нельга, прынамсі, перабольшваць. Да сярэдзіны XIII ст. землі Беларусі не ведалі ні рэальнай агрэсіі з боку нямецкіх рыцараў, ні нашэсця мангола–татараў.

## II.4. Улада і людзі

На тэрыторыі сучаснай Беларусі першымі самастойнымі дзяржавамі былі Полацкае і Тураўскае княствы. Як ужо згадвалася, Полацкае княства адразу, яшчэ пры Ўладзіміры Святаславічы, выдзелілася ў асобную зямлю, якой валодалі «Рагваложы ўнукі». Яна стала калектыўнай спадчынай роду Ізяслава Ўладзіміравіча. У XI ст. улада ў ім перадавалася старэйшаму сыну.



Пасля смерці Ўсяслава Брачыславіча, калі Полацкая зямля раздзялілася на ўдзелы — вотчыны яго сыноў, галоўны полацкі стол атрымаў таксама старэйшы з іх Давыд. У вотчынах–удзелах улада размяркоўвалася так, што галоўны стол вотчыны займаў старэйшы прадстаўнік роду, а яго малодшыя сыны атрымлівалі часовыя ўдзелы. Калі ўладальнік удзелу паміраў, яго стол перадаваўся наступнаму па ўзросце, і ўсе астатнія падымаліся на прыступку вышэй. Пасад «старшага» горада зямлі быў самы прэстыжны, і ў XII ст. за Полацк вялі барацьбу князі друцкія, менскія і віцебскія.

У Тураўскім княстве таксама была мясцовая дынастыя, хоць яно доўгі час залежала ад Кіева, а ў 1142 — 1158 г. непасрэдна падпарадкоўвалася яму. У 1150-х г. князь Юры Яраславіч з дынастыі Святаполчычаў заняў Тураў і ператварыў яго ў сваю вотчыну. З гэтага часу ў Тураўскім княстве як самастойнай дзяржаве сталі таксама выдзяляцца ўдзелы, улада ў якіх размяркоўвалася па тым жа прынцыпе. Тураўскія князі належалі да «ўнукаў Яраслававых», таму, у адрозненне ад полацкіх, яны мелі права прэтэндаваць на вялікакняскі пасад. І калі тураўскі князь сядаў у Кіеве (у 1015 г. з Турава ў Кіеў перайшоў Святаполк Уладзіміравіч, у 1054 — Ізяслаў Яраславіч, у 1093 — Святаполк Ізяславіч), то ў Тураве кіраваў пасаднік.

Найважнейшыя інстытуты ўлады ў гэтых дзяржавах ад пачатку іх узнікнення ўвасаблялі князь, дружына і веча. Яны валодалі легітымным правам на прымус. Персанальна князю належала найвышэйшая ўлада — палітычная, судовая і адміністрацыйная. Ён кіраваў войскам, абараняў межы, вёў войны і заключаў мір, збіраў даніну і палюддзе з падданых, вырашаў іншыя дзяржаўныя пытанні. Яго апораю ва ўсім была дружына — карпарацыя прафесійных воінаў, што служыла асабіста князю. Яе вышэйшае кола складала т.зв. «старэйшая» дружына, у якую ўваходзілі князевы «мужы», а ў малодшай былі «пасынкі», «отракі», «дзецкія» ды іншая прыслуга. У XII ст. з княскай дружыны і рода–племяннной знаці стаў фармавацца новы сацыяльны слой — баярства. Баяры — васалы князя, якія атрымалі зямлю ў вотчыннае ўладанне і былі абавязаныя яму за гэта ваеннай службай. Са свайго боку, манарх трапляў у залежнасць ад буйных баяраў, што мелі вялікія зямельныя ўладанні і сваё войска.

Калі князі і баяры складалі верхнюю страту грамадства, то на процілеглым полюсе яго сацыяльнай структуры знаходзіліся сяляне.

Абсалютная большасць насельніцтва жыла ў вёсцы і займалася сельскай гаспадаркай, якая складала аснову эканомікі. Апрача земляробства, у якім ужо выкарыстоўваўся двух- і трохпольны севазварот, сельскі люд займаўся жывёлагадоўляй і промысламі. Асноўнай вытворчай адзінкай лічылася гаспадарка адной сялянскай сям'і — дым, ці рала. Сельскае насельніцтва было арганізавана ў абшчыны («міры», «верві») — тэрытарыяльныя аб'яднанні сялянскіх сямей. Яно складалася з свабодных і залежных ад землеўладальніка людзей. Вольныя жыхары сёл зваліся смердамі, катэгорыю ж нявольных (або чэлядзі) складалі халопы (рабы, якімі станавіліся палонныя) і закупы (сяляне, якія трапілі ў залежнасць праз даўгі). Пачыналася феадалізацыя грамадства, паглыблялася маёмаснае расслаенне, і ўсё больш свабодных абшчыннікаў пераходзіла ў стан залежных. У XII ст. з'явіліся вотчыны і памесныя землеўладанні, але яны былі яшчэ рэдкімі выспамі ў моры свабоднага сялянскага землекарыстання.

Станаўленне дзяржаўнасці на Русі было цесна звязана з горадамі — апорай новай сацыяльнай арганізацыі. Гарады як пасяленні новага тыпу пачалі ўзнікаць на Русі яшчэ ў IX—X ст. Адной з прадпасылак іх з'яўлення лічыцца паспяховае развіццё земляробства, што дазволіла частцы людзей пакінуць сельскую гаспадарку і займацца толькі рамяством ды гандлем. Археолагамі заўважана, што большасць гарадоў на тэрыторыі Беларусі ўтварыліся ў выніку славянскай каланізацыі. Яны паўставалі на новых месцах, незалежна ад старых племянных цэнтраў. Аднак шляхі іх узнікнення маглі быць розныя. Калі Полацк ды Тураў утварыліся на месцы старажытных племянных цэнтраў, то такія гарады, як Менск, Заслаўе, Наваградак, Горадня, Браслаў і інш. з'явіліся ў якасці памежных крэпасцяў і фарпостаў каланізацыі, некаторыя ж паўставалі як княскія рэзідэнцыі і адміністрацыйныя цэнтры.

Першым горадам Беларусі летапісы пад 862 г. называюць Полацк. У паведамленнях за X ст. упершыню згадваецца Тураў (980 г.), Ізяслаўль і Віцебск, а летапісныя звесткі за XI ст. дадаюць да іх 12 новых назваў. На XII ст. крыніцы называюць яшчэ 18 гарадоў. Усяго да сярэдзіны XIII ст. на тэрыторыі Беларусі летапісы згадваюць 35 гарадоў. Праўда, не ўсе яны з'яўляліся гарадамі ў навуковым сэнсе, частка з іх, відаць, была проста абгароджанымі пасяленнямі (сам тэрмін «горад» ад слова «гарадзіць», «абгароджваць»). І далёка не кожны з летапісных гарадоў ператварыўся ў асяродак рамяства і



гандлю. Невыпадкова некаторыя з іх дасюль не лакалізаваны археолагамі.

На раннім этапе горад уяўляў сабой закрытае ўмацаванне, у якім жылі князь (ці яго васал) з дружынай ды рамеснікі і гандляры. Потым, па меры развіцця, за сценамі горада вырастала новае, неўмацаванае пасяленне, званае пасадам (цэнтральная ўмацаваная частка называлася дзядзінцам). Пасады, на якіх жыў вольны рамесны люд, з'яўляліся ў асноўным у XII ст., калі сталі бурна развівацца рамёствы.

Найбольшым горадам у межах Беларусі быў Полацк, колькасць жыхароў якога ў XII ст. магла сягаць 10 тыс. (для параўнання: у Кіеве — 50 тыс., у Ноўгарадзе — ад 20 да 30 тыс.). Насельніцтва іншых налічвала па некалькі тысяч. У скандынаўскіх сагах і саксонскіх легендах Полацк фігураваў побач з Кіевам і Ноўгарадам як трэці цэнтр Русі. Злучаны наўпростымі і непасрэднымі сувязямі з Візантыйскай імперыяй, краінамі лацінскай Еўропы і мусульманскага Ўсходу, Полацк стаў сапраўды найбуйнейшым рамесна–гандлёвым і культурным цэнтрам. Сярод найбольшых гарадоў тагачаснай Беларусі былі таксама Тураў і Віцебск, потым Пінск, Берасце, Слуцк, Наваградак.



*Старажытнае Берасце. Рэканструкцыя П. Лысенкі.*

Апошні, размешчаны ўбаку ад магістральных шляхоў, на балта–славянскім памежжы, літаральна здзівіў археолагаў багаццем знаходак. Раскопкі паказалі, што ў XII—XIII ст. ён быў адным з найбагацейшых гарадоў рэгіёна, з цэлым кварталам ювеліраў і залатароў, аб'яднаных у прафесійную арганізацыю — «братчыну», што ён актыўна гандляваў з замежнымі краінамі. Дарэчы, даследчыкі Наваградка прыкмецілі цікавую асаблівасць: забудова ў ім блізкая да планіроўкі заходнееўрапейскіх гарадоў.

Разгалінаваная сістэма рэк спрыяла развіццю гандлёвых зносін не толькі паміж гарадамі і акругамі краю. Як высветлілі

археолагі, купцы прыязджалі сюды з таварамі з самых далёкіх земляў. У прыватнасці, з Кіева прывозіліся прадметы хрысціянскага культу, шкляныя бранзалеты, з Валыні — шыферныя праслачкі, з Візантыі — амфары, з Каўказа — самшыт, з мусульманскага Ўсходу — фаянсавы посуд, а з краінаў лацінскага Захаду — найперш вырабы з каляровых металаў. Сярод рэчаў, знойдзеных у Беларусі — бронзавы кубак з Самбіі, саксонскі бронзавы рукамыйнік, залаты пярсцёнак з лацінамоўным надпісам, скандынаўская зброя і інш. З Беларусі ж вывозіліся каштоўныя футры (собаль, куніца, вавёрка), мёд, воск, смала, лён ды іншая сыравіна.



*Жылая забудова на Менскім замку XIII ст.*
*Рэканструкцыя П. Русава.*

Сістэма кіраваня ў гарадах Беларусі была падобная да візантыйскага ўзору. Цэнтральную ўладу ў іх увасаблялі княскія намеснікі, званыя пасаднікамі. Князь жа прызначаў цівуноў, якія судзілі, ключнікаў, мытнікаў. Аднак апрача манаршай у горадзе існавала іншая галіна ўлады — веча як сход усяго вольнага насельніцтва. Калі князь абапіраўся на дружыну, то за вечам стаяла ваенная арганізацыя горада — «воі». Паміж імі складвалася пэўная раўнавага сілаў. Князь залежаў ад веча праўна і фінансава, кантраляваўся ім, а веча само было маладзеяздольным без князя.

Найбольш звестак захавалася пра дзейнасць вечавога сходу ў Полацку, дзе вечавыя традыцыі былі такія ж даўнія, як і ў Ноўгарадзе. Як заўважана ў Лаўрэнцеўскім летапісе пад 1176 г., «Новгородци бо изначала и Смолняне, и Кыяне, и Полочане, и вся



власти якож на думу на веча сходятся». Пра полацкае веча ёсць згадкі і ў адной з ісландскіх сагаў.

Яшчэ на пачатку XI ст. полацкі князь Брачыслаў мусіў раіцца з «мужамі» — сваёй баярскай думай, каб вырашыць пытанне аб найме варагаў. З часам жа актыўным фактарам палітычнага жыцця сталі «людзі» — гараджане, іх веча. Пра гэта сведчыць шмат летапісных запісаў. Так, у 1132 г. палачане прагналі пастаўленага Кіевам князя Святаполка. У 1151 г. жыхары Полацка здалі свайго князя Рагвалода ў Менск яго суперніку Расціславу Глебавічу, а апошняга запрасілі да сябе на княжанне. Праз сем гадоў жыхары Друцка выгналі свайго князя Глеба Расціславіча, а з Полацка разгневаныя гараджане, сабраўшы веча, прымусілі ўцячы князя Расціслава Глебавіча. Абапіраючыся на свае ўзброеныя сілы, веча кантралявала дзейнасць князёў. Невыпадкова, калі ў 1161 г. войска полацкага князя Рагвалода аказалася разбітым, то ён, баючыся адказнасці перад вечам, не адважыўся вяртацца ў Полацк. У крытычныя дні 1186 г., калі ў Полацкую зямлю ўварвалася войска суседніх княстваў, полацкае веча ўзяло адказнасць на сябе і вырашыла праблему шляхам перамоваў.

Падзеі XII ст., калі абшчыны гарадоў Полаччыны па сваім рашэнні шматразова мянялі князёў, паказваюць сапраўды важную ролю веча ў іх жыцці. Пры гэтым рашэннямі, прынятымі полацкім вечам, кіраваліся ўсе гарады зямлі. «Што старэйшыя пастановяць, на тым і прыгарады іх стануць», — зазначана летапісцам. Падобна, што ў тыя гады ў Полацку баланс дзвюх асноўных уладаў зрушыўся на карысць веча, і сходу гараджан належала больш улады, чым князю.

Да вечавых традыцый, спасылаючыся на прыклады Полацка, апелявалі летапісцы і праз некалькі стагоддзяў. У прыватнасці, аўтары Хронікі Вялікага Княства Літоўскага і Жамойцкага, а таксама Летапісу Рачынскага зазначылі, што «мужы Палачане... вечам справавалі, як Вялікі Ноўгарад і Пскоў». А невядомы аўтар беларуска–літоўскага летапісу XVI ст. у апісанне падзей другой паловы XIII ст. унёс устаўку «О Полацкой Венецыи, або свободности», у якой сцвярджае, што «держали на тот час землю русскую сами мещане полоцкие», без князёў «волно пановали собе и жадной зверхности над собою не имели». З–за недахопу звестак немагчыма вызначыць, наколькі працяглым быў перыяд самакіравання Полацка без князя. Выглядае, аднак, што ў XIII ст. Полацкае княства

эвалюцыянавала ад раннесярэднявечнай манархіі да арыстакратычнай рэспублікі. Такім чынам, яшчэ ў дамагдэбургскія часы самакіраванне мела ў беларускім горадзе сваю традыцыю.

## II.5. Хрысціянізацыя і развіццё культуры

З усталяваннем раннесярэднявечных дзяржаў ва Ўсходняй Еўропе было звязана ўвядзенне монатэістычнай рэлігіі. Хрысціянства дазваляла манархам абвясціць сваю ўладу свяшчэннай і аб'яднаць падданых агульным веравызнаннем. На момант першай летапіснай згадкі Полацка большая частка Еўропы была ўжо хрысціянскай. Славянскія народы цягам X ст. адзін за адным прымалі хрысціянства як дзяржаўную рэлігію. Яшчэ каля 800 г. былі ахрышчаны маравы, у 964 новая рэлігія ўведзена ў Балгарыі, у 966 г. — у Польшчы, у 973 г. — у Чэхіі. Па–за межамі хрысціянскага свету заставаліся толькі Скандынавія, Ісландыя, Фінляндыя, Прусія, Літва і Русь.

Першапачаткова пазнаць вучэнне Хрыста ўсходнія славяне маглі вельмі рана. Пэўна, яны сутыкнуліся з ім яшчэ ў VII ст., пад час паходаў у землі Візантыйскай імперыі. Некаторыя гісторыкі лічаць, што ўжо кіеўскія конунгі Аскольд і Дзір былі хрысціянамі. У IX ст. хрысціянства павольна распаўсюджвалася ў асяроддзі варажскіх і славянскіх дружыннікаў, якія мелі непасрэдны кантакт з хрысціянскім светам. Дакументальна засведчана, што яшчэ ў 867 г. русіны прынялі з Візантыі епіскапа, а потым і архіепіскапа, аднак першая царкоўная арганізацыя загінула пад хвалямі паганства. Дагавор, заключаны ў 944 г. князем Ігарам з Візантыяй, быў падпісаны як воінамі–язычнікамі, так і хрысціянамі, а княгіня Вольга сама ахрысцілася ў візантыйскай сталіцы і, згодна з некаторымі сведчаннямі, вяла перамовы аб прыняцці хрысціянства як з Рымам, так і з Канстанцінопалем. Перыяд яе княжання быў часам мірнага суіснавання паганства з новай рэлігіяй, пашыранай у прыдворна–дружынным асяроддзі. Можна меркаваць, што хрысціянская супольнасць існавала ў Кіеве задоўга да Ўладзіміра. Абапіраючыся на паведамленні ісландскай «Сагі пра хрышчэнне», некаторыя гісторыкі лічаць, што і ў Полацку ў канцы X ст. хрысці-



янскае вучэнне мог прапагандаваць скандынаўскі місіянер Торвальд. Ранняе знаёмства з хрысціянскай верай стала важнай прадпасылкай для ўвядзення яе ў якасці дзяржаўнай рэлігіі.

Афіцыйнай датай прыняцця «грэцкай веры» лічыцца 988 ці 989 г., калі Ўладзімір Святаславіч, пасля спробы ўмацаваць асноўныя паганскія культы, расчараваўся ў іх і прыняў рашэнне аб увядзенні монатэізму. Летапісец вобразна апісаў, як валадар русаў выбіраў паміж ісламам, іудаізмам, лацінскім і грэцкім хрысціянствам і ўрэшце аддаў перавагу атракцыйнай рэлігіі Канстанцінопаля. Такі выбар не ў апошнюю чаргу быў абумоўлены палітычнымі матывамі: толькі хрысціянства давала Русі магчымасці ўвайсці ў сістэму еўрапейскіх дзяржаў, атрымаць іх прызнанне і давер.



*Пячатка полацкага епіскапа Міны (1105—1116).*

Першымі былі ахрышчаныя княскі двор і дружына, а таксама жыхары Кіева. «Сабралася народу вялікае мноства, увайшлі ў ваду і стаялі там, пакуль святары чыталі малітвы», — занатавана ў крыніцы пра хрышчэнне кіяўлян. Пэўна, гэтаксама хрысцілі людзей і ў іншых землях. Для хрысціянізацыі ўсёй Русі князь Уладзімір паслаў сваіх сыноў з адпаведнымі місіямі ў галоўныя гарады — Ноўгарад, Полацк, Тураў, Чарнігаў, Белгарад, Уладзімір–Валынскі і Растоў. У некаторых землях не абыходзілася без канфліктаў. Паводле зніклага летапісу, выкарыстанага ў свой час Васілём Тацішчавым, у Ноўгарадзе ў 991 г. жыхары ўзбунтаваліся супраць прысланага епіскапа і іх утаймаваннем займалася ваенная экспедыцыя на чале з Дабрынем. Да падобных сутыкненняў дайшло і ў Растоўскай зямлі. Наконт такіх здарэнняў на тэрыторыі Беларусі крыніцы нічога не паведамляюць. Толькі ў Тураве паданні згадваюць прапаведніка Дыянісія, забітага мясцовымі прыхільнікамі паганскіх культаў, аднак яны малавартыя для гісторыка.

Цэнтрамі распаўсюджвання новай веры рабіліся заснаваныя епархіі, храмы і манастыры. Прынята лічыць, што першая ў Беларусі епархія была ўтворана ў Полацку праўдападобна ў 992 г., пры князі Ізяславе, хоць першым дакладна вядомым з летапісаў полацкім уладыкам стаў епіскап Міна, прызначаны на кафедру ў 1105 г.

Другой на тэрыторыі Беларусі была Тураўская епархія, заснаваная ў 1005 г. Яе першым уладыкам крыніцы называюць епіскапа Фаму.

Межы епархіяў тады супадалі з межамі княстваў. Полацкая ахоплівала землі ў басейне Дзвіны і Бярэзіны, да Тураўскай у пачатку XII ст. належалі Пінск, Берасце, Здзітаў, Нобель, Сцяпань, Дубровіца, Слуцк, Копысь, Гарадок, Смедынь, а таксама панямонскія гарады Наваградак, Ваўкавыск і Горадня. Усходняя частка Палесся ўваходзіла ў Кіеўскую, землі па левы бераг ракі Сож — у Чарнігаўскую, а Верхняе Падняпроўе — у Смаленскую епархіі.

Увядзенне хрысціянства было не кароткачасовым эфектным актам, а стала працяглым і складаным працэсам, расцянутым на стагоддзі, таму дата 988 г. мае толькі сімвалічнае значэнне. У Сярэднявеччы новую веру параўнальна хутка прымалі толькі вышэйшыя слаі грамадства, галоўным чынам княскія дружыннікі і гараджане, тады як вясковы люд яшчэ стагоддзямі маліўся паганскім святыням. І пазней сярод гараджан яшчэ доўга звычайнай з'явай было двухвер'е, пра што сведчаць пахаванні ў курганах, гарадзішчы–свяцілішчы, культавыя валуны, амулеты, упрыгожванні з паганскай сімволікай і інш.

На тэрыторыі Беларусі хрысціянізацыя спачатку ахапіла толькі гарады і адміністрацыйныя цэнтры, але ўжо ў першыя дзесяцігоддзі пасля афіцыйнага прыняцця новай веры яна дасягнула значных поспехаў. У Полацку ў 990-х г. княжыў першы ў беларускай гісторыі князь–хрысціянін Ізяслаў (памёр у 1001 г.) — сын Уладзіміра і Рагнеды, ахарактарызаваны летапісцамі як вельмі набожны, князь–кніжнік. Паданні сцвярджаюць, што на паўднёвых межах Полаччыны, у гарадку Ізяслаўль (цяперашняе Заслаўе) тысячу гадоў назад быў заснаваны жаночы манастыр для Рагнеды, якая прыняла імя Анастасіі. Гэта, аднак, не пацвярджаецца археалагічна, затое матэрыялы раскопак, праведзеных беларускімі археолагамі, сведчаць, што ў сярэдзіне XI



*Барысаў камень XII ст. у Дзвіне. Гравюра XIX ст.*



ст. бадай усе жыхары гэтага горада ўжо вызнавалі хрысціянства. Вясковае ж насельніцтва ў асноўным заставалася пры паганскіх вераваннях. Відаць, доўгі час паганскія звычаі былі жывучымі і ў асяроддзі арыстакратыі. Нездарма полацкага князя Ўсяслава Брачыславіча летапісцы і аўтар «Слова пра паход Ігараў» лічылі народжаным ад «валхвавання», прыпісваючы яму здольнасць ператварацца ў ваўка і пераганяць паганскага бога Хоса (за гэта Ўсяслаў і быў празваны Чарадзеем). Магчыма, цесныя сувязі Полацка з суседнімі балтамі спрыялі як большай цярпімасці палачан да паганства, так і асаблівай укаранеласці яго пражыткаў на гэтай зямлі. Можна меркаваць, што са сцвярджэннем новай веры звязана з'яўленне ў XII ст. на Полаччыне так званых «Барысавых камянёў» — вялікіх валуноў з выбітымі на іх крыжам, кароткім надпісам ды імем полацкага князя Барыса.

Даўжэй за іншыя вобласці цягнулася хрысціянізацыя Беларускага Панямоння. Тут нават насельніцтва гарадоў, вельмі markup рознае паводле этнічнага складу, у XI ст. яшчэ заставалася пераважна паганскім, бо толькі другой паловай гэтага стагоддзя археолагі датуюць першыя рэчы хрысціянскага культу (нацельныя крыжыкі) і прылады для пісання. Але ў XII ст. хрысціянізацыя Панямонскага краю паскорылася, пра што сведчыць пашырэнне хрысціянскага абраду пахавання нябожчыкаў у грунтавых магілах, узвядзенне храмаў у гарадах.

Працэс тэрытарыяльнай экспансіі хрысціянства на землях усходніх славян цягнуўся да канца XII ст. На канец першай трэці XIII ст. на ўсёй Русі існавала адна мітраполія, 16 —17 епіскапій, 70 манастыроў і прыкладна 6 тысяч парафіяў. Для такіх вялікіх абшараў гэтага было замала. У параўнанні з еўрапейскімі краінамі парафіяльная сетка тут заставалася рэдкай, асабліва на вёсцы. Яе гушчыня залежала ад рэгіёна: калі землі сучаснай Беларусі ахопліваліся ў асноўным трыма епархіямі (Полацкай, Тураўскай і Смаленскай), дык на вялізных абшарах Паўночна–Ўсходняй Русі існавала толькі адна Растоўская епархія.

Хрысціянства, уведзенае ў якасці дзяржаўнай рэлігіі, узняло Русь на больш высокі ўзровень узаемаадносін з еўрапейскімі краінамі і народамі. Аднак прыняцце яго ўсходняй формы ад Канстанцінопаля азначала прызнанне сюзерэнітэту візантыйскага імператара. У палітычным мысленні Візантыі імператар быў «касмакратам», чыя

ўлада пашыраецца на ўвесь цывілізаваны свет — тыя землі Ўсходняй Еўропы, якія ў рэлігійна–культурным плане трапілі ў арбіту імперыі. Вядомы візантолаг Дзмітры Абаленскі адзначыў, што з прыняццем усходняга хрысціянства Русь увайшла ў «візантыйскую супольнасць народаў». Рэальна да палітычнага падпарадкавання Русі Канстанцінопалю ніколі не даходзіла, аднак ідэалагічна яно прадугледжвалася.

Прыняцце «грэцкай веры» ўключыла ўсходнеславянскія землі ў хрысціянскі свет, далучыўшы іх да тысячагадовай культурнай традыцыі грэка–рымскай цывілізацыі, што мела асабліва важнае значэнне для культурнага развіцця нашых далёкіх продкаў. Візантыйская хрысціянская культура перыяду росквіту імперыі, які працягваўся з IX да канца XI ст., валодала вялікай прывабнай сілай, а яе трансмісіі на Русь спрыяла сама сітуацыя.

Пасля фармальнага хрышчэння паўстала вострая неабходнасць у пашырэнні хрысціянскай асветы, у літургічных тэкстах, у навучанні царкоўных служак, узвядзенні храмаў і г.д. У забеспячэнні гэтых патрэб важную ролю выконвала Балгарыя, якая прыняла хрысціянства на чвэрць стагоддзя раней. Канстанцінопальскі патрыярхат пагадзіўся, каб на Русі, як і ў Балгарыі, у царкве выкарыстоўвалася не грэцкая, а славянская мова. Так для рэлігійных патрэб у землях старажытнай Русі стала ўводзіцца славянская азбука, распрацаваная ў 863 г. на аснове грэцкага пісьма балгарскімі асветнікамі Кірылам і Мяфодзіем для мараўскай місіі і названая пазней «кірыліцай». Царкоўнаславянская мова ў яе балгарскай версіі прыйшла на землі Русі–Беларусі ў перакладных кнігах Святога Пісання і ў літургіі. Яна стала не толькі формай рэлігійнага самавыяўлення, але і асновай сярэднявечнай літаратуры. Для праваслаўна–славянскага рэгіёна яе функцыя была міжнароднай, яе разумелі ўсе (у адрозненне ад лаціны як літургічнай мовы ў заходнім хрысціянстве). Аднак гэта мела і адмоўныя наступствы: адсутнасць патрэбы ў грэцкай мове і лаціне вяла да самаізаляцыі, да незапатрабаванасці рымскай і візантыйскай спадчыны.



*Надпіс палачаніна на сцяне Сафійскага сабора ў Кіеве.*



З хрысціянскай асветай цесна звязана развіццё пісьменнасці. Адносна часу з'яўлення пісьма ў нашых землях выказаны розныя думкі. Усходнія славяне задоўга да хрышчэння ведалі і пісьмёны Хазарскага каганату, і скандынаўскія руны. Некаторыя даследчыкі лічаць, што тут існавала свая сістэма рунічнага пісьма. Прынамсі, на плінфе Каложскага храма заўважаны знакі, падобныя на руны. Аднак рэгулярнага выкарыстання якога–небудзь алфавіту не было. Да IX ст. усходнія славяне яшчэ не дасягнулі такога ўзроўню сацыяльнай арганізацыі, на якім становіцца важнай пісьмовая мова. Ужо на пачатку X ст. для русінаў было даступнае кірылічнае пісьмо, распрацаванае балгарскімі асветнікамі, а з моманту хрысціянізацыі пачалося яго пастаяннае выкарыстанне.

Адным з самых старажытных сведчанняў засваення кірылічнага пісьма крывічамі лічыцца надпіс «ГОРОУХША» на керамічным посудзе першай паловы X ст., знойдзеным у кургане каля Смаленска. А на віслай пячатцы полацкага князя Ізяслава з канца X ст. даследчыкі прачыталі надпіс «ИЗЯС(ЛАВ)ОС». Да самых ранніх помнікаў мясцовага пісьменства можна аднесці таксама кірылічны тэкст на камені сярэдзіны XI ст., выяўленым у падмурку полацкага Сафійскага сабора. Спецыялісты расчыталі на ім словы «Давыдь. Тоума. Микоула. Къпьсь. Тоума». Лічыцца, што гэта імёны майстроў будаўнічай арцелі, якая ўзводзіла храм. На сцяне ж Кіеўскай Сафіі жыхар Полацка пакінуў надпіс: «Воинегъ писалъ Журяговиць полоцянинъ».



*Берасцяная грамата з Віцебска. XIII ст.*

З XI ст. пісьмом авалодвалі не толькі прадстаўнікі эліты, але і сярэднія слаі грамадства. Яго ведалі як гараджане, так і жыхары аддаленых пасяленняў. Пра гэта сведчаць бронзавыя зашчапкі ад рукапісных кніг другой паловы XI—XII ст. і металічныя пісалы для пісання па навошчаных дошчачках, знойдзеныя археолагамі ў вялікай колькасці ў Менску, Друцку, Навагрудку, Ваўкавыску, Браславе ды іншых беларускіх гарадах. Цікава, што прапорцыі пісалаў, выяўленых на пэўнай плошчы, у Навагрудку і ў Ноўгарадзе прыкладна роўныя, значыць, пісьмо на дошчачках было пашырана ў іх

прыкладна аднолькава. У Віцебску і Мсціславе выяўлены напісаныя гараджанамі лісты на бярозавай кары — берасцяныя граматы XIII ст. Надпісы, зробленыя кірыліцай, сустракаюцца на шматлікіх пабытавых рэчах таго часу — праслачках, грэбенях, амфарах і г.д. Прыкладам, на шыферным праслачку з Горадні невядомая жанчына пакінула надпіс «Г(осподи) помози рабе своей не...», а на самшытавым грэбені з Берасця выпісаны літары паловы славянскага алфавіту.

Аўтары спецыяльных даследаванняў сцвярджаюць, што на Русі XII — першай паловы XIII ст. чытаць і пісаць умела сама меней 10 % насельніцтва горада. Невыпадкова прадметам гандлю і каштоўнай ваеннай здабычай стала кніга. У гарадах, пры манастырах і саборах ствараліся школы і бібліятэкі, перакладаліся і перапісваліся кнігі, вяліся летапісы. Асабліва багатая бібліятэка існавала з XI да другой паловы XVI ст. пры Сафійскім саборы ў Полацку. Кнігі тады пісалі на пергаміне ўставам, тэкст аздабляўся каляровымі мініяцюрамі, застаўкамі, загалоўкамі і канцоўкамі, а пераплёты звычайна ўпрыгожваліся абкладамі і аздобамі з каляровых металаў. На землях Беларусі шырокай папулярнасцю карысталіся перакладзеныя з грэцкай на царкоўнаславянскую «Гісторыя іудзейскай вайны» Іосіфа Флавія, гістарычныя аповесці «Александрыя», «Троя» і інш. З гэтых кніг пісьменны жыхар тагачаснай Беларусі мог атрымаць звесткі пра мінулае еўрапейскіх народаў. Арыгінальную літаратуру прадстаўлялі галоўным чынам жыцці і летапісы. Спецыялісты лічаць, што ўласныя летапісы складаліся ў Полацку, Тураве і Навагрудку. На жаль, яны не захаваліся, але фрагменты гэтых летапісаў былі ўключаны перапісчыкамі ў іншыя летапісныя зводы. Часткі полацкага летапісу можна выявіць у кіеўскім зводзе. Полацкім летапісам карыстаўся і Васіль Тацішчаў, калі працаваў над «Гісторыяй Расійскай». Ад наваградскага летапісу яшчэ менш



*Старонка Тураўскага евангелля XI ст.*



слядоў. Хоць, на думку Ўладзіміра Пашуты, менавіта ён стаў асновай сюжэта пра Міндоўга ў Іпацеўскім зводзе.

З царкоўных кніг да нас дайшлі таксама толькі паасобныя творы. Самы ранні сярод іх — Тураўскае евангелле, напісанае на беларускіх землях у XI ст. на царкоўнаславянскай мове. Сярод кніг Святога Пісання далітоўскай эпохі вядомы яшчэ Аршанскае, Полацкае і Дабрылава Евангеллі, а таксама Супрасльскі рукапіс XI ст. Шырокай папулярнасцю карысталіся «Сказанне пра Барыса і Глеба», створанае ў Кіеве, а таксама мясцовыя агіяграфічныя творы XII ст. — «Жыцці» першай на Русі жанчыны–пісьменніцы Ефрасінні Полацкай (1101—1167), якая даводзілася ўнучкай князю Ўсяславу Чарадзею, тураўскага епіскапа Кірылы (1113 — пасля 1190), а таксама «Жыцце Аўрамія Смаленскага», напісанае ў 1240 г.

Полацкая князёўна Ефрасіння (свецкае імя Прадслава) у дзявочыя гады пастрыглася ў манашкі і пасялілася ў келлі Сафійскага сабора. Карыстаючыся бібліятэкай храма, славутая манахіня–асветніца перапісвала і, магчыма, перакладала кнігі, складала малітвы і дыдактычныя пропаведзі. Ефрасіння заснавала жаночы і мужчынскі манастыры, якія сталі асяродкамі асветы ў Полацкай зямлі, па яе замове ў Полацку збудавалі дзве царквы. Сярод суайчыннікаў яна была вядомая як добры дарадчык, справядлівы суддзя і міратворца. У пажылым узросце Ефрасіння выправілася ў паломніцтва ў Ерусалім і там, знясіленая падарожжам, захварэла і памерла. Славутая палачанка была першай жанчынай на Русі, кананізаванай царквой, і стала нябеснай заступніцай Беларусі.

Епіскап Кірыла Тураўскі лічыўся адным з самых адукаваных людзей свайго часу. Знаўца візантыйскага пісьменства і грэцкай мовы, ён быў адораны немалым літаратурным талентам. Яго алегарычна–ўзнёслыя высокамастацкія «Словы», прытчы і малітвы–спаведзі мелі папулярнасць на ўсіх землях Русі і нават за яе межамі, у прыватнасці, у XVI ст. на Балканах. Сучаснікі называлі Кірылу Тураўскага «другім Златавустам, што больш за ўсіх заззяў на Русі», а «вучэннем сваім канцы рускія асвяціў».

Высокаадукаваны смаленскі манах–прапаведнік Аўрамій, як і Ефрасіння, займаўся перапіскай і распаўсюджваннем кніг. Мясцовае духавенства з зайздрасці абвінаваціла яго ў ерасі, з яго смяяліся гараджане, але хрысціянская вера дапамагла Аўрамію атрымаць маральную перамогу.

Вяршыняй свецкай арыгінальнай літаратуры той эпохі па праву лічыцца славутае «Слова пра паход Ігараў» — ананімны твор, напісаны ў 1185 —1187. Створана яно на тыповай для Кіеўскай Русі літаратурнай мове, у якой спалучаюцца як уплывы народных дыялектаў, так і запазычанні з чужых моваў. Твор багаты архаічнай усходнеславянскай сімволікай і нясе ў сабе выразны след старажытнага дружыннага эпасу, але ў той жа час ён з'яўляецца ўзорам хрысціянскай літаратуры. Тыпалагічна спецыялісты ставяць яго ў адзін шэраг з французскай «Песняй пра Раланда», нямецкай «Песняй пра нібелунгаў» і грузінскай песняй «Віцязь у тыгравай шкуры» Шаты Руставелі. У «Слове» асабліва выразны грамадзянскі пафас аўтара. Ён усхваляе доблесць князёў, асуджаючы іх самавольства, ідэалізуе герояў праз асвятленне іх годных учынкаў і ваенных подзвігаў. Аўтар многа гаворыць пра князёў полацкіх, асабліва пра Ўсяслава Брачыславіча. Ніводнаму князю Русі XI ст. не прысвечана ў гэтым творы столькі прыхільных слоў, як Усяславу Чарадзею. Унукаў жа яго аўтар папракае за тое, што яны страцілі «дзедаву славу».

З прыняццем хрысціянства, якое ад пачатку высока ставіла мастацкае слова і форму, звязаны сапраўдны пераварот у развіцці пластычнага мастацтва. На Русь, якая да X ст. наогул не ведала мураванага дойлідства, з Візантыі прыйшла традыцыя манументальнай архітэктуры з складаным тыпам крыжова–купальнага храма, дасканалай сістэмай перакрыццяў і высокай будаўнічай тэхнікай. Хрысціянства прынесла на нашыя землі таксама першыя ўзоры іканапісу і фрэскавы жывапіс.

Самым першым хрысціянскім храмам на Русі стала Дзесяцінная царква ў Кіеве (на яе ўтрыманне князь Уладзімір прызначыў дзесятую частку даходаў — «дзесяціну»). Пазней там паводле візантыйскіх узораў быў узведзены славуты сабор Святой Сафіі. На землях Беларусі першай царквой можна лічыць храм Багародзіцы, збудаваны ў Полацку недзе на мяжы X—XI ст. А ў сярэдзіне XI ст. (паводле археолага Леаніда Аляксеева — у 1062—66 г.) тут жа з'явіўся велічны мураваны храм — сабор Святой Сафіі, трэці сабор такога тыпу ў Усходняй Еўропе (пасля кіеўскага і ноўгарадскага) і першы помнік каменна–цаглянага дойлідства ў Беларусі. Яго будавала самастойная арцель візантыйскіх дойлідаў. Гэта быў вялікі прадаўгаваты ў плане пяцікупальны храм з вежай–званіцай. Выцягнутымі ўверх прапорцыямі, шэрагам адметных рысаў, характэрных больш



для заходняга дойлідства, полацкая Сафія адрознівалася ад кіеўскай і ноўгарадскай. Яна быццам увасобіла тыя ідэі сепаратызму, якімі кіраваўся князь Усяслаў у сваёй палітыцы.

Пры сынах Усяслава Брачыславіча школа полацкай архітэктуры, якая творча перапрацоўвала візантыйскую спадчыну, дасягнула росквіту. Кожны з нашчадкаў славутага Чарадзея імкнуўся паставіць храм як у сваёй вотчыне, так і пры сваім двары ў Полацку. У XII ст. у Полацку было ўжо больш за дзесятак мураваных хрысціянскіх святыняў, у тым ліку славутая Спаская царква Ефрасіннеўскага манастыра, узведзеная полацкім дойлідам Іаанам па замове Ефрасінні Полацкай. З усіх помнікаў той эпохі яна адзіная цалкам захавалася да нашых дзён. Гэта самы ранні помнік, у якім праявіліся новыя формы, што з канца XII ст. пашырaліся па ўсёй Русі — выцягнутасць уверх, вертыкальнасць кампазіцыі. З'яўленню такіх асаблівасцяў полацкага дойлідства, пэўна, спрыялі сувязі з нямецкай калоніяй у нізоўях Дзвіны. Заходні ўплыў можна заўважыць не толькі ў формах мясцовай архітэктуры, але і ў раманскіх рысах твораў дробнай пластыкі. Магчыма, сваю ролю тут выканала асаблівае геаграфічнае становішча Полацка, які ў XII ст. ужо гандляваў з немцамі і скандынавамі, а ў XIII ст. стаў галоўным партнёрам усёй Ганзы на Дзвіне.

Па ўзоры полацкіх храмаў будаваліся цэрквы і ў іншых беларускіх землях, на Панямонні і ў Смаленшчыне. Так, смаленскі князь Давыд Расціславіч запрасіў да сябе полацкіх дойлідаў, якія ўзвялі яму высотны храм Архангела Міхаіла. Традыцыі полацкага фрэскавага жывапісу дабратворна ўплывалі на развіццё манументальнага мастацтва Смаленска.

Апрача Полацка ў XII ст. мураваныя цэрквы з'явіліся ў Віцебску, дзе майстры невядомай арцелі, выкарыстаўшы арыгінальную тэхніку кладкі, узвялі прыгожую Дабравешчанскую царкву, а таксама ў Ваўкавыску, Наваградку, Тураве і ў Горадні, у якой самабытную мясцовую архітэктуру прадстаўлялі тры царквы XII ст. — Ніжняя, Каложская і Прачысценская. Падмуркі каменнай царквы унікальнай канструкцыі выяўлены археолагамі на дзядзінцы ў Менску. Яе будавалі, найпраўдападобней, польскія майстры па замове князя Яраполка ці Глеба Менскага ў XI ст., але будаўніцтва чамусьці так і не было завершана. З'яўленне такой колькасці храмаў у пэўнай ступені адлюстравала поспехі распаўсюджвання новай веры.

Можна меркаваць, што ў XII — пачатку XIII ст. працэс хрысціянізацыі зямель Беларусі ў асноўным завяршыўся.

Акрамя цэркваў у беларускіх гарадах сталі ўзводзіцца і грамадзянскія каменныя пабудовы, церамы і вежы. Княскія харомы ў XII ст. былі збудаваны ў Горадні і Полацку. У Камянцы, што каля Берасця, пад канец XIII ст. паўстаў знакаміты «слуп» — абарончая вежа тыпу данжон, вядомая цяпер як Белая. Падобныя вежы меліся тады таксама ў Берасці, Горадні, Наваградку і Тураве.

Вяршыняй дэкаратыўна–прыкладнога мастацтва Беларусі таго часу можна лічыць шасціканцовы ўкладны крыж, створаны ў 1161 г. у Полацку майстрам Лазарам Богшам для Спаскай царквы па замове Ефрасінні Полацкай. У яго мастацкім аздабленні спалучаны элементы як візантыйскай, так і раманскай традыцыі, але пераважаюць простыя геаметрычныя матывы, што і адрознівае гэты помнік ад твораў прыкладнога мастацтва з Паўднёвай і Ўсходняй Русі. Мовазнаўцы адзначаюць, што надпіс на крыжы, у якім паведамлялася пра колькасць скарыстанага золата, срэбра і жамчуга, а таксама ўтрымлівалася грозная перасцярога на выпадак выкрадання рэліквіі, адлюстраваў некаторыя асаблівасці мясцовага полацкага дыялекту. На жаль, на пачатку другой сусветнай вайны гэтая нацыянальная рэліквія знікла і дасюль пра месца яе знаходжання нічога не вядома.

Такім чынам, дзякуючы прыняццю хрысціянства і пашырэнню пісьма, праз рэцэпцыю візантыйскіх узораў культуры і пэўныя ўплывы лацінскага Захаду, у XI — XII ст. землі сучаснай Беларусі выйшлі на сцэну еўрапейскай гісторыі. Невыпадкова на карце Абсторфера, створанай у XIII ст. — старэйшай геаграфічнай карце свету, апрача Кіева і Ноўгарада сярэднявечную Русь прадстаўлялі Полацк і Смаленск.

# III. Утварэнне Вялікага Княства Літоўскага

## III.1. Ад Міндоўга да Гедыміна

Па пісьмовых крыніцах Літва вядома з XI ст. Упершыню яна згадана пад 1009 г. у аналах нямецкага гарадка Кведлінбурга ў запісе пра місіянера Брунона (Brun von Querfurt), забітага на памежжы Літвы (Litua) і Русі. З 1040 г. пра Літву сталі паведамляць і ўсходнеславянскія летапісы. Этымалогія гэтай назвы дакладна не вызначана, аднак большасць літоўскіх гісторыкаў лічыць, што яна паходзіць ад невялікай рачулкі Летаўкі, што ўпадае ў Вяллю. Верагодна, спачатку Літвой называлася зямля — тэрыторыя племянной групоўкі ўсходніх балтаў, якая знаходзілася на паўднёвым усходзе сучаснай Рэспублікі Літва і ў прылеглых раёнах Беларусі, паміж рэкамі Нёманам і Вяллёй, а потым назва перайшла на народ.

Па ўзроўні сацыяльнага развіцця балты адставалі ад славян, не мелі ні дзяржаўнай арганізацыі, ні монатэістычнай рэлігіі. Разам з латгаламі, земгаламі, лівамі ды іншымі прыбалтыйскімі плямёнамі старажытная Літва плаціла даніну Русі і, праўдападобна, нейкі час была залежнай непасрэдна ад Полацка. У XII ст. полацкія, віцебскія ды менскія князі выкарыстоўвалі літоўскія дружыны ў ваенных паходах у сваіх інтарэсах, абапіраліся на іх у міжусобнай барацьбе. Аднак з раздрабленнем і аслабленнем княстваў Беларусі ініцыятыва ваенных акцый пераходзіла да самой Літвы. З летапісаў і

хронікі Генрыха Латыша відаць, што на пачатак XIII ст. яна стала магутнай ваеннай сілай. З 1201 да 1236 г. літоўскія дружыны зрабілі 22 паходы на ўладанні Нямецкага ордэна, 4 — на Польшчу і 14 разоў хадзілі па здабычу на ўсходнеславянскія землі, у тым ліку на Полаччыну і Смаленшчыну. У адносінах да Літвы і нямецкі Ордэн Братоў па мячы, што ўзяўся актыўна каланізаваць Прыбалтыйскія землі, доўгі час займаў толькі абарончыя пазіцыі.

Да сярэдзіны XIII ст. літоўскія плямёны яшчэ не мелі адной дзяржаўнай арганізацыі. Аднак пастаянныя паходы і войны спрыялі іх аб'яднанню ў саюз, вялі да палітычнай кансалідацыі. Калі ў 1219 г. з галіцкімі князямі Данілам і Васількам падпісвалі пагадненне Літва і Жамойць (якая пад гэтым годам упершыню згадана летапісцам), іх прадстаўнікамі былі больш за 20 балцкіх правадыроў (кунігасаў), у тым ліку 5 «старэйшых», сярод якіх і Міндоўг. Гэты саюз, ці канфедэрацыя з'яўлялася ўжо агульналітоўскай ваеннай арганізацыяй, кіраванай «старэйшымі» кунігасамі. Між тым становішчу, у якім знаходзіліся літоўскія плямёны ў другой трэці XIII ст., адпавядала больш цеснае аб'яднанне і цэнтралізацыя ўлады. Падпарадкаваўшы землі Латвіі ды Эстоніі, нямецкія рыцары звязвалі планы далейшай экспансіі з Літвой і Падзвіннем. У 1236 г. яны ажыццявілі свой першы значны паход у Жамойць, аднак былі разгромлены ў бітве пад Шаўлямі. Узрастала пагроза і з боку Прусіі, дзе знаходзіўся Тэўтонскі ордэн. Пасля аб'яднання тэўтонцаў з Інфлянцкім ордэнам у 1237 г. мэтай нямецкіх рыцараў стала падпарадкаванне Жамойці, якая на сушы раздзяляла тэрыторыі іх дзяржаў.



*Вялікі князь Міндоўг (1230—1263).*

З Іпацеўскага летапісу вядома, што прыкладна ў 1240-х г. Міндоўг парушыў ранейшы парадак кіравання літоўскімі землямі ды захапіў уладу ў свае рукі: «пачаў княжыці адзін ва ўсёй зямлі Літоўскай». Пры гэтым частка племянных правадыроў была, відаць, знішчаная, а іншыя



сталі яго васаламі. Крыху пазней улада Міндоўга распаўсюджваецца на сумежныя тэрыторыі Беларусі. Першай такой зямлёй стала Сярэдняе Панямонне — Чорная Русь з гарадамі Наваградак (у летапісах Ноўгародак), у якім Міндоўг укняжыўся, Ваўкавыск, Горадня, Здзітаў і Слонім. Летапісы не падаюць ніякіх сведчанняў гвалтоўнага падпарадкавання гэтай зямлі. Хутчэй за ўсё, Міндоўг тут быў абвешчаны князем са згоды мясцовага насельніцтва. У Наваградку нейкі час знаходзілася яго рэзідэнцыя. Позні Густынскі летапіс сцвярджае, што ў 1246 г. Міндоўг прыняў хрысціянства ўсходняга абраду, хоць, праўда, верагоднасць гэтага паведамлення мізэрная.

Прыкладна ў тыя ж гады ў Полацку, дзе абарвалася мясцовая дынастыя (апошні з вядомых полацкіх Рагвалодавічаў князь Брачыслаў згадваецца ў летапісах пад 1239 г.), быў пасаджаны на княжанне Міндоўгаў пляменнік Таўцівіл, які, калі верыць Мацею Стрыйкоўскаму, прыняў там праваслаўе. Няма ніводнага сведчання пра падпарадкаванне Полацка сілай, таму з улікам ролі полацкага веча можна меркаваць, што літоўскага князя хутчэй за ўсё запрасілі самі палачане. Падобны саюз адпавядаў іх інтарэсам.

Як ужо згадвалася, на ўсходзе і поўдні Русі раздробленыя княствы спустошыла мангола–татарская арда на чале з ханам Батыем. Хоць тэрыторыя сучаснай Беларусі, як і Літвы, не зведала татарскага нашэсця, рэальная пагроза іх нападу існавала. Землі Беларусі і раней былі слаба звязаныя з цэнтрам Русі, а пасля падпарадкавання Кіева татарскаму хану сувязі яшчэ больш аслаблі. З іншага боку, Полаччына мела даўні вопыт цеснага кантакту з балцкімі плямёнамі. Паміж усходнімі латгаламі, літоўцамі і славянамі ў басейне Дзвіны і Нёмана ніколі не было выразнай этнічнай мяжы. Усходнеславянскае насельніцтва тут нярэдка жыло ўперамешку з балцкім. У княскім асяроддзі практыкаваліся міжэтнічныя шлюбы (напрыклад, князь Усевалад з Герцыке ажаніўся з дачкой літоўскага кунігаса Даўгерда), князі–русіны маглі змяняцца літоўцамі. Таму аб'яднанне раздробленых, аслабленых зямель у адну дзяржаву, па–першае, было выгадна не толькі літоўскім князям, але і суседнім усходнеславянскім гарадам і землям, а па–другое, абапіралася на набыты вопыт суіснавання.

У 1248 ці ў 1249 г. дайшло да канфлікту Міндоўга з яго васаламі Таўцівілам, Ердзівілам і Вікінтам. Апошнія ўцяклі да князя

Данілы Галіцкага і атрымалі яго падтрымку, папрасіўшы таксама дапамогі ў яцвягаў і рыжскага арцыбіскупа. Для замацавання саюзу з немцамі полацкі князь Таўцівіл ахрысціўся ў Рызе па лацінскаму абраду. Але найбольш рэальна выгнанцам дапамагалі галіцка–валынскія дружыны, якія некалькі гадоў запар ваявалі гарады Беларускага Панямоння. Князь Міндоўг здолеў хутка раскалоць кааліцыю. Жамойць і яцвягі былі падкуплены «срэбрам многім», а Ордэну ён паабяцаў аддаць жамойцкія землі і прыняць лацінскую веру. У 1251 г. Міндоўг ахрысціўся ў заходнім абрадзе, атрымаўшы тытул прыкладнага сына Рымскага касцёла і карону. «Крещение же его льстиво бысть», — зазначыў аўтар Іпацеўскага летапісу, падкрэсліўшы тактычныя інтарэсы князя. Тады ж было заснавана і літоўскае біскупства (diecesis Lethoviensis). Першы літоўскі біскуп быў высвечаны толькі праз два гады. Ім стаў дамініканін Віт, які, аднак, не прыехаў да сваёй дыяцэзіі. Яшчэ праз год інфлянцкі арцыбіскуп Альберт высвяціў для літоўскай дыяцэзіі новага біскупа Хрысціяна, але і той нядоўга прабыў у Літве. А ўлетку 1253 г. праўдападобна ў Наваградку адбылася ўрачыстая каранацыя Міндоўга. У вачах хрысціянскай Еўропы гэты акт адразу ўзносіў Літву ў ранг каралеўства, якім лічылася вялікая і незалежная дзяржава.



*Вялікі князь Войшалк (1263—1267).*

З апошнім ворагам — Галіцка–Валынскім княствам —Міндоўгу ўдалося замірыцца пасля таго, як ягоны сын Войшалк, што раней знаходзіўся ў Лаўрышаўскім манастыры, выступіў з выгаднымі для Рамана Данілавіча ўмовамі і ў 1254 г. аддаў яму гарады Наваградак, Слонім і Ваўкавыск. Раман пачаў княжыць у Наваградку як васал Міндоўга. Але ўжо ў канцы 1250-х г., пад час наезду хана Бурундая (з якім выступілі



і галіцка–валынскія князі), Войшалк разам з Таўцівілам вярнулі сабе Наваградак. Важна зазначыць, што ў гэтай вайне з Данілам Галіцкім жыхары гарадоў Чорнай Русі занялі бок Міндоўга, а гэта наўрад ці здарылася б пасля гвалтоўнага падпарадкавання Беларускага Панямоння літоўскім князем.

Хоць яшчэ ў 1260 г. Міндоўг падпісаў акт аб перадачы Літвы ў валоданне Ордэну ў выпадку сваёй беспатомнай смерці, ён неўзабаве пайшоў на разрыў з немцамі. Гэта адбылося пасля таго, як жамойты разам з латышамі і эстонцамі разграмілі прускіх і інфлянцкіх рыцараў каля возера Дурбе (1260). Здолеўшы аб'яднаць літоўскія землі і Беларускае Панямонне ды ўмацаваць свае пазіцыі, Міндоўг адрокся ад каталіцтва (біскуп Хрысціян быў прагнаны) і ўзняў на былых саюзнікаў зброю. Праз два гады супольна з сынамі ноўгарадскага князя Аляксандра Яраславіча ён ажыццявіў паход супраць немцаў. Разам з ноўгарадскім і цвярскім палкамі ва ўладанні Інфлянцкага ордэна выступілі аддзелы князёў Траняты (з Жамойці), Таўцівіла (з Полацка) і Аляксандра (з Віцебска). Аднак акцыя не дала значных вынікаў, бо дзеянні саюзнікаў былі нескаардынаваныя.

Панаванне Міндоўга стала першым этапам знішчэння племяннога ладу і стварэння новай структуры ўлады і ўласнасці ў Літве, а гэта не магло не выклікаць супраціву старой знаці. У 1263 г. у выніку змовы нальшчанскага князя Даўмонта, жамойцкага Траняты і полацкага князя Таўцівіла (некаторыя крыніцы называюць яшчэ Гердзеня) Міндоўг і два яго сыны былі забітыя (паводле Хронікі Літоўскай і Жамойцкай, Даўмонт адпомсціў Міндоўгу за тое, што той сілай забраў яго жонку). Абвясціўшы сябе ўладаром Літвы, Транята забіў і полацкага князя Таўцівіла, у якім бачыў канкурэнта, але неўзабаве сам загінуў ад Міндоўгавых конюхаў. Тады Міндоўгаў сын Войшалк, які хаваўся ў Пінску, прыйшоў з пінянамі ў Наваградак і абвясціў сябе яго князем. Пры дапамозе пінскіх і галіцка–валынскіх дружынаў ён у 1264 г. расправіўся з праціўнікамі ды сцвердзіў сваю ўладу і ў іншых бацькоўскіх уладаннях. Даўмонт мусіў уцякаць у Пскоў, дзе яго прынялі на княжанне.

Праваслаўны па веравызнанні князь Войшалк неўзабаве падпісаў цесны саюз з Галіцка–Валынскім княствам і стаў леннікам князя Васілька Данілавіча, а потым наогул перадаў свой пасад Шварну (Свараміру), які быў сынам галіцка–валынскага князя Данілы і зяцем Міндоўга, а сам вярнуўся ў манас-

тыр. Аднак у 1267 г. Войшалк быў забіты паводле загаду князя Льва Данілавіча. На ім род Міндоўга абарваўся.

У Полацку ў той час пасля князя Таўцівіла сядзеў Гердзень, які неўзабаве загінуў, абараняючы Полаччыну ад Даўмонта, а з 1265 г. летапісы згадваюць на полацкім стале Ізяслава. З'яўляючыся васаламі Войшалка, князі Гердзень ды Ізяслаў выступалі адначасова і ад Полацка, і ад Віцебска (у дамове Ізяслава з інфлянцкім магістрам і Рыгай 1265 г. гаворыцца: «Полацк і Віцебск адно ёсць»). Значыць, землі Беларускага Падзвіння былі ўжо пэўным чынам далучаныя да новай дзяржавы.

Унутранае жыццё ў княстве яшчэ доўга бударажылася барацьбой за трон. Пасля памерлага Шварна ўладаром стаў Трайдзень (1269—1282), потым панавалі Будзікід і Пукувер (1290—1294). Пры Трайдзені ў час войнаў гарады Чорнай Русі зноў маглі выбіраць паміж князем–паганцам і праваслаўнымі князямі галіцка–валынскімі. І зноў, як пры Міндоўгу, яны схіліліся на бок літоўскага князя. Уся Чорная Русь з гарадамі Навагрудак, Горадня, Ваўкавыск, Слонім і Турыйск засталася ў складзе дзяржавы Трайдзеня. Яго ўладу прызнавалі ўжо і яцвягі. Прусаў, якія ўцякалі ад тэўтонскіх рыцараў, князь сяліў каля Горадні і Слоніма. Затое Полацк і Віцебск адышлі ад дзяржавы Трайдзеня. Згодна з летапісамі, яны зноў мелі сваіх усходнеславянскіх князёў: у Полацку сядзеў Канстанцін Бязрукі, а ў Віцебску — спачатку наместнік смаленскага князя Фёдара Чорнага, а потым князь Міхаіл Канстанцінавіч з Рурыкавічаў.



*Наваградскі замак.*
*Рэканструкцыя Я. Куліка па даследаваннях М. Ткачова.*



З укняжаннем Трайдзеня абвастрыліся адносіны Літвы з галіцка–валынскімі князямі. Пасля яго нападу на Драгічын у 1274 г. Леў Данілавіч звярнуўся па дапамогу да хана Менгу–Цімура, які арганізаваў паход велізарнай кааліцыі на літоўскую дзяржаву. Разам з татарамі ды галіцка–валынскім войскам у паходзе мелі ўдзельнічаць князі турава–пінскія, бранскі і смаленскі. Аперацыя звялася да ўдару на Навагрудак, але скончылася безвынікова. Паходы татарска–галіцкай кааліцыі на Беларускае Панямонне паўтараліся таксама ў 1276 і 1277 г.



*Вялікі князь літоўскі Віцень (1295—1315).*

Пры князі Віцені (1295—1315) абвастрылася барацьба з Нямецкім ордэнам. Канчаткова падпарадкаваўшы прусаў, тэўтонскія рыцары з 1283 г. пачалі ўрывацца ў Панямонне і Жамойць. Ужо ў 1284 г. яны ўпершыню напалі на Горадню, захапілі і спалілі яе. Крыжаносцы ўрываліся ў Панямонне таксама ў 1295, 1311 (двойчы), 1314 г. і пазней, але найчасцей яны хадзілі на Жамойць. У тых умовах аб'яднанне беларускіх і літоўскіх земляў адпавядала супольным інтарэсам абароны. Невыпадкова, каб палепшыць адносіны з Валынню ды мабілізаваць сілы на барацьбу з Ордэнам, Будзікід у 1289 г. перадаў уладзімірскаму князю горад Ваўкавыск.

Калі ў 1270-х г. у Полацку і Віцебску, як ужо адзначалася, яшчэ сядзелі князі з дынастыі Рурыкавічаў, дык у канцы XIII ст. на полацкім стале зноў з'явіўся нейкі літоўскі князь (імя невядомае), які прыняў каталіцтва і, паміраючы бяздзетным, перадаў усю зямлю Рыжскаму арцыбіскупу. Згодна з найбольш пашыранай у беларускай гістарыяграфіі версіяй, заснаванай пераважна на паведамленнях Мацея Стрыйкоўскага, у 1305 г. у Полацку з'явілася шмат каталіцкага духавенства, немцаў–місіянераў, дзейнасць якіх выклікала супрацiў палачан, і тыя

папрасілі дапамогі ў князя Віценя, які ў 1307 г. вызваліў Полаччыну ад немцаў і далучыў яе да свайго княства. Тады ж на полацкі стол быў пасаджаны Віценеў брат — Воін. Праўдападобна, гэта гістарыяграфічная легенда, асновай для якой стаў рэальны факт непрацяглага ўсталявання немцаў у Полацку раней, яшчэ пры Таўцівілу.

Перыяд панавання Гедыміна (1316—1341), які стаў вярхоўным князем Літвы пасля смерці Віценя, быў часам імклівага тэрытарыяльнага росту дзяржавы і яе ўмацавання. У яе склад уключаліся галоўным чынам землі Беларусі. Калі на пачатку XIV ст. вяршэнства ўлады літоўскага князя прызнавалі з беларускіх зямель толькі Чорная Русь і Полаччына, дык да сярэдзіны стагоддзя ў такую залежнасць трапіла амаль уся тэрыторыя сучаснай Беларусі, за выняткам Падняпроўя, Пасожжа і раёнаў Ніжняй Прыпяці.

Адной з першых да Гедымінавай дзяржавы была далучана Віцебская зямля. У 1318 г. Альгерд Гедымінавіч ажаніўся з Марыяй — дачкой апошняга віцебскага князя Яраслава Васілевіча, і калі ў 1320 г. той памёр, княства засталося Альгерду.


*Вялікі князь Гедымін (1316—1341).*

Берасцейская зямля ўвайшла ў склад Літоўскай дзяржавы таксама ў пачатку княжання Гедыміна. Праўдападобна, жыхары Берасцейшчыны былі незадаволены залежнасцю ад валынскіх князёў, і Гедыміну давялося ваяваць не з насельніцтвам, а з гэтымі князямі. У 1315 г. Гедымін перамог у сутычцы з галіцка–валынскім князем і авалодаў Берасцейскай зямлёй. А праз дзесяць гадоў Любарт (Дзмітры) Гедымінавіч, ажаніўшыся з дачкой апошняга валынскага князя Льва Юр’евіча, атрымаў усю Валынь у спадчыннае валоданне.

Прыкладна ў сярэдзіне 1320-х г. уладу літоўскага князя прызналі і цэнтральныя землі Беларусі. Менскі князь Васіль у 1326 г. ужо ўваходзіў у лік паслоў Гедыміна, накіраваных у Ноўгарад Вялікі. Васаламі літоўскага манарха сталі таксама князь друцкі і лукамскі.



Наступным было далучана Палессе. У 1330-х г. у Пінскай зямлі ўжо сядзеў Нарымонт (Глеб) Гедымінавіч. Праўда, у Тураве і Гарадку яшчэ доўгі час заставаліся мясцовыя Рурыкавічы. Пісьмовыя крыніцы не падаюць ніякіх фактаў гвалтоўнага падпарадкавання ці барацьбы з мясцовымі князямі або насельніцтвам. Праўдападобна, што і Палессе было далучана добраахвотна.

Гедымін пашырыў свой уплыў таксама на Кіеў, Цвер і Вязьму. Яго «малодшым братам» стаў князь смаленскі. Адзін Гедымінаў стаўленік заняў княскі пасад у Пскове, іншы — пінскі князь Глеб Нарымонт — атрымаў у дзяржанне прыгарад Ноўгарада Вялікага Ладагу і Карэльскую зямлю. Ноўгарадскі ўрад даручыў яму як служыламу князю абарону сваіх межаў.

Аб’ядноўваючы ўсходнеславянскія землі пад сваёй уладай, Гедымін абыходзіўся, як правіла, без падаўлення і заваявання. Ён першым з літоўскіх князёў пачаў называць сябе валадаром не толькі ліцвінаў, але і русінаў (rex Letvinorum et Ruthenorum), а свае ўладанні — каралеўствам ліцвінаў і русінаў (regnum Letvinorum et Ruthenorum).

Трактуючы велізарную манархію як спадчыннае ўладанне роду (патрымоніум), Гедымін яшчэ пры жыцці параздаваў яе ўдзелы ў кіраванне сваім сынам: Вільню, якая з 1323 г. у дакументах фігуруе як сталіца княства, з блізкімі гарадамі — Ашмянаю, Браславам і Вількамірам — ён перадаў малодшаму Яўнуту (старэйшаму ад апошняга шлюбу), Кернаву і Слонім — сыну Манівіду, Пінск і Тураў — Нарымонту, Наваградак і Ваўкавыск — Карыяту, Валынь — Любарту, Крэва, Віцебск і Менск — Альгерду, Трокі, Берасце і Горадню — Кейстуту. Полаччына ж засталася ў кіраванні Гедымінавага брата Воіна, а потым перайшла да Нарымонта.

Землі Беларусі захавалі ў дзяржаве Гедыміна пэўную аўтаномію і сваю палітычную вагу. Прыкладам, Полацк па–ранейшаму самастойна падпісваў дамовы з Рыгай. Гандлёвае пагадненне беларуска–літоўскай дзяржавы з Ордэнам у 1338 г. было падпісана пры згодзе не толькі Гедымінавічаў і літоўскага баярства, але таксама полацкага епіскапа Рыгора, полацкага і віцебскага князёў ды саміх гарадоў Полацка і Віцебска.

Гедымінавы сыны, якія атрымалі ўдзелы ў Беларусі, былі аточаны мясцовым баярствам, прымалі ўсходнюю рэлігію ды мясцовую культуру. Карыят пасля хрышчэння ў праваслаўе стаў звацца Міхаілам, Любарт — Дзмітрыем, Нарымонт — Глебам, а Яўнут — Іванам. Хоць сам Гедымін заставаўся паганцам, ён паважаў рэлігію сваіх падданых. Яму належыць фармулёўка прынцыпаў талеранцыі, якія доўга вызначалі канфесійную палітыку літоўскіх князёў: «каб хрысціяне паважалі ды славілі Бога па–свойму, Русь — па–свойму, палякі — па–свойму, а мы славім па нашаму звычаю».

Стаўшы вялікім князем у тыя часы, калі даводзілася адбіваць амаль штогадовыя напады нямецкіх рыцараў, Гедымін пайшоў на важны дыпламатычны ход: у канцы 1322 г. ён звярнуўся з лістом да рымскага папы Іаана XXII, а ў наступным — да ганзейскіх гарадоў, каталіцкіх ордэнаў дамініканаў і францысканаў. Вялікі князь заклікаў перасяляцца ў яго землі рамеснікаў, земляробаў і купцоў з ганзейскіх гарадоў, абяцаючы ім ільготы і нямецкае (рыжскае) права ў гарадах Беларусі і Літвы, а таксама манахаў–францысканаў, якія ведаюць «польскую, земгальскую і рускую мову». Невядома, які эфект меў гэты зварот, але палітычнае становішча дзяржавы дзякуючы такой дыпламатыі часова палепшылася. У кастрычніку 1323 г. паміж Ордэнам і Гедымінам была падпісана віленская дамова аб замірэнні. Праўда, Ордэн не збіраўся доўга трымацца гэтага пагаднення.

У мэтах супольнай барацьбы супраць Тэўтонскага ордэна Гедымін пайшоў на збліжэнне з Польшчай. У 1325 г. іх саюз быў замацаваны шлюбам Казіміра, сына польскага караля Ўладыслава Лакетка (1320—1333), з Гедымінавай дачкой Альдонай–Ганнай. Найбольш значнай супольнай акцыяй саюзнікаў стаў паход іх злучаных сілаў на Брандэнбург у 1326 г., у якім вызначыўся «асабліва блізкі сябра» Гедыміна гарадзенскі стараста Давыд. Кіруючы Гарадзенскай зямлёй на правах лена, ён доўгі час паспяхова бараніў ад крыжаносцаў усё Беларускае Панямонне.

Асаблівых поспехаў Гедымін дамогся сваёй усходняй палітыкай, асноўным прынцыпам якой было негвалтоўнае далучэнне новых зямель Русі. За гады яго княжання ў склад ВКЛ увайшла не толькі асноўная частка тэрыторыі сучаснай Беларусі (за выключэннем раёнаў Ніжняй Прыпяці): у арбіту яго ўплываў пачалі ўцягвацца і князі з далёкіх зямель Усходняй Русі.



Адным з галоўных фактараў, які спрыяў поспеху ў іх «збіранні» вакол літоўскай дынастыі, стала антытатарская палітыка, якой паслядоўна трымаліся літоўскія князі. Да моцнага ВКЛ як альтэрнатывы ханскай уладзе хіліліся і заходнія землі Вялікарасіі, для элітаў якіх вялікаўладзімірскі князь быў фактычна стаўленікам Залатой Арды і ўвасабляў патрабаванні татарскага хана. Другім выйгрышным момантам палітыкі вялікага князя літоўскага была рэлігійная талеранцыя. Стараннямі Гедыміна для праваслаўных жыхароў ВКЛ у 1317 г. адкрылася асобная літоўская мітраполія з цэнтрам у Навагрудку, якая існавала прынамсі да 1330 г. У яе ўваходзілі Полацкая, Тураўская і Пінская епархіі, а мітрапалітам быў Феафіл.

Уплыў Гедыміна хутка пашырыўся далёка на поўдзень. Ужо ў 1324 г., выкарыстаўшы перамір'е з Нямецкім ордэнам, ён авалодаў Кіевам і пасадзіў там свайго брата Фёдара. У залежнасць ад Гедыміна трапіў і Смаленск. Вядома, што смаленскі князь уваходзіў у лік трох яго пасланцоў, якія ў 1326 г. былі ў Ноўгарадзе, дзе заключылі мір з Ноўгарадскай рэспублікай і Нямецкім ордэнам. Сваю залежнасць ад Гедыміна князь Іван Аляксандравіч смаленскі засведчыў і ў дакуменце 1340 г.

Даўнія кантакты звязвалі ВКЛ з Цвярскім княствам — на пачатак XIV ст. бадай самым моцным на Паўночна–Ўсходняй Русі. Канкуруючы з суседняй Масквой, Цвер сама разлічвала на першую ролю ў «збіранні» спадчыны Рурыкавічаў. Узвышэнне Масквы пужала цвярскіх князёў, і яны імкнуліся да ўмацавання саюзу з ВКЛ. Першым фактам непасрэднай сувязі паміж Вільняй і Цверру стала выдача Гедымінавай дачкі Марыі за цвярскога князя Дзмітрыя Міхайлавіча зімою 1320/21 г. Ужо праз год зяць Гедыміна, атрымаўшы ханскі ярлык на вялікае княжэнне, узначаліў «рускі улус» Залатой Арды. Потым ярлык атрымаў яго брат Аляксандр. Хан Узбек тады быў зацікаўлены ў мірных адносінах з ВКЛ, бо хацеў устрымаць гэтую моцную дзяржаву ад уключэння ў антытатарскую кааліцыю хрысціянскіх манархаў Усходняй Еўропы. Менавіта цвярскім князям, якія мелі даўнія і найбольш шчыльныя сувязі з Літвой, ён адводзіў важную ролю ў ажыццяўленні сваіх планаў.

З княжання Івана Каліты (1325—1340) стала хутка ўзрастаць і моц Масквы. Князь Іван Данілавіч імкнуўся захоўваць добрыя адносіны як з Ардой, ад якой Маскоўскае княства непасрэдна

залежала, так і з ВКЛ. Вытрымліваючы такую палітыку, зімой 1333/34 г. ён ажаніў свайго сына Сямёна з Гедымінавай дачкой Аўгустай (пасля хрышчэння Анастасіяй). Аднак у 1335 г. Гедымін сам парушыў мір і паслаў войска на Таржок, у адказ на што вялікі князь маскоўскі спаліў залежныя ад ВКЛ гарадкі Смаленскай зямлі — Осечань, Расну і інш. Так, прыкрытая ваенным патэнцыялам саюзнай татарскай Арды, Масква фактычна ўпершыню адкрыта выступіла супраць ваеннага мерапрыемства ВКЛ. Першы канфлікт быў вычарпаны дробнымі памежнымі сутычкамі і не перарос у вайну, аднак з 1330-х г. Маскоўскае княства стала ўмацоўвацца дзякуючы новай палітыцы Залатой Арды: хан Узбек паставіў на мэце ўмацаванне Масквы як супрацьвагі на шляху ўзрасталай літоўскай экспансіі. З гэтага яшчэ больш выразна акрэсліўся саюз Вільні і Цверы.

Паўночныя рэспублікі Русі Пскоў і Ноўгарад Вялікі, імкнучыся захаваць незалежнасць ад цвярскога, а потым і ад маскоўскага князя, часам самі звярталіся па дапамогу да літоўскіх князёў. Іх сувязі з ВКЛ былі даўнія. Напрыклад, у 1266 г. князем Пскова па дамоўленасці стаў Даўмонт, а ў часы Гедыміна падобную ролю для Пскова выконваў Давыд Гарадзенскі. Потым у Пскове цягам 10 гадоў «з литовской руки» княжыў Аляксандр Міхайлавіч Цвярскі. І пазней адносіны з Псковам складваліся карысна для Вільні. У 1341 г. Гедымінавы сыны Альгерд і Кейстут вадзілі войска на дапамогу пскавічам у барацьбе з інфлянцкімі рыцарамі. У паходзе ўдзельнічаў і полацкі полк на чале з Любкам Воінавічам, які загінуў у сутычцы з немцамі. За гэтую дапамогу пскавічы прапанавалі Альгерду стаць іх князем, але той пакінуў у Пскове свайго старэйшага сына Андрэя. Праз некалькі гадоў Андрэй вярнуўся з Пскова і стаў князем полацкім (1345). А ў Ноўгарадзе Вялікім на «кармленні» сядзеў Гедымінаў сын пінскі князь Глеб–Нарымонт, які атрымаў у дзяржанне Ладагу, Арэшак, Карэлу і Капор'е. Яму як служыламу князю наўгародцы даручылі абарону сваіх межаў. У сярэдзіне XIV ст. Ноўгарадская зямля выплочвала Вялікаму Княству даніну ў футрах, прадуктах і рознай сыравіне, а ў яе холмскім, вялікалуцкім і ржэўскім паветах валасці мелі падвойную дзяржаўную прыналежнасць.



Поспехі ўсходняй палітыкі Гедыміна выклікалі сур'ёзны непакой Залатой Арды, якая ў 1339/40 г. пачала вайну супраць ВКЛ. Хан Узбек прыступіў да ажыццяўлення праграмы маскоўска–татарскага націску на Вялікае Княства Літоўскае. У той жа год разам з татарамі супраць Смаленска выправілі войска амаль усе княствы Ўсходняй Русі.

Пры Гедыміне з ростам яго дзяржавы набыла асаблівую актуальнасць праблема хрышчэння літоўцаў. Яшчэ пад час абвастрэння канфлікту з крыжаносцамі, калі рымскі папа і Нямецкі ордэн пачалі блакаваць Літву, не дазваляючы іншым хрысціянскім краінам гандляваць з паганымі, у 1323 г. Гедымін дэклараваў папскаму легату гатовасць прыняць рымскае хрысціянства. На той час каталіцкія храмы ў дзяржаве ўжо існавалі — два ў Вільні і адзін у Наваградку (тут касцёл францішканаў быў адкрыты яшчэ пры Віцені). Манахі, якія прыходзілі на запрашэнне вялікага князя літоўскага (а імі пераважна былі немцы), асядалі і на беларускіх землях ды займаліся місіянерствам. Аднак пагадненне з Рымам выклікала хваляванні як у Жамойці, так і на Беларусі. Прыняцце лацінскай веры прывяло б да канфлікту з праваслаўнай большасцю ВКЛ, гэтаксама як хрышчэнне ў праваслаўе азначала б страту Жамойці і паглыбленне канфлікту з Ордэнам. У кожным разе парушалася б раўнавага двух народаў дзяржавы. Таму сам Гедымін адмовіўся ад абяцанага хросту. Па іншых звестках, у 1340 г. ён, праўдападобна, прыняў хрысціянства і рыхтаваў хрышчэнне ўсёй Літвы, але менавіта з гэтай прычыны, калі верыць чэшскай хроніцы Бенеша Вайтмільскага, быў атручаны сваімі ж набліжанымі.

Гедымін пакінуў на карце Ўсходняй Еўропы вялікую дзяржаву. Заснаваная ў сярэдзіне XIII ст. літоўскім князем Міндоўгам, праз стагоддзе яна ўключала ў сябе і большую частку сучаснай тэрыторыі Беларусі. Манархія Гедыміна склалася з трох асобных палітычна–этнічных тэрытарыяльных утварэнняў — Аўкштоты, Жамойці і Беларусі. У яе дзяржаватворчым працэсе ад самага пачатку вялікая роля належала ўсходнеславянскаму элементу. Як адзначалася вышэй, Чорная Русь стала адной з тэрытарыяльных асноў манархіі Міндоўга. Беларусы (русіны) уваходзілі ў склад вайсковых сілаў ужо першых літоўскіх князёў. Вядома, што Войшалк, які першым з іх цалкам пераняў «рускую» культуру, абапіраўся на беларускія

гарады і дружыны. Дзяволтва і Нальшчаны, якія не прызналі ўлады Міндоўга, падпарадкоўваліся менавіта іх сілай. Лучнікі з беларускіх зямель былі і ў войску Трайдзеня.

Крыніцы амаль нічога не паведамляюць пра канкрэтныя шляхі ўключэння зямель Беларусі ў Вялікае Княства Літоўскае. Праўдападобна, асноватворным пачаткам манархіі літоўскіх князёў, што ўтваралася як двуэтнічная балта–славянская, або, калі карыстацца сучаснымі азначэннямі, літоўска–беларуская дзяржава, быў узаемавыгадны саюз літоўскіх князёў з беларускім баярствам і гарадамі. Вядома, што полацкія, а потым і валынскія ды смаленскія баяры ішлі на гэты саюз на падставе традыцыйнай для ўсходнеславянскіх зямель формы «ряда» — дамовы, якая пакідала ім унутраную аўтаномію і старую структуру мясцовай улады. Прыкладам, Транята пасадзіў свайго князя ў Полацку па «ряду» з палачанамі, і ў яго баярскую думу ўваходзілі полацкія баяры–думцы. Прадстаўнікі мясцовай грамадскай эліты і пасля прызнання вярхоўнай улады літоўскага князя ўдзельнічалі ў вырашэнні важных пытанняў палітычнага і гаспадарчага жыцця сваёй зямлі. Таму больш блізкай да гістарычнай праўды падаецца пазіцыя такіх гісторыкаў, як Мацвей Любаўскі, Іван Лапа, Фёдар Леантовіч, Аляксандр Праснякоў і інш., якія неаднакроць падкрэслівалі, што Вялікае Княства Літоўскае як дзяржаву ніяк не выпадае лічыць прадуктам заваявання Русі літоўцамі. Да падобных высноў прыйшлі і сучасныя беларускія даследчыкі праблемы Вячаслаў Насевіч і Аляксандр Краўцэвіч. Сіла тут у кожным разе выконвала далёка не галоўную ролю. Сапраўды, новая дзяржава ўяўляла з сябе своеасаблівую форму грамадска–палітычнага сінтэзу, у якім раннефеадальныя інстытуты Літвы спалучаліся з больш развітай дзяржаўна–палітычнай сістэмай былых княстваў на тэрыторыі Беларусі (і перадусім Полацкага), наследуючы традыцыю дзяржаўнасці Кіеўскай Русі. Іншымі словамі, палітычная экспансія Літвы на ўсход прывяла да канструктыўнага ўтварэння фактычна літоўска–беларускай дзяржавы, у якой пры палітычнай дамінацыі літоўцаў значэнне тэрытарыяльнага, дэмаграфічнага і грамадска–культурнага патэнцыялу Беларусі яшчэ некалькі стагоддзяў узрастала.Як у свой час канстатаваў ужо згаданы расійскі гісторык Аляксандр Праснякоў, Вялікае Княства Літоўскае ўтваралася літоўцамі, «аднак на тэрытарыяльнай, этнаграфічнай і культурнай аснове беларускай».



## III.2. Палітыка Альгерда і Ягайла

Пасля смерці Гедыміна ў Вільні застаўся яго наймаладзейшы сын Яўнут, якому бацька перадаў вялікае княжанне. Але тое, што віленскі пасад заняў не старэйшы з Гедымінавічаў, выклікала разлад сярод братоў. Ускладнілася і знешнепалітычнае становішча дзяржавы. Крыжаносцы, памірыўшыся з польскім каралём Казімірам Вялікім, увайшлі ў Жамойць, замацаваліся ў нізоўях Нёмана ды ўзмацнілі націск на паганую Літву, ужо «падараваную» ім граматай імператара Людовіка Баварскага 1337 г. У імператарскай грамаце як складовая частка Літвы называлася і Русь.



*Вялікі князь Альгерд (1345—1377).*

На пачатку 1345 г. браты Альгерд і Кейстут, змовіўшыся, ажыццявілі дзяржаўны пераварот. Кейстут захапіў Вільню і абвясціў уладаром Альгерда, самага старэйшага з Гедымінавічаў, які меў вотчынныя ўладанні на тэрыторыі Беларусі — Віцебск і Крэва. Прагнаны Яўнут уцёк у Маскву, дзе прыняў праваслаўны хрост, але праз два гады вярнуўся, памірыўся з братамі і атрымаў ва ўладанне горад Ізяслаўль (цяперашняе Заслаўе пад Менскам). Таксама хуткім было вяртанне Нарымонта, які пасля перавароту Кейстута апынуўся ў Ардзе.

Звяржэннем Яўнута пачаўся перыяд дыярхіі — панавання двух, Альгерда і Кейстута. Браты раздзялілі тэрыторыю дзяржавы на дзве часткі прыкладна па лініі Горадня—Трокі — і далей да Інфлянтаў. Кейстут атрымаў у валоданне заходнюю палову — Жамойць, Трокі, Горадню, Падляшша з Бельскам і Берасцейскую зямлю, а Альгерд — усе ўсходнія землі. Першы меў сталіцай Трокі і займаўся заходняй палітыкай, найперш — барацьбой з Нямецкім ордэнам, а другому належала Вільня і ягонай справай былі дачыненні з Масквой, Ноўгарадам, Псковам ды татарамі.

Галоўная небяспека па–ранейшаму зыходзіла ад Нямецкага ордэна. Хоць Альгерд і Кейстут для барацьбы з імі нярэдка

аб’ядноўвалі сілы, стрымаць паходы рыцараў не ўдавалася. Ад немцаў шмат цярпелі і заходнія землі Беларусі. Зімою 1348 г. у вялікай бітве каля ракі Стрэва, прытоку Нёмана, крыжаносцы разграмілі аб’яднанае войска Альгерда і Кейстута, у складзе якога былі дружыны з беларускіх гарадоў, у прыватнасці — з Берасця, Віцебска, Полацка і Смаленска. Пад час паходу 1363 г. тэўтонскія рыцары захапілі Горадню, спалілі Камянец і спустошылі іх наваколлі. У 1370-х інфлянцкія рыцары ўрываліся на Полаччыну. У адказ Кейстут вадзіў войска на тэрыторыю ордэнскіх уладанняў. Ад 1343 да 1382 г. адбылося каля 30 уварванняў яго аддзелаў у Прусію. Як сведчаць нямецкія хронікі, у гэтых паходах актыўна ўдзельнічалі і «рутэны» — жыхары заходнебеларускіх земляў. У 1375 г. разам з Кейстутам у Інфлянты вадзіў дружыны полацкі князь Андрэй Альгердавіч.


*Рыцары Нямецкага ордэна. XIV ст.*

Складанымі заставаліся дачыненні і з Польшчай. На працягу 1340—1350-х г. паміж польскім каралём Казімірам, з аднаго боку, ды Альгердам і Кейстутам, з другога, вялася ўпартая барацьба за Валынь і Падляшша. Толькі ў 1366 г., паводле дамовы, падпісанай Казімірам з усімі князямі літоўскімі, Берасце было канчаткова прызнана тэрыторыяй Гедымінавічаў. У 1377 г. пагадненне Альгерда з польскім каралём Людовікам Венгерскім пацвердзіла, што Валынь і Берасцейская зямля належаць Вялікаму Княству, а Галіччына з далучанымі Холмскім і Белзскім удзелам — Польшчы.

Як і пры Гедыміне, надзвычай поспяховай была ўсходняя палітыка, якой займаўся Альгерд. Выступіўшы з антытатарскай праграмай збірання земляў Русі, ён здолеў хутка распаўсюдзіць свой уплыў ажно да ўладанняў Масквы і да нізоўяў Дняпра. З беларускіх земляў ужо ў канцы 1340—1350-х г. Альгерду падпарадкаваліся Бабруйск, Рэчыца, Чачэрск і Прапойск. У 1358 г. быў падначалены Мсціслаў — цэнтр удзельнага княства, які Альгерд аддаў свайму сыну Лугвену (Сымону), родапачынальніку мсціслаўскіх князёў Лугвенавічаў. Пра тое, калі



і як быў падпарадкаваны Гомель, крыніцы не паведамляюць нічога. Потым пад Альгердаву ўладу трапілі Бранск і Тарапец, прычым першы літоўскаму князю перадало само бранскае баярства. Яшчэ праз два гады Альгерд пасадзіў свайго сына Ўладзіміра намеснікам у Кіеў. Верхавенства літоўскага князя прызналі таксама гарады Севершчыны і Чарнігаўшчыны. На поўдні Гедымінавіч дамогся самых большых набыткаў. Увосень 1362 г. у бітве каля Сініх Вод, што на Падоллі, ён разграміў войска трох татарскіх ордаў — Крымскай, Перакопскай і Ямбалукскай — ды выйшаў да нізоўяў Днястра і парогаў Дняпра. Гэтая перамога паклала пачатак вызваленню ўсходнеславянскіх земляў ад ардынскага панавання.


*Воіны ВКЛ. XIV — пачатак XV ст.*

Паслядоўным было і замацаванне ўплыву ва ўсходнім напрамку, у прыватнасці, на Смаленск, з князем якога Іванам Альгерд падтрымліваў добрыя адносіны. У 1341 г. ён дапамог смаленскаму князю ў канфлікце з Масквою, які разгарэўся з–за Мажайска, а ў 1352 дыпламатычным шляхам прадухіліў уварванне маскоўскага войска ў Смаленскую зямлю. Пра далейшую залежнасць Смаленска сведчыў удзел смаленскіх палкоў на баку Альгерда ў бітве на Стрэве (1348), а пазней прысутнасць невядомага смаленскага князя ў складзе войск ВКЛ у паходзе на Ордэн (1352), потым удзел Святаслава Іванавіча Смаленскага ў паходах Альгерда на Маскву. Праўда, непасрэдна падпарадкаваць Смаленск Альгерду так і не ўдалося.

Пры Альгердзе дайшло да першых сур’ёзных канфліктаў з Масквой, якая выступіла з уласнай праграмай збірання спадчыны Рурыкавічаў. Спачатку Альгерд зблізіўся з маскоўскім князем Сямёнам Гордым, падпісаўшы ў 1349 г. з ім пагадненне, але яшчэ больш умацаваў саюз з Цверру, ажаніўшыся з дачкой цвярскога князя Міхаіла Аляксандравіча Ўлляная. Канкураваўшае з Масквой Цвярское княства займела цяпер у асобе Альгерда магутнага апекуна, з чаго і пачаліся канфлікты. Калі ў 1368 г. цвярскі князь Міхаіл Аляксандравіч, на землі якога напала войска маскоўскага

князя Дзмітрыя Іванавіча, папрасіў заступніцтва ў Альгерда, той сабраў войска і з Віцебска рушыў на Маскву. Ён аблажыў Крэмль, аднак не змог здабыць абнесенай магутнымі мурамі цвердзі і праз тры дні адышоў. Маскоўскае войска ў адказ напала на Смаленск і Цвер. У 1370 і 1372 г. паходы на Маскву па просьбе цвярскога князя паўтараліся, але да вызначальнай бітвы справа не даходзіла. Канфлікт быў залагоджаны мірным пагадненнем. Пад канец княжання Альгерда цвярскі князь Міхаіл Аляксандравіч не вытрымаў ваеннага націску суседа і, не дачакаўшыся дапамогі з Вялікага Княства, пасля паражэння паддаўся князю Дзмітрыю Іванавічу. Так Цвер канчаткова падпала пад кантроль Масквы.

Далучэнне новых усходнеславянскіх земляў пры Альгердзе істотна павялічыла вагу «рускага» (усходнеславянскага) элемента ў дзяржаве літоўскіх князёў. Менавіта пры ім «руская» мова набыла ролю афіцыйнай, дзяржаўнай, а працэс рутэнізацыі ахапіў і прыдворнае жыццё. Гэта было абумоўлена культурнай перавагай русінаў. Праваслаўныя святары і манахі з'яўляліся тымі нешматлікімі падданымі літоўскага князя, якія ўмелі чытаць і пісаць. Сярод нашчадкаў самога Альгерда праваслаўных было намнога больш, чым паганцаў — прынамсі ўсе дзеці ад яго першай жонкі Марыі Віцебскай і большасць ад другой, Ульяны Цвярской. Ёсць звесткі, што Альгерд і сам быў ахрышчаны ў праваслаўе, меў хрысціянскае імя Андрэй. У летапісах, напрыклад, паведамляецца, што калі ў 1341 г. пскавічы прапанавалі яму стаць іхнім князем і ахрысціцца, ён адказаў, што ўжо ахрышчаны. Як зазначыў пра Альгерда гісторык Ігнацы Крашэўскі, «мова, звычаі, вера, правa Русі не былі яму чужыя». Вядома пра прыязнае стаўленне князя да праваслаўных. У Віцебску яго стараннямі для іх быў узведзены храм Святога Духа і адрамантавана старая Дабравешчанская царква.

Каб нейтралізаваць царкоўна–палітычны ўплыў Масквы на праваслаўнае жыхарства дзяржавы, Альгерд дамагаўся ўтварэння асобнай літоўска–рускай мітраполіі. Ён паслаў прапанаванага епіскапамі кандыдата ў мітрапаліты манаха Фёдара не ў Канстанцінопаль, а да балгарскага патрыярха ў Тырнову. Не прызнаны канстанцінопальскім патрыярхам руска–літоўскі мітрапаліт рэзідаваў у Наваградку і Кіеве. Калі ж яго епархіі апынуліся ў юрысдыкцыі маскоўска–ўладзімірскага мітрапаліта Аляксея, Альгерд у 1354 г. выслаў у Канстанцінопаль свайго кандыдата Рамана, які і атрымаў сакру. Яго катэдра знаходзілася ў Наваградку, а з 1358 г. — у Кіеве. На тэрыторыі Беларусі мітрапаліту Раману падпарадкоўваліся Полацкая, Смаленская і Тураўская епархіі. Паміж Раманам і Аляксеем вялася ўпартая барацьба за панаванне на ўсёй Русі, пакуль руска–літоўскі мітрапаліт не памёр (1362).



Пасля смерці Альгерда ў 1377 г. у дзяржаве зноў пачаліся ўнутраныя разлады і міжусобіцы. Віленскі пасад атрымаў Ягайла, сын Альгерда ад яго другой жонкі цвярской княгіні Ўльяны. З гэтым не пагадзіліся старэйшыя Альгердавічы, дзеці ад віцебскай княжны Марыі. Відаць, Ягайла і сам імкнуўся пазбавіцца галоўнага канкурэнта — полацкага князя Андрэя — або падпарадкаваць яго ўладанні. Ужо ў 1377 г. разам з Кейстутам ён паспрабаваў сілай авалодаць Полацкам. Адбіцца ад іх войска палачанам дапамаглі інфлянцкія рыцары. Аднак і Андрэй пасля гэтага не застаўся ў Полацку: зімою таго ж года ён з дружынай і сынамі ўцёк у Пскоў, дзе быў прыняты на княжанне, а потым апынуўся ў Маскве. Праз год ён удзельнічаў у першай пераможнай бітве маскоўскага войска з татарамі на рацэ Вожа, а яшчэ праз год разам з маскоўскай рацццю прыйшоў ваяваць Севершчыну. Тады ж на бок Масквы перайшоў Дзмітры Альгердавіч (Бранскі), які валодаў Бранскам і Трубчэўскам. Удзельныя князі Валыні і Падолля адчувалі сябе практычна незалежнымі. Усё гэта пагражала распадам тэрытарыяльнай цэласці дзяржавы.


*Вялікі князь Кейстут (1345—1382).*

Магчыма, гэта агрэсіўная палітыка Масквы, у прыватнасці, захоп северскіх гарадоў, падштурхнула Ягайлу да саюзу з ханам Мамаем. У 1380 г. Ягайла павёў войска на злучэнне з сіламі Залатой Арды для супольных дзеянняў супраць маскоўскага князя Дзмітрыя

Іванавіча, аднак у вырашальны момант ён не далучыўся да Мамая, і татары былі разгромлены на Куліковым полі. На баку Маскоўскай Русі ў бітве ўдзельнічалі Ягайлавы браты — Андрэй Полацкі, Дзмітры Альгердавіч а таксама Дзмітры Баброк, якія, камандуючы палкамі правай і левай рукі, шмат зрабілі для дасягнення гістарычнай перамогі. Ухіленне Ягайлы ў апошні момант ад бітвы, верагодна, не ў апошнюю чаргу было абумоўлена настроямі яго войска, складзенага пераважна з жыхароў Беларусі.



*Ягайла, вялікі князь літоўскі (1377—1392) і кароль польскі (1386—1434).*

У 1381 г., каб адпомсціць Андрэю Альгердавічу, Ягайла перадаў Полацк свайму брату Скіргайлу, аднак палачане не прынялі нежаданага князя–паганца ды, абняславіўшы, прагналі яго з горада. Пазней Скіргайла прыйшоў здабываць Полацк з войскам, атрымаўшы для гэтага ў дапамогу аддзел інфлянцкіх рыцараў. Тры месяцы ён трымаў горад у аблозе. Палачане папрасілі падтрымкі ў Ноўгарада, аднак ніякай рэальнай дапамогі не атрымалі і адбіваліся самастойна. Так і не авалодаўшы Полацкам, Скіргайла неўзабаве адышоў ад горада, бо мусіў спяшацца ў Вільню, каб ратаваць Ягайлу.

На той час супярэчнасці паміж Ягайлам і Кейстутам дасягнулі крытычнага моманту. Калі Кейстут па–ранейшаму ўсе сілы накіроўваў на барацьбу з нямецкімі рыцарамі, дык ягоны пляменнік пайшоў на збліжэнне з імі. У 1380 г. ён падпісаў пагадненні і з Тэўтонскім, і з Інфлянцкім ордэнам, паабяцаўшы ў выпадку вайны з рыцарамі не падтрымліваць Кейстута. Даведаўшыся пра гэта, Кейстут у 1381 г. заняў Вільню і, заняволіўшы Ягайлу з маці, захапіў вярхоўную ўладу. Пасля прысягі, дадзенай Кейстуту — «николи противу его не стояти и завжды в его воли быти», — Ягайла быў пакінуты на волі.

Аднак калі на Севершчыне супраць Кейстута выступіў Ягайлаў брат Дзмітры Карыбут і стары князь рушыў туды, мяшчане Вільні, узначаленыя рыжскім немцам Ганулем, ажыццявілі пераварот, і сталіца апынулася ў руках Ягайлы. Пры ўдзеле тэўтонскіх рыцараў былі заняты і Трокі. Кейстут паспяшаўся ў свае ўладанні. Неўзабаве каля Трокаў зграмадзіліся гатовыя да бітвы войскі Кейстута ды яго сына Вітаўта, з аднаго боку, і Ягайлы, якога падтрымлівалі нямецкія рыцары, з другога. Сечу прадухіліла прапанова Ягайлы падпісаць замірэнне. Аднак пасля таго, як войска было распушчана, у Вільні Кейстута і Вітаўта арыштавалі. Праз некаторы час пераведзенага ў Крэўскі замак Кейстута задушылі падасланыя Ягайлам найміты, а сын ягоны здолеў уцячы ў Прусію да нямецкіх рыцараў.



Князя Ягайлу, які захапіў вярхоўную ўладу, не прызнаваў ні Андрэй Полацкі, ні Дзмітры Бранскі, ні ягоны галоўны супернік Вітаўт Кейстутавіч. Каб умацавацца на віленскім пасадзе, Ягайла наблізіў да сябе Скіргайлу і аддаў яму Кейстутаў удзел — Троцкае княства. На нейкі час у дзяржаве зноў усталявалася дыярхічная форма княжання. Аднак становішча Ягайлы як вярхоўнага ўладара заставалася складаным.

З Прусіі з сіламі нямецкіх рыцараў у Літву пачаў урывацца Вітаўт. У 1383 г. ён ужо захапіў Трокі, трымаў у аблозе Вільню. Каб пазбавіць Ордэн свайго небяспечнага суперніка, Ягайла пайшоў на таемныя перамовы з Вітаўтам. Апошні згадзіўся прызнаць Ягайлу вярхоўным уладаром пры ўмове, што той верне яму бацькавы ўладанні, і ў 1384 г. вярнуўся з Прусіі ў свае землі. Аднак, атрымаўшы толькі Берасцейшчыну і Гарадзеншчыну (гарады Бельск, Берасце, Драгічын, Горадня, Камянец, Сураж, Ваўкавыск), Вітаўт застаўся незадаволены. Ён дамагаўся ўсіх зямель Троцкага княства, але ў Троках сядзеў Скіргайла. Каб вызваліць Трокі для Вітаўта, Ягайла вырашыў перавесці брата ў Полацк, але з гэтым не мог змірыцца законны ўладальнік Полаччыны Андрэй Альгердавіч. Так што ўнутрыпалітычнае становішча ў дзяржаве было надзвычай складанае, і Ягайла мусіў шукаць выйсце.

## III.3. Крэўская унія

Каб пераадолець унутраны палітычны крызіс, Ягайла шукаў апоры ў саюзе з суседнімі дзяржавамі. Дзякуючы такой палітыцы ў сярэдзіне 1380-х г. вызначылася збліжэнне Вялікага Княства

Літоўскага з Маскоўскай дзяржавай. Дзмітры Іванавіч Данскі ўсталяваў непасрэдныя адносіны з Ягайлам і ў 1383—84 г. Масква і Вільня перайшлі ад канфрантацы да палітычнага супрацоўніцтва. Са свайго боку Ягайла праз сваю маці Ўлляну — дачку цвярскога князя Аляксандра Міхайлавіча — пачаў перамовы з Масквой і дасягнуў папярэдняе дамоўленасці аб збліжэнні з вялікім князем Дзмітрыем Іванавічам. У 1384 г. паміж апошнім і Ўллянай Аляксандраўнай было падпісана адпаведнае пагадненне. Прадугледжвалася, што Ягайла ажэніцца з дачкой маскоўскага князя Соф'яй, прыме праваслаўе і ахрысціць сваіх суайчыннікаў. Вялікая частка арыстакратыі Вялікага Княства Літоўскага ставілася прыхільна да такога саюзу з Масквой. Аднак падобная перспектыва ўмацавала б становішча русінаў — беларуска–ўкраінскай большасці насельніцтва дзяржавы, што паскорыла б асіміляцыю літоўцаў. Акрамя таго, хрысціянства ўсходняга абраду не спыніла б агрэсіі нямецкіх рыцараў, для якіх праваслаўе было ерассю. Існуюць меркаванні, што віленска–маскоўскаму збліжэнню перашкодзілі Ордэн і Арда. У кожным разе, Ягайла ўрэшце адмовіўся ад збліжэння з Масквой і аддаў перавагу блоку з Польшчай, ідэю якога абараняў блізкі да яго рыжскі немец Гануль.

Літоўска–польскі саюз у той сітуацыі больш адпавядаў інтарэсам Ягайлы і кракаўскага двара. Ён дазваляў аб'яднаць сілы супраць агульнага ворага — Нямецкага ордэна. Для літоўцаў, якія складалі тады прыкладна пятую частку насельніцтва Ягайлавай дзяржавы, саюз з палякамі і хрысціянства заходняга абраду давалі магчымасць захаваць палітычную дамінацыю ды ўберагчыся ад далейшай рутэнізацыі. Малапольскія паны, роля якіх у ажыццяўленні уніі была асабліва вялікая, імкнуліся атрымаць землі Валыні ды Падолля, пазбавіцца нявыгаднага саюзу з Венгрыяй.

У 1385 г. пасля перамоваў з Кракава прыехалі ўпаўнаважаныя паслы Польскай Кароны. 14 жніўня 1385 г. у Крэўскім замку (цяпер вёска Крэва ў Смаргонскім раёне Беларусі) паміж імі, з аднаго боку, і Ягайлам ды яго братамі Скіргайлам, Карыбутам, Вітаўтам і Лугвенам, з другога, адбылося падпісанне акта пра аб'яднанне дзяржаў. Ягайлу кракаўскія паслы афіцыйна запрашалі заняць польскі каралеўскі пасад і ажаніцца з дванаццацігадовай каралевай Ядзвігай. Ад яго ж патрабавалася выканаць некаторыя ўмовы, у прыватнасці, прыняць каталіцтва і перавесці ў гэтую веру сваіх



яшчэ не ахрышчаных братоў, сваякоў і суайчыннікаў, вызваліць палонных хрысціян, галоўным чынам палякаў, коштам уласных сродкаў вярнуць землі, страчаныя Літвой і Польшчай, і нарэшце, што мела асаблівае значэнне, «назаўсёды далучыць (applicare) свае Літоўскія і Рускія землі да каралеўства Польскага».

Падпісаная ў Крэве унія была канчаткова зацверджана ў лютым 1386 г., пасля хрышчэння Ягайлы, яго шлюбу з Ядзвігай і ўрачыстай каранацыі ў Кракаве. Ягайла пачаў афіцыйна тытулавацца «каралём Польшчы, вярхоўным князем літоўскім і дзедзічам рускім». З юрыдычнага боку крэўскі акт фактычна азначаў інкарпарацыю Літоўска–Рускай дзяржавы ў склад Польскай Кароны. Аднак на практыцы ажыццявіць прынятае рашэнне было



*Крэўскі замак.*
*Рэканструкцыя Я. Куліка па матэрыялах М. Ткачова.*

немагчыма. Дзяржава Гедымінавічаў па–ранейшаму існавала як асобны грамадска–палітычны арганізм. Дзякуючы актыўнасці тых грамадскіх сілаў, што былі незадаволеныя прапанаванай польскім бокам формай уніі, інкарпарацыя стала толькі кароткачасовым эпізодам чыста юрыдычнай гісторыі.

Яшчэ пакуль Ягайла быў у Кракаве, на Беларусі супраць яго выступіў полацкі ўдзельны князь Андрэй Альгердавіч, які заявіў, што, прыняўшы лацінства, той не можа быць уладаром Літвы і Русі.

Каб захаваць за сабою Полацк, ён звярнуўся па падтрымку да Ордэна. Пасля адпаведных перагавораў 10 кастрычніка 1385 г. Андрэй Альгердавіч падпісаў з Робінам фон Эльцам акт аб перадачы «Полацкага каралеўства» на вечнае валоданне інфлянцкаму магістру



*Акт Крэўскай уніі 1385 г.*
*З архіва Кракаўскай капітулы.*

за гарантыю апекі Ордэна над ім і яго наступнікамі, а сам атрымліваў Полацкую зямлю ў якасці лена з рук магістра. Услед за гэтым ён падпісаў другі акт, у якім інфармаваў вялікага магістра пра заключанае з інфлянцкім лідэрам пагадненне. Атрымаўшы гарантыі падтрымкі ад Ордэна, полацкі князь узяўся дзейнічаць супраць Ягайлы і ў пачатку 1386 г. разам са Святаславам Смаленскім распачаў ваенную акцыю на Віцебшчыне, а потым і пад Мсціславам. Інфлянцкі магістр рушыў на злучэнне з імі і каля трох тыдняў ваяваў землі ВКЛ, дайшоўшы да Ашмяны, але пасля гэтага з палонам вярнуўся ў свае межы, пакінуўшы саюзнікаў. Смаленская раць дзейнічала ў Падняпроўі, але Орша і Мсціслаў адбіваліся. Высланае Ягайлам войска, узначаленае Скіргайлам,



Карыбутам, Лугвенам і Вітаўтам, заспела смаленцаў пад Мсціславам і ў красавіку 1386 г. разграміла іх у бітве на рацэ Віхра. Смаленскі князь Святаслаў загінуў, а яго сын Юры стаў даннікам літоўскіх князёў. Полацк, у якім закрыўся Андрэй Альгердавіч, яшчэ доўга і ўпарта бараніўся. Але вясною 1387 г. Скіргайла авалодаў горадам, захапіў Андрэя і адаслаў яго ў Кракаў да Ягайлы. Тры гады зняволены полацкі князь мусіў правесці ў вязніцы.



*Князь Скіргайла (1353—1397).*

Прыехаўшы ў 1387 г. у Вільню, Ягайла ажыццявіў абяцанае хрышчэнне Літвы (толькі Аўкштоты, бо землі Жамойці знаходзіліся пад уладай Ордэна). Баяры, якія прынялі каталіцтва (большасць простага люду яшчэ доўга заставалася ў паганстве), атрымалі ад Ягайлы прывілей, што даваў поўнае права ўласнасці на спадчынныя землі, вызваляў ад усіх абавязкаў на карысць уладара, за выняткам вайсковай службы і даніны, ды інш. Аднак правы свецкіх феадалаў выглядалі сціпла параўнальна з прывілеямі, якія атрымаў у Літве каталіцкі касцёл.

Стварыўшы ў 1387—88 г. каталіцкае біскупства з катэдрай у Вільні, Ягайла заклаў і першыя парафіі: у дадатак да тых, якія ўжо існавалі ў Вільні і Наваградку (а тут касцёл францішканаў з'явіўся яшчэ пры Віцені). Каталіцкія храмы паўсталі ў Вількаміры, Майшаголе, Медніках, Немянчыне, Крэве, Гайне і Абольцах. Манарх забяспечыў касцёлы часткай дзяржаўных даходаў, а віленскай катэдры надаў прыкладна 50—60 вёсак з 600 дымамі падданага насельніцтва. Уладанні касцёла, якія сталі першай латыфундыяй у Літве і Беларусі, атрымалі поўны фінансавы і судовы імунітэт. Адразу займеўшы тое, чаго ў Еўропе духавенства дамагалася стагоддзямі, каталіцкі касцёл стаў магутнай сілай у Літве, а потым і ў Беларусі. Для праваслаўнай царквы стварэнне Віленскага біскупства было моцным ударам, бо асудзіла яе на страты на карысць касцёла.

Застаючыся вярхоўным уладаром Вялікага Княства, Ягайла атрымаў ад удзельных князёў прысяжныя лісты аб вернасці яму і Кароне Польскай ды ад'ехаў у Польшчу. Намеснікам сваім ён пакінуў троцкага князя Скіргайлу, узняўшы яго «вышэй за ўсіх братоў». Асобным прывілеем за 27 красавіка 1387 г. Ягайла пацвердзіў правы Скіргайлы на Троцкае княства і надаў брату новыя ўладанні на Беларусі — Менск, Свіслач, Бабруйск, Рэчыцу, Любеч, Прапойск, Любашаны, Ігумен, Лагойск і Лебедзева, а таксама Полацкае княства. Аднак становішча Ягайлы як суверэна ў Княстве было, відаць, недастаткова трывалым, калі ён прызначыў віленскім старастам паляка Клеменса Маскажэўскага ды праслаў яму ў Вільню польскую залогу. На Скіргайлу як намесніка ён, відаць, не спадзяваўся. Пазней польскі храніст Мацей Стрыйкоўскі паведамляў, што гэты князь «больш імкнуўся памнажаць святыні грэцкія, чым распаўсюджваць веру рымскую, бо з ранняга ўзросту выхоўваўся сярод русінаў». Варта згадаць, што да пераходу ў каталіцтва Скіргайла быў праваслаўным (Іванам), як і іншыя Ягайлавы браты або і сам Ягайла.

Узімку 1389/90 г. незадаволены становішчам служылага князя Вітаўт скарыстаў апазіцыйнасць баяраў Літвы і Русі ды паўстаў супраць Ягайлавай улады. Пасля няўдалай спробы захапіць Вільню ён уцек да прускіх рыцараў. Каб атрымаць ваенную дапамогу, Вітаўт стаў васалам Ордэна і аддаў яму Жамойць. Чакалася падтрымка і ад маскоўскага князя Васіля I (1389—1425), за якога Вітаўт аддаў сваю дачку Соф'ю. Ужо ў верасні 1390 г. Вітаўт прывёў крыжаносцаў на Вільню, а праз год авалодаў Горадняй, яшчэ праз год захапіў Навагрудак, Мерач, зноў пагражаў Вільні.

Вайна паказала, што без кампрамісу Ягайла не ўтрымае ўлады над землямі Літвы і Русі. На Беларусі ды Ўкраіне ён сутыкнуўся з адкрытай непрыхільнасцю насельніцтва. Тады Ягайла правёў таемныя перамовы з Вітаўтам, у выніку якіх увесну 1392 г. той зноў пакінуў крыжаносцаў, папярэдне спаліўшы іх замкі пад Горадняй. 4 жніўня ў Востраве, што на Гарадзеншчыне (недалёка ад Ліды), было падпісана пагадненне, на падставе якога ўлада ў Вялікім Княстве пажыццёва перадавалася Вітаўту. Як адзначыў мясцовы летапісец, укняжанню Вітаўта «рада была ўся зямля Літоўская і Руская».

Так пад вярхоўным суверэнітэтам Ягайлы непасрэдным уладаром дзяржавы стаў Вітаўт Кейстутавіч, які тытулаваўся «supremus dux Lithuaniae» — «вялікім князем літоўскім», або «вялікім князем Літвы ды панам і дзедзічам зямель Русі». Хоць пасля прысягі на вернасць Ягайлу і Ядзвізе ён і знаходзіўся ў васальнай залежнасці ад Польскага каралеўства, пагадненне 1392 г. у параўнанні з Крэўскім актам давала дзяржаве пэўную самастойнасць. Яно стала першым юрыдычна–прававым крокам на шляху да аднаўлення дзяржаўнага суверэнітэту Вялікага Княства Літоўскага.



## III.4. Вялікае княжанне Вітаўта

Атрымаўшы вялікакняскую ўладу, Вітаўт заняўся ўмацаваннем дзяржавы знутры і выкараненнем сепаратызму, бо за час яго барацьбы з Ягайлам многія землі паспелі аддзяліцца. У 1393 г. узнялі бунты смаленскі князь Глеб Святаславіч, ноўгарад–северскі Карыбут, падольскі Хведар Карыятавіч, а таксама Ўладзімір Альгердавіч кіеўскі і яго брат Свідрыгайла, што па маці меў удзел у Віцебску. Вітаўту давялося сілай падпарадкоўваць некаторыя гарады і вобласці на Беларусі і Ўкраіне. Друцкія князі Дзмітры Васілевіч і Дзмітры Сямёнавіч ды Смаленск добраахвотна абавязаліся службай Вітаўту, пасля чаго друцкія князі сталі яго намеснікамі ў сваёй вотчыне, а Смаленск атрымаў Глеб Святаславіч, заменены пазней Вітаўтавым намеснікам. У адрозненне ад іх Орша паддалася толькі пасля двух дзён абароны. У выніку горад быў зведзены да статуса гаспадарскага. Бараніўся і Віцебск, дзе пасля смерці сваёй маці княгіні Ўлляны засеў Свідрыгайла, забіўшы там Ягайлавага намесніка Хведара Вясну. Тады Вітаўт



*Вялікі князь Вітаўт (1392—1430).*

сілай захапіў горад, паланіў Свідрыгайлу і адаслаў у Польшчу. Але неўзабаве вялікаму князю зноў давялося весці войска на Віцебск: у 1396 г. Свідрыгайла ўцёк да інфлянцкіх рыцараў і адтуль вярнуўся ў Віцебск. Вітаўт цэлы месяц трымаў горад у аблозе, калі ж авалодаў — наладзіў расправу, а Свідрыгайлу ў кайданах адправіў у Польшчу да Ягайлы.

Ліквідуючы або замяняючы князёў найбольш аўтаномных удзелаў (Кіева, Уладзіміра–Валынскага, Ноўгарада–Северскага, Падолля і інш.), Вітаўт зрабіў важны крок да палітычнай цэнтралізацыі дзяржавы, да ўмацавання сваёй улады. Ён садзіў сваіх намеснікаў або зводзіў да статуса намеснікаў спадчынных уладальнікаў вялікіх удзелаў, і цяпер яны залежалі ад яго намнога больш, чым князі. Ужо ў 1390-х г. ніводзін з вялікіх удзелаў не меў князя сваёй мясцовай дынастыі. Хоць адасобленасць земляў, іх унутраная аўтаномія захоўваліся яшчэ не адно стагоддзе, спадчынна–прававых падстаў для выступленняў супраць цэнтральнай улады не было.


Конны татарскі воін.
З сярэднявечнай гравюры.

Адчуўшы трываласць свайго становішча, Вітаўт у 1398 г. выкарыстаў незадаволенасць крэўскім актам з боку баяраў і князёў ды пайшоў на абвастрэнне дачыненняў з Польскім каралеўствам. Непасрэднай падставай для гэтага стаў ліст каралевы Ядзвігі, у якім тая запатрабавала ад вялікага князя даніны з земляў Літвы і Русі, падараваных ёй Ягайлам у якасці вена (на землях Беларусі, у прыватнасці, каралева атрымала ўладанні на Віцебшчыне і ў Падняпроўі). Абураны Вітаўт склікаў княска–баярскую нараду на востраве Салін, што на Нёмане. Князі і баяры з Літвы і беларуска–ўкраінскіх зямель Русі (з Беларусі, напрыклад, князь Іван з Друцка, Ямонт Тулунтавіч з Клецка ды інш.) падтрымалі свайго вялікага князя. Яны заявілі, што «заўсёды былі свабодныя, як і іх продкі, і ніколі не плацілі ніякай даніны



Польшчы», ды абвясцілі Вітаўта сваім «каралём». Тады ж Вітаўт дасягнуў таемнага пагаднення з Нямецкім ордэнам, замацаванага подпісамі прысутных на востраве. Да канфлікту з Польшчай не дайшло бадай толькі з прычыны драматычных падзей на Ворскле, якія пабурылі далёкасяжныя планы віленскага манарха.

Згодна з летапісамі, Вітаўт рыхтаваў вялікі паход супраць татарскай арды. Прыняўшы разбітага Цімурам хана Тахтамыша і пасяліўшы яго ў Лідскім замку, вялікі князь хацеў вярнуць яму Сарай, каб потым мець ад хана падтрымку ў сваёй усходняй палітыцы. Падтрымаўшы паход на Арду, у 1399 г. вайну супраць татараў абвясціў рымскі папа Баніфацый IX. Разам з войскам Вітаўта, якое складалася з ратнікаў беларускіх, літоўскіх і ўкраінскіх земляў, а таксама конніцы Тахтамыша, на поўдзень рушыла дапамога з Польшчы і Прускага ордэна. Аднак 12 жніўня ў бітве каля ракі Ворсклы татары хана Цімур–Кутлука і Эдыгея дазвання разграмілі сілы Вітаўта, а сам ён уцёк з невялікай дружынай. Адных князёў загінулі дзесяткі, у тым ліку Альгердавы сыны героі Кулікоўскай бітвы Андрэй Полацкі і Дзмітры Баброк.



*Вялікі магістр Нямецкага ордэна Ульрых фон Юнгінген (1407—1410).*

Трагедыя на Ворскле падарвала сілы Вялікага Княства, аслабіла пазіцыі Вітаўта. Затое яна была надзвычай выгадная для Масквы, бо адвяла пагрозу з боку як Літвы, так і Арды. Вітаўт мусіў пайсці на ўмацаванне саюзу з Ягайлам. У студзені 1401 г. у Вільні былі падпісаны акты новай уніі з Польскім каралеўствам, вядомай як віленска–радамская. Яна прызнавала палітычную асобнасць Вялікага Княства Літоўскага, улада ў якім пажыццёва належала Вітаўту, а пасля яго смерці землі і ўлада ў дзяржаве мелі перайсці да Ягайлы ці ягоных пераемнікаў. Калі б бяздзетным памёр Ягайла, польскія паны павінны былі б узгадніць кандыдатуру новага караля з Вітаўтам. Акты віленска–радамскай уніі падпісалі «прэлаты, бароны, шляхцічы і зямяне зямель літоўскіх і рускіх». Гэта першы



*Бітва пад Грунвальдам (Дуброўнай). 1410 г.*
*Дрэварыт з хронікі Марціна Бельскага (1597).*

вядомы выпадак, калі пытанне дзяржаўнай уніі вырашалася пры ўдзеле грамадскай эліты нелітоўскіх зямель як актыўнай палітычнай сілы.

Выкарыстоўваючы замацаваны дынастычным шлюбам саюз з Масквою, Вітаўт працягваў пашыраць свой уплыў на ўсходнія славянскія землі, дзе пасля Ворсклы яго пазіцыі пахіснуліся. Вялікі князь маскоўскі Васіль Дзмітрыевіч быў яго зяцем і не выступаў супраць Вітаўтавай палітыкі на ўсходзе. Яшчэ ў 1395 г., калі ад Вялікага Княства адпаў Смаленск, Вітаўт прывёў войска і сілай падпарадкаваў горад, выгнаўшы мясцовага Рурыкавіча і пасадзіўшы там намеснікаў Васіля Барэйкавіча і Ямонта. Дарэмна смаленскі князь спрабаваў вярнуць свой стол пры дапамозе разанцаў — Масква падтрымлівала Вітаўта. Такой жа прыхільнай пазіцыі



ў дачыненні да ўсходняй палітыкі Вільні маскоўскі князь трымаўся і пазней. Канчаткова Смаленск быў уключаны Вітаўтам у склад Вялікага Княства ў 1404 г., пасля таго, як годам раней яму ўдалося падпарадкаваць Вязьму. Смаленск здалі баяры, калі князь Юры Святаславіч паехаў прасіць дапамогі ў Маскве. Праз год, калі абараніць іх ад Вітаўта папрасілі пскавічы і ноўгарадцы, маскоўскі князь Васіль Дзмітрыевіч разарваў мірнае пагадненне з Вільняй і тры гады прайшлі ў стане вайны. Аднак абышлося без буйных сутычак, і ў 1408 г. маскоўскі манарх зноў падпісаў з Вітаўтам замірэнне.

Пасля ўрэгулявання дачыненняў з Маскоўскай дзяржавай, Ноўгарадам і Псковам стала магчымым пачаць барацьбу з Тэўтонскім ордэнам. Калі ў 1409 г. насельніцтва Жамойці, якое цярпела ад нямецкіх рыцараў, у чарговы раз узняло паўстанне, Вітаўт падтрымаў яго. Польшча ўступілася за Вітаўта і ультыматыўна запатрабавала ад Ордэна спыніць ваенныя дзеянні. У адказ на гэта вялікі магістр Ульрых фон Юнгінген (1407—1410) абвясціў вайну і захапіў польскую зямлю Добжынь. Нядоўгае замірэнне, у часе якога чэшскі кароль Вацлаў IV (1378—1419) выступаў у ролі суддзі, праціўнікі выкарысталі для актыўнай мабілізацыі сілаў. Калі заходнія манархі сталі на бок Ордэна, Ягайла і Вітаўт канчаткова зарыентаваліся на сілавое рашэнне пытання.

Распрацаваўшы план супольнай вайны, яны на пачатку ліпеня 1410 г. прывялі свае злучаныя сілы на тэрыторыю Прусіі для генеральнай бітвы з Прускім ордэнам. У Вітаўта было больш за 40 харугваў з земляў Вялікага Княства Літоўскага, у тым ліку 28 з беларускіх — берасцейская, ваўкавыская, віцебская, гарадзенская, пінская, полацкая, наваградская, смаленская ды іншыя, а таксама аддзелы татарскай конніцы. Разам армія Вітаўта, якая больш чым на дзве траціны складалася з русінаў і мела галоўным штандарам харугву з дзяржаўным гербам Пагоняй, налічвала блізу 10—12 тыс. вершнікаў. У Ягайлы ў 51 харугве было прыкладна 12 — 14 тыс. коннікаў. На дапамогу палякам прыйшлі найманыя жаўнеры з Чэхіі на чале з Янам Жыжкам. Сілы ж тэўтонаў сягалі прыкладна 16 тыс. Бітва адбылася 15 ліпеня каля прускіх вёсак Танэнберг ды Грунвальд (у беларускіх летапісах — каля Дуброўны). «Пры націску аддзелаў ад пераломваных дзідаў і ўзаемных удараў зброі сыходзіў

такі вялікі грукат і гук, такі далёкасяжны быў ляскат мечаў, быццам звалілася якая агромністая скала, так што чулі яго нават тыя, хто быў аддалены на некалькі міляў», — пісаў пра сечу польскі храніст Ян Длугаш.

Бітва, якая ўвайшла ў гісторыю як адна з найбуйнейшых у сярэднявечнай Еўропе, скончылася поўным разгромам ордэнскага войска. Вялікае значэнне для перамогі меў тактычны манеўр Вітаўта — запланаванае адступленне яго харугваў, якое дазволіла расстроіць баявы парадак рыцараў. З поля сечы саюзнікі рушылі далей у Прусію. Над Ордэнам навісла смяротная небяспека. Прускія замкі і гарады здаваліся без супраціву, дваранства і біскупы прысягалі пераможцам. Аднак сталіца Ордэна Мальбарк упарта абаранялася, і два месяцы аблогі не прынеслі ніякай карысці. Неўзабаве Вітаўт пакінуў Мальбарк і павёў войска на Горадню, а за ім мусіў вяртацца і Ягайла.

Мірны дагавор, падпісаны ў 1411 г. у Торуні, зафіксаваў кампраміс паміж Ордэнам і саюзнікамі: у межах ордэнскай дзяржавы заставаліся польскія Кульмская зямля і Памор'е, а Жамойць і Судавы вярталіся Вітаўту толькі на час яго жыцця (канчаткова Жамойць увайшла ў склад Вялікага Княства па ўмовах мельненскага міру 1422 г.). Гэтыя ўмовы не маглі задавальняць трыумфатараў Грунвальду. Тэўтонскі ордэн, займеўшы падтрымку Жыгімонта Люксембургскага — з 1410 г. нямецкага кайзера, а потым і імператара Святой Рымскай імперыі, — таксама спадзяваўся ў далейшым дамагчыся сатысфакцыі. Таму барацьба паміж блокам пераможцаў і Ордэнам працягвалася. Канфлікт не змаглі вырашыць мірным шляхам на Канстанцкім саборы ў 1418 г. Усведамленне непазбежнасці новай вайны падштурхнула Ягайлу і Вітаўта да больш цеснага аб'яднання сілаў, да ўмацавання іх дзяржаўнага саюзу, дзякуючы якому і ўдалося разграміць асноўны патэнцыял галоўнага ворага пад Танэнбергам.

Акт новай уніі быў прыняты ў кастрычніку 1413 г. на з'ездзе польскіх і літоўскіх паноў і баяр у Гарадлі над Бугам. Ён прызнаваў, што як дзяржава Вялікае Княства Літоўскае захавае сваю асобнасць і пасля смерці Вітаўта. Літоўскія баяры абавязваліся не выбіраць нікога вялікім князем без згоды Ягайлы, а польскія — не выбіраць новага караля без узгаднення з вялікім князем літоўскім. Літоўскае баярства атрымала прывілей, які гарантаваў яму права



распараджацца сваёй зямлёй, атрыманай ад бацькоў, і публічныя свабоды. У мэтах збліжэння з Польшчай заможныя баярскія роды Літвы былі дапушчаны (адаптаваны) да польскіх шляхецкіх гербаў. Паводле прыкладу Кароны Польскай, у дзяржаве ўтвараліся ваяводствы і каштэляніі. У створаныя Віленскае і Троцкае ваяводствы ўвайшлі Падляшша, Палессе, Панямонне, Цэнтральная Беларусь і некаторыя землі Падняпроўя. З гэтага часу ў фармаванні адміністрацыйнай структуры Вялікага Княства Літоўскага эвалюцыя старых формаў спалучалася з рэцэпцыяй польскіх узораў.

Абвешчаныя ў Гарадлі правы і свабоды не тычыліся большасці падданых Вялікага Княства, бо распаўсюджваліся толькі на ядро гэтай дзяржавы — згаданыя ваяводствы, а іншыя землі захоўвалі шырокую аўтаномію. Артыкул 9 гарадзельскага акта адзначаў, што да новаўтвораных урадаў і дзяржаўнай рады дапускаюцца «толькі каталіцкай веры прыхільнікі і падуладныя святой Рымскай царквы», а ў артыкуле 12 гаварылася, што і дараваныя свабоды ды прывілеі належаць толькі «рымскай царквы падуладным». Такім чынам, гарадзельскі акт умацоўваў хрысціянства лацінскага абраду як упрывілеяваную рэлігію дзяржавы. Як і ў 1387 г., літоўскае баярства зноў атрымала выгады дзякуючы злучэнню з Польшчай і павінна было стаць апорай уніі. Гарантаваныя прывілеем палітычна–прававыя перавагі літоўскай эліты забяспечвалі яму манаполію на ўладу ў дзяржаве.



*Імператар Жыгімонт Люксембургскі (1410—1437) са світаю.*

Праваслаўныя князі і баяры Вялікага Княства, якія прадстаўлялі інтарэсы насельніцтва Русі, у гарадзельскім з'ездзе наогул не ўдзельнічалі. На землі–вобласці Беларусі (Полацкую, Віцебскую, Смаленскую) прынятыя акты не распаўсюджваліся, і палітычныя правы праваслаўных князёў і баяраў тут не аспрэчваліся. Аднак яны страчвалі магчымасць усяля-

кага ўплыву на дзяржаўную ўладу ў цэлым. Беларусы (русіны) паводле паходжання і рэлігіі складалі асноўную частку жыхарства і ў раёнах Русі Літоўскай (Цэнтральная і Заходняя Беларусь), што ўвайшла ў Віленскае і Троцкае ваяводствы. Недалучэнне праваслаўных да прывілеяў, гарантаваных каталікам, было сур'ёзнай дыскрымінацыяй першых. Гэта выклікала разлад, падрывала грамадскі мір, што быў асновай існавання вялікай поліэтнічнай і поліканфесійнай дзяржавы. Балта–славянскі грамадскі саюз раскалоўся на Русь і Літву.

Занядбанне інтарэсаў унутранай кансалідацыі дзяржавы і дыскрымінацыя праваслаўнай Русі былі вялікай памылкай Вітаўта. У гады яго княжання гэтая небяспека яшчэ не была такой відавочнай. Здолеўшы забяспечыць палітычную перавагу літоўцаў, якія з'яўляліся меншасцю (баярам Вітаўта шчодра раздаваліся вялізныя зямельныя абшары на Беларусі, дзе такім чынам ствараліся першыя латыфундыі), жорсткі манарх у гады свайго княжання ўмеў заспакойваць і ўсходнеславянскую большасць — дзе сілай, а дзе павагай іх старыны, прызнаннем адасобленасці зямель–вобласцяў. Аднак пасля Вітаўта цэнтралізацыя сутыкнулася з цэнтрабежнымі сіламі і антаганізм перарос у грамадзянскую вайну.

Каб нейтралізаваць знешні ўплыў мітрапольнага цэнтра, які знаходзіўся ў Маскве, Вітаўт імкнуўся стварыць уласную праваслаўную іерархію, планаваў аб'яднаць грэцкую царкву з рымскай. Ідэю царкоўнай уніі і яе магчымы плён у справе барацьбы з татарамі Вітаўт і Ягайла абмяркоўвалі з мітрапалітам Кіпрыянам яшчэ напрыканцы XIV ст. Пасля смерці Кіпрыяна Цамблака ў 1407 г. вялікі князь разам з праваслаўным духавенствам сваёй дзяржавы прасіў канстанцінопальскага патрыярха зацвердзіць ім асобнага мітрапаліта, якім прапаноўвалася зрабіць полацкага ўладыку Феадосія. Аднак Канстанцінопаль праз два гады высвяціў адзінага для «ўсяе Русі» мітрапаліта, якім стаў маскоўскі стаўленік Фоцій. Вітаўт згадзіўся на яго пры той умове, што Фоцій стане паслядоўнікам Цамблака і будзе рэзідаваць у Кіеве. Але той не знайшоў паразумення з Вітаўтам і ўвесь час сядзеў у Маскве, а золата і грашовыя зборы з падуладных яму епархій Беларусі і Ўкраіны вывозіў у Візантыю. Тады Вітаўт забараніў Фоцію візітаваць гэтыя епархіі, а 15 лістапада 1416 г. сабраў у Наваградку з'езд духавенства (сярод



васьмі епіскапаў прысутнічалі ўладыка полацкі Феадосій, смаленскі Севасцян і тураўскі Яўфімій) ды свецкай эліты. На наваградскім саборы было дэкларавана, што праваслаўная царква ВКЛ адлучаецца ад Масквы, і праведзена абранне новага кіеўскага мітрапаліта, якім стаў вядомы балгарскі вучоны манах Рыгор Цамблак, пляменнік былога мітрапаліта Кіпрыяна. Гэта ён у 1418 г. на саборы ў Канстанце выступіў з прамовай, у якой заклікаў аб'яднаць заходнюю і ўсходнюю цэрквы, і прасіў папу прыслаць на Русь сваіх прадстаўнікоў для ўвядзення уніі. Аднак рашэнне аб уніі не магло быць прынята, бо на саборы адсутнічалі візантыйскі цэзар і патрыярх. Пасля ад'езду непрызнанага патрыярхатам Цамблака ў 1419 г. у Малдову праваслаўнае насельніцтва Беларусі і Ўкраіны зноў трапіла пад юрысдыкцыю маскоўскага мітрапаліта Фоцыя (да 1431 г.), з якім хутка замірыўся і Вітаўт.

У 1420-х г. вялікі князь Вітаўт дамогся найбольшых знешнепалітычных поспехаў. У арбіце яго ўплываў знаходзіліся Крымская і Заволжская арда, Маскоўскае княства (маскоўскі князь у 1426 г. нават даручыў яму апекавацца сваім непаўналетнім сынам Васілём, які даводзіўся ўнукам Вітаўту), Пскоў і Ноўгарад. Цвярскія і разанскія Рурыкавічы ўступілі ў саюз з манархам магутнай балта–славянскай дзяржавы, заключыўшы з ім, як і князі вярхоўскія, дамову аб службовых адносінах і паабяцаўшы быць «з ім заадно». Мяжа паміж залежнымі ад Вільні княствамі і землямі, падкантрольнымі Маскве, пралягала тады па рацэ Угры.

Дасягнуўшы такой магутнасці, Вітаўт паспрабаваў вырашыць пытанне аб сваёй гегемоніі ў Усходняй Еўропе. Для гэтага трэба было разарваць акты 1386 і 1413 г., якія звязвалі Вялікае Княства з Польшчай, і стварыць незалежнае каралеўства з Літвы і Русі. Імператар Святой Рымскай імперыі яшчэ перад Грунвальдскай бітвай абяцаў яму карону. У 1429 г. Вітаўт ініцыяваў міжнародны кангрэс у Луцку, на які апрача яго і Ягайлы прыехаў імператар Жыгімонт Люксембургскі (1410—1437), а таксама мноства еўрапейскай знаці. Афіцыйна на парадак дня выносіліся пытанне вайны з Турцыяй і праблема гусітаў, але для Вітаўта найважнейшай была справа яго каранацыі, да якой прыхільна паставіўся імператар. Наданне вялікаму князю тытула караля ўключыла б Вітаўта на роўных правах у сям'ю хрысціянскіх манархаў Еўропы, а яго дзяржава стала б незалежным каралеўствам. Але на кангрэсе

кракаўскі біскуп Збігнеў Алясніцкі востра выступіў супраць Вітаўтавай ідэі, адкрыта сцвярджаючы, што той задумаў аддзяліць Літву ад Польшчы, і польская дэлегацыя сарвала нараду, з’ехаўшы з Луцка. І ўсё ж Вітаўт не пакінуў сваіх планаў. На жнівень 1430 г. быў скліканы міжнародны з’езд у Вільні, на якім і мела адбыцца каранацыя старога князя. Сабралася многа ўладароў, у тым ліку маскоўскі вялікі князь Васіль Васілевіч (1425—1462), прыехалі абодва магістры Нямецкага ордэна (прускі і інфлянцкі). Але імператарскія паслы, што везлі карону, былі затрыманы ў Польшчы. Каранацыю адклалі на 8 верасня, але і на той дзень паслы не з’явіліся. 27 кастрычніка ў Троках Вітаўт памёр, так і не паспеўшы каранавацца.

Не стала манарха, які з аморфнай балта–славянскай канфедэрацыі ўтварыў магутную цэнтралізаваную дзяржаву. Пры ім княства зрабілася вялікім не толькі па назве (Вітаўт першым пачаў афіцыйна тытулавацца вялікім князем), але і паводле ахопленай тэрыторыі ды палітычнай ролі ў міжнародным жыцці Ўсходняй Еўропы.

# IV. Шляхі кансалідацыі

## IV.1. Свідрыгайла і грамадзянская вайна

Пасля смерці Вітаўта згодна з умовамі уніі ўлада ў дзяржаве мусіла перайсці да Ягайлы як вярхоўнага суверэна. Аднак баяры і князі, што сабраліся на з'ездзе ў Вільні з усёй Літвы і Русі, па-свойму патлумачылі існуючую дамову ды самастойна, без узгаднення з каралём Ягайлам, адзінагалосна абвясцілі вялікім князем Свідрыгайлу (Баляслава) Альгердавіча. Баючыся абвастрэння канфлікту, Ягайла пагадзіўся з такім выбарам.

Князь Свідрыгайла быў надзвычай яркай, неардынарнай асобай. Яго добра ведалі на беларускіх і ўкраінскіх землях як праціўніка збліжэння з Польшчай і даўняга суперніка Вітаўта. Неаднаразова выступаючы супраць Ягайлы і Вітаўта, ён заўсёды абапіраўся на русінаў, якія бачылі ў Свідрыгайлу абаронцу сваіх інтарэсаў і гуртаваліся вакол яго. Гэта падкрэслена і ў хроніцы Яна Длугаша, які напісаў, што Свідрыгайла здабыў «павагу русінаў, бо хоць сам быў каталіком, большую прыхільнасць выяўляў да іхнай веры». Паказальна, што і ў 1393, і ў 1396 г. віцябляне ўпарта баранілі свой горад, калі ў ім сядзеў Свідрыгайла. Праўдападобна, ён яшчэ тады абяцаў праваслаўнай арыстакратыі ўраўняць яе ў правах з каталікамі.

Стаўшы вялікім князем, каталік Свідрыгайла парушыў 9-ы артыкул Гарадзельскага прывілея і пачаў раздаваць русінам важныя дзяржаўныя пасады, атачаць сябе «схізматыкамі». Незадаволенасць каталікоў могуць добра характарызаваць словы кракаўскага біскупа Збігнева Алясніцкага, які ў 1432 г. з абурэннем напісаў пра

становішча ў Вялікім Княстве, што «русіны ўзялі перавагу над літоўцамі, яны трымаюць у сваіх руках амаль усе найважнейшыя гарады і пасады, чаго не бывала пры нябожчыку Вітаўту», а храніст Ян Длугаш намаляваў Свідрыгайлу чалавекам з недалёкім розумам, схільным да п'янства і шаленства.

У знешняй палітыцы пачатак княжання Свідрыгайлы адразу ж прывёў да канфлікту з Польшчай. Спрэчкі за Падолле ўжо ў канцы 1430 г. перараслі ва ўзброеную барацьбу, выклікалі разрыў паміж Свідрыгайлам і Ягайлам. Пасля бясплённых перамоў польскі кароль у чэрвені 1431 г. абвясціў вайну і накіраваў свае войска на Валынь. Свідрыгайла тым часам шукаў саюзнікаў. Яго падтрымліваў імператар Святой Рымскай імперыі Жыгімонт Люксембургскі, які паабяцаў вялікаму князю каралеўскую карону, а таксама Нямецкі ордэн, якому важна было паправіцца пасля паражэння 1410 г. У чэрвені 1431 г. Свідрыгайла падпісаў абаронча–наступальны саюз з вялікім магістрам Нямецкага ордэна Паўлам Русдорфам (1422—1441), скіраваны супраць Польскага каралеўства і гусітаў. Сваю дапамогу яму паабяцалі таксама татары і малдаўскі гаспадар.



*Вялікі князь Свідрыгайла Альгердавіч (1430—1432).*

Перспектыва поўнага разрыву з Польшчай ды страта палітычнай манаполіі, гарантаванай Гарадзельскім прывілеем, выклікала актыўнае супрацьдзеянне літоўскага баярства, якое падтрымлівала унію. Не маглі дараваць Свідрыгайлу і тыя, хто быў пры ўладзе ў гады княжання Вітаўта, але страціў яе. Пры інспірацыі польскіх саюзнікаў яны таемна падрыхтавалі замах на Свідрыгайлу. Напад ажыццявілі старадубскі князь Жыгімонт Кейстутавіч і Сымон Гальшанскі ўначы 1 верасня 1432 г. у Ашмяне. Свідрыгайла ледзь уратаваўся і ўцёк у Полацк.

Новым вялікім князем літоўцы адразу ж абвясцілі Вітаўтавага брата князя Жыгімонта Кейстутавіча. Яго прызналі Вільня,



Трокі, Коўна, Жамойць і Горадня, сілай яму было падпарадкавана Берасце. У выніку частка Беларусі (Чорная Русь) пайшла за Жыгімонтам. Аднак Полацкая, Віцебская і Смаленская землі, а таксама ўся Ўкраіна не прызналі яго і па–ранейшаму лічылі сваім вялікім князем Свідрыгайлу. Так дзяржава часова падзялілася на Літву і Русь: як адзначыў летапісец, «князі рускія і баяры пасадзілі князя Свідрыгайлу на вялікае княжанне Рускае», «Літва ж пасадзіла вялікага князя Жыгімонта Кейстутавіча на вялікае княжанне на Вільні і на Троках».

Жыгімонт адразу аднавіў саюз з Польшчай, падпісаўшы з Ягайлам унію ў Горадні, у якой пацвердзіў вярхоўны суверэнітэт Ягайлы над сабой на ўмовах 1401 г., г.зн. абмежаваў самастойнасць Вялікага Княства часам свайго жыцця. Яму ў дапамогу Ягайла прыслаў польскае войска. Аднак Свідрыгайла яшчэ не лічыў сваю справу прайгранай. Абапіраючыся на Полацк, ён ужо з восені 1432 г. пачаў рабіць паходы на падуладныя Жыгімонту землі. Зімой і летам наступнага года Свідрыгайлава войска зноў хадзіла да Вільні і Навагрудка, заняло шэраг невялікіх гарадоў. Але ў цэлым ваенныя дзеянні былі для яго няўдалыя. Абяцанай дапамогі Свідрыгайлу ні ад татараў, ні ад малдаўскага гаспадара не было. Толькі інфлянцкі магістр Керскорф, верны саюзніцкаму пагадненню, пасылаў рыцараў на Літву. А Жыгімонт Кейстутавіч пры падтрымцы палякаў ваяваў Беларусь: у 1433 г. ён вадзіў войска ажно да Мсціслава.



*Брат–рыцар Нямецкага ордэна. З дрэварыту XV ст.*

Асноўнай сацыяльнай сілай Свідрыгайлы былі заможныя праваслаўныя роды Беларусі і Ўкраіны, якія захавалі вернасць яму як вялікаму князю, тады як Жыгімонт абапіраўся ў асноўным на каталікоў (хоць каталікі былі і на баку Свідрыгайлы, а праваслаўныя баяры — у лагеры Жыгімонта). Гэтая акалічнасць надае вайне быццам бы нацыянальна–рэлігійны характар. У сапраўднасці яна была барацьбой не столькі нацыянальнай, колькі сацыяльнай — змаганнем княска–

баярскіх партый між сабою. Інтарэсаў шырокіх слаёў насельніцтва яна не кранала. Ні веравызнанне, ні этнічнае паходжанне не мелі ў гэтай вайне вызначальнай ролі. Называючы сябе заўзятым каталіком, Свідрыгайла ўзначальваў галоўным чынам праваслаўны паводле складу лагер баяраў і князёў, але і яны змагаліся не за веру, а за сваё дамінавальнае становішча ў дзяржаве. Нездарма сярод яго прыхільнікаў былі і заможныя літоўскія роды каталіцкага веравызнання — тыя, хто выступаў супраць уніі з Польшчай і за саюз з Тэўтонскім ордэнам.

Маючы колькасную перавагу ў сілах, Свідрыгайла, аднак, не здолеў плённа яе выкарыстаць і хутка страціў галоўнага саюзніка. Калі польска–чэшскае войска ўварвалася ў Новую Марку і падышло да Гданьска, вялікі магістр мусіў падпісаць з Каронай замірэнне. У выніку дагавора, заключанага ў канцы 1433 г. у Ленчыцах, Ордэн выбыў з вайны і адрокся ад саюзу з Свідрыгайлам. Шматвызначальным для зыходу вайны стаў вялікі земскі прывілей, выдадзены Жыгімонтам 6 траўня 1434 г. у Троках, які выбіў галоўны козыр у Свідрыгайлы. Гэтым актам абвяшчалася раўнапраўе русінаў і літоўцаў у межах цэлай дзяржавы, так што правы, гарантаваныя каталікам Гарадзельскім прывілеем, пашыраліся на ўсіх падданых незалежна ад веравызнання (каталікі захоўвалі манаполію толькі на пасады ваяводы і кашталяна віленскага і троцкага). Яшчэ раней, у1432 г., такі ж прывілей Ягайла выдаў для Луцкай зямлі. Цяпер і беларуска–ўкраінскае баярства атрымала гарантыі недатыкальнасці сваіх зямельных уладанняў, свабоду распараджэння зямлёй, ільготы ў дзяржаўных павіннасцях, а таксама права на адопцыю рыцарскіх гербаў ад літоўскіх родаў, пабратаных з польскай шляхтай.

Троцкі прывілей стаў першай пасля 1386 г. законнай асновай раўнапраўя праваслаўных і каталікоў у ВКЛ. Ураўняўшы правы ўсіх зямель дзяржавы, ён спрыяў кансалідацыі ўсяго баярства, аб'ядnанню Літвы і Русі. Фактычна, гэта быў першы агульнадзяржаўны прывілей, які выдаваўся, як падкрэслівалася ў тэксце, дзеля таго, каб не было няроўнасці і разладу паміж народамі Княства, каб усе ў згодзе дбалі пра агульную дзяржаву.

Свідрыгайла спадзяваўся на дапамогу каталіцкай Еўропы і звярнуўся да Базельскага сабора. У 1433 г. у Базель быў высланы ліст паноў–русінаў з Віцебска, якія выказалі жаданне падпарадкавацца Рыму, а ў наступным годзе на царкоўным саборы з'явілася дэлегацыя Свідрыгайлы, якая пацвердзіла яго планы уніі і папрасіла дапамогі ў барацьбе з Жыгімонтам і Ягайлам. Аднак пасля троцкага прывілея Жыгімонта лагер Свідрыгайлы пачаў хутка страчваць прыхільнікаў. Яго цвёрды намер увесці царкоўную унію стаў адштурхоўваць русінаў. Паспрыяла гэтаму і неапраўданая жорсткасць князя, які ўлетку 1435 г. загадаў спаліць у Віцебску працiўніка уніі мітрапаліта Герасіма за тое, што ўладыка быццам бы рыхтаваў перадачу Смаленска Жыгімонту Кейстутавічу.



Губляючы прыхільнікаў, Свідрыгайла спяшаўся нанесці вырашальны ўдар па непрыяцелю. У ліпені 1435 г. разам з саюзным войскам інфлянцкага магістра ён рушыў у Літву Завілейскую. Яго армію ўзначаліў князь Жыгімонт Карыбутавіч, які спецыяльна вярнуўся з Чэхіі. На дапамогу Жыгімонту Кейстутавічу прыйшлі польскія аддзелы. Прыняўшы бітву ў надзвычай нявыгадных умовах пад Вількамірам, каля ракі Святой, 1 верасня сілы Свідрыгайлы пацярпелі поўную паразу. Толькі князёў загінула трынаццаць з пяцідзесяці, якія бралі ўдзел у сечы. Амаль усе астатнія трапілі ў палон. Як пазней было адзначана ў Густынскім летапісе, менавіта ад гэтай паразы «руские князи начаша оскудевати и обнищевати». Вялікія страты панеслі таксама інфлянцкія рыцары. Загінуў сам магістр Керскорф. Пасля гэтага Нямецкі ордэн падпісаў у Брэсце Куяўскім «вечны» мір з Жыгімонтам Кейстутавічам і Ягайлам. Вялікі магістр адмовіўся ад усялякіх сувязяў са Свідрыгайлам і прызнаў уладаром ВКЛ Жыгімонта Кейстутавіча, абавязваючыся і ў будучым прызнаваць толькі таго манарха Літвы, які будзе абраны са згоды Польскага каралеўства, ды не падтрымліваць вялікіх князёў літоўскіх у іх антыпольскіх захадах. Трактатам таксама пацвярджаліся ранейшыя дзяржаўныя межы паміж бакамі і дэкларавалася свабода гаспадарчых сувязяў.

Князь Свідрыгайла «на 30 конях» зноў уцёк у Полацк. Тут, на землях паўночнай Беларусі, ён меў трывалую падтрымку. Полацк атрымаў ад Свідрыгайлы князя Міхаіла Іванавіча Гальшанскага, а Віцебск — Васіля Сямёнавіча Краснага з друцкіх Рурыкавічаў. Але калі ў 1435 г. Полацк і Віцебск яшчэ адбіліся ад войска Жыгімонта, дык летам наступнага года, не адчуваючы ніякай падтрымкі, прызналі яго ўладу. Землі–вобласці адна за адной адпадалі ад Свідрыгайлы. Смаленск падпарадкаваўся Жыгімонту таксама ў1435 г. Нейкі час неўтаймоўны князь яшчэ знаходзіў апору на Ўкраіне, потым пакінуў і яе, атрымаўшы прыстанішча ў Валахіі. Адно пасля смерці Жыгімонта ён пасяліўся ў Луцку на Валыні, дзе і памёр.

Поўную перамогу Жыгімонта летапісец адзначыў як укняжанне яго «на вялікім княжанні на Літоўскім і Рускім», што азначала аб'-

яднанне дзвюх галоўных частак дзяржавы. У гэтым выявілася і ўмацаванне цэнтралістычнай, «пралітоўскай» арыентацыі насельніцтва беларускіх зямель. Аднак палітыка Кейстутавіча, які, з аднаго боку, аддаў палякам Падолле, а з другога — пярэчыў Кракаву і, умацоўваючыся на вялікакняскім стале, імкнуўся аслабіць залежнасць ад Польшчы, памножыла партыю ягоных праціўнікаў. Скрайняй жорсткасцю да арыстакратыі, як адзначана ў Хроніцы Быхаўца, спробамі падарваць яе пазіцыі і атачыць сябе новымі, асабіста яму адданымі людзьмі, Жыгімонт аб'яднаў супраць сябе князёў і баяр абодвух веравызнанняў. Віленскі і троцкі ваявода Даўгірд і Лелюша пры падтрымцы князя Аляксандра Чартарыйскага падрыхтавалі замах на вялікага князя. 20 сакавіка 1440 г. яго выканалі згаданы князь Чартарыйскі і кіяўлянін Скабейка, якія таемна праехалі ў троцкі замак, схаваўшы сваіх людзей у вазах з сенам. Смерцю Жыгімонта на вялікакняскім пасадзе абрывалася лінія Кейстутавага роду. Заставаліся Альгердавічы, але з іх толькі нашчадкі Ягайлы сцвердзілі сваю дынастыю — дынастыю Ягайлавічаў.

Адразу пасля забойства гаспадара на Валыні з'явіўся Свідрыгайла, які ўжо называў сябе «вярхоўным князем Літвы». Заняць віленскі стол разлічвалі таксама сын Жыгімонта Кейстутавіча князь Міхалюшка (Міхалка) ды Ўладыслаў Ягайлавіч Варненьчык, які з 1434 г. быў каралём Польшчы. Аднак апошні затрымаўся ў венгерскім паходзе. Рада вяльможаў, узначаленая Янам Гаштаўтам, без паразумення з палякамі 29 чэрвеня 1440 г. абвясціла вялікім князем 13-гадовага Ягайлавага сына Казіміра.

## IV.2. Княжанне Казіміра Ягайлавіча

Стаўшы гаспадаром, Казімір і яго рэгенты на чале з троцкім ваяводам Янам Гаштаўтам мусілі нанова аб'ядноўваць дзяржаву, бо землі–вобласці пасля забойства Жыгімонта зноў адпалі. Жамойць прызнала вялікага князя ўжо ў 1441 г. дзякуючы прывілею, выдадзенаму ёй Казімірам. Не стала ўпарціцца баярства Полацкай і Віцебскай земляў. А вось у Смаленску новаму манарху было нялёгка сцвердзіць сваю ўладу. Паўстанне 1440 г. там было інспіравана часткай прыхільнікаў Свідрыгайлы. Мяшчане выгналі прэч вялікакняскага намесніка з блізкімі да яго баярамі, а ў горад паклікалі нашчадка Рурыкавічаў князя Андрэя Дарагабужскага, а потым — князя Юрыя Лугвенавіча з Мсціслава, які быў праваслаўны і прыняў тытул «гаспадара Смаленскага». Новы смаленскі князь пасадзіў у вязніцу пралітоўскае баярства і стаў зносіцца з Полацкам ды Віцебскам. Маскоўскія і ноўгарадскія летапісы адзначалі, што ён ужо нават княжыў у гэтых гарадах. Магчыма, Юры Лугвенавіч сапраўды мерыўся ажыццявіць даўні план Андрэя Альгердавіча — адарваць ад Літвы паўночна–ўсходнія землі Княства і стварыць на абшарах Беларусі асобную дзяржаву. Пра тое, што ён меў такія намеры, сцвярджалі гісторыкі Л.Калянкоўскі і Р.Бэхтальд. Але на ўтаймаванне Смаленска прыйшло гаспадарскае войска, якое ў 1442 г. падпарадкавала горад. Юры Лугвенавіч уцёк у Ноўгарад, а Казімір Ягайлавіч зноў пасадзіў намеснікам Андрэя Саковіча, для супакаення ж смаленцаў выдаў устаўную грамату. Гэтай граматай Казімір Ягайлавіч, як і Вітаўт ды Свідрыгайла, замацаваў за Смаленскай зямлёй мясцовыя грамадска–прававыя нормы і звычаі, чым забяспечыў лаяльнасць смалян да вярхоўнай улады вялікага князя літоўскага. Падобныя прывілеі і аўтаномію вялікі князь даў Жамойці, якая была за Міхалюшку, і супакоіў яе. Даволі проста ўдалося замацаваць за цэнтрам і ўкраінскія землі, вярнуўшы Кіеўскую зямлю князю Алельку — малодшаму сыну Ўладзіміра Альгердавіча, а на Валыні ўтварыўшы ўдзельнае княства старога Свідрыгайлы, якому даваўся пажыццёвы тытул вялікага князя.





*Вялікі князь Казімір Ягайлавіч (1440—1492). Фрагмент саркафага на Вавелі.*

Унутраная палітыка Казіміра Ягайлавіча была выразна скіраваная на кансалідацыю сацыяльных вярхоў усіх зямель дзяржавы і яе цэнтралізацыю. Але дасягалася гэта не настолькі радыкальнымі мерамі, як пры Вітаўце. Атрымаўшы ад папярэднікаў пасля доўгай унутрыдзяржаўнай барацьбы кангламерат самых розных земляў і ўладанняў, Казімір ужо на пачатку свайго панавання заключыў пагадненні з Псковам, Ноўгарадам і Цвярскім княствам, а потым і з Маскоўскай дзяржавай. Гэтыя дамовы, якія прызнавалі

нязменнымі межы і сферы ўплываў Вялікага Княства ажно да вытокаў Волгі і вярхоўяў Акі, удавалася вытрымліваць на працягу ўсяго панавання Казіміра Ягайлавіча. Каб умацоўваць сувязь з Вільняй паўднёвых і ўсходніх ускраін вялізнай краіны, ён садзіў там сваіх намеснікаў, а землям–анексам выдаваў устаўныя граматы на самакіраванне. Кіеўскі ўдзел у 1471 г. пасля смерці князя Сямёна быў забраны ў Алелькавічаў і ператвораны ў звычайную правінцыю (кіеўскім намеснікам стаў Марцін Гаштаўт), а нашчадкам Альгерда па кіеўскай лініі Казімір перадаў у валоданне Слуцк, Капыль і Клецк. Праўда, Мсціслаўскае княства ён зноў аддаў Юрыю Лугвенавічу, калі той вярнуўся, затое Магілёў вылучыў з удзелу і пасадзіў у ім свайго намесніка.

Пасля вострых канфліктаў і грамадзянскай вайны 1430-х г. пры новым гаспадары ўнутранае жыццё ў дзяржаве паступова стабілізавалася, умацавалася цэнтральная ўлада. Асабліва важным для ўнутранай кансалідацыі грамадскіх вярхоў быў агульназемскі прывілей, выдадзены Казімірам у 1447 г. Князі, паны і баяры ўсёй дзяржавы (прывілей выдаваўся падданым «Вялікага Княства Літоўскага, Рускага і Жамойцкага») незалежна ад веравызнання атрымалі новыя правы і свабоды. У прыватнасці, яны былі вызвалены ад дзякла і серабшчыны, набылі права вольнага выезду за мяжу, а таксама права судзіць сялян і мяшчан, якія жылі ў межах іх уладанняў. Гэтыя выгоды прывілей гарантаваў і князям, і панам, і дробнаму баярству, аб'ядноўваючы, такім чынам, у адзін стан і нобіляў, і сярэднія сацыяльныя групы. Па значнасці Казіміраў прывілей 1447 г. можна параўноўваць з Кошыцкім, які атрымала польская шляхта ў 1374 г., бо фактычна з яго бярэ пачатак парламентарызм у Вялікім Княстве Літоўскім: для вырашэння такіх пытанняў дзяржаўнага значэння, як збор фінансавых сродкаў, цяпер патрабаваўся непасрэдны ўдзел вызваленых ад падаткаў (дзякла і серабшчыны) падданых вялікага князя, каб атрымаць іх згоду.

Самастойнае абранне Казіміра Ягайлавіча на віленскі пасад разарвала персанальную унію з Каронай, адноўленую Жыгімонтам у 1432 г., і юрыдычна абедзве дзяржавы Ягайлавічаў з 1440 г. зноў нічым не былі аб'яднаныя. Але ў 1444 г. у бітве пад Варнаю загінуў без вестак польскі кароль Уладыслаў, і палякі прапанавалі карону Казіміру як яго маладзейшаму брату. Радныя паны ў Вялікім Княстве спачатку не дазвалялі вялікаму князю ісці на гэта. Калі ж прапанову паўтарылі, вяльможы, пасля доўгага абмеркавання прын-





*Замкавая гара ў Вільні з руінамі Замка Гедыміна.*
*Стан на 1830-я г. Карціна М.Янушэвіча.*

цыпаў новага саюзу, змянілі сваё стаўленне да уніі. Яны патрабавалі, каб у акце аб'яднання не значылася ні слова пра інкарпарацыю ці падпарадкаванне: злучэнне магло быць толькі добраахвотным саюзам дзвюх раўнапраўных дзяржаў. У чэрвені 1447 г. са згоды паноў–рады Казімір Ягайлавіч прыняў польскую карону. Заключаная унія мела персанальны характар: вялікі князь літоўскі адначасова з'яўляўся і каралём польскім. Хоць палякі яшчэ неаднаразова (у прыватнасці, у 1448 і 1451 г. і пазней) патрабавалі вярнуць прававую сілу Крэўскага акта, гэта сустракала катэгарычны супраціў з боку Вільні.

Дачыненні паміж Каронай Польскай і Вялікім Княствам Лтоўскім пагаршаліся і з прычыны тэрытарыяльных спрэчак. Яны не перарасталі ў вайну, відаць, толькі дзякуючы цвёрдай палітыцы Казіміра, які, быццам арбітр, залагоджваў вострыя канфлікты. Прыкладам, калі ў 1452 г., пасля смерці Свідрыгайлы, гаспадарская рада выслала войска на чале з пінскім князем Юрыем, Радзівілам і Юршай займаць Валынь, палякі рыхтаваліся выправіць туды сваё шляхецкае рушанне. Магло б дайсці да вайны, каб Казімір не здолеў супакоіць і польскіх паноў, і магнатаў Вялікага Княства Літоўскага.

У знешняй палітыцы Казіміра адным з найбольш значных актаў было падпісанне «вечнага міру» з вялікім князем маскоўскім Васілём Сляпым у 1449 г. Пасля ваенных акцый 1444 г. з мэтай здабыцця Вязьмы ён пайшоў на гэты мір і значныя саступкі Маскве па той прычыне, што рэальную небяспеку яго княжанню нёс Міхаіл Жыгімонтавіч (Міхалюшка). Атрымаўшы ў 1444 г. ад Казіміра гарады Клецк, Старадуб і Бранск, той не задаволіўся, бо разлічваў на Трокі як спадчыну Кейстутавага роду і спадзяваўся на мітру вялікага князя. Па ягонай наводцы з 1448 г. штогод на паўднёвыя землі ВКЛ пачалі налятаць крымскія татары.



*Старонка беларуска–літоўскага летапісу 1446 г.*

Пагадненне 1449 г. паміж Масквой і Вільняй размежавала сферы іх уплыву і надоўга стабілізавала ўзаемаадносіны паміж двума цэнтрамі аб’яднання ўсходнеславянскіх тэрыторый. Вялікі князь маскоўскі (унук Вітаўта) абавязаўся не мяшацца ў смаленскія справы, а Казімір — не ўступацца за Ноўгарад, Пскоў ды Ржэў і прызнаў уладу выбранага ў Маскве мітрапаліта Іоны (1448—1461), які адмовіўся падпарадкоўвацца Рыму і сарваў Фларэнційскую унію. Манархі дамовіліся таксама не прымаць князёў–перабежчыкаў. Для Вільні дамова 1449 г. стала фактычна паваротным пунктам яе ўсходняй палітыкі. У адрозненне ад часоў Вітаўта, цяпер яна адмаўлялася ад актыўнай ролі на сумежных усходнеславянскіх землях і пакідала іх у сферы маскоўскага ўплыву.



Адной з прычынаў аслаблення ўсходняй палітыкі Казіміра Ягайлавіча стала рэзкае ўзрастанне пагрозы з боку Асманскай імперыі і працяглая вайна Польскага каралеўства з Тэўтонскім ордэнам (1453—1466), у якой ВКЛ афіцыйна не ўдзельнічала. Захоп Канстанцінопаля туркамі ў 1453 г. і падпарадкаванне імі Крымскага ханства (1466) вымушалі Казіміра Ягайлавіча ўзгадняць сваю маскоўскую палітыку з антытурэцкімі планамі. Тым часам Масква яшчэ ў 1451 г. паставіла ў залежнасць, а ў 1485 г. канчаткова падпарадкавала Цвер. Тады ж была ліквідавана самастойнасць Разанскага княства. Ноўгарадская рэспубліка, шукаючы падтрымкі ў супрацьборстве з Масквой, выказала Казіміру Ягайлавічу свой намер далучыцца да Вялікага Княства — пры ўмове захавання сваёй прававой сістэмы і мясцовага ладу. Аднак Казімір пайшоў толькі на тое, што даў намесніка ў Ноўгарад, якім стаў слуцкі князь Міхаіл Алелькавіч. Не атрымаўшы падтрымкі, Ноўгарад Вялікі ў 1471 г. зноў пацярпеў ад маскоўскага войска, а ў 1478 г. Іван III канчаткова падначаліў рэспубліку сваёй уладзе і зліквідаваў яе вечавыя інстытуты.

Знешнепалітычная пасіўнасць Вялікага Княства была прычынай таго, што неўзабаве яно страціла свайго апошняга саюзніка на ўсходзе — хана Ахмата. У 1480 г. той павёў ардынскае войска на Маскву і чакаў падмогі ад Казіміра, што адпавядала іхняй дамове аб супольных дзеяннях, аднак абяцаныя сілы з Вільні так і не з’явіліся. Пасля вядомага стаяння на рацэ Угры татары пайшлі назад, спусташаючы па дарозе уладанні Казіміра Ягайлавіча — «помсцячы за здраду». А Маскоўская дзяржава, дзякуючы такому выхаду канфлікта, канчаткова скінула з сябе залежнасць ад Залатой Арды.



*Жыхары Вялікага Княства. З даўняй гравюры.*

На пагаршэнне палітычнага становішча Вялікага Княства ў значнай ступені ўплывала пастаянная адсутнасць манарха, што справядліва выклікала незадаволенасць паноў і князёў. Стаўшы польскім каралём, Казімір Ягайлавіч займаўся пера-

важна польскімі справамі і ў Кракаве праводзіў намнога больш часу, чым у Вільні. Напрыклад, у 1470 г. ён першы раз за 17 гадоў наведаў Полацк, Віцебск і Смаленск. Гэта зніжала эфектыўнасць цэнтральнай улады, адмоўна адбівалася на дзяржаўнай палітыцы Вялікага Княства. Паны–рада неаднаразова прасілі Казіміра, каб ён або стала знаходзіўся ў межах свайго княства, або згадзіўся на абранне новага гаспадара. Пытанне пра выбар новага вялікага князя ставілася радай двойчы, у 1456 і 1461 г. Як кандыдат на віленскі пасад у 1456 г. фігураваў Сямён Алелькавіч — праваслаўны слуцкі князь, праўнук Альгерда, якога выстаўляла палітычная эліта не толькі беларуска–ўкраінскіх, але і ўласна літоўскіх зямель. Іх партыю ўзначальвалі віленскі ваявода Ян Гаштаўт і праваслаўны князь Юры Астрожскі. У 1461 г. зноў кандыдаваў Сямён Алелькавіч. У якасці альтэрнатыўнага варыянта гаспадара прасілі перадаць вялікакняскую ўладу аднаму са сваіх сыноў. Аднак Казімір ні на што не пагаджаўся. У 1478 г. на сойме ў Берасці ён заявіў, што «пры сваім жыцці нікому не даручыць кіравання Літвою».

Незадаволенасць Казімірам Ягайлавічам і ўнутраныя супярэчнасці выліліся ў бунт удзельных князёў супраць манарха. У 1481 г. нашчадкі Альгерда слуцкі князь Міхаіл Алелькавіч і Хведар Бельскі, а таксама Юры Гальшанскі ды Іван Глінскі падрыхтавалі замах на гаспадара з мэтай ажыццяўлення дзяржаўнага перавароту. Польскі гісторык Аскар Галецкі адзначыў, што змова мела характар родавай акцыі Алелькавічаў. Планавалася, што Казімір IV будзе забіты ў Кобрыні, куды ён меўся прыехаць на вяселле Хведара Бельскага з Ганнай Кобрыньскай. Аднак змоўшчыкаў своечасова выкрылі. Гальшанскага ды Алелькавіча схапілі і 30 жніўня 1481 г. пакаралі смерцю — прылюдна адсеклі галовы на адной з плошчаў у Вільні, а Бельскі з Глінскім уцяклі ў Маскву. Там яны хацелі атрымаць дапамогу і абяцалі за гэта далучыць да маскоўскіх уладанняў беларускія землі ажно па Бярэзіну. Пазней праз гэта іх выступленне выдавалася за праяву гравітацыі беларусаў да Масквы. У сапраўднасці ж яно было дынастычнай змовай старой княскай арыстакратыі, пакрыўджанай ліквідацыяй удзелаў, якая лічыла сябе паўнапраўнай пераемніцай віленскага пасаду. Бунт князёў не меў ні нацыянальных, ні рэлігійных матываў і на грамадскі рух не абапіраўся. Нямецкі гісторык Горст Ябланоўскі, які грунтоўна даследаваў



становішча тагачасных русінаў (беларускага і ўкраінскага насельніцтва) у Вялікім Княстве Літоўскім, не знайшоў ні рэлігійных, ні тым больш нацыянальных матываў у фактах пераходу часткі яго эліты ў падданства маскоўскага ўладара. Арыентацыя тагачаснай палітычнай апазіцыі Казіміру Ягайлавічу наогул не адлюстроўвала настрояў шырэйшых колаў грамадства.

## IV.3. Абарона ад Масквы і татараў

Пры адноснай стабільнасці ўнутранага жыцця Вялікага Княства Літоўскага ў апошняй трэці XV ст. сталі абвастрацца дачыненні з Масквой. Падпарадкаваўшы ўдзельныя княствы Ўсходняй Русі, цэнтралізаваная дзяржава Івана III усутык падышла да межаў літоўска–беларускага гаспадарства і стала прэтэндаваць на гарады–рэспублікі Пскоў і Ноўгарад. Узрастанне ролі Масквы суправаджалася стварэннем ідэалагічных падстаў яе вышэйшасці. Пасля захопу Канстанцінопаля туркамі (1453) і гібелі апошняга імператара на яго мурах Масква, якая глядзела на падзенне сталіцы універсальнай хрысціянскай дзяржавы як на вынік заключэння Фларэнцыйскай уніі (1439), стала сама прэтэндаваць на яе прэрагатывы. Шлюб вялікага князя маскоўскага з апошняй прадстаўніцай візантыйскага імператарскага дому Соф'яй Палеалог (1472) наблізіў Маскву да наследавання палітычнай ролі «Рамейскага царства». У 1480 г. у «Пасланні на Угру» растоўскі архіепіскап Васіян, заклікаўшы Івана III выступіць супраць татарскага цара Ахмата, упершыню звярнуўся да яго як да сапраўднага, «рускіх краін вялікага хрысціянскага цара». У гэтым тытуле ўтрымлівалася далёкасяжная палітычная праграма. Назваўшыся «государем всея Руси», маскоўскі ўладар выступіў з дамаганнем сваёй улады над усімі ўсходнеславянскімі землямі, якія ніколі не ўваходзілі ў Маскоўскую дзяржаву. Так, ужо ў 1478 г. ён запатрабаваў ад Казіміра Ягайлавіча Полацка, Віцебска, Смаленска ды іншых гарадоў ВКЛ.

Узрослая сіла і ваенная актыўнасць Маскоўскай дзяржавы выклікала пераход на яе бок напаўсамастойных чарнігава–северскіх і вярхоўскіх удзельных князёў. Раней многіх уцекачоў ад вялікага князя маскоўскага Казімір Ягайлавіч садзіў на ўсходніх ускраінах сваёй дзяржавы, бо спадзяваўся, што, пакрыўджаныя Масквой, яны будуць яе ворагамі. Прыкладам, князю Івану Мажайскаму дасталі-

ся Старадуб, Гомель і Бранск, Шамячычам — Ноўгарад–Северскі і Рыльск, дзедзічу Вярэйскага княства — Любеч і г.д. Атрымалася ж наадварот: у новых умовах нашчадкі амаль усіх маскоўскіх уцекачоў зноў адыходзілі да Масквы. Але было б несправядліва трактаваць іх адыход як звычайную здраду. Паводле іх дагавораў з вялікімі князямі літоўскімі апошнія мусілі бараніць сваіх падапечных, але гэтага не рабілі ні Казімір Ягайлавіч, ні пазней ягоны сын Аляксандр. Ва ўмовах пастаяннага ваеннага ціску з боку Масквы і пасіўнасці Вільні некаторыя з вярхоўскіх князёў супраціўляліся, але пабачыўшы, што дамову не выконваюць самыя вялікія князі літоўскія, напаўзалежныя Рурыкавічы здымалі з сябе абавязак захоўваць ім вернасць.



*Вялікі князь маскоўскі Іван III (1462—1505).*

Тым часам пасля распаду Залатой Арды на Астраханскае, Казанскае і Крымскае ханствы для ВКЛ асабліва небяспечным суседам стала апошняе, аб'яднанае ў сярэдзіне XV ст. пад уладаю дынастыі Гірэяў. Пры хане Менглі–Гірэю, які ў 1466 г. прыйшоў да ўлады пры падтрымцы туркаў, Крымскае ханства ператварылася ў васала Асманскай імперыі. З крымскім ханам зблізіўся і вялікі князь Іван III ды заключыў з ім пагадненне. У выніку з 1474 г. пачаліся набегі татараў на Падолле, паўднёва–ўсходнія раёны Польшчы, Валынь, Кіеўшчыну і ажно на землі Беларусі.

На ўсходзе памежныя гарады і валасці Вялікага Княства ўжо напрыканцы панавання Казіміра Ягайлавіча сталі аб'ектам рабаўнічых нападаў служылых людзей маскоўскіх. У 1492 г., як толькі памёр Казімір IV, Маскоўская дзяржава распачала першую адкрытую вайну за гэтак званую «вотчыну». Падтрыманы новай хваляй князёў–перабежчыкаў (на бок Масквы тады перайшлі Сямён Варатынскі, Міхаіл Мязецкі, Андрэй і Васіль Бялеўскія), Іван III



без цяжкасцяў авалодаў землямі ў вярхоўях Акі, заняў Мязецк, Сярпейск, Масальск, Вязьму. Каб замацаваць поспех, ён прасіў крымскага хана ўдарыць па Княству з поўдня, а ў 1493 г. накіраваў паслоў да Тэўтонскага ордэна і мазавецкага князя з мэтай утварэння ваеннага альянсу супраць Ягайлавічаў.

Паны–рада Вялікага Княства папрасілі маладзейшага Казіміравага сына Аляксандра ў небяспечнай сітуацыі не пакідаць дзяржавы і прапанавалі яму пасад манарха. Для большай законнасці абрання асобнага ад Польшчы гаспадара ў такі зручны момант у Вільню на з'езд былі паклікапы паны, баяры і зямяне з тэрыторыі ўсёй дзяржавы. Канкурэнтам маладога Ягайлавіча стаў слуцкі князь Сямён Міхайлавіч з Алелькавічаў, які ўехаў у сталіцу з вялікім уласным почтам, але рада абвясціла, што вялікакняскі пасад перадаецца Аляксандру згодна з апошняй воляй яго бацькі Казіміра, і гэта вызначыла вынікі выбару.

30 ліпеня 1492 г. Аляксандр быў абвешчаны вялікім князем літоўскім без усялякіх узгадненняў з палякамі, а праз тыдзень гаспадар выдаў прывілей, якім пацвердзіў ранейшыя правы і вольнасці шляхты і абмежаваў уладу манарха на карысць паноў–рады.

Імкнучыся спыніць агрэсію ўсходняга суседа, Аляксандр накіроўваў паслоў у Маскву са скаргамі на парушэнне міру, а ў Заволжскую Арду і Польшчу — з просьбай дапамогі, спрабаваў схіліць на свой бок Крым. У 1494 г. віленскім паслам нарэшце ўдалося падпісаць мірнае пагадненне з вялікім князем Іванам Васілевічам, якое вызначыла новыя межы паміж дзяржавамі. Вяземскае княства і землі ў вярхоўях Акі адышлі да Масквы. Мір быў замацаваны шлюбам Аляксандра Казіміравіча з дачкой Івана III князёўнай Аленай, якая ў 1495 г. пераехала ў Вільню.



*Аляксандр Казіміравіч, вялікі князь літоўскі (1492—1506).*

Здавалася, сваяцтва манархаў павінна было палепшыць адносіны паміж дзяржавамі, аднак дынастычны шлюб толькі ўскладніў іх. Дзякуючы саюзу з Менглі–Гірэем і малдаўскім гаспадаром Стэфанам вялікі князь маскоўскі стаў ажыццяўляць націск на Аляксандра Казіміравіча, а сувязі з дачкой Аленай выкарыстоўваць для збору інфармацыі. Не без ініцыятывы Івана III крымскія татары пачалі штогод урывацца на Ўкраіну і часта дасягаць тэрыторыі Беларусі. А ўсходнія воласці Вялікага Княства рабавалі служылыя людзі маскоўскія. З увагі на пагрозу, якая нарастала з боку Масквы, у 1499 г. была зроблена спроба замацаваць саюз з Каронай на ўмовах Гарадзельскай уніі. Каб умацаваць дзяржаву знутры, Аляксандр задумаў аб'яднаць падданых у межах адной канфесіі — г.зн. ажыццявіць даўні план царкоўнай уніі. План гэты, аднак, не ўдаўся, затое выклікаў агрэсіўную рэакцыю Масквы.



*Татарскі коннік.*
*З сярэднявечнай гравюры.*

Фармальнай прычынай развязвання новай вайны стаў быццам бы праслед грэцкай царквы ў Вялікім Княстве і спробы гвалтоўнага ўвядзення уніі. Іван III гэтым апраўдваў пераход шэрагу памежных князёў (Сямёна Бельскага, Васіля Шамячыча, Сямёна Мажайскага ды інш.) пад ягоную ўладу. У сапраўднасці гвалту над праваслаўем не было. Вялікая княгіня Алена, жывучы ў Вільні, ніколі не скардзілася на гэта ў лістах да бацькі. Аляксандр Казіміравіч спрабаваў зняць канфлікт. Саступіўшы дамаганням цесця, ён упершыню звярнуўся да маскоўскага манарха як да «гасудара ўсяе Русі». Аднак Іван III выправіў з Масквы віленскіх паслоў і ўвесну 1500 г. услед за імі накіраваў войска.

За некалькі месяцаў вайны пад уладай маскоўскага ўладара апынуліся Пуціўль, Мцэнск, Сярпейск, Старадуб, Гомель, Любеч, Ноўгарад–Северскі, Рыльск. Высланыя на абарону межаў сілы найвышэйшага гетмана князя Канстанціна Іванавіча Астрожскага былі разгромлены велізарнай маскоўскай арміяй 14 ліпеня ў бітве на рацэ Ведрашы, што каля Дарагабужа. Па намове Івана III



з поўдня на Валынь і ажно на Берасцейшчыну ўварваліся крымскія татары.

Дзяржава апынулася ў небяспечным становішчы. Аляксандр Казіміравіч прасіў дапамогі ў малдаўскага гаспадара, заволжскага хана, інфлянцкага магістра, а таксама ў сваіх братоў — польскага караля Яна Альбрэхта і караля венграў ды чэхаў Уладыслава. Аднак у вайну з Масквой на баку Вільні ўступіў толькі Інфлянцкі ордэн. Яго магістр Вальтэр фон Плетэнберг (1494—1535) рыхтаваўся да гэтага і сам шукаў саюзнікаў, бо Іван III першым яшчэ ў 1496 г. пачаў ваенныя дзеянні супраць Інфлянтаў. Паколькі і Прусія, і Імперыя пакінулі яго без усялякай падтрымкі, то Плетэнберг мог спадзявацца толькі на антымаскоўскі блок з Вялікім Княствам Літоўскім. У саюзе з Аляксандрам Казіміравічам ён узяўся ваяваць супраць Івана III акурат тады, калі новаабраны вялікі магістр Прускага ордэна наладжваў добрыя адносіны з Масквой для барацьбы супраць Ягайлавічаў. Праўда, Аляксандр Казіміравіч і Плетэнберг нядоўга трымаліся ўмоваў антымаскоўскага трактата. Вялікі князь літоўскі першым жа і парушыў яго, не ўзяўшы ўдзелу ў паходзе інфлянцкага магістра на Пскоў. Не было абяцанай дапамогі і другому альянту — хану Заволжскай арды Шаху–Ахмату. Той павёў свае войска на Маскву, але не дачакаўся падтрымкі з ВКЛ і не змог нанесці ўдару. Затое на зваротным шляху сілы Шах–Ахмата разграміў Менглі–Гірэй. Так былі знішчаны рэшткі магутнае калісьці Залатой Арды ў Заволжы, апошняга саюзніка Вялікага Княства на ўсходзе.

Смерць польскага караля Яна Альбрэхта і прапанова каранавацца Аляксандру зноў паставілі на парадак дня пытанне пра унію з Каронай. У 1501 г. на Пётркаўскім сойме пры ўдзеле дэлегацыі Аляксандра Казіміравіча і паноў–рады былі прыняты папярэднія ўмовы аб'яднання дзяржаў, названыя пазней Мельніцкай уніяй (па месцы яе зацвярджэння каралём). У яе тэксце, што нагадваў гарадзельскую унію, гаварылася, што Карона і Княства «аб'ядноўваюцца і злучаюцца ў адно непадзельнае і аднароднае цела, каб быў адзін народ, адно племя, адно брацтва і супольныя нарады», супольна выбіраюць аднаго манарха. Стаўшы польскім каралём, Аляксандр зацвердзіў гэтае пагадненне. Тое ж зрабілі яго паны–рада. Аднак вальны сойм Вялікага Княства Літоўскага не прызнаваў пётркаўскага акта, паколькі яго ажыццяўленне азначала б поўнае зліццё дзяржаў, а гэта было непрымальным для магнатаў Літвы і Беларусі.

Адсутнасць гаспадара і спадзяванні на дапамогу іншых дзяржаў абумовілі пасіўнасць узброеных сілаў Вялікага Княства. Маскоўскія ваяводы пустошылі валасці Мсціслаўшчыны, Віцебшчыны і Полаччыны, спрабавалі здабыць Смаленск. Толькі ў красавіку 1503 г. было заключана пагадненне аб міры на 6 гадоў, паводле якога Маскоўскае княства ўключыла ў свой склад занятыя ў гэтай вайне велізарныя тэрыторыі з гарадамі Чарнігаў, Старадуб, Гомель, Ноўгарад–Северскі, Рыльск, Любеч, Пуціўль, Хоцім, Бранск, Любуцк, Дарагабуж, Невель, Вяліж ды інш.

Падпісаўшы згаданае вышэй замірэнне з Вялікім Княствам, Іван III усё адно не пакінуў яго ў спакоі. Ён падштурхоўваў да нападаў



*Вывад палону татарамі. З сярэднявечнай гравюры.*

крымскіх татараў, патрабуючы ад хана пустошыць не толькі землі Ўкраіны, але хадзіць «да Слуцка, і да Турава, і да Пінска, і да Менска». У 1503 г. татары двойчы ўрываліся на Беларусь, а ў 1505 г. іх 5–тысячная конніца дайшла да Менска, зрабавала цэнтральную Беларусь і вывела ў няволю дзесяткі тысяч жыхароў.

Абарона ад крымскіх татараў была доўгі час малаэфектыўнай з прычыны недасканалай ваеннай арганізацыі Вялікага Княства,





*Бітва з татарамі.*
*Дрэварыт з «Трактата пра дзве Сарматыі» Мацея з Мехава. 1521 г.*

перадусім недахопу сродкаў. Першай буйной перамогі над наезнікамі яно дамаглося ўлетку 1506 г. Калі 12–тысячная арда ўварвалася на Беларусь ды, рабуючы і палячы ўсё на сваім шляху, распусціла загоны ў напрамку Слуцк — Клецк — Наваградак — Ліда, дворны маршалак князь Міхаіл Глінскі з паспалітым рушаннем здолеў дазвання разграміць яе ў бітве пад Клецкам і вызваліў дзесяткі тысяч палоненых беларусаў. У выніку такога трыумфу хан Менглі–Гірэй на нейкі час стаў саюзнікам Вялікага Княства.

19 жніўня 1506 г. вялікі князь Аляксандр памёр. Паны–рада не паехалі ў Польшчу, а зноў без узгаднення з палякамі склікалі з’езд у Вільні, на які запрасілі князёў, паноў і баяраў з тэрыторыі ўсёй дзяржавы. У колах арыстакратыі хадзілі чуткі пра Міхаіла Глінскага

як альтэрнатыўнага кандыдата на вялікакняскі стол. Гэта адлюстравала антыдынастычныя настроі, але, як і ў выпадку з Сямёнам Алелькавічам, рэальнага значэння не мела. 2 кастрычніка «аднастайнаю воляю» прысутных гаспадаром быў абраны другі Казіміраў сын Жыгімонт, вядомы ў гістарыяграфіі пад мянушкай «Стары».

Калі ў Маскве пасля ваяўнічага Івана III вялікім князем стаў Васіль Іванавіч (1505—1533), віленскі ўрад ультыматыўна запатрабаваў ад яго вярнуць захопленыя ў апошняй вайне землі. Пасля адмоўнага адказу вальны сойм пастанавіў рыхтавацца да вайны. Сабранае паспалітае рушанне было ўжо гатовае ісці на Севершчыну, калі маскоўскае войска з поўначы і ўсходу першым уварвалася на Беларусь, чым пачало чарговую, трэцюю па ліку вайну. У дадатак на пачатку 1508 г. на Беларусі выбухнуў бунт князя Міхаіла Глінскага. Упаўнаважаны маскоўскага ўрада дзяк Губа Маклакоў падпісаў з мяцежным князем у Тураве пагадненне аб супольных дзеяннях супраць Вялікага Княства Літоўскага. Глінскаму паабяцалі перадаць усе гарады, якія будуць захоплены ў вайне, і ён прыняў падданства Васіля III. На Беларусь да бунтаўнікоў прыйшло вялікае маскоўскае войска на чале з ваяводам Васілём Шамячычам. З ім Глінскі два тыдні трымаў у аблозе Менск, гарнізон якога складалі ўсяго 30 чалавек, аднак у абароне горада самы актыўны ўдзел бралі мяшчане, і ўсе штурмы былі паспяхова адбітыя. Пасля няўдалай аблогі Менска Глінскі з Шамячычам спрабавалі захапіць Оршу, а іншыя ваяводы пустошылі ваколіцы Слуцка, Слоніма, Клецка, Навагрудка — «землю воевали мало не до Вильны». Па сведчанні самога Глінскага, яны «везде огонь пускали, и шкоды чинили, и полону на колко десять тысяч взяли». Але паддаўся ім толькі Друцк. Іншыя гарады Беларусі адбіліся. Бунтаўнікі не атрымалі ад беларускага насельніцтва ніякай падтрымкі, так што ні пра які "нацыянальны" характар паўстання Міхаіла Глінскага гаварыць не даводзіцца.

Летам 1508 г. шляхецкае рушанне Вялікага Княства Літоўскага на чале з гетманам Канстанцінам Астрожскім пры падтрымцы польскіх харугваў без асаблівых сутычак выгнала непрыяцеля за межы краіны. Потым пад Слуцкам князь Астрожскі разбіў і крымскіх татараў, нaкліканых на край Глінскім. Вайна скончылася кампрамісным пагадненнем аб «вечным міры», падпісаным у верасні 1508 г. Новы трактат замацаваў дзяржаўныя межы, што склаліся ў выніку вой-



наў Івана III. Род Глінскіх атрымаў права выехаць у Маскву. За ім пацягнуліся князі Адзінцэвічы, Друцкія, Казлоўскія.

Нават тая вайна, да якой у Вільні рыхтаваліся, скончылася без карысных вынікаў. Адной з прычын гэтага была ўжо тады выяўленая ваенная слабасць Вялікага Княства Літоўскага ў параўнанні з Маскоўскай дзяржавай. У мэтах больш эфектыўнага выкарыстання ваенна–эканамічнага патэнцыялу ўрад імкнуўся ўдасканаліць арганізацыю земскай службы. Яшчэ навагрудскі сойм 1502 г. вызначыў норму службы: усе землеўладальнікі былі абавязаны выстаўляць па адным добра ўзброеным конніку з кожных 10 сялянскіх службаў. Менскай ваеннай уставай 1507 г. канчаткова зацвярджаўся ўрад гетмана найвышэйшага з паўнамоцтвамі дыктатара на час ваенных дзеянняў, прызначаліся нормы пакаранняў: за спазненне на месца збору ваеннаабавязаны мусіў плаціць 100 рублёў грошай, а калі і праз тыдзень не прыязджаў у войска — страчваў жыццё. Апошняе пагражала і за ад'езд з тэатра ваенных дзеянняў без дазволу.




*Жыгімонт I Стары, вялікі князь літоўскі (1506—1548).*

Аднак гэтыя захады мала павысілі эфектыўнасць шляхецкага рушання. Як шматлікія прывілеі, раздадзеныя шляхце, так і адсутнасць моцнай цэнтральнай улады, асабліва яе выканаўчых органаў, у часы цяжкіх войнаў адмоўна ўплывала на абароназдольнасць дзяржавы.

Пасля «вечнага міру» 1508 г. зноў пачасціліся наезды крымскіх татараў на тэрыторыі Вялікага Княства. У 1510 г. яны вялікімі сіламі ўварваліся на Беларусь і дайшлі амаль да Вільні. Найбольш жа цярпелі ад татараў украінскія землі, што станавіліся арэнай нападу амаль штогод. Да актыўных дзеянняў крымскага хана зноў падштурхоўваў і вялікі князь маскоўскі Васіль III. Мір,

падпісаны з Жыгімонтам Старым, ён выкарыстаў для падрыхтоўкі новай вайны. Цяпер надзейным саюзнікам Масквы стаў Тэўтонскі ордэн, які з 1466 г. быў у васальнай залежнасці ад Польскага каралеўства і прагнуў дамагчыся рэваншу ды вярнуць страчаныя раней Гданьск, Торунь і іншыя землі. Заручыўшыся падтрымкай вялікага магістра Альбрэхта Брандэнбургскага, восенню 1512 г. Васіль III распачаў чарговую інтэрвенцыю.

Галоўныя маскоўскія сілы імкнуліся захапіць Смаленск, а іншыя ваявалі воласці Оршы, Друцка, Віцебска. Але кампанія 1512 г. не мела поспеху. Панёсшы цяжкія страты пад Смаленскам, які добра бараніўся, ваяводы адступілі. На наступнае лета Васіль III правёў другі смаленскі паход — зноў безвыніковы.



*Імператар Максімільян I (1493—1519). Гравюра 1519 г.*

Тым часам асаблівую цікавасць да саюзу з Масквой выявілі Габсбургі, якім патрэбна было выцесніць Ягайлавічаў з Чэхіі і Венгрыі. Паўстаў план цэлай кааліцыі супраць Ягайлавічаў, з якім у 1513 г. у Маскву накіраваўся імператарскі пасол Шнітцэнпаўмер. У кааліцыю апрача Васіля III ды імператара Максімільяна I мелі ўвайсці вялікі магістр прускі, магіст інфлянцкі, кароль Даніі, нямецкія князі Саксоніі ды Брандэнбурга, а таксама валошскі ваявода. У Даніі планавалася правесці з'езд удзельнікаў альянсу з мэтай падпісання трактата.

Маскоўскі ўладар ухапіўся за прапанову саюзу, але перайначыў яго ўмовы: сваім партнёрам па дагаворы ён разглядаў толькі імператара, адкінуўшы саму ідэю дацкага з'езду. У Маскве быў складзены тэкст новай дамовы пра пажыццёвы наступальна–абарончы саюз Васіля III з Максімільянам I супраць Жыгімонта Старога і яго дзяцей. Згодна з ім імператар мусіў выступіць пад лозунгам абароны Ордэна і вяртання яму адабраных палякамі тэрыторый, а вялікі князь маскоўскі — за вяртанне земляў «рускіх». Маскоўская рэдакцыя пагаднення выклікала незадаволенасць Максімільяна I, тым



не менш 4 верасня 1514 г. ён ратыфікаваў трактат, пасля чаго накіраваў да Васіля III чарговае пасольства, зняўшы з тэксту пункты пра дапамогу Маскве ў адваяванні «рускай вотчыны».

Пад час трэцяй ваеннай кампаніі ўлетку 1514 г. 80–тысячная маскоўская армія авалодала Смаленскам і рушыла ўглыб Беларусі. Гарады Мсціслаў, Крычаў і Дуброўна капітулявалі. Над дзяржавай навісла вялікая небяспека. Да генеральнае бітвы, якая спыніла рух агрэсараў, дайшло 8 верасня 1514 г. паміж Оршай і Дуброўнай. На берагах Дняпра і Крапіўны маскоўскую армію сустрэла 30–тысячнае войска найвышэйшага гетмана Канстанціна Астрожскага. «Бысть побоище великое Москвичем с Литвою под городом под Оршею, и вскричаша, и возопиша жены Оршанки на трубы Московския, и слышати было стуку и грому великого между Москвич и Литвою. И удариша Москвичи на Литву <...>, и треснули копья Московския <...> И бысть непособие Божие Москвичам». Дзякуючы таленту гетмана амаль утрая большая маскоўская армія пацярпела поўнае паражэнне. Знішчэнне галоўных сілаў непрыяцеля ў той момант было раўназначна абароне суверэнітэту Вялікага Княства. Аршанская перамога трывала ўвайшла ў беларускую гісторыю. Яна апявалася ў даўняй беларускай народнай песні:

*Слава Воршы ўжо ня горша,*
*Слаўся, пан Астрожскі!*

Неаднакроць згадвалі яе і беларуска–літоўскія летапісы. У Кароткім Валынскім летапісе ўжо праз год пасля бітвы з'явілася пахвала князю Астрожскаму — сапраўдны гімн пераможцу і яго віцязям. Прыгадваючы словы прарока Ісаі пра тое, што за памнажэнне зла і няпраўды пралієцца кроў людская, летапісец адзначыў, што гэтым прароцтвам быў адораны Астрожскі, які, разграміўшы маскоўскую армію, «...цэрквы Божыя хрысціянскія і многіх мужоў і жон іх ад насільства абараніў».



*Вялікі князь маскоўскі Васіль III (1505—1533).*

Хоць трыумф пад Оршай і не прынёс пераломy ў вайне, яго

ўмела выкарыстаў у дыпламатычных мэтах Жыгімонт Стары, разаслаўшы вестку пра перамогу па еўрапейскіх дварах. Пасля інфармацыі пра Аршанскую бітву Максімільян I канчаткова змяніў свае пазіцыі, абвясціў, што больш не адчувае сябе звязаным са старой дамовай з Васілём III, і маскоўска–габсбургска–ордэнская кааліцыя распалася. На Венскім кангрэсе 1515 г. Ягайлавічы і Габсбургі



*Конніца гетмана Канстанціна Астрожскага ў бітве пад Оршай 8 верасня 1514 г. Фрагмент жывапіснай карціны 1520-х г.*



паразумеліся. Ваенныя дзеянні на нейкі час амаль перапыніліся і звяліся ў асноўным да рэйдаў на чужую тэрыторыю. Аднак з поўдня яшчэ актыўней пачалі нападаць крымскія татары. У 1518 г. іх напад амаль супаў з паходам чатырох груповак маскоўскага войска на Беларусь. Ваяводы Васіля III пустошылі адначасова Падняпроўе і Полаччыну, сягаючы самага Менска. На баку Масквы тады ў вайну ўступіў і Тэўтонскі ордэн.

Толькі ў 1520 г. ваенныя дзеянні перапыніліся, і маскоўскі ўладар, заклапочаны саюзам Жыгімонта Старога з Крымскім ханствам ды перамогамі над Ордэнам, пайшоў на перамовы. Праз 2 гады вялікае пасольства на чале з полацкім ваяводам Пятром Кішкам падпісала ў Маскве дагавор аб міры тэрмінам на 5 гадоў. Смаленск застаўся ў складзе Маскоўскай дзяржавы.



*Гетман найвышэйшы Канстанцін Астрожскі. Літаграфія Ц. Замойскай (1822) паводле даўняга партрэта.*

Так канец XV — першая трэць XVI ст. прайшлі ў амаль бясконцых войнах з Маскоўскім княствам і Крымскім ханствам. Летапісы паведамляюць пра 13 уварванняў маскоўскіх ваяводаў у межы Беларусі. Вайна вымагала ад дзяржавы і грамадства пастаяннай напругі, велізарных фінансавых затратаў, падрывала гаспадарку. Асабліва спустошанымі былі землі на ўсходзе і поўначы Беларусі. Некаторыя раёны проста бязлюдзелі. Прыкладам, у Гомельскай воласці ў сярэдзіне XVI ст. шчыльнасць насельніцтва не дасягала 1 чалавека на 1 кв. км.

З іншага боку, знешняя агрэсія з'явілася падставай

унутранай кансалідацыі Літвы і Русі (Беларусі), прывяла да канчатковага вызначэння тэрытарыяльнага складу Вялікага Княства Літоўскага ў шырокім сэнсе. Землі, якія не мелі трывалай сувязі з ядром дзяржавы (Вярхоўскія і Северскія княствы), адышлі да Масквы, а іншыя — яшчэ шчыльней аб'ядналіся ў Вялікім Княстве. У гэтай сувязі паказальна, што ўзняты ў 1508 г. бунт князя Міхаіла Глінскага, так актыўна падтрыманы Масквой, не знайшоў на тэрыторыі Беларусі ніякай рэальнай падтрымкі насельніцтва.

# V. Дзяржава і грамадства

## V.1. Тэрыторыя дзяржавы і становішча беларускіх зямель

У тэрытарыяльным плане дзяржава ўяўляла з сябе кангламерат самых розных зямель і ўладанняў — гаспадарскіх вотчын, удзельных княстваў, зямель–вобласцяў (анексаў) і напаўсамастойных княжанняў. Знаўца праблемы Мацвей Любаўскі вылучаў дванаццаць тэрытарыяльна–гістарычных частак: уласна Літву, Русь Літоўскую, Жамойць, Палессе, Падляшша (Берасцейскую зямлю), пяць асобных вобласцяў (Полацкую, Віцебскую, Смаленскую, Кіеўскую, Валынскую і Падольскую) і раздробленыя Чарнігаўска–Северскія землі. Ядром Вялікага Княства Літоўскага была гістарычная Літва і тая частка Беларусі, што ўваходзіла ў гаспадарскую вотчыну. Вотчыну ўтваралі даўнія родавыя ўладанні вялікіх князёў літоўскіх разам з далучанымі да іх пазней розным шляхам беларускімі гарадамі і валасцямі — Наваградкам, Горадняй, Берасцем, Браславам, Слонімам, Менскам, Бабруйскам, Мазыром, Магілёвам, Рагачовам, Гомелем, Пінскам, Клецкам.

Фармаванне тэрыторыі дзяржавы завяршылася толькі ў 1520-х г. Ад часоў Альгерда і Кейстута яе цэнтральная частка (ядро) захавала след падзелу на дзве паловы, якія ў 1413 г. былі пераўтвораны ў Віленскае і Троцкае ваяводствы. Па колькасці насельніцтва гэтыя

землі значна пераўзыходзілі іншыя абшары дзяржавы. Тут канцэнтравалася большасць уладанняў самога гаспадара, а таксама маёнткаў паноў і князёў. Менавіта на гэтую тэрыторыю распаўсюджваўся і акт Гарадзельскай уніі, які стаў тут галоўным земскім прывілеем.

Толькі абшарамі Вялікага Княства Літоўскага ў вузкім сэнсе як сваёй вотчынай манарх валодаў непасрэдна, г.зн. быў адзіным сувэрэнам усёй улады ў яго межах. Землі тут падзяляліся на гаспадарскія двары (двор не толькі як цэнтр кіравання, але і як акруга, што да яго належала) і воласці. Галоўныя адміністрацыйныя пасады вялікі князь раздаваў дзяржаўцам з буйной зямельнай арыстакратыі, пераважна са старадаўніх літоўскіх родаў. Іх уладанні, як і гаспадарскія двары, былі раскіданы па ўсёй дзяржаве. Паны і князі атрымлівалі ад гаспадара розныя формы імунітэту — падаткавыя ільготы, што ўмацоўвалі іх матэрыяльнае становішча, права на збор мыта, на вытворчасць алкаголю, правядзенне кірмашоў, будаўніцтва замкаў і г.д. На земскую службу яны выязджалі з уласным почтам, засядалі ў цэнтральных органах улады, судзіліся толькі ў гаспадара. Такіх родаў было крыху больш за паўсотні. Значна большую групу складалі сярэднія і дробныя землеўладальнікі — баяры і зямяне, абавязаныя за атрыманую ў карыстанне зямлю ваеннай службай вялікаму князю.



*Вільня.*
*Гравюра з «Універсальнай касмаграфіі» Себасцяна Мюнстара (Базель, 1545).*

Параўнальна з іншымі складовымі часткамі дзяржавы найбольш трывала падпарадкоўваліся цэнтру тэрыторыі вотчынных уладанняў гаспадара. Прынцып кіравання вотчынай адмаўляў традыцыйныя для старабеларускіх зямель формы ўнутранай аўтаноміі. Толькі ўсходнія воласці, далучаныя да ядра Вялікага Княства пазней (пасля 1345 г., калі Альгерд і Кейстут дамовіліся справядліва дзяліць нованабытыя землі) і слаба заселеныя, захавалі некаторыя рудыменты даўняга самакіравання. Цэнтрамі такіх адміністрацыйна–тэрытарыяльных адзінак былі старажытныя гарады — Гомель, Мазыр, Рагачоў, Бабруйск, Магілёў ды інш. Яны самастойна размяркоўвалі павіннасці і падаткі, мелі свой копны (абшчынны) суд, які разглядаў справы, звязаныя галоўным чынам з гаспадаркай. У Беларускім Падняпроўі валашчане імкнуліся атрымаць шырэйшую самастойнасць, у прыватнасці — пазбавіцца прадстаўніка цэнтральнай улады і аднавіць старыя формы самакіравання. Прыкладам, у Магілёўскай і Свіслацкай воласцях кіраўніцтва ажыццяўлялася не намеснікамі гаспадара, а мясцовымі старцамі.



У XV ст. на тэрыторыі Беларусі існавала яшчэ каля дзесяці ўдзельных княстваў, якімі кіравалі князі–васалы ці намеснікі гаспадара. Гэта Мсціслаўскае, Слуцкае, Заслаўскае і Клецкае ў Віленскім ваяводстве і Кобрынскае, Гарадзецкае (з цэнтрам у цяперашнім Давыд–Гарадку на Прыпяці), Пінскае, Тураўскае ды Свіслацкае — у Троцкім. Валодалі імі, як правіла, Гедымінавічы, прадстаўнікі ж дынастыі Рурыкавічаў заставаліся даўжэй толькі ў Друцку і Лукамлі. Увогуле, і літоўскія князі, асеўшы ў аўтаномных удзелах на абшарах Беларусі, пастуова страцілі дынастычныя сувязі ды ў XV ст. сваім становішчам мала чым розніліся ад Рурыкавічаў.

Мсціслаўскае княства спачатку было дзедзічным уладаннем Лугвенавічаў, нашчадкаў Альгерда, а потым, з канца XV ст., ім валодалі князі Жаслаўскія, нашчадкі Івана–Юнута Гедымінавіча, пакуль у 1529 г. яно не «спала» ў дамен Жыгімонта І Старога. Слуцк быў рэзідэнцыяй князя Аляксандра (Алелькі) — сына Ўладзіміра Альгердавіча, які атрымаў замест страчанага Кіева гарады Слуцк і Капыль з іх дварамі. Як уладанне Алелькавічаў Слуцкае княства існавала да XVII ст., пакуль не вымер род, і ў 1612 г. яно перайшло да Радзівілаў. Пінскім княствам, якое належала нашчадкам Нарымонта Гедымінавіча, з 1470 г. валодалі таксама Алелькавічы, а ў 1501 г., пасля смерці княжны Марыі з Алелькавічаў, у спадчыннае валоданне Пінск атрымаў нашчадак уцекача ад маскоўскага самаўладдзя Хведар Іванавіч Яраславіч, які ўнаследаваў пасля бацькі таксама Клецкі і Давыд–Гарадоцкі ўдзелы. Не маючы сыноў, ён адпісаў свае ўладанні Жыгімонту Старому, які ў 1519 г. перадаў іх каралеве Боне. Бона Сфорца атрымала і Кобрынскае княства. У Тураве да 1440 г. сядзелі мясцовыя Рурыкавічы, потым горадам кіравалі намеснікі вялікага князя. У 1505 г. Тураў атрымаў князь Міхаіл Львовіч Глінскі, а ў 1508 г., пасля яго бунту і ўцёкаў у Маскву, старажытны горад на Прыпяці дастаўся князю Канстанціну Іванавічу Астрожскаму.

На ўсходніх межах дзяржавы амаль суцэльную зону ўтваралі княствы Вярхоўскія (тыя, што знаходзіліся ў вярхоўях Акі), а такса-

ма Ноўгарад–Северскае, Старадубскае і Бельскае. Сядзелі ў іх пераважна залежныя ад літоўскага князя Рурыкавічы. У гэтых памежных землях Казімір Ягайлавіч даваў кармленні і вотчыны перабежчыкам з Масквы. Так, Бранск, Старадуб і Гомель у 1446 г. гаспадар аддаў князю Васілю Яраславічу Бароўскаму, а пасля яго ўцёкаў — Івану Андрэевічу Мажайскаму, а Ноўгарад–Северскі і Рыльск атрымаў Васіль Іванавіч Шамячыч. Аднак у канцы XV ст., калі абвастрыліся адносіны з Іванам III, які дэманстраваў большую актыўнасць і сілу, а Казімір Ягайлавіч знаходзіўся пераважна ў Кароне і быў заклапочаны нарастаннем небяспекі з боку Турцыі, яго праваслаўныя васалы з усходніх ускраін разам з вотчынамі пачалі зноў пераходзіць да Масквы.

Паводле прававога становішча ўдзельныя княствы з'яўляліся своеасаблівымі дзяржавамі ў дзяржаве. Прынцып кіравання імі адрозніваўся шырокім аўтанамізмам, паколькі рэальная ўлада ў такіх удзелах належала не гаспадару, а мясцоваму васалу. Падпарадкаванне ўдзельнага князя гаспадару афармлялася двухбаковай дамовай. Першы мусіў выявіць «пакору», адмовіцца ад знешнепалітычнай самастойнасці і абавязацца манарху вайсковай службай. Астатняга падпарадкаванне цэнтру не тычылася. Удзельны князь як вотчыннік валодаў сваім удзелам і мог кіраваць ім, паводле аднаго з гаспадарскіх актаў, «прыбаўляючы і пашыраючы, як тое сам найлепей разумеючы». Ён вяршыў суд, збіраў падаткі з насельніцтва, мог раздаваць зямлю баярам на ўмовах вайсковай службы, нават дзяліць сваё ўладанне — толькі каб не ў шкоду «службе гаспадарскай». Унутранае адміністрацыйнае кіраванне ўдзелам ажыццяўлялася мясцовым баярствам, якое складала раду князя. Наогул, удзельны гаспадар у мініяцюры ўзнаўляў даўнія парадкі вялікіх княжанняў: меў княскі двор і мноства ўрадаў — лоўчага, канюшага, ключніка, акольнічага, сакольнічага і г.д.



*Бона Сфорца (1494—1557), каралева польская і вялікая княгіня літоўская.*



Пры ліквідацыі такога ўдзелу функцыі мясцовага князя пачынаў выконваць прызначаны гаспадаром намеснік (ці ваявода, як называлі некаторых намеснікаў). Яму падпарадкоўвалася мясцовая адміністрацыя, што складалася з цівуна, які прыглядаў за гаспадаркай і збіраў падаткі, ключніка, гараднічага і інш. Гэтым дасягалася большая падпарадкаванасць былога ўдзелу дзяржаўнаму цэнтру, аднак некаторая яго адасобленасць захоўвалася і надалей.

Асаблівы статус у Вялікім Княстве Літоўскім мелі так званыя землі прыслухаючыя — вобласці, або анексы, якія захавалі сваю цэласнасць і адасобленасць. У Беларусі такой аўтаноміяй карысталіся землі Полацкая, Віцебская і Смаленская. Асновай іх падпарадкавання цэнтру быў дагавор («ряд»), які ўлічваў інтарэсы абодвух бакоў. Перш чым пасадзіць у галоўны горад зямлі намесніка, вялікі князь мусіў гарантаваць захаванне яе асноўных правоў — даць прывілей (устаўную грамату), які ўтрымліваў прынцыпы рэгулявання прававых адносін паміж зямлёй і ўладаром дзяржавы. Першыя ўстаўныя граматы землям выдаў Вітаўт: Полацку і Віцебску — у пачатку 1390-х, Смаленску — у 1395 г. Ад яго ж атрымалі такія граматы зямля Кіеўская, Валынь, Жамойць і іншыя вобласці. Вялікія князі Казімір Ягайлавіч ды яго сыны Аляксандр і Жыгімонт потым неаднаразова пацвярджалі Вітаўтавы прывілеі.

Устаўная грамата санкцыявала аўтаномнасць зямлі–анекса, з аднаго боку, і легітымізавала вярхоўную ўладу вялікага князя, з другога. Жыхарам абяцалася, што з прызнаннем вярхоўнай улады вялікага князя іхняе прававое становішча не пагоршыцца. Прызнаючы пэўныя правы зямлі, гаспадар абавязваўся трымацца іх «вечна і непарушна». У граматах яны звычайна называліся «правам дабравольным хрысціянскім», або «вольнасцямі», чым падкрэсліваўся добраахвотны характар далучэння зямлі да Вялікага Княства Літоўскага. Манарх абяцаў берагчы цэласнасць тэрыторыі ўсёй вобласці («Віцябляны [ці Палачаны — аўт.] не дарыцися нікому»), асабістую бяспеку яе жыхарам — сваім падданым, гарантаваў захаванне іх маёмасці, права свабоднага пераезду ў суседнія землі ці за мяжу («путь чист, куды кто хочет, безо всякой зачепки») і г.д. Варта заўважыць, што калі прывілеі землям Валынскай, Кіеўскай і Падляшскай мелі станавы характар, дык устаўныя граматы Полацкай, Віцебскай і Смаленскай даваліся не якой–небудзь адной сацыяльнай групе, а ўсяму насельніцтву вобласці. Так, у полацкім прывілеі гаворыцца, што яго атрымліваюць не толькі князі, паны і баяры, але і «мяшчане і ўвесь горад, і ўся зямля Полацкая», у віцебскім — «мяшчане места віцебскага і ўся зямля Віцебская».

Прызнаючы ўладу вялікага князя літоўскага, зямля–вобласць страчвала палітычную незалежнасць, але захоўвала судова–адміністрацыйную і фінансавую самастойнасць. Палачане, прыкладам, па-ранейшаму самастойна ўсталёўвалі зносіны з Рыгай, самі вырашалі пытанні знешняга гандлю. Земскія адміністрацыйныя пасады ў вобласці займалі мясцовыя князі і баяры. У кіраванне апошнім аддаваліся воласці, якія баяры трымалі «па году». Перад цэнтральнай уладай мясцовыя землеўладальнікі былі абавязаны толькі земскай службай, а простыя жыхары вобласці мусілі ўдзельнічаць у пабудове замкаў, адбываць стацыйныя і дарожныя павіннасці. Усе фінансавыя пытанні ўваходзілі ў кампетэнцыю гарадской абшчыны, фактычна — баярства і заможных мяшчан.

Права вечавых гарадоў «садзіць» сабе князя ў новай сітуацыі жыхары Полацка і Віцебска захавалі і ў адносінах да гаспадарскага намесніка, а пазней — да ваяводы. Згодна з абласнымі прывілеямі, вялікі князь мог прызначыць ім намеснікаў толькі са згоды жыхароў зямлі, іх агульнага сходу. «А каторы будзе ваявода наш ім нялю-



*Полацк. З гравюры 1579 г.*

бы, тады нам ім ваяводу іншага даці, па іх волі», — адзначалася ў устаўной грамаце Полацку 1503 г. І ў Віцебску, і ў Полацку прадстаўнік вярхоўнай улады, займаючы гэтую пасаду, мусіў на крыжы прысягаць абшчыне і абяцаць жыхарам, што не будзе парушаць іх права. Калі ж ён «чыніў крыўды», гарадскі сход скардзіўся



гаспадару, і той абараняў інтарэсы зямлі. Паскардзіліся віцебскія баяры і мяшчане на «цяжкасці і крыўды», якія яны цярпелі ад ваяводы Івана Сапегі, і Жыгімонт Стары прыслаў ім новага ваяводу. Так насельніцтва вобласці брала рэальны ўдзел у кіраванні сваёй зямлёй.

Уваходзячы ў Вялікае Княства Літоўскае, Віцебская і Полацкая землі выпрацоўвалі сваё аўтаномнае, унутранае заканадаўства, а нормы іх мясцовага звычаёвага права ўключаліся ў абласныя прывілеі. Узбагачаныя імі, устаўныя граматы Полацку і Віцебску ўтрымлівалі некаторыя прынцыпы больш шырокай аўтаноміі, чым прывілеі іншым абласцям. Напрыклад, права на суд толькі ў межах сваёй зямлі, на няўдзел у гарнізоннай службе ў іншых гарадах, а таксама згаданае вышэй права на абранне ваяводы. Праўда, на практыцы ў першай палове XVI ст. не ўсё з гэтых прынцыпаў і не заўжды вытрымлівалася, паколькі цэнтральныя ўлады імкнуліся наблізіць палітычны лад ваяводства да агульнадзяржаўных стандартаў.

Асаблівае становішча зямель–анексаў паказвае, што фармальна ў дзяржаўна–прававым сэнсе розныя землі Вялікага Княства Літоўскага аб'ядноўвала толькі прызнанне вярхоўнай улады аднаго гаспадара. Пры адсутнасці агульнага заканадаўства аўтаномныя вобласці жылі сваім правам і сваімі інтарэсамі. Невыпадкова ў крытычныя моманты дзяржава магла распадацца на палітычна самастойныя часткі, як гэта здаралася ў 1432 і 1440 г. Аднак потым яны зноў лёгка аб'ядноўваліся, і нават цяжкія войны з аднаверным маскоўскім уладаром не адкалолі землі Ўсходняй і Паўночнай Беларусі ад ядра дзяржавы, што даказала яе жыццяздольнасць. Што ж магло нейтралізаваць цэнтрабежныя імпульсы і злучыць этнічна і рэлігійна розныя землі ў адзін дзяржаўны арганізм?

Такім аб'яднаўчым пачаткам сталі, з аднаго боку, супольнасць палітычных і эканамічных інтарэсаў прадстаўнікоў розных зямель, а з другога — цярпімасць цэнтральнага кіравання да мясцовых парадкаў, якая забяспечвала зваротную лаяльнасць падданых. Для князёў і паноў беларускіх зямель палітычны лад Вялікага Княства Літоўскага быў бліжэйшы і прывабнейшы, чым парадкі Маскоўскага княства. У дзяржаве вялікага князя літоўскага праваслаўная эліта аўтаномных зямель–анексаў імкнулася атрымаць (і не беспадстаўна) такія ж правы, як і паны каталіцкага веравызнання. Поспеху інтэграцыйнай палітыкі Ягайлавічаў не магло не спрыяць яе універсальнае правіла «старыны не рушым, навіны не ўводзім». Ста-

рына — гэта мясцовыя сацыяльныя, прававыя і фінансавыя нормы, выпрацаваныя ў землях да іх уваходжання ў Вялікае Княства



*Брама гарадскіх муроў Вільні ў канцы XVIII ст. Малюнак Ф.Смуглевіча.*

Літоўскае, гэта старыя звычаі і традыцыі. «...Обычай звечный, стародавный... и есть их старина», — адзначалася ў адной з грамат Жыгімонта II Аўгуста. Да з'яўлення Статутаў абавязак захоўваць старыну быў няпісаным законам, што аберагаў грамадскае жыццё і прававы лад земляў–княжанняў ад умяшанняў дзяржаўнай адміністрацыі. Такое шанаванне старыны дазволіла, напрыклад, Падняпроўскім ды Падзвінскім землям і валасцям стагоддзямі захоўваць сваю самабытнасць і адасобленасць. Старажытныя гарады з вечавой традыцыяй заставаліся там цэнтрамі даўніх валасцяў, а грамадскія сувязі і земскія карпарацыі характарызаваліся незвычайнай трываласцю. Вартае ўвагі тое, што і мясцовае насельніцтва, і вялікія князі часта апелявалі да парадкаў, заведзеных яшчэ Вітаўтам. «Нехай то будет по тому, как здавна бывало, за великого князя Витовта», — паўтаралася часта ў гаспадарскіх граматах. Гаспадар не рэгуляваў і не санкцыяваў усё ўнутранае жыццё грамадства, а толькі сцвярджаў сваю вярхоўную ўладу над «старынай» — мясцовым сацыяльным арганізмам, земствам. Цэнтральнае кіраванне ў такіх землях саступала па значэнні лакальнаму. Вялікі князь трымаў у сваіх руках толькі самыя важныя ўрадавыя функцыі, астатняе пакідаў мясцовым структурам. Мясцовая эліта дзяліла з вялікім князем рэальную ўладу — удзельнічала ў кіраванні сваёй зямлёй, так што падзел на вобласці ў Вялікім Княстве меў не толькі адміністрацыйнае, але і палітычнае значэнне.



Такім чынам, у тэрытарыяльна–палітычным плане на першую палову XVI ст. Вялікае Княства Літоўскае заставалася дзяржавай нецэнтралізаванай і неуніфікаванай. І хоць асноўнай тэндэнцыяй тагачаснай Еўропы стала палітычнае аб'яднанне і адміністрацыйна–прававая уніфікацыя, няма падстаў залічваць яго да асабліва унікальных і нежыццяздольных дзяржаўных утварэнняў, як гэта часам сцвярджалася ў расійскай гістарыяграфіі. Іспанія XVI ст. таксама ўяўляла з сябе кангламерат дзяржаваў (Кастылія, Арагон, Валенція, Леон і інш.), злучаных адно супольным уладаром. У Італіі палітычная раздробленасць на той час толькі паглыбілася. А найбольшае падабенства да мазаічнай карціны дзяржаўнасці нашых далёкіх продкаў можна знайсці ў Святой Рымскай імперыі нямецкай нацыі, што таксама з'яўлялася кангламератам старых і новых інстытутаў, аб'яднаннем розных паводле памеру і статуса тэрытарыяльных утварэнняў. Шматстайнасць і архаізм і тут, і там былі абумоўлены гістарычна, яны фіксавалі асаблівасці розных гістарычных працэсаў і зямель, натуральна злучаючы іх у адно цэлае. У гэтым плане Вялікае Княства Літоўскае істотна адрознівалася ад Маскоўскай дзяржавы. Калі Вільня далучала ўсходнеславянскія землі па дамове, не парушаючы мясцовага грамадскага арганізма, гарантавала падданым недатыкальнасць, пакідаючы іх ранейшыя ўладанні, дык Масква дзейнічала наадварот. Паслядоўна праводзячы палітыку уніфікацыі, вялікі князь маскоўскі пазбаўляў далучаныя землі ўсялякай асобнасці, раздаваў іх у кармленне князям і баярам, прысланым з цэнтра, разбураў лакальныя земскія супольнасці, высяляючы мясцовых жыхароў углыб дзяржавы, на новыя для іх тэрыторыі.

# V.2. Палітычная сістэма

## Вялікі князь

Уладаром дзяржавы быў вялікі князь, або, як ён называўся ў актах з XV ст., — гаспадар. Улада вялікага князя ў межах яго дзяржавы (апрача зямель–анексаў, ці вобласцяў) напачатку нічым не абмяжоўвалася, і ён з'яўляўся адзінай крыніцай права. Але ўжо ў XV ст. яе абмяжоўвалі дадзеныя шляхце прывілеі, а потым і магнацка–шляхецкія палітычныя органы, пра якія будзе ніжэй. У выніку дзяржаўнай уніі з Польскім Каралеўствам сцвердзіўся прынцып выбарнасці манарха, які таксама быў своеасаблівым інструментам абмежавання яго ўлады. Праўда, да вольнай элекцыі 1573 г. выбар ажыццяўляўся з кандыдатаў адной дынастыі, аднак гэта не пярэчыла нормам тагачаснай практыкі. Імператар Святой Рымскай імперыі доўгі час таксама выбіраўся толькі з дынастыі Габсбургаў. Хоць персанальная унія з Каронай неаднаразова разрывалася, звязаныя з ёю правы грамадскай эліты ў адносінах да вялікага князя захоўваліся і мелі важнае палітычнае значэнне.



*Вялікі князь Вітаўт.*
*Літаграфія Ю.Азянблоўскага*
*паводле партрэта XVII ст. з Нясвіжа.*

Да XIV ст. урадавую дзейнасць ажыццяўляў толькі сам вялікі князь, на якім замыкаліся ўсе функцыі кіравання дзяржавай. Ад-



нак патрэбы арганізацыі дваровай гаспадаркі, праблемы ўнутранай і знешняй палітыкі абумовілі ўтварэнне спецыяльных урадаў (пасадаў) і органаў цэнтральнага кіравання. Так, яшчэ пры Вітаўце з'явіліся гаспадарскі і земскі маршалак, пісар, кухмістр, канцлер, падчашы, падскарбі, потым новыя ўрады на ўзор польскіх і нямецкіх ўводзілі Свідрыгайла і Казімір Ягайлавіч. У канцы XV ст. былі ўтвораны ўрады гетмана найвышэйшага, харужага, мечніка, падстолія, скарбнага і інш. Той, хто атрымліваў пасаду, як правіла, валодаў ёю пажыццёва, а пакінуць мог пры пераходзе на іншую (звычайна вышэйшую). Многія ўрадавыя функцыі маглі спалучацца ў руках адной асобы. Але практычна да самай Люблінскай уніі гэтыя пасады не былі самастойнымі інстытутамі, а пералічаныя ўраднікі адно выконвалі даручэнні вялікага князя і ягонай рады. Сапраўднымі ж дзяржаўнымі органамі яны сталі толькі ў 1560-х г., калі пачалі выконваць пастановы вальнага сойма.

У землях–вобласцях пасля ліквідацыі ўдзельнай сістэмы цэнтральную ўладу ўвасаблялі спачатку намеснікі, а потым — ваяводы і старасты. У іх кампетэнцыі было вырашэнне судова–адміністрацыйных і ваенных пытанняў, а таксама нагляд за гаспадаркай вобласці. Ім жа падпарадкоўваліся кіраўнікі ніжэйшых тэрытарыяльных акругаў — дзяржаў і паветаў. Ваяводы, дзяржаўцы ды іншыя прадстаўнікі гаспадарскай адміністрацыі не мелі грашовага забеспячэння і сядзелі на «кармленні», г.зн. утрымліваліся за кошт дзяржання.

## Паны–рада

Першым прававым і рэальным крокам па абмежаванні ўлады вялікага князя стала княская рада. Як кола набліжаных да ўладара дзяржаўных людзей–дарадцаў яна была з'явай агульнаеўрапейскага характару. Крыніцамі засведчана існаванне такога інстытута ўжо для эпохі Кіеўскай Русі. З летапісаў вядома, што полацкі князь Таўцівіл, напрыклад, у 1263 г. раіўся са сваімі полацкімі баярамі. У другой палове XIII ст. у Полацку функцыянавала рада баяраў з 30 чалавек. Інстытут дараднікаў мелі пры сабе і першыя літоўскія князі. Пры іх рада выконвала і палітычную ролю. Міндоўг, а таксама Гедымін важныя палітычныя пытанні абмяркоўвалі ў коле асоб з бліжэйшай арыстакратыі. Вітаўт змяніў склад дараднікаў і акружыў сябе новымі людзьмі — баярамі, супрацьпаставіўшы іх удзель-

ным князям. Пры ім гэтую групу ўтварылі тыя баяры, якія дапамагалі Вітаўту здабываць уладу і атрымалі за гэта зямельныя ўладанні. Часам у нарадах удзельнічалі і праваслаўныя князі. Прынамсі, пытанне аб выдзяленні ўласнай мітраполіі Вітаўт вырашаў, параіўшыся з «нашею братьею, с князьми рускими наших руских земель». З радай Вітаўт абмяркоўваў і свой намер каранавацца.

Да сярэдзіны XV ст. склад рады дакладна не вызначаўся, як і яе кампетэнцыі. Становішча змянілася, калі буйная зямельная арыстакратыя, выкарыстоўваючы ўласную грамадска–палітычную вагу, пачала дамагацца ад манарха юрыдычнага замацавання свайго дамінавальнага становішча. Ужо акты Гарадзельскай уніі далі ёй шырокія палітычныя правы і паставілі вялікага князя ў залежнасць ад паноў і баяраў. Наступным крокам стала прызнанне акрэсленай дзяржаўнай ролі княжат і панят прывілеем 1447 г., у якім Казімір Ягайлавіч пацвердзіў права апошніх выбіраць новага манарха пасля яго смерці. Вядомы Судзебнік 1468 г. ён уклаў «с князьми и с паны–радою нашою Великого Князства Литовского». У тыя дзесяцігоддзі з прычыны частых ад'ездаў вялікага князя ў Польшчу рада пачала выконваць функцыі вярхоўнай улады. Яна ажыццяўляла дыпламатычныя зносіны, кіравала ўзброенымі сіламі, разбірала канфлікты, раздавала землі служылым людзям і г.д. Тады ж больш выразна акрэсліўся і склад рады. У другой палове XV ст. у яе ўваходзілі вышэйшыя духоўныя і свецкія вяльможы, вялікакняскія наместнікі, а таксама ўдзельныя князі, якім гарантавалася месца іх паходжаннем і асабістым правам. Аднак з цэнтралізацыяй дзяржавы роля князёў паніжалася, так што ў XVI ст. паны, дзякуючы атрыманым прывілеям, дасягнулі больш высокага становішча.

Поўнае юрыдычнае замацаванне ролі гаспадарскай рады як дзяржаўнага органа зафіксавалі прывілеі Аляксандра Казіміравіча ад 1492 і Жыгімонта Старога ад 1506 г. Князі, паны і зямяне ўсіх зямель разам з гаспадарскаю радаю, абіраючы манархам Аляксандра, дамагліся ад яго не толькі пацвярджэння сваіх ранейшых правоў і вольнасцяў, але і абмежавання вялікакняскай улады на карысць рады: гаспадар абавязваўся надалей кіраваць дзяржавай не самастойна, а толькі супольна з радаю, не мяняючы без яе згоды нічога ва ўнутраных справах, не раздаючы без яе ведама дзяржанняў, не размяркоўваючы фінансавых сродкаў і г.д. Аднак прывілей



Аляксандра яшчэ не гаварыў пра абавязковасць удзелу рады ў выданні пастаноў, таму пасля 1492 г. былі прыклады і асабістых распараджэнняў гаспадара. Права на гэта яго канчаткова пазбавіў толькі прывілей 1506 г., згодна з якім усе дзяржаўныя пастановы маглі выдавацца вялікім князем толькі пасля іх абавязковага абмеркавання з гаспадарскаю радаю.

У актавых дакументах новы орган улады звычайна называўся «паны рада», «панове рада обоего стану духовные и светские», ці проста «паны». З канца XV да сярэдзіны XVI ст. канчаткова сцвердзіўся яго склад. У раду пастаянна ўваходзілі каталіцкія біскупы — віленскі, луцкі, жамойцкі і кіеўскі, ваяводы (ці старасты) — віленскі, троцкі, жамойцкі (стараста), кіеўскі, полацкі, смаленскі (да 1514 г.), наваградскі, віцебскі, падляшскі, луцкі стараста і валынскі маршалак, наступнымі былі кашталяны (займалі месцы ў той жа паслядоўнасці, што і ваяводы), а таксама цэнтральныя земскія і дворныя ўраднікі — канцлер і падканцлер, гетман, маршалак земскі і дворны, падскарбі. З агульнага складу гэтага органа вылучылася так званая пярэдняя, або старшая рада — вузейшае кола, якое праводзіла закрытыя паседжанні і абмяркоўвала найбольш важныя дзяржаўныя пытанні. У яго ўваходзіла пяць асобаў, якія сядзелі на першай лавіцы: біскуп, ваявода і кашталян віленскія ды ваявода і кашталян троцкія. Неабходнасць прысутнасці іншых вырашаў манарх.



*Вялікі князь і кароль Жыгімонт Стары (1506—1548).*

Шлях у раду адкрываўся для кожнага, хто належаў да вольнага шляхецкага стану і быў падданым Вялікага Княства Літоўскага. Рэальна ж у ёй пастаянна засядалі прадстаўнікі найвышэйшай эліты — князі і паны, якія займалі звычайна не адзін, а некалькі ўрадаў. Напрыклад, урады канцлера і гетмана найчасцей спалучаліся з віленскай і троцкай ваяводскімі пасадамі. Іх уладальнікі былі буйнымі латыфундыстамі, у чыіх руках канцэнтравалася ваенная і фінансава–эканамічная ўлада. У перыяд з 1492 да 1569 г. згаданыя цэнтральныя ўрады займалі прадстаўнікі дзесяці самых заможных родаў — Радзівілаў і Гаштаўтаў, князёў Астрожскіх, Гальшанскіх і Збаражскіх, паноў Хадкевічаў, Глябовічаў, Кішак, Кезгайлаў і Забярэзінскіх. Астрожскі і Хадкевіч былі праваслаўнымі, але ўваходзілі ў «пярэднюю» раду. На менш значныя ўрады праваслаўныя прызначаліся часцей, так што, нягледзячы на Гарадзельскі акт, веравызнанне мала ўплывала на склад паноў–рады. Аднак праваслаўныя духоўнага стану ў яе ніколі не дапускаліся.



*Герб ВКЛ.*
*З кнігі Себасцяна Мюнстара «Універсальная касмаграфія» (Базель, 1545).*

На пачатку XVI ст. ясна вызначыліся і паўнамоцтвы рады. Яна ведала дыпламатычнымі дачыненнямі дзяржавы, абаронай і фінансавымі пытаннямі, а таксама займалася справамі шляхецтва, кантралявала раздачу земляў ды выконвала шэраг судовых функцыяў. Толькі з ведама паноў радных займаліся дзяржаўныя пасады. Ім жа належала і права выбару вялікага князя, які запрашаўся з дынастыі Ягайлавічаў. Так былі абраны Аляксандр Казіміравіч, Жыгімонт I Стары і яго сын Жыгімонт II Аўгуст.

Палітычная вага паноў–рады пачала змяншацца ў сярэдзіне XVI ст., калі ўтварыўся новы, таксама надзелены вярхоўнай уладай дзяржаўны орган — шляхецкі сойм.



## Вальны сойм

Інстытут сойму як станавага прадстаўніцтва быў тыповай з'явай дзяржаўнага жыцця тагачаснай Еўропы. У Англіі з 1265 г. існаваў парламент, у Іспаніі з канца XIII ст. картэзы, у Францыі з 1302 г. генеральныя станы, у Швецыі з 1435 г. рыгсдаг, у тым жа XV ст. з'явіліся райхстаг у Нямеччыне, снэм у Чэхіі, сейм у Польшчы і інш. Польскі прадстаўнічы орган паўстаў на аснове шляхецкіх з'ездаў і сваім прыкладам мог уплываць на фармаванне адпаведнага інстытута ў Вялікім Княстве, які таксама ўтварыўся ў выніку эвалюцыі тэрытарыяльных з'ездаў.

Свой мясцовы сход, паходжанне якога ў гістарыяграфіі прынята звязваць з сярэднявечным вечам, існаваў у кожнай зямлі. У актах XV ст. захавалася багата сведчанняў пра дзейнасць соймаў (земскіх соймікаў) у Полацку, Віцебску, Смаленску ды іншых землях-вобласцях. Удзел у іх спачатку бралі прадстаўнікі самых розных сацыяльных групаў — баяраў, шляхты і мяшчан. На абласных соймах размяркоўваліся дзяржаўныя падаткі, ваенныя павіннасці, прызначаліся кандыдаты на мясцовыя ўрады, разглядаліся судовыя справы, а таксама абіраліся дэлегаты на агульнадзяржаўныя з'езды. Фактычна, у кампетэнцыі агульнага сходу вобласці было вырашэнне ўсіх важных пытанняў земскага жыцця — ад выпрацоўкі лакальных прававых нормаў да пабудовы новых умацаванняў і вызначэння «помачы» вялікаму князю. Аднак з органа шырокага прадстаўніцтва ён паступова трансфармаваўся ў алігархічны інстытут. Барацьба інтарэсаў, якая з другой паловы XV ст. вялася паміж баярамі–шляхтай, з аднаго боку, і мяшчанамі, з другога, скончылася перамогай першых, так што ўжо ў першай трэці XVI ст. абласны соймік ператварыўся ў орган шляхецкага стану. Цяпер ён адстойваў інтарэсы заможных родаў. У Віцебску, напрыклад, з мясцовых элітаў у соймавых пасяджэннях звычайна ўдзельнічалі князі Палубінскія, Сакалінскія, Жылінскія, Горскія, паны Сапегі, Зяноўевічы ды прадстаўнікі некаторых іншых родаў, а ў Полацку — князі Лукамскія, паны Глябовічы, Зяноўевічы, шляхцічы Корсакі.

Пад канец XV ст. на аснове абласных соймікаў паўстаў агульны сойм усіх зямель Вялікага Княства Літоўскага. Як і ў іншых краінах Цэнтральна–Ўсходняй Еўропы, найважнейшым фактарам з'яўлення новага інстытута было наданне шляхецкаму стану такіх прывілеяў, пасля якіх кожная надзвычайная павіннасць вымагала яго згоды. У

выніку манарх мусіў склікаць на агульны з'езд ужо не толькі вышэйшую эліту (раду), але і прадстаўнікоў баярства–шляхты. Далучэнне да гаспадарскай рады на з'ездах няўрадавай шляхты, якая рэпрэзентавала розныя землі, ператварыла іх у агульныя прадстаўніцтвы, у вальныя соймы (вальнымі ў тагачаснай мове называлі агульнадзяржаўныя форумы). І хоць кожны з'езд паноў–рады, асабліва дапоўнены князямі і баярамі, у актах канца XV — пачатку XVI ст. маглі называць соймам, вальным соймам быў толькі той, на які апрача гаспадарскай рады з'язджаліся князі, паны і баяры з усіх зямель дзяржавы. Такім чынам, прынцыповым адрозненнем сойма ад веча ці алігархічнага з'езда была шляхецкая прадстаўнічасць. На вальным сойме прысутнічалі не толькі паны, якія займалі важныя дзяржаўныя пасады, але і няўрадавая шляхта зямель і паветаў — усе, хто валодаў зямлёю па рыцарскім праве.



*Пячатка менскага кашталяна Яна Глябовіча. 1582 г.**

Падобныя форумы сталі звычайнымі тады, калі для вырашэння дзяржаўных пытанняў першаступеннай важнасці цэнтральнай уладзе было важна атрымаць згоду зямель–вобласцяў. Шукаючы апоры на мясцовыя грамадска–палітычныя сілы, вялікія князі склікалі агульны сойм кожнага разу, як толькі з'яўлялася патрэба зацвердзіць новыя падаткі або паўставала праблема адносінаў з іншымі дзяржавамі. Ужо Казімір Ягайлавіч меў за правіла для разгляду самых адказных палітычных пытанняў, найперш уніі з Каронай, склікаць на з'езд апрача паноў–рады шырокае кола князёў і баярства з розных зямель сваёй дзяржавы. Гэтаксама зрабілі паны–рада, калі спатрэбілася абраць новага манарха без узгаднення з Польшчаю. У 1492 г. на віленскі з'езд яны склікалі як арыстакратыю з усіх зямель, так і землеўладальнікаў, якія не займалі дзяржаўных пасадаў. Упершыню разам з радай новага гаспадара абіралі князі, паны і зямяне з тэрыторыі цэлай дзяржавы, незалежна ад веравызнання. Гэтая акалічнасць надавала ўладзе манарха аднолькавую легітымнасць у межах усёй дзяржавы. Віленскі з'езд 1492 г. і можна лічыць першым сапраўдным вальным соймам. Пастаянна ж склікацца соймы пачалі ў часы княжання Жыгімонта І Старога.

У XVI ст. Вялікае Княства Літоўскае ўваходзіла з новым палітычным органам, новай формай дзяржаўнай кансалідацыі.

**Цітоў А. Пячаткі старажытнай Беларусі. Мінск, 1993. С.46.*



Цяпер палітычнае адзінства дзяржавы забяспечвалася не толькі прызнаннем аднаго манарха, але і ўдзелам прадстаўнікоў розных тэрытарыяльных частак у цэнтральным органе ўлады. Праўда, да поўнага вызначэння яго функцый і складу дайшло толькі ў другой палове XVI ст., у выніку дзяржаўных рэформаў напярэдадні Люблінскай уніі. Першапачаткова кампетэнцыі вальнага сойму былі абмежаваныя праблемамі ўнутранага жыцця, пытаннямі уніі і абрання новага манарха. Удзел баярства–шляхты ў ім спачатку быў вельмі нязначны і зводзіўся да ўхвалення прынятых панамі рашэнняў, аднак на абозных соймах, скліканых пад час паспалітага рушання, рыцарскі стан дамагаўся ўсё большага ўплыву. Узрастанне ваеннай небяспекі з боку Маскоўскага княства і Крымскага ханства з канца XV ст. прымусіла манарха і яго раду паставіць у цэнтр увагі праблемы арганізацыі абароны. У гады княжання Жыгімонта Старога гэтая праблема стала наогул галоўнай задачай вальных соймаў. Практычна ўсе яны разглядалі пытанні, звязаныя з вайной. Так, на сойме 1510 г. абмяркоўвалася справа арганізацыі абароны краіны, у 1514 г. прымалася ўхвала аб працягу вайны з Масквой, у 1515 г. прызначалі падаткі на тую ж вайну, у 1516 г. ухвалялі мабілізацыю паспалітага рушання і збор серабшчыны, у 1522 г. выпрацоўваліся ўмовы замірэння з Масквой, і г.д.




*Фрагмент карты Вялікага Княства Літоўскага 1613 г.*

Цяжар земскай абароны клаўся найперш на плечы землеўладальнікаў, таму, каб узгоднена шукаць «способ ку обороне слуш-

ный» — прызначаць новыя падаткі (серабшчыну), новыя нормы земскай службы, — гаспадар мусіў склікаць на соймы ўсю шляхту пагалоўна. Але ў часе вайны ад'езд шляхты на сойм мог абярнуцца цяжкімі наступствамі. Таму ў 1512 г. была прынята норма прадстаўніцтва ўпаўнаважаных паслоў — па два шляхціча ад зямлі ці павета. Пры гэтым і асабістая прысутнасць іншых не забаранялася. Князі ж, паны і ўраднікі па–ранейшаму запрашаліся пайменна. Усе яны разам з пасламі ад шляхты аб'ядноўваліся на сойме ў «рыцарскае кола», тады як паны–рада ўтваралі сваё асобнае кола.

Так паўстаў новы, стала дзеючы палітычны інстытут — вальны сойм, які замкнуў сістэму органаў вярхоўнай улады ў дзяржаве. У адрозненне ад соймаў Швецыі ці Нарвегіі, якія прадстаўлялі і сялян, або снэму Чэхіі, у якім адстойваліся інтарэсы і мяшчанства, сойм Вялікага Княства Літоўскага быў органам чыста шляхецкага прадстаўніцтва. Утварэнне агульнадзяржаўнага сойма азначала абмежаванне ўлады манарха станамі, аднак шляхта супрацьстаяла тут не столькі манарху, колькі панскай алігархіі, якая цалкам дамінавала ў сойме. За «шляхецкую дэмакратыю» належала яшчэ доўга змагацца.

## V.3. Грамадскія структуры

У XV ст. грамадства стала выразна раздзяляцца на асобныя сацыяльна–палітычныя групы. Сацыяльнае расслаенне ў Полацкай зямлі добра прасочваецца на мясцовым актавым матэрыяле. Калі ў 1440—50-х г. полацкія граматы падпісвалі ўсе жыхары Полаччыны — «вси полочане», «полочане, вси люди добрые и малые», дык з 1460-х фігуравала ўжо некалькі асобных групаў: граматы падпісваліся «от бояр полоцких, от мещан и всего посполства», а неўзабаве з'явіліся і сацыяльныя нізы — «чорныя людзі».

Баярамі ў Вялікім Княстве Літоўскім, падобна як раней на Русі, лічыліся ваеннаслужылыя людзі, якія за службу атрымлівалі ад вялікага князя зямельныя ўладанні. Мясцовае баярства ў беларускіх землях–вобласцях даволі рана аб'ядналася і ўзначаліла там земскае жыццё. Дзякуючы сістэме дзяржанняў і кармленняў, яно трымала ў сваіх руках усю мясцовую адміністрацыю. Напрыклад, у рэальным кіраванні Полаччынай удзельнічалі практычна ўсе буйныя баярскія роды зямлі. Да баярства далучаліся і ўдзельныя князі, якія



пасля рэформаў Вітаўта хутка бяднелі, гублялі палітычную вагу і пераходзілі ў стан служылых. Падпарадкоўваючы сабе земскі соймік, баяры і князі праводзілі праз яго юрыдычныя і маёмасныя інтарэсы сваёй групы.

Баяры–шляхта першымі юрыдычна аформіліся ў асобны стан, а з яго выдзяленнем адасаблялася і мяшчанства, якое займала прамежкавае становішча паміж упрывілеяванымі грамадскімі вярхамі і масай сялянства. У мове афіцыйных дакументаў яшчэ доўга пераважала назва «баяры», а тэрмін «шляхта» (польскае *szlachta* паходзіць ад нямецкага *Geschlecht*) у шырокі ўжытак увайшоў толькі з другой чвэрці XVI ст. У Вялікім Княстве, як і ў Кароне, гэтае слова азначала нобіляў (лац. nobilis —высакародны, радавіты, знатны) — катэгорыю людзей з акрэсленымі прывілеямі, правамі і абавязкамі.

Як асобная сацыяльная група баярства ўмацавалася ў часы княжання Вітаўта. Маючы патрэбу ў ваеннай сіле, Вітаўт шчодра раздаваў надзелы сваім васалам, асабліва на беларускіх землях. Пры ім баярства ўпершыню выступіла ў якасці асобнай палітычнай сілы. У тагачасных дзяржаўных актах яно ўжо фігуравала як суб'ект палітычнага жыцця, які браў на сябе пэўныя абавязкі. Ягайлаў прывілей 1387 г. паклаў пачатак кансалідацыі буйнога літоўскага баярства каталіцкага веравызнання з іншымі землеўладальнікамі, а Гарадзельскі акт 1413 г. стаў іх спробай аддзяліцца ад дробнага рыцарства: набілітацыя тычылася толькі буйнога баярства (51 род), якое прымала прывілеі і гербы польскай шляхты, а разам з імі і саму назву «шляхта». Аднак такая алігархічная мадэль панавальнага стану ў Вялікім Княстве не сцвердзілася. Ужо ў 1440 г., каб утрымаць дробнае рыцарства Драгічынскай зямлі ў складзе Вялікага Княства, Казімір Ягайлавіч надзяліў яго, як і ўсё падляшскае баярства, правамі шляхты. На думку польскага гісторыка Генрыха Лаўмяньскага, набілітацыя рыцарства мела для кансалідацыі панавальнага стану намнога большае



*Баярын Вялікага Княства Літоўскага. Гравюра XVI ст.*

значэнне, чым голаснае братанне польскіх і літоўскіх баяраў у Горадлі. Нобілі і простае рыцарства аб'ядноўваліся ў адной прававой групе, у адным стане, цесна звязаным з каранаванай дынастыяй. Шляхецкія правы і прывілеі сталі галоўным фактарам інтэграцыі эліт усіх зямель Вялікага Княства Літоўскага. Розніца веравызнанняў не была тут асаблівай перашкодай. Праз 20 гадоў пасля падпісання Гарадзельскага акта агульназемскі прывілей Жыгімонта Кейстутавіча (1434) распаўсюдзіў правы каталікоў і на праваслаўную арыстакратыю Беларусі ды і Украіны, а агульнадзяржаўны прывілей Казіміра Ягайлавіча 1447 г. значна пашыраў эканамічны і судовы імунітэт усёй



*Фрагмент прывілея падляшскай шляхце, выдадзенага ў 1516 г. Жыгімонтам I.*

шляхты таксама незалежна ад іх веры. Апрача права распараджацца вотчыннымі ўладаннямі і асабістай недатыкальнасці (без судовага разбору асоб гэтага стану нельга было караць), баяры–шляхта атрымалі права выезду за мяжу. Сяляне іх вотчын вызваляліся не толькі ад дзякла і паншчыны на гаспадара, але і ад серабшчыны (за выняткам павіннасці будаваць дарогі і рамантаваць замкі). Раней гэты падатак збіраўся ў выглядзе грошай (срэбра, таму і называўся серабшчынай) і прызначаўся на патрэбы вайны. Саступіўшы баярам серабшчыну, вялікі князь практычна перадаў ім і кантроль за справай абароны, таму цяпер ён кожнага разу мусіў на сойме заручацца іх дазволам на збор сродкаў, без якіх дзяржава не магла абысціся.

У першай палове — сярэдзіне XV ст. асноўныя палітычныя і грамадскія правы шляхты як стану землеўладальнікаў былі ўжо



афармленыя. Прывілеі 1492 і 1506 г. не ўносілі ў яе прававое становішча нічога прынцыпова новага, апрача артыкула аб неўзвышэнні людзей простага паходжання над шляхтай, які азначаў пачатак яе адасаблення. У 1522 г. соймавая ўхвала вызначала парадак доказу шляхецкай прыналежнасці, што засведчыла імкненне ўрада спыніць пастаяннае папаўненне шляхецкага стану служылым баярствам.

У залежнасці ад маёмаснага становішча і палітычнага значэння ў складзе шляхты выдзялялася некалькі страта. Верхнюю ўтварала арыстакратыя — вялікія паны і князі, прадстаўленыя нашчадкамі Рурыкавічаў і літоўскіх дынастый. Яны валодалі вялікімі латыфундыямі і тысячамі падданых сялян, апрача агульнага шляхецкага права мелі яшчэ сваё асобнае, у прыватнасці, былі непадсудныя павятовай адміністрацыі, выступалі на вайну пад уласнай харугвай, выстаўляючы сваё войска з баяр і слуг. Вайсковы попіс 1528 г., у якім зафіксавана колькасць выстаўленых коняў, дазволіў даследчыкам вызначыць групу самых буйных землеўладальнікаў. Гэта Кезгайлы, Радзівілы, Гаштаўты, Алелькавічы, Астрожскія, Осцікавічы, Глябовічы, Забярэзінскія, Кішкі, Хадкевічы, Сангушкі і інш. — разам крыху больш за 20 родаў, якія ставілі амаль трэцюю частку папісанага войска. Асноўную ж масу шляхты ўтваралі сярэднія і дробныя землеўладальнікі, на мове тагачаснай тэрміналогіі — баяры, баяры–шляхта, зямяне, якія валодалі па дзесятку–другім сялянскіх гаспадарак. Яшчэ ніжэй знаходзілася самая дробная шляхта, якая не мела сваіх падданых. Такія шляхцічы валодалі мінімальным надзелам зямлі і за яго самі служылі буйному пану ці вялікаму князю.

Галоўным паказальнікам прыналежнасці да шляхецкага стану былі не гербы, а служба з зямлі, таму да гэтай катэгорыі служылага люду прымыкала і мяшчанства, і заможнае сялянства (прыкладам, конныя мяшчане ў Віцебску, баяры путныя і панцырныя). Выразнай мяжы паміж баярствам і вольным сялянствам (вайскова–служылым людам) да сярэдзіны XVI ст. не існавала. Толькі з часам гэты падзел умацаваўся, нарадзіўшы традыцыю падзелу ўсіх на шляхту і людзей нешляхецкага паходжання.

Агульныя палітычныя і маёмасныя інтарэсы, практыка надання зямельных уладанняў у розных раёнах краіны, а таксама змяшаныя шлюбы, адсутнасць этнічнага антаганізму — усё гэта абумовіла тое, што палітычны народ Вялікага Княства Літоўскага ўтвараўся як агульнадзяржаўная супольнасць. Шляхта выступала ў ролі канса-

лідоўнай сацыяльнай сілы. Наўрад ці будзе перабольшваннем сказаць, што і беларускія, і ўкраінскія грамадскія эліты адчувалі дзяржаву Ягайлавічаў настолькі ж сваёй, наколькі і літоўскія.

Жыхары гарадоў складалі параўнальна невялікую частку насельніцтва Беларусі (згодна з падлікамі Зіновія Капыскага, прыкладна 15--16 % усяго люду), хоць іх грамадска–палітычная роля была непрапарцыйна большай за ўдзельную вагу. Паўстаўшы яшчэ ў XI—XII ст., многія гарады Беларусі мелі традыцыі высокаразвітага рамя-



*Праца сялян на фальварку. Гравюра XVI ст.*

ства, актыўнага гандлю і ад пачатку ўтварэння Вялікага Княства займалі важныя пазіцыі ў палітычным жыцці краіны. І хоць у агульнадзяржаўных органах улады гарады не мелі свайго прадстаўніцтва, іх значэнне палягала на ролі даўніх рэгіянальных цэнтраў, сталіцаў зямель і воласцяў. І вялікія князі ўлічвалі гэта. Так, Полацк і Віцебск удзельнічалі ў падпісанні гандлёвага пагаднення Гедыміна з Нямецкім ордэнам у 1338 г. Дагавор Свідрыгайлы з ордэнскай дзяржавай у 1432 г. разам з баярамі падпісала многа гарадоў, сярод якіх — Вільня, Полацк, Віцебск, Менск, Наваградак, Берасце, Смаленск і інш. У прывілеі Казіміра Ягайлавіча 1447 г. у ліку самых буйных гарадоў дзяржавы таксама названы два беларускія гарады — Горадня і Слуцк.



Па колькасці насельніцтва самым вялікім на Беларусі быў Полацк, у якім на пачатак XVI ст. жыло прыкладна 10 тысяч чалавек. У Берасці тады магло налічвацца да паловы гэтага ліку жыхароў, а ў Горадні, Менску, Наваградку прыкладна па 4—5 тысяч. Малых гарадоў і мястэчак з насельніцтвам да 1—3 тысяч на пачатак XVII ст. на тэрыторыі мелася ўжо больш за 300.

Насельніцтва буйных гарадоў Беларусі, асабліва заходніх, было поліэтнічным. Ужо ў XIII—XIV ст. у іх пасялілася шмат іншаземцаў, асабліва немцаў. У Полацку, напрыклад, існавала ўласная ганзейская факторыя, якая функцыявала да пачатку XVI ст. Нямецкія абшчыны ў XIV ст. з'явіліся ў Горадні і Берасці. З часоў Вітаўта ў беларускіх гарадах сяліліся таксама палякі, яўрэі і татары. Жылі яны па сваім праве, трымаючыся абшчынамі. Нямецкія купцы і рамеснікі, утвараючы вольную супольнасць, кіраваліся ўласным правам, вядомым як магдэбургскае (па найменні горада Магдэбурга, у якім яно было выпрацавана). Нямецкае права давала ім значныя перавагі перад іншымі гарадскімі абшчынамі.

Каб паспрыяць гандлёва–рамеснаму развіццю гарадоў, прывабіць у іх новае насельніцтва, вялікія князі пачалі надзяляць магдэбургскім правам свае найбольш важныя месты. Першай у 1387 г. прывілей на самакіраванне паводле нямецкага права атрымала Вільня, а ўжо ў 1390 і 1391 г. ён быў выдадзены Берасцю і Горадні. На працягу XV ст. магдэбургскае права атрымалі яшчэ тры гарады Беларусі — Слуцк (1441), Полацк (1498) і Менск (1499). У прывілеі на самакіраванне Полацку вялікі князь Аляксандр адзначаў, што дае гораду нямецкае права «на вечные часы», «штобы люди нашы, там жывучи, через урад добрый и справедливый были размножены». Так у Беларусі пачаўся працэс рэцэпцыі нямецкага гарадскога права, у выніку чаго



*Узвядзенне гарадскіх муроў. Гравюра XV ст.*

апрача гарадоў на праве «рускім» ці «літоўскім» (пад якім звычайна разумелі нормы Статута) з'явіліся гарады магдэбургскія — уласна гарады ў юрыдычным сэнсе слова, аддзеленыя ад зямлі ці воласці. Рамеснікі і гандляры такога горада, падпарадкаваныя магдэбургскаму праву, утваралі асобную прававую групу і называліся «мяшчанамі».

У заходніх землях Беларусі буйныя гарады атрымлівалі магдэбургскае права значна раней, чым на ўсходзе. Гэта магло быць звязана з жывучасцю валаснай сістэмы і вечавога ладу ў Падняпроўі ды Падзвінні. У гэтым рэгіёне старадаўнія цэнтры земляў, асабліва Віцебск, Смаленск і Полацк, яшчэ доўга захоўвалі сувязь з воласцямі. Як ужо адзначалася вышэй, насельніцтва і горада, і воласцяў утварала там адну абшчыну, і гараджане разам з баярамі ўдзельнічалі ў абласным самакіраванні. Аднак у другой палове XV — пачатку XVI ст. у выніку развіцця феадальнага землеўладання і на ўсходзе Беларусі валасная сістэма ды гарадская абшчына сталі хутка разбурацца. Яскравы прыклад таму — сацыяльная барацьба ў Полацку, дзе баяры ўпарта адмаўляліся ад агульнагарадскіх павіннасцяў. У той сітуацыі гарадскія вярхі самі дамагаліся патрэбнага ім прывілея на самакіраванне, таму магдэбургскае права трапляла на падрыхтаваную глебу. Спробы навязаць самакіраванне сілай, без зацікаўленых у ім сацыяльных колаў, наўрад ці мелі б поспех.



*Пячатка горада Віцебска 1559 г. У полі «Спас нерукатворны».*

Кожнай граматай на магдэбургскае права прадугледжваліся тры асноўныя прынцыпы: 1) адмяняліся ранейшыя прававыя нормы і звычаі, на якіх было арганізавана жыццё горада; 2) утвараўся орган самакіравання — магістрат, склад якога звычайна абіраўся жыхарамі горада; 3) улада і суд іншых органаў і асоб (апрача органаў гарадскога самакіравання) у адносінах да мяшчан страчвалі сілу. Так з атрыманнем магдэбургскага прывілея беларускі горад атрымліваў прававую самастойнасць, г.зн трапляў у новыя ўмовы развіцця, якія прынцыпова адрозніваліся ад тых, што давала мясцовае, «рускае» права. З пункту гледжання закону ён залежаў толькі ад цэнтральных органаў дзяржаўнага кіравання. Прывілей на самакіраванне вызваляў мяшчан ад працы на карысць



гаспадара, яны бралі ў сваё кіраванне гарадскую гаспадарку, а таксама атрымлівалі шэраг важных ільготаў. Як правіла, гэта было вызваленне ад талок і «гвалтаў», ад падводнай павіннасці, утрымання ганцоў і паслоў, ад абавязку выстаўляць на замку старожу (мяшчанам заставалася толькі ахоўваць брамы і муры самога горада), ды інш. Набывалі ж мяшчане права на вольны гандаль у дзяржаве без мытных падаткаў, значную плошчу зямлі вакол горада (напрыклад, Нясвіж атрымаў 100 валок), а таксама права на «ўваходы» ў гаспадарскія лясныя абшары і воды (для выпасу жывёлы, карыстання драўнінай на будоўлю і ацяпленне, палявання і рыбнай лоўлі). Прывілей звычайна дазваляў мяшчанам збіраць прыбытак ад гарадскіх мераў і вагаў, ад крам і лавак, даваў права будаваць грамадскія лазні і часам нават бровары. Буйныя гарады з магдэбургскім правам, размешчаныя на важных гандлёвых шляхах, будавалі для замежных купцоў гасцінныя двары (у Полацку, напрыклад, іх было ажно чатыры). Абавязкі ж «вольных» гарадоў былі невялікія. Фактычна яны зводзіліся да выплаты падатку ў дзяржаўны скарб (магістрат размяркоўваў яго па ўсіх мяшчанах), у тым ліку серабшчыны і ардыншчыны, калі тыя накладаліся на ўсю дзяржаву.



*Герб Полацка. XVI ст.*

Горадам кіраваў магістрат, які засядаў у ратушы і складаўся з двух інстытутаў — рады і лавы. Лава была органам войта як прадстаўніка ўладальніка горада, ім жа ўзначальвалася і займалася судовымі справамі па крымінальных справах мяшчан. У яе ўваходзілі прысяжныя лаўнікі. Рада ж з'яўлялася інстытутам грамадскага самакіравання ды разбірала маёмасныя і цывільныя справы мяшчан. Узначальвалі раду бурмістры, а ў яе склад уваходзілі радцы. Члены магістрата (апрача войта) абіраліся мяшчанамі на агульных выбарах. Войт жа прызначаўся гаспадаром, хоць, напрыклад, у Оршы ў другой палове XVI ст., у Мазыры і Нясвіжы мяшчане самі выбіралі і войта. Права выбіраць прадстаўніка на гэтую пасаду пазней багатыя мяшчане многіх гарадоў выкуплялі. У гарадах з канфесійна розным складам насельніцтва раду ўтваралі на парытэтных пачатках: палову мес-

цаў аддавалі праваслаўным, а палову — каталікам. Напрыклад, у прывілеі Вільні гаварылася, што «половица тое рады и бурмистров закону Римского, а половица закону Грецкого, так яко ободвум законам право Магдебурское дано». Парытэтнасць прадстаўніцтва асноўных канфесій у магістратах прадугледжвалі таксама граматы, выдадзеныя Драгічыну (1498), Полацку (1498), Наваградку (1511) і іншым гарадам Беларусі. Аднак магдэбургскі прывілей Магілёву, у якім абсалютна дамінавала праваслаўнае насельніцтва, такога прынцыпу не ўводзіў.

Варта заўважыць, што з магдэбургскім прывілеем беларускія гарады не проста пераймалі новыя прынцыпы арганізацыі жыцця, але прыстасоўвалі іх да ўласных умоў і асаблівасцяў. Заходнееўрапейскія нормы магдэбургскага права дапаўняліся тут мясцовай традыцыяй, таму арганізацыі і функцыі органаў самакіравання ў розных гарадах Беларусі часта маглі значна розніцца. Некаторыя гарады і мястэчкі атрымалі не поўнае магдэбургскае права, а толькі некаторыя элементы самакіравання. Напрыклад, Сураж, Ула, Вяліж ды іншыя малыя гарады мелі толькі ўласны войтаўскі суд. У тых выпадках, якія недастаткова рэгламентаваліся нормамі нямецкага права, гараджане абапіраліся на ўласны вопыт самакіравання. Таму ў Полацку, Оршы, Слуцку, Крычаве, Віцебску і Мсціславе поруч з магістрацкімі органамі як элемент гарадскога самакіравання захоўваўся вядомы з вечавых часоў інстытут сотніка, а ў некаторых местах (напрыклад, у Слуцку і Слоніме) і ў XVI—XVII ст. апрача рады судовыя справы разбіраў даўні копны суд.

Хоць прававыя нормы магдэбургскага прывілея распаўсюджваліся на ўсіх аднолькава, мяшчанская супольнасць не была з’яднанай. Розніца ў рэальным становішчы асноўных групаў насельніцтва магдэбургскага горада вынікала з іх маёмаснай няроўнасці. Багатая вышэйшая праслойка мяшчан, якая засяродзіла ў сваіх руках гарадскую ўладу, утварала патрыцыят. Складаючы толькі некалькі працэнтаў ад усіх гараджан, яны валодалі асноўнай доляй маёмасці. Большасць жа рамеснікаў і гандляроў адносілася да паспольства. Аднак гэтыя групы не былі замкнутымі ці ізаляванымі. Патрыцыят, напрыклад, папаўняўся мяшчанамі з паспольства, якія, узбагаціўшыся, пачыналі дамагацца ўлады. Гэтакімі ж пранікальнымі былі і межы паміж мяшчанамі ды сялянствам. За кошт сялян, якія ўцякалі ад прыгнёту ўладальнікаў, галоўным чынам і папаўнялася насельніцтва гарадоў. Як вядома з дакументаў, пад апекай полацкага магістрата шматкроць знаходзілі прыстанак «халопы нявольныя і рабы» вакольных земляў. Прыватнаўласных сялян часта пасяляў у горадзе і сам іх уладальнік.



Аддзяліўшы горад ад воласці, даўшы мяшчанам юрыдычныя гарантыі прыватнай уласнасці, а галоўнае — юрыдычна–прававую самастойнасць, магдэбургскае права стварала спрыяльныя ўмовы для гаспадарчага развіцця горада і яго мяшчанскай супольнасці (communitas civium). Сцвярджаючы свабоду асобы і культывуючы правааздольнасць мяшчан як стану, яно ўключала Беларусь у абшар еўрапейскай цывілізацыі, адным з самых важных феноменаў якой было гарадское самакіраванне. Так што рэцэпцыя нямецкага магдэбургскага права ў культурна–цывілізацыйным плане ставіла беларускі горад упоравень з такімі гарадамі, як Прага, Вена ці Гамбург.



*Грош ВКЛ 1556 г. Рэверс.*

Сялянства да сярэдзіны XV ст. у абсалютнай большасці яшчэ асабіста не залежала ад землеўладальнікаў. Яно складалася ў асноўным з цяглых людзей, якія мелі дзялку зямлі ды выконвалі за яе гаспадарчыя працы і плацілі аброк. На захадзе Беларусі за адзінку абкладання павіннасцямі бралася служба (звычайна два ці тры сялянскія дымы, аднак маглі быць службы і з большай колькасцю гаспадарак). У Падняпроўі і Падзвінні яшчэ існавалі воласці, насельніцтва якіх выконвала агульныя павіннасці. У гэтых землях да XVII ст. дамінавальнай формай гаспадаркі заставаліся промыслы, і сяляне адбывалі павіннасць данінай, а не цяглам. Сярод даннікаў былі бортнікі, баброўнікі, асочнікі, лаўцы, сакольнікі, руднікі, рыбаловы і г.д. За карыстаннеляснымі абшарамі падняпроўскія сяляне плацілі дзяржаве даніну бабрамі, куніцамі, мёдам і нават срэбрам.

У юрыдычным плане сярод сельскага насельніцтва адрозніваліся людзі пахожыя (свабодныя), непахожыя («отчычы»,«людзі отчызныя»), закупы (часова несвабодныя) і чэлядзь нявольная, парабкі (рабы). «Воляй» сялян было права вольнага пераходу да іншага гаспадара, калі павіннасці рабіліся надта цяжкімі. Землеўладальнікі ж імкнуліся пазбавіць іх такога права. Для гэтага яны выкарыстоўвалі прынцып даўнасці — працягласць пражывання падданых у

адным маёнтку. Сялян, якія на працягу доўгага часу жылі ў адным уладанні, пан называў «звечнымі», «айчыстымі» і не адпускаў са сваёй зямлі.

Працэс запрыгоньвання сялян беларускія гісторыкі прасочваюць па дакументах з сярэдзіны XV ст., хоць выказваюцца меркаванні, што з'яўленне гэтай формы пазаэканамічнага прымусу можна адносіць і да ранейшых часоў. Ужо ў прывілеі Казіміра Ягайлавіча 1447 г. пастанаўлялася, што «айчыстых» сялян нельга прымаць на гаспадарскія двары. Спачатку паступова была запрыгонена асноўная маса сялян у прыватнаўласніцкіх уладаннях Беларусі. У гаспадарскіх вотчынах яны яшчэ доўга маглі карыстацца правам пераходу, а ў Падняпроўскіх і Падзвінскіх валасцях запрыгоньванне актывізавалася толькі пасля правядзення аграрнай рэформы ў часы Жыгімонта Аўгуста. Аднак , як лічыць даследчык гэтай праблемы Міхаіл Спірыдонаў, асноўная маса вольнага (пахожага) сялянства прыкладна ў сярэдзіне XVI ст. ужо была запрыгонена.



*Сяўба. З гравюры XVI ст.*

Існаваў яшчэ вышэйшы слой сельскага насельніцтва, які ўтваралі служылыя сяляне — слугі путныя, панцырныя, шчытныя, конныя. Яны мелі асабістую вольнасць, неслі ваенную службу, выконвалі розныя даручэнні ўладаў, але і ад цягла не вызваляліся, якое, праўда, было лягчэйшае, чым у простых сялян. Але гэтая катэгорыя сельскага насельніцтва была параўнальна малалікая. Звычайна з іх ліку папаўняліся шэрагі шляхты пасля спусташальных войнаў.

У цэлым да канца XVI ст. сфармаваўся адносна адзіны стан прыгонных, у які ўвайшлі былыя вольныя (пахожыя) сяляне і чэлядзь. Іх сацыяльны статус замацоўваўся юрыдычна, права на іх эксплуатацыю было аформлена заканадаўча. Так прыгон стаў галоўным сродкам прымусу сялян працаваць на пана–землеўладальніка.



## V.4. Пачатак кадыфікацыі права

Першым вопытам увядзення пісьмовага права ў межах усёй літоўска–беларускай дзяржавы стаў так званы Судзебнік вялікага князя Казіміра — зборнік судовых нормаў. Ён складаўся з 25 артыкулаў аб пакараннях за крымінальныя злачынствы і павіннасцях на гаспадара. Зборнік быў уведзены Казімірам Ягайлавічам пасля ўзгаднення з панамі–радаю ў 1468 г. Яго нормы генетычна ўзыходзілі як да «Рускай Праўды», так і да мясцовага звычаёвага (беларускага і літоўскага) права. Паколькі мовай Судзебніка была старабеларуская (на той перыяд канцылярская), то ў свой час польскі правазнавец Вацлаў Мацеёўскі назваў яго «беларускім Статутам».

Аднак у прававым плане землі Вялікага Княства Літоўскага заставаліся раз'яднанымі. Паралельна з прынятым Судзебнікам у землях–анексах па–ранейшаму выкарыстоўваліся лакальныя судовыя нормы, яны кіраваліся сваімі юрыдычнымі правіламі. Патрэбы часу вымагалі агульнай прававой сістэмы для ўсіх станаў і зямель. Асаблівым стымулам для распрацоўкі агульнага кодэкса стала неабходнасць умацавання палітычна–дзяржаўнай самастойнасці Вялікага Княства на фоне пастаяннага імкнення Польскага каралеўства цясней заціснуць вузлы уніі. Знаўца гісторыі права Юліуш Бардах звярнуў увагу таксама на патрэбу пераадолець унутраную раз'яднанасць зямель ВКЛ адзінай юрыдычнай сістэмай, якой і стаў Статут.

Упершыню думка аб намеры кадыфікаваць права афіцыйна прагучала ў гаспадарскім прывілеі Валынскай зямлі, у якім Аляксандр Казіміравіч абяцаў, што неўзабаве «вси земли наши одного права держати мают и одним правом сужены будут подле Статуту». Гісторыкам аднак невядома, якія непасрэдныя захады прымаліся пасля гэтага. Канкрэтная просьба аб кадыфікацыі права ўпершыню прагучала на Віленскім сойме 1514 г., але праект Статута быў пададзены сойму толькі праз восем гадоў. Арганізатарам падрыхтоўкі кодэкса мог быць, на думку Станіслава Лазуткі, віленскі ваявода і канцлер ВКЛ Альбрэхт Гаштаўт. Пасля дапрацовак і рэдагавання (непасрэдна над тэкстам працавалі гаспадарскія сакратары і пісары Іван Гарнастай, Міхаіл Копаць, Іван Сапега, а таксама радныя паны) кодэкс атрымаў канчатковае зацвярджэнне на Віленскім сойме 1528/

29 г. На жаль, Першы Статут ВКЛ не быў выдадзены друкам. Звод законаў пашыраўся ў рукапісным выглядзе, таму і засталося некалькі рэдакцый яго тэксту. Хоць у пастанове 1522 г., калі ў Вільні функцыявала друкарня Францішка Скарыны, вялікі князь Жыгімонт І паабяцаў друк Статута, аднак абяцанне так і засталося нявыкананым, бо ўжо праз тры гады друкарня спыніла існаванне.

Так набыў афіцыйную сілу першы фундаментальны звод прававых нормаў (282 артыкулы, сістэматызаваныя ў 13 раздзелаў), агульны пісаны закон для тэрыторыі Вялікага Княства Літоўскага. Статут 1529 г. быў кодэксам усяго насельніцтва гэтай дзяржавы, а не толькі «класа феадалаў», як звычайна пісалася ў савецкай гістарыяграфіі. Выдаваўся ён, як сказана ва ўступе да кодэкса, «прелатом, князём, паном, шляхте и всему посполству и их подданым, а тубылцом земль Великого Князства нашого Литовского которого бы колвек стадла и стану были», г.зн. яго прававая моц распаўсюджвалася на ўсіх жыхароў Вялікага Княства (за выняткам мяшчан, якія кіраваліся нормамі магдэбургскага права).



*Першая старонка Статута 1529 г. (Спіс Дзялыньскага).*

Асноўнай крыніцай для першай агульнадзяржаўнай кадыфікацыі было звычаёвае права «рускае» (г.зн. беларускае і ўкраінскае) ды літоўскае, перапрацаваныя нормы Рускай Праўды, што стагоддзямі прымяняліся на тэрыторыі Беларусі ды Украіны, заканадаўчыя акты вялікага князя (прывілеі), а таксама некаторыя нормы рымскага, элементы польскага, чэшскага і нямецкага права, у прыватнасці — славутага помніка прававой думкі сярэднявечнай Еўропы «Люстра саксаў».



Утрымліваючы добра распрацаваныя нормы дзяржаўнага, грамадскага, сямейнага, крымінальнага і працэсуальнага права, першы Статут замацоўваў палітычны і сацыяльны лад, дасягнуты на той час у развіцці Вялікага Княства. Яго тэрытарыяльную цэласнасць і палітычную самастойнасць гарантавалі спецыяльныя артыкулы. Дзяржавы «ни в чом не вменшим», «от всякой легкости и пониженеиа ... того панства стеречи будем», а ўладанні і ўрады будуць давацца толькі «прирожоным и тубыльцом» Вялікага Княства, — абавязваўся гаспадар, падпісваючы Статут.

Адлюстраваўшы выразны ўплыў эпохі Адраджэння, першы агульнадзяржаўны звод уводзіў шэраг перадавых па тым часе прававых нормаў. Варта згадаць прынцып персанальнай адказнасці за правапарушэнне, роўнасць усіх перад законам, прысягу службовых асобаў і асабліва абарону правоў жанчыны. Смяротная кара за згвалтаванне жанчыны была ўключана ў звод з прыкладу заходнееўрапейскіх кодэксаў. Узорам для ўвядзення забароны на збор мытных падаткаў і заснавання ўласных мытняў стала норма польскага права, якая, у сваю чаргу, паходзіла з нямецкага, і г.д. Праўда, Статут замацаваў прыярытэт князёў і паноў у палітычнай сістэме дзяржавы, і толькі ў наступнай яго рэдакцыі шляхце ўдалося сцвердзіць ролю свайго сойма.

У галіне кадыфікацыі Статут 1529 г. выводзіў дзяржаву Ягайлавічаў на адно з перадавых месцаў у тагачаснай Еўропе. Адаптацыя антычных і сярэднявечных заходнееўрапейскіх узораў права яскрава сведчыла пра высокі ўзровень прававой культуры ў Вялікім Княстве Літоўскім. Дзякуючы Першаму, а потым Другому і Трэцяму Статутам Вялікае Княства Літоўскае ўвайшло ў кола дзяржаў, у якіх права стала важным элементам рэгулявання грамадскага і дзяржаўнага жыцця. З суседніх еўрапейскіх краін раней свае праекты кадыфікацыі прынялі толькі чэхі (1500) ды венгры (1514), але шэраг больш развітых дзяржаў яшчэ не мелі такога кодэкса, як у Вялікім Княстве. Напрыклад, суседняя Польшча, нягледзячы на спробы і праекты, не валодала ўласнай кадыфікацыяй, бо Статут Яна Ласкага 1506 г. быў толькі зборам правоў дзеючых, уключаў статуты Казіміра Вялікага, земскія прывілеі і інш.

Статут Вялікага Княства Літоўскага з'яўляецца не толькі выдатным творам юрыдычнай думкі, але і найважнейшым помнікам

старабеларускай мовы. Яго слоўны запас узбагачаны юрыдычнай тэрміналогіяй, створанай на аснове беларускіх і ўкраінскіх дыялектаў, або непасрэднымі запазычаннямі з лацінскай, польскай і нямецкай моў. Па разнастайнасці лексікі са Статутам наўрад ці могуць параўнацца іншыя тагачасныя помнікі справавога пісьменства той эпохі.

# VI. Рэлігія і культура

## VI.1. Талеранцыя. Стан праваслаўнай царквы

На тэрыторыі Беларусі з XIV ст. надзіва мірна ладзілі між сабою прадстаўнікі розных веравызнанняў — праваслаўя, каталіцтва, мусульманства і іудзейства. Верацярпімасць, узведзеная Гедымінам у ранг дзяржаўнай палітыкі, стала асновай балта–славянскага грамадскага саюзу і важнай умовай поспеху аб'яднаўчай праграмы вялікіх князёў літоўскіх. Адыход ад традыцыі талерантнасці, звязаны з прыняццем Літвою заходняга хрысціянства ды яе імкненнем уберагчыся ад рутэнізацыі, быў часовай зменай гэтай палітыкі. Рэлігійная нецярпімасць дзяржаўнай улады Вялікага Княства, галоўныя прынцыпы якой утрымліваліся ў прывілеях 1387 і 1413 г., пасля Вітаўта не вытрымала выпрабавання жыццём. З укняжаннем Свідрыгайлы праваслаўныя князі і паны адразу ўзняліся на важныя дзяржаўныя пасады, і хоць той хутка страціў уладу, з імі ўжо нельга было не лічыцца. Троцкі прывілей 1434 г. азначаў пераход да больш рэалістычнай канфесійнай палітыкі, і згаданыя абмежаванні па канфесійнай прыналежнасці ператвараліся ў анахранізм.

Дыскрымінацыя праваслаўных падданых, якая выяўлялася ў іх недапусканні да найвышэйшых урадаў, сама па сабе была не пера-

следам, а стрымліваннем праваслаўя. Афіцыйнае стаўленне вялікіх князёў да праваслаўнай царквы заўсёды характарызавалася лаяльнасцю. Нават дэспатычны Вітаўт, загадваючы ў 1392 г. хрысціць у лацінскі абрад яшчэ неахрышчаных літоўцаў, распарадзіўся даваць русінам волю выбару, а ў грамаце аб прызначэнні мітрапалітам Рыгора Цамблака падкрэсліў, што зусім не хоча, каб у яго княстве грэцкая вера «змяншалася ці гінула, і цэрквы... ў заняпад прыходзілі», ды што рупіцца толькі аб парадку і ладзе ў праваслаўнай царкве.

Праўда, ствараючы ўласную царкоўную ерархію, вялікі князь Вітаўт пайшоў на ўмяшанне ва ўнутраныя справы царквы, і абранне мітрапаліта на саборы ў Наваградку (1416) стала першым прыкладам узвядзення ўладыкі пры ўдзеле свецкіх асоб. Крок гэты быў прадыктаваны неабходнасцю пазбавіцца ўсялякай залежнасці ад мітрапалітальнага цэнтра ў Маскве. У палітычным плане падпарадкаванне праваслаўнага насельніцтва Вялікага Княства мітрапаліту, які рэзідаваў у Маскве, было некарысным для Вільні. Вырашэннем гэтай праблемы магла стаць аўтакефалія грэцкай царквы ў Вялікім Княстве або яе унія з Рымам. Канстанцінопальскія патрыярхі звычайна працівіліся падзелу адзінай Рускай мітраполіі, бо праз аднаго мітрапаліта было прасцей трымаць яе пад кантролем, таму спадзяванні ўскладваліся на унію.



*Цэнтр Вільні.*
*Фрагмент гравюры з атласа Г. Браўна. 1576 г.*

У XV ст. ідэя царкоўнай уніі набыла ў колах як свецкай, так і духоўнай эліты беларуска–украінскіх зямель дастаткова шырокую папулярнасць. Яе прыхільнікамі былі амаль усе мітрапаліты, што абіраліся як кандыдаты ад Вялікага Княства Літоўскага. І калі ў ліпені 1439 г. Фларэнційскі сабор прыняў рашэнне пра аб'яднанне ўсходняй і заходняй цэркваў, гістарычную булу падпісаў прызнаны кардыналам мітрапаліт кіеўскі і ўсёй Русі Ісідар (1436—1458). Вяртаючыся з сусветнага царкоўнага форуму да свайго епіскапства, ён затрымаўся ў Польскім Каралеўстве, з Кракава праз Галіцкую зямлю паехаў у Берасце, адтуль у Вільню, а потым — у Кіеў і Смаленск, паўсюль распаўсюджваючы спісы сабornага рашэння пра унію. Аб'яднанне цэркваў прадугледжвала роўнасць заходняга і ўсходняга абрадаў, што азначала канец схізме. Цэрквы Ўсходняй Еўропы заклікаліся «прыняць гэтую найсвяцейшую унію з вялікай духоўнаю радасцю».



На землях Беларусі і Ўкраіны ні праваслаўныя князі, ні духавенства, ні паства не выявілі ніякіх пярэчанняў пастанове Фларэнційскага сабора. Толькі віленскі каталіцкі біскуп сустрэў яе непрыязна. Затое ў Маскве, куды мітрапаліт прыехаў вясною 1441 г., пасля першай жа службы яго абвясцілі «латинским прелестником» ды ерэтыкам, унію катэгарычна адхілілі, а самога Ісідара зняволілі і асудзілі саборам епіскапаў (з няволі мітрапаліту пашчасціла ўцячы, і ён яшчэ год жыў на землях Беларусі і Ўкраіны, а потым дабраўся да Італіі). Так і не прызнаўшы уніі, у 1448 г. у Маскве без блаславення канстанцінопальскага патрыярха замест Ісідара мітрапалітам абралі разанскага епіскапа Іону (1448—1461). Гэта азначала ўсталяванне маскоўскай самастойнасці, заснаванне яе аўтакефальнай мітраполіі. Так, амаль праз паўтара стагоддзя супрацьборства паміж Масквой і Вільняй, дайшло да незваротнага падзелу мітраполіі «ўсёй Русі». Калі ў 1451 г. Казімір Ягайлавіч прызнаў Іону мітрапалітам «кіеўскім і ўсёй Русі», праваслаўныя епархіі Беларусі і Ўкраіны зноў перайшлі ў падпарадкаванне мітрапаліта, які рэзідаваў у Маскве. Аднак у 1458 г. па рашэнні папы Пія II (1458—1464) і пры згодзе канстанцінопальскага патрыярха Ісідара II (1456—1462) кіраўніком «мітраполіі Кіева і ўсёй Русі» быў прызначаны Грыгор Балгарын (1458—1472) — вучоны балгарскі манах, вучань і паслядоўнік Ісідара, а яго сядзіба пераносілася ў Вільню. Яшчэ праз тры гады аўтакефальная мітраполія стала называцца мітраполіяй «Маскоўскай і ўсёй Русі», а назва «Кіеўская» засталася для старой мітраполі, да якой належалі землі Беларусі і Ўкраіны. Мітрапаліту кіеўскаму тады падпарадкоўваліся епархіі Полацкая, Тураўская, Смаленская, Бранская, Пярэмышльская, Луцкая, Уладзімірская, Холмская і Галіцкая.

Пасля падзелу большасць епіскапаў прызнала вяршэнства мітрапаліта–уніята, толькі чарнігаўскі і бранскі ўцяклі да Масквы. Рымскі папа абавязаў Казіміра Ягайлавіча не дапускаць да беларуска–украінскіх епархій мітрапаліта Іону як «аблуднага канстанцінопальскага патрыярха, прызначанага правіцелем туркаў», а сабор праваслаўных епіскапаў у Маскве, са свайго боку, пракляў Фларэнційскую унію і самога Грыгора Балгары-

на. Маскоўскі мітрапаліт Іона выкарыстоўваў кожную магчымасць, каб схіліць епіскапаў Беларусі і Ўкраіны на свой бок, у пасланнях да іх ды свецкіх вяльмож заклікаў трымацца праваслаўя. Нягледзячы на гэта, на беларускіх землях пастанова Фларэнційскага сабора прызнавалася яшчэ доўга, фактычна да пачатку XVI ст. У гады княжання Казіміра Ягайлавіча папулярнасць ідэі царкоўнай уніі спрыяла бесканфліктнасці міжканфесійных адносін у Вялікім Княстве Літоўскім. Толькі рымскія папы як быццам перасталі верыць у поспех пастановы Фларэнційскага сабора на беларуска–украінскіх землях.

Абраны мітрапалітам у 1475 г. смаленскі епіскап Місаіл (1475—1480) (пачынаючы з яго мітрапалітамі былі, як правіла, не грэкі, а мясцовыя ўладыкі) таксама прапагандаваў ідэю царкоўнай уніі. З яго ініцыятывы ў 1476 г. у Рым пісьмова звярнуліся прадстаўнікі Кіеўскай мітраполіі і свецкай эліты Беларусі і Ўкраіны. Апрача самога мітрапаліта і архімандрытаў галоўных манастыроў ліст падпісалі 13 праваслаўных князёў і паноў, сярод якіх былі, у прыватнасці, старшы полацкі баярын Астафі Корсак, а таксама князь Міхаіл Алелькавіч. У сваім пасланні яны пісалі пра «адсутнасць разыходжанняў паміж грэкамі і лацінянамі ў адносінах да Хрыста» і, прызнаючы папскае верхавенства над Кіевам, выказвалі жаданне падпарадкавацца Апостальскай сталіцы ды прасілі папу прыслаць у Кіеў сваіх прадстаўнікоў. Гэтае пасланне, пакінутае Рымам без адказу, яскрава сведчыць, што аб'яднанне цэркваў падтрымлівалася і ў асяроддзі праваслаўнай свецкай арыстакратыі, так што нельга сцвярджаць, быццам да уніі вялі адно дзяржаўныя ўлады і толькі насільна. У гэтай сувязі дакумент аказаўся настолькі важны, што ўжо пасля першай публікацыі тэксту ліста уніяцкім мітрапалітам Іпаціем Пацеем (1605) яго аўтэнтычнасць аспрэчылі праваслаўныя палемісты, і амаль да нашага часу многія даследчыкі сцвярджалі, быццам гэта фальсіфікацыя канца XVI — пачатку XVII ст. Сапраўднасць паслання была даказана гісторыкамі толькі ў 1990-х г. дзякуючы знаходкам яго копій з пачатку XVI ст.

З прыкладу Місаіла, у 1500 г. кіеўскі мітрапаліт Іосіф Балгарыновіч (1498—1501) таксама звярнуўся да рымскага папы Аляксандра VI (1492—1503) са спецыяльным пасланнем, у якім прызнаваў папскую ўладу і рашэнні, прынятыя Фларэнційскім саборам. З тэкстам гэтага паслання ў 1501 г. у Рыме з'явілася дэлегацыя на чале з каралеўскім сакратаром Эразмам Цёлкам, у якую ўваходзіў і праваслаўны па веравызнанні гаспадарскі сакратар Івашка Сапега. Нічога не маючы супраць далучэння Кіеўскай мірапаліі да каталіцкай супольнасці, Рым аднак зрэагаваў на ініцыятыву вельмі стрымана. Мітрапаліту Іосіфу Балгарыновічу было прапанавана адрачыся ад канстанцінопальскага патрыярха, прызначанага турэцкім султанам, і высвяціцца ў папы, на што той не пагадзіўся. Пасля гэтага ідэі аб'яднальнага Фларэнційскага сабора надоўга забыліся.





*Рымскі папа Аляксандр VI.*

Тым часам канфесійная палітыка першых Ягайлавічаў — Казіміра і Аляксандра — прынцыпова не мянялася і наследавала даўнюю традыцыю верацярпімасці. Пры манархах–католіках праваслаўе надалей развівалася. Напрыклад, калі за гады княжання першага на тэрыторыі Беларусі праваслаўных храмаў было фундавана 7, то каталіцкіх — толькі 3 (у Дуброўне, Клецку і Пінску). Віцяблянам і смалянам манарх неаднаразова гарантаваў у іх «царкоўныя дамы не ўступацца», праваслаўя іхняга «не рушыці, падаткі ім на іх веру не чыніці». Нездарма Супрасльскі летапіс называў Казіміра «добрым»і «справядлівым». Вядомыя таксама факты матэрыяльнай падтрымкі грэцкай царквы Ягайлавічамі, якія могуць сведчыць пра намер вярхоўнай улады ў канцы XV ст. умацаваць праваслаўе ў ВКЛ. Так, у 1489 г. Казімір, а ў 1497 г. Аляксандр ажыццявілі зямельныя наданні кіеўскаму Мікалаеўска–Пустынкаўскаму манастыру, у 1501 г. вялікі князь перадаў тры вёскі ва ўладанне Полацкаму Сафійскаму сабору, у 1504 г. ён жа падараваў тры маёнткі смаленскаму епіскапу Іосіфу Солтану ды вярнуў яму землі, забраныя манархамі раней. Ад таго ж Аляксандра Казіміравіча турава–пінскі ўладыка Васьян атрымаў выключнае права даваць дазвол на ўзвядзенне новых храмаў і поўную юрысдыкцыю над духавенствам.

Пры такой цярпімасці цэнтральнай улады да праваслаўя цяжка вытлумачыць з'яўленне шырока вядомай забароны будаваць новыя і рамантаваць старыя храмы, якая быццам была выдадзена, як прынята лічыць, Казімірам у 1481 г. Арыгінал гэтага дакумента гісторыкам невядомы. Вялікі князь Аляксандр у 1494—95 г. у перапісцы з Іванам III спасылаўся не на забарону, выдадзеную Казімірам Ягай-

лавічам, а на пастанову, якая ўжо існавала да княжання яго бацькі: «Князі нашыя і панове, уся зямля, маюць на тое права і запісы ад продкаў нашых і ад бацькі нашага і ад нас, і тое ў правах напісана, што цэркваў грэцкага закону больш не прыбаўляць...». Лічыцца, што забарона магла быць выдадзена яшчэ Вітаўтам, на што ёсць спасылка ў ленчыцкім сінодзе 1527 г., аднак і гэты дакумент у арыгінале не знойдзены. Найбольш верагоднай крыніцай забароны застаецца віленска–калішскі статут 1420 г., які не дазваляў будаваць новыя праваслаўныя храмы і капліцы без дазволу мясцовых біскупаў у Гнёзненскай правінцыі, а Віленская дыяцэзія падпарадкоўвалася гнёзненскаму прымасу.

У кожным разе вядомая забарона не тычылася тэрыторыі зямель–вобласцяў і выдавалася, відаць, для абмежавання ўплыву праваслаўнай царквы на тэрыторыі ўласна Літвы. На Полаччыне, Віцебшчыне ды іншых беларускіх землях, якія не ўваходзілі ў склад Віленскага і Троцкага ваяводстваў, развіццё праваслаўнай царквы не абмяжоўвалася. Устаўная грамата, выдадзеная Віцебску ў 1503 г. вялікім князем Аляксандрам, сведчыць, што ў праваслаўе там пераходзілі нават літоўцы і палякі. «Каторыя будуць ліцвін або лях, хрышчаныя ў Віцебску ў Рускую веру, і хто з таго роду і цяпер жыве, таго нам не рушыці, права іх хрысціянскага ні ў чым не ламіці», — абяцаў гаспадар. Ваенная канфрантацыя з Масквой вельмі хутка прымусіла віленскі ўрад наогул адмовіцца ад усялякіх забаронаў: у 1503 г. у інструкцыі паслам да вялікага князя маскоўскага Аляксандр Казіміравіч паведамляў, што скасаваў абмежаванне на ўзвядзенне праваслаўных храмаў: «не дазволена было Русі цэрквы будаваць, але тым разам кароль яго міласць тое ім дапусціў».


*Свята–Духаўская царква ў Віцебску. З малюнка 1664 г.*

Сведчаннем нармальнага становішча грэцкай царквы ў Вялікім Княстве Літоўскім можна лічыць хуткі рост колькасці яе храмаў і



манастыроў. З канца XIII да сярэдзіны XVI ст. на беларускіх землях было заснавана каля 40 праваслаўных манастыроў, у тым ліку 17 — на Полаччыне, 7 — у Наваградскім павеце, па 5 — у Аршанскім і Пінскім, па 4 — у Віцебскім і Менскім, па 3 — у Берасцейскім, Гарадзенскім і Мсціслаўскім. Перад Люблінскай уніяй праваслаўныя цэрквы абсалютна дамінавалі сярод храмаў беларускіх гарадоў. Прыкладам, у Пінску іх было 14, у Наваградку — 10 (і толькі 1 каталіцкі касцёл), у Берасці — 9, у Віцебску — 7, у Горадні і Слоніме — па 6 і г.д. У сталіцы дзяржавы Вільні праваслаўных храмаў тады было 15 (пры 14 каталіцкіх касцёлах). У цэлым з 259 касцёлаў Віленскага каталіцкага біскупства на паветы Беларусі прыпадала толькі 93 храмы, пры гэтым яны знаходзіліся галоўным чынам на захад ад лініі Браслаў — Паставы — Вілейка — Менск — Нясвіж — Пінск. На ўсход ад яе касцёлы сустракаліся яшчэ зусім рэдка.


*Касцёл Божага цела ў Нясвіжы. Фрагмент гравюры Т. Макоўскага. 1604 г.*

Адносіны дзяржавы да праваслаўнай царквы ў Вялікім Княстве з канца XV ст. афіцыйна рэгуляваліся заканадаўствам. У 1499 г. па просьбе кіеўскага мітрапаліта Іосіфа Балгарыновіча вялікі князь Аляксандр выдаў спецыяльны дэкрэт, які забяспечваў юрысдыкцыю мітрапалітам і епіскапам ды іх судам. Дэкрэт фігураваў як пацвярджэнне так званага «Скрутка Яраслава» — нейкага статута аб царкоўных судах, выдадзенага князем Яраславам у XI ст. (паколькі арыгінал гэтага дакумента невядомы, а самая ранняя копія датуецца XV ст., многія вучоныя аспрэчваюць яго сапраўднасць). Грамата Аляксандра перадавала ў суд мітрапаліта справы як супраць католікаў, так і супраць праваслаўных, забараняючы ўраднікам, незалежна ад іх веравызнання, умешвацца ў царкоўнае судаводства, не дазваляла вяльможам здымаць з пасадаў святароў без дазволу мітрапаліта і аберагала маёмасць царквы ад канфіскацыі свецкай улады. Цяпер ніхто не мог чыніць праваслаўнай царкве «крыўды» і ўмешвацца ў яе справы. Віленскі сабор 1509 г. пацвердзіў прынцы-

пы цалкам незалежнай юрысдыкцыі мітрапаліта і епіскапату. Прывілей Аляксандра праваслаўным ерархам быў паўтораны і Жыгімонтам I у 1511 г. Так аформіўся эканамічны і судовы імунітэт праваслаўнай царквы ў Вялікім Княстве Літоўскім, і з пункту гледжання закону яна карысталася тут такой жа самастойнасцю, як і каталіцкі касцёл. Фактычна, у Беларусі грэцкая царква мела большую незалежнасць ад свецкай улады, чым у Маскве, дзе ўжо ў XV ст. дзяржава пачала рэалізоўваць праграму канфіскацыяў царкоўных уладанняў. У Вялікім Княстве Літоўскім, наадварот, непарушна захоўвалася недатыкальнасць царкоўнай маёмасці, на якую не замахваліся ні манархі, ні каталіцкае духавенства, ні пазней шляхецкі сойм.

У цэлым за гады княжанняў Аляксандра Казіміравіча, Жыгімонта Старога і Жыгімонта Аўгуста дзяржаўная палітыка Вялікага Княства Літоўскага ў сферы канфесійнага жыцця эвалюцыянавала ад талерантнасці да свабоды веравызнанняў. У перспектыве нарастальнага напружання ў адносінах з Масквой стаўленне ўладаў Вялікага Княства да праваслаўнага насельніцтва сваёй дзяржавы і не магло быць неталерантным. Статут 1529 г. як першы агульнадзяржаўны прававы кодэкс аднолькава пацвердзіў правы і свабоды не толькі каталіцкага касцёла, але і праваслаўнай царквы. У часе рэформаў напярэдадні Люблінскай уніі дайшло і да фармальнага ураўноўвання правоў вернікаў розных рэлігій, зафіксаванага ў прывілеі 1563 г. Нездарма калі пасля Берасцейскай царкоўнай уніі стала нарастаць канфесійная напруга, эпоха Ягайлавічаў ставілася ў станоўчы прыклад, а пра Жыгімонта Старога пісалася, што ён «цэрквы рускія гэтаксама будаваў і багаціў, як і касцёлы каталіцкія».

З укняжаннем Аляксандра Ягайлавіча і пачаткам войнаў на ўсходзе з вострай крытыкай канфесійнай палітыкі ўладаў ВКЛ стала выступаць Масква, якая вінавацiла вялікіх князёў літоўскіх у прыцясненні рэлігійнай свабоды падданых — прымусовым пераводзе праваслаўных у лацінскую веру. Гэтае абвінавачанне стала ідэалагічным лейтматывам вялікай вайны, развязанай Іванам III у 1500 г. Тэзіс аб пераследзе грэцкай царквы ў дзяржаве Ягайлавічаў увайшоў і ў расійскую ды савецкую гістарыяграфію. Прыведзеныя факты, аднак, сведчаць не пра пераслед, а пра паслядоўную лаяльнасць вялікіх князёў літоўскіх да праваслаўя ў XV — пачатку XVI ст., нягледзячы на антыправаслаўныя настроі лацінскага духавенства. Праўда, рэальнае становішча праваслаўнай царквы ў ВКЛ было намнога горшае, чым пазіцыі ўпрывілеяванага каталіцкага касцёла. У адрозненне ад апошняга, яна ніколі не мела прадстаўнікоў у гаспадарскай радзе, не мела і дзяржаўнай апекі.




*Жыгімонт Аўгуст,
вялікі князь літоўскі (1544—1572)
і кароль польскі (1548—1572).
Гравюра XVI ст.*

Пераканаўчым доказам таго, што праваслаўныя ў Вялікім Княстве да Люблінскай уніі карысталіся свабодамі і не цярпелі ганенняў, можна лічыць стаўленне саміх праваслаўных князёў і баяраў да іх дзяржавы ў гады войнаў з Маскоўскім княствам. Яны захоўвалі вернасць вялікаму князю — каталіку (згаданы вышэй пераход князёў вярхоўскіх і северскіх на бок Масквы ў канцы XV — пачатку XVI ст. меў матэрыяльныя, а не канфесійныя прычыны), значыць, былі задаволеныя сваім становішчам. У самых складаных сітуацыях, калі падданым грэка–візантыйскай царквы даводзілася ваяваць з адзінаверцамі, веравызнанне не ўплывала на пазіцыі праваслаўнай арыстакратыі Беларусі. Інтарэсам князёў і баяраў больш адпавядаў палітычны лад Вялікага Княства Літоўскага, чым аўтакратычная мадэль Маскоўскай дзяржавы. Нават праваслаўныя ерархі дэманстравалі ў дачыненні да вярхоўнай улады ВКЛ калі не прыхільнае, дык дастаткова лаяльнае стаўленне. Прыкладам, пад час аблогі Смаленска войскам Васіля III у 1512—1514 г. смаленскі епіскап Варсафоні ініцыяваў малітвы за дараванне перамогі над маскві-цянамі, а пасля захопу горада арміяй Васіля III узначаліў антымаскоўскую змову.

Калі б праваслаўе ў Вялікім Княстве сапраўды цярпела пераслед, як сцвярджалася ў Маскве, дык сюды не ўцякалі б шматлікія падданыя маскоўскага манарха — і князі, і пярэднейшыя баяры. Між тым і яны, зацятыя абаронцы праваслаўя, добра адчувалі сябе пад уладаю Ягайлавічаў. Так што пра прыгнечаны стан грэцкай царквы ў Вялікім Княстве да другой паловы XVI ст., тым больш пра яе пераслед, гаварыць не даводзіцца. Галоўная праблема таілася

ва ўнутраным стане самога праваслаўя на землях Беларусі ды Ўкраіны. Тое, што ерархія фармавалася толькі з небагатых родаў, што праваслаўныя магнаты амаль не апекаваліся сваёй царквой, што бракавала заможных апекуноў — усё гэта аслабляла царкву, паніжала яе інтэлектуальна–культурны ўзровень. Царква не давала патрэбнай адукацыі, і наогул, як сведчыў сучаснік, «не магла школ і навук паспалітых пашыраці, бо яны не фундаваліся». У дадатак праваслаўнае духавенства перажывала маральнае разлажэнне. «Блуды і распушчэнствы» у грэцкай царкве трывожылі і цэнтральную ўладу. Сам Жыгімонт Аўгуст у 1546 г. у пасланні кіеўскаму мітрапаліту Макарыю II (1534—1556) прапанаваў тэрмінова склікаць сабор ды прыняць захады па аздараўленні сітуацыі. Падобнае ўнутранае становішча грэцкай царквы не толькі падрывала яе пазіцыі ў супрацьстаянні з каталіцкім касцёлам, але і паніжала аўтарытэт праваслаўнай веры ў вачах грамадства.

## VI.2. На скрыжаванні культурных традыцый

У канцы XV — пачатку XVI ст. пачаўся росквіт беларускай культуры. З аднаго боку, гэты працэс характарызавала генетычная пераемнасць агульнай усходнеславянскай спадчыны, а з другога — засваенне новых традыцый, выкліканых уплывамі еўрапейскага Адраджэння. Надыход эпохі Рэнесансу і абумовіў небывалыя зрухі ў развіцці культуры беларускага краю, прывёўшы да яго першай своеасаблівай вестэрнізацыі.

Пранікненне заходняй культуры на Беларусь адбывалася перш за ўсё праз каталіцкі касцёл і непасрэдныя кантакты з рымалацінскім светам. Пры колькаснай перавазе праваслаўя ўсё больш адчувальнай рабілася прысутнасць каталіцкага касцёла, асабліва на захадзе Беларусі, дзе засталіся раёны кампактнага пражывання балтаў. Падлічана, што ў першай палове XVI ст. у беларускіх паветах ВКЛ існавала 177 лацінскіх парафій. Міжэтнічныя і міжканфесійныя кантакты ў гэтых раёнах былі асабліва цесныя.

Другім важным каналам уплыву лацінскай цывілізацыі на Беларусь сталі непасрэдныя кантакты з заходнім светам. Дзякуючы сацыяльна–эканамічнаму ўздыму гарадоў, развіццю гандлю, яны асаблі-



ва ўзраслі з XV ст. Прывілей Казіміра Ягайлавіча 1447 г. замацаваў права шляхты Вялікага Княства Літоўскага вольна выязджаць у кожную (акрамя непрыяцельскай) краіну «для лепшага шчасця набыцця або ўчынкаў рыцарскіх». Пасля падзення Візантыйскай імперыі ўсё




*Прага. Фрагмент гравюры Г. Шэдэля. 1493 г.*

больш частымі наведвальнікамі краін каталіцкай Еўропы станавіліся «русіны» -- праваслаўныя прадстаўнікі элітаў Беларусі і Ўкраіны. Асабліва паказальны прыклад праваслаўнага дваранiна Аляксандра Солтана, які ў 1467 — 1469 г. аб'ездзіў двары самых магутных еўрапейскіх манархаў і пабыў на Святой зямлі.

Новыя тэндэнцыі ў еўрапейскай культуры, узмацненне гуманістычнага пачатку ў грамадскай думцы, пашырэнне сувязяў з рымалацінскім светам і патрэбы ўнутранага развіцця краю — усё гэта клікала выхадцаў з зямель Беларусі ў еўрапейскія універсітэты. Ужо ў канцы XIV ст. яны вучыліся ў Карлавым універсітэце ў Празе, заснаваным у 1348 г., а з пачатку XV ст. галоўнай навучальнай установай для «ліцвіноў і русінаў» быў Кракаўскі універсітэт, адкрыты ў 1364 г. Пасля рэформы, праведзенай Ягайлам у 1400 г., ён стаў вышэйшай навучальнай установай не толькі Кароны Польскай, але і Вялікага Княства Літоўскага. Спецыяльна для выхадцаў з Вялікага Княства ў ім была створана студэнцкая бурса. На працягу XV — XVI ст. тут адвучылася не менш за 430 чалавек, якія ў метрычных кнігах універсітэта запісаліся выхадцамі з Літвы і Русі. Амаль палова студэнтаў атрымала ступень бакалаўра. Сярод іх былі прадстаўнікі вядомых родаў — Радзівілаў, Сапе-




*Панарама Кракава. Гравюра Г. Шэдэля.1493 г.*

гаў, Хадкевічаў, Валовічаў, князёў Свірскіх і інш. Асноўную ж масу навучэнцаў складалі дзеці мяшчан і шляхты. Па навуку ў Кракаў прыязджалі жыхары Берасця, Ваўкавыска, Віцебска, Горадні, Клецка, Любані, Менска, Оршы, Пінска, Полацка, Слуцка ды іншых беларускіх гарадоў і мястэчак. А з першай паловы XVI ст. сярод тых, хто дамагаўся універсітэцкай адукацыі, былі ўжо і жыхары вёсак.

Прыкладна ў сярэдзіне XVI ст. колькасць студэнтаў з Беларусі ў Кракаўскім універсітэце значна зменшылася. Прычынай было пашырэнне Рэфармацыі. Многія ўплывовыя роды імкнуліся паслаць сваіх дзяцей на навучанне не ў Кракаў, а ў пратэстанцкія краіны або ў прэстыжныя каталіцкія універсітэты Цэнтральнай Еўропы. Перавага аддавалася універсітэтам Італіі. Так, выхадцы з Беларусі вучыліся ў Балонні і Падуі — цэнтрах рэнесансавай думкі, а таксама ў Вітэнбергу, Ляйпцыгу і Франкфурце. З 1544 г. адкрыўся універсітэт у Караляўцы, і многа ліцвіноў ехала на вучобу ў суседнюю Прусію. Некаторыя стараліся атрымаць адукацыю ў трох — чатырох універсітэтах..



*Дзядзінец Collegium Maius Кракаўскага універсітэта.*





*Падуя. Гравюра XV ст.*

Пачатковую адукацыю будучыя студэнты калегіумаў, універсітэтаў і акадэмій атрымлівалі ў касцёльных, царкоўных і гарадскіх школах. Праўда, у праваслаўным асяроддзі дзеці часцей навучаліся дома, бо да сярэдзіны XVI ст. школы пры цэрквах былі даволі рэдкай з'явай, і існавалі яны толькі ў буйных гарадах. Да 1580-х г. у іх не было і школьных падручнікаў, замест якіх выкарыстоўваліся рэлігійныя тэксты. Затое ў Віленскай лацінскай дыяцэзіі пра школьную справу рупіліся непараўнальна больш. Найдаўнейшыя (з канца XV — пачатку XVI ст.) дакументальна засведчаныя школы пры касцёлах на землях Беларусі былі ў Горадні, Гайне, Гарадзішчы, Мастах, Палонцы, Шыдлавічах, Трабах, Зэльве і інш. Польскі гісторык Ежы Ахманьскі дапускаў верагоднасць існавання такіх школ яшчэ ў дзесятках гарадоў і мястэчак, у прыватнасці, у Лоску, Лідзе, Менску, Міры, Нясвіжы, Навагрудку, Полацку, Слоніме, Шчучыне, Віцебску і г.д. Мовай навучання ў іх была польская, старабеларуская («руская») і літоўская (у залежнасці ад месцазнаходжання школы і настаўніка), а таксама лацінская. Прыкладам, у канцы XV ст. віленскі канонік і гаспадарскі пісар Адам Якубовіч з Котры, што ў Гарадзенскай воласці, да студыяў у Кракаўскім універсітэце вывучаў «рускую» мову ў школе віленскага кафедральнага касцёла. Пад актам віленскай уніі 1499 г. ён падпісаўся па–старабеларуску.

У XVI ст. універсітэцкая адукацыя і служба пры адным з еўрапейскіх двароў сталі неабходнасцю для ўсіх, хто хацеў атрымаць месца ў адміністрацыі, касцёле ці судаводстве. Гэта было і своеасаблівым сведчаннем гуманістычнага выхавання моладзі. Невыпадкова навагрудскі падсудак Хведар Еўлашоўскі ў мемуарах з годнасцю прыгадаў, што ягоны сын служыў у князёў Гонзага ў Мантуі.

Эпоха Адраджэння наклала адбітак літаральна на ўсе бакі грамадска–палітычнага і культурнага жыцця краіны. Наяўнасць этнічна беларускага насельніцтва каталіцкага веравызнання (размешчанага пераважна на захадзе цяперашняй тэрыторыі краіны), развіццё вольных магдэбургскіх гарадоў, традыцыйная верацярпімасць і павялічэнне колькасці людзей з еўрапейскай адукацыяй — усё гэта спрыяла глыбокім культурным пераменам. У выніку пранікнення новай заходнелацінскай традыцыі і яе сутыкнення з грэцка–візантыйскай, якая ў першай палове XVI ст. тут яшчэ цалкам дамінавала, на землях Беларусі пачаўся працэс культурнай сінтэзацыі. Спалучэнне ўсходніх і заходніх уплываў найвыразней праявілася ў развіцці літаратуры, пісьменства, архітэктуры.



*Заняткі ў універсітэце. Сярэднявечная гравюра.*

У літаратуры ўспрыманне новага адбывалася дзякуючы перакладам. Перакладаліся не толькі тэксты Святога Пісання і літургічныя творы, але жыцці святых, апакрыфічныя творы, духоўныя і свецкія аповесці. У сярэдзіне XV ст. у Беларусі былі вядомы пераклады каталіцкае імшы «Як се мша чтеть римским обычаем» і «Песні песняў». Крыху пазней з'явіліся пераклады свецкай аповесці «Сказанне пра Сівілу Прарочыцу», «Кнігі пра Тундаля», жыція «Аляксея, чалавека Божага», рэлігійных аповесцяў «Мукі Хрыстовы», «Аповесць пра трох каралёў». Шырокую папулярнасць займелі вядомыя яшчэ ў эпоху Кіеўскай Русі пераклады свецкіх аповесцяў «Троя» і «Александрыя». Персанажы «Александрыі» фігуравалі ў беларускіх летапісах, а бітва Аляксандра Македонскага з індыйскім царом Порам стала сцэнай беларускага лялечнага тэатра (батлейкі). Невыпадкова гэтыя творы згадваў у прадмове да перакладу Біблії і Францішак Скарына.



Праз пераклад гістарычных кніг («Аповесць пра Траянскую вайну», «Хранограф») пачалася і рэцэпцыя еўрапейскай гістарычнай думкі. У канцы XVI ст. шляхцічам Вялікага Княства Амброжыем Брэжэўскім на старабеларускую мову была перакладзена «Хроніка ўсяго свету» польскага гісторыка Марціна Бельскага (1551 г.) і хронікі Мацея Стрыйкоўскага.

Апрача перакладаў вядомымі і даступнымі ў Вялікім Княстве былі і арыгіналы лацінскіх старадрукаў. У канцы XV—XVI ст. тут з'явіліся прыватныя бібліятэкі, фонды якіх у значнай ступені складалі выданні лацінамоўнай літаратуры. Засваенне твораў (заходнееўрапейскага) пісьменства рыхтавала глебу для нараджэння сваёй арыгінальнай свецкай літаратуры на лацінскай мове. Першым навалацінскім творам была гістарычная паэма Яна Вісліцкага «Пруская вайна», выдадзеная ў Кракаве ў 1516 г. Асабліва ж вядомай стала лірычна–эпічная паэма «Песня пра зубра» («Carmen de statura, feritate ac venatione bisontis»), напісаная ў Рыме ў 1521—22 г. для папы Льва X (1513—1521) паэтам Міколам Гусоўскім і выдадзеная ў 1523 г. у Кракаве. Мікалай Гусоўскі паходзіў хутчэй за ўсё з Усава, што на беларуска–літоўскім памежжы. Ад яго паэмы прынята адлічваць пачатак навалацінскай паэзіі Беларусі і Літвы.



*Зубр, апеты Міколам Гусоўскім. Гравюра XVI ст.*

Уплыў лацінскай традыцыі і пашырэнне некірылічных тэкстаў у Беларусі былі настолькі значнымі, што апрача кірылічных літар тут на пісьме пачалі выкарыстоўвацца лацінскія літары. Калі ў XV ст. і лацінскія словы маглі запісвацца кірыліцай, дык у XVI ст. нават усходнеславянскі тэкст часта перадаваўся ўжо лацінкай. Рэаліі культурнага жыцця ў Беларусі былі такія, што адной асобе даводзілася пісаць і на старабеларускай, і на лацінскай, і на польскай мове. Магчыма, у выніку гэтага гатычная графіка лацінска–польскага пісьма адбілася на форме старабеларускага скорапісу. Літары апошняга сталі падобныя да паўустаўных, што адрознівала іх ад маскоўскага шрыфту. Такім шляхам яшчэ ў XVI ст. паўстала беларуская лацінская графіка.

У XVI ст. у Беларусі, як і ў цэлым Вялікім Княстве Літоўскім, у пісьменстве суіснавалі і развіваліся чатыры моўныя стыхіі — царкоў-

наславянская, старабеларуская, лацінская і польская. Дзве першыя належалі да ўсходняй культурнай традыцыі, дзве апошнія — да лаціна–рымскай. Таму літаратурная творчаць у беларускім краі гэтага часу была полілінгвістычная, а дзейнасць многіх гуманістаў–асветнікаў немагчыма ўпісваць у традыцыю нейкага аднаго народа.

Высокага развіцця ў тыя часы дасягнула літаратура на старабеларускай мове — афіцыйнай мове Вялікага Княства Літоўскага. У канцы XIV—XV ст. дзелавое пісьмо на ёй ужо выразна адрознівалася ад пісьма Русі Маскоўскай. Пісьменства на тэрыторыі Беларусі настолькі ўзбагацілася арфаграфічнымі, граматычнымі і лексічнымі асаблівасцямі, што спецыялісты лічаць магчымым гаварыць пра беларускую літаратурна–пісьмовую мову XV—XVI ст. У той перыяд з'явіліся першыя творы старабеларускай свецкай пісьменнасці — граматы, акты, прывілеі, летапісы.



*Слуцкі князь Юры Алелькавіч (1492—1542).*

Зыходзячы з мовы летапісаў Вялікага Княства Літоўскага, яшчэ Мікалай Кастамараў называў іх беларускімі, іншыя вучоныя — літоўскімі, літоўска–рускімі, заходнерускімі і інш., а цяпер спецыялісты ўслед за Мікалаем Улашчыкам звычайна класіфікуюць такія летапісы як беларуска–літоўскія. У межах сучаснай Беларусі ў канцы XIII ст. гістарычныя запісы вяліся ў Навагрудку і, праўдападобна, у Пінску, а магчыма, і ў іншых гарадах. У Полацку ці ў Смаленску ў XV ст. быў ілюстраваны і, верагодна, перапісаны і Радзівілаўскі летапіс, славуты сваімі мініяцюрамі.

У XV ст. сталі ствараццa агульнадзяржаўныя па ідэйна–палітычным змесце летапісныя творы — летапісы Вялікага Княства Літоўскага. Большасць іх асвятляе палітычную гісторыю дзяржавы да сярэдзіны XV ст., толькі ў некаторых помніках запісы даведзены да XVI, і яшчэ радзей — да XVII ст. Сваімі каранямі яны сягаюць летапісання Кіеўскай Русі, з якога часам без зменаў запазычваліся цэлыя фрагменты і сюжэты. Галоўнай жа структурна–семантычнай



мадэллю першых твораў новага летапісання стала Аповесць мінулых гадоў.

Найдаўнейшым помнікам беларуска–літоўскага летапісання лічыцца «Летапісец Вялікіх князёў Літоўскіх», або беларуска–літоўскі летапіс 1446 г., створаны ў Смаленску. Гэта першы агульнадзяржаўны летапісны звод і адзін з самых ранніх твораў уласна беларускай гістарычна–дакументальнай прозы, у якім увасоблены вопыт кароткай гісторыі Вялікага Княства Літоўскага ад смерці Гедыміна да смерці Вітаўта. Галоўная ідэя гэтага прасякнутага дзяржаўным патрыятызмам зводу ў усхваленні дзейнасці вялікіх князёў літоўскіх, абгрунтаванні і апраўданні палітыкі аб'яднання Літвы і Русі.

Беларуска–літоўскі летапіс 1446 г. стаў асновай наступнага летапіснага зводу, створанага ў першай чвэрці XVI ст. у новай палітычнай сітуацыі і пад уплывам ідэй Адраджэння. Яго ядром была «Хроніка Вялікага Княства Літоўскага і Жамойцкага», напісаная асобай, набліжанай да літоўскіх паноў Гаштаўтаў. На думку Мікалая Ўлашчыка, праца над ім вялася ў Навагрудку. У адрозненне ад першых летапісаў, хроніка падае міфічную гісторыю Вялікага Княства першапачатковага перыяду. Шэраг летапісаў, аб'яднаных у гэты звод, вылучае наяўнасць легенды пра рымскае паходжанне літоўскіх нобіляў (яны выводзіліся ад Палямона — родзіча рымскага імператара Нерона). Падобная генеалогія выявіла тагачасную тэндэнцыю звязваць сваю панавальную дынастыю і дзяржаўнасць са старажытнай Рымскай імперыяй, характэрную для ўсёй Еўропы. Яна была вядома ўжо Яну Длугашу, але канчаткова сфармавалася і пашырылася, відаць, не раней за 1520-я г., паколькі ў Супрасльскім летапісе, перапісаным у 1519 г. дзесьці ў Усходняй Беларусі па замове князя Сямёна Іванавіча Адзінцэвіча, яе яшчэ няма.




*Старонка рукапісу Хронікі Быхаўца.*

У першай палове XVI ст. быў створаны і трэці звод агульнадзяржаўнага беларуска–літоўскага летапісання, вядомы цяпер па адзіным помніку — «Хроніцы Быхаўца» (назва паходзіць ад прозвішча

шляхціча Аляксандра Быхаўца — уладальніка рукапісу, знойдзенага ў 1820-х г. у Магілёўцах Ваўкавыскага павета). У арыгінале хроніка была напісана на старабеларускай мове кірыліцай, але ў XVIII ст. яе перапісалі лацінскай графікай, і даследчыкі маюць справу толькі з такім тэкстам помніка. Створаны на жывой, блізкай да размоўнай мове, гэты твор заснаваны на асноўных сюжэтах першых зводаў, якія дапоўнены новымі, невядомымі іншым летапісам паведамленнямі. Аб'яднаўшы серыю гістарычных аповесцяў, напісаных у розныя часы і складзеных у паслядоўнасці, ён з выразна патрыятычных пазіцый асвятляе гісторыю Вялікага Княства Літоўскага ад яе пачаткаў да 1506 г. Існуе шмат меркаванняў наконт аўтарства і часу напісання «Хронікі Быхаўца». На думку знаўцы беларуска–літоўскага летапісання Мікалая Ўлашчыка, яе стварылі на пачатку XVI ст. у праваслаўным асяроддзі слуцкага князя Юрыя Алелькавіча. Такія ж вучоныя, як Ежы Ахманьскі, Рымантас Ясас, Мечысловас Ючас настойвалі на аўтарстве кагосьці з асяроддзя ўплывовага роду Гаштаўтаў. Але і Ахманьскі пагаджаўся, што, прынамсі, апошняя частка хронікі стваралася праваслаўным патрыётам Вялікага Княства.



*Храніст Мацей Стрыйкоўскі (1547—1592).*

У XV—XVI ст. беларуска–літоўскія летапісы выкарыстоўвалі ў сваіх творах польскія храністы. Так, Ян Длугаш пры напісанні «Гісторыі Польшчы» карыстаўся перакладзенай на лацінскую мову версіяй «Летапісца вялікіх князёў літоўскіх» («Origo regis»). А Мацей Стрыйкоўскі ў «Хроніцы польскай, літоўскай, жамойцкай і ўсёй Русі» каля 300 разоў спасылаўся на рукапісы беларуска–літоўскіх летапісаў, большасць якіх пазней загінула.

Узровень сацыяльна–эканамічнага і культурнага развіцця гарадоў Вялікага Княства Літоўскага, а таксама грамадска–палітычная і канфесійная атмасфера ў дзяржаве на пачатку XVI ст. аказаліся



дастаткова спрыяльнымі для ўзнікнення якасна новай з'явы культурнага жыцця — кнігадрукавання. Пачынальнікам беларускага, а разам з тым і ўсходнеславянскага (бо беларускае было заснавана першым) кнігадрукавання стаў прадстаўнік новай, гуманістычнай культуры палачанін Францішак Скарына (1490 — каля 1551). Адвучыўшыся ў 1504—06 г. у Кракаўскім універсітэце і атрымаўшы там ступень бакалаўра філасофіі, сын полацкага купца Лукі ў 1512 г. абараніў у Падуі дыплом доктара «навук лекарскіх», а ў 1517 г. у Празе распачаў выданне кніг «Старога Запавету» і «Псалтыра», перакладзеных на царкоўнаславянскую мову беларускай рэдакцыі. За два–тры гады Францішак Скарына надрукаваў у Празе 23 кнігі Біблії, а потым перанёс сваю дзейнасць у Вільню. У сталіцы ВКЛ ён заснаваў друкарню ў доме бурмістра Якуба Бабіча — першую друкарню ва ўсёй Усходняй Еўропе, у якой выдаў «Малую падарожную кніжку» (1522) і «Апостал» (1525). На гэтым кнігавыдавецкая дзейнасць Скарыны спынілася. Шукаючы прычыны гэтага, даследчыкі называюць адыход з жыцця асноўных апекуноў першадрукара — згаданага бурмістра Якуба Бабіча і радцы Багдана Онкава, а таксама абвастрэнне адносін паміж патрыцыятам і мяшчанскім людам Вільні. Праўдападобна, з мэтай распаўсюджання сваіх выданняў Скарына прыкладна ў 1525 г. паехаў у Маскву, але гэтае падарожжа завяршылася поўнай няўдачай: яго кнігі былі абвешчаны «ерэтычнымі» і прылюдна спалены.



*Францішак Скарына. Гравюра 1517 г. з кнігі Скарыны «Ісус Сірахаў».*

Кнігі Францішка Скарыны склалі дзве трэці ўсіх выданняў кірылічнага шрыфту, якія з'явіліся на працягу XV і першай чвэрці XVI ст. у Еўропе, і больш паловы такіх кніг, выдадзеных на еўра-

пейскіх землях да сярэдзіны XVI ст. Яны адразу прыцягвалі да сябе ўвагу сучаснікаў, чыталіся і перапісваліся імі. Скарынавымі выданнямі карысталіся наступныя друкары — браты Мамонічы, Мацвей Кавячынскі, Сымон Будны, Лаўрэнці Крышкоўскі, Васіль Цяпінскі, а таксама маскоўскі першадрукар Іван Фёдараў. Першадрукі Скарыны займелі шырокую чытацкую аўдыторыю не толькі на землях Беларусі, Літвы і Украіны, яны вывозіліся ў Расію, а на Захадзе былі знаёмы польскім, чэшскім і нямецкім інтэлектуалам. Цяпер выданні славутага палачаніна захоўваюцца галоўным чынам у бібліятэках Расіі, Украіны, а таксама ў кнігасховішчах Варшавы, Кракава, Капенгагена, Кембрыджа, Лондана, Любляны, Прагі.



*«Дыспут».*
*Гравюра тытульнай старонкі кнігі Скарыны «Ісус Сірахаў».*

Па светагляду Францішак Скарына быў чалавекам тыпова рэнесансавай культуры. Ён упершыню мэтанакіравана выкарыстаў Біблію для выхавання ўсяго «люду паспалітага», перакладаючы яе на зразумелае для простых людзей слова. Ухіляючыся ад схаластычных дыскусій, асветнік вольна, гуманістычна тлумачыць біблейскія тэксты і суправаджае іх уласнымі прадмовамі ды пасляслоўямі. Кнігі Бібліі, выдадзеныя Скарынам, значна менш канфесійныя, чым іншыя тагачасныя пераклады Святога пісання. Сімвалічна, што ў іх, ці не ўпершыню ў сусветнай практыцы падобных выданняў, змешчаны не відарыс святога, а аўтапартрэт Скарыны.

Творчасць Францішка Скарыны — характэрны прыклад плённага спалучэння дзвюх культурных традыцый — грэка–славянскай і заходнелацінскай. Гэты сінтэз яскрава выяўляецца і ў змесце ягоных кніг, і ў іх афармленні (графіка, кампазіцыя і інш.), нават у шрыфце: першадрукар злучыў беларускі паўустаў з лацінскай антыквай. У прадмовах і пасляслоўях старую гімнаграфічную традыцыю ён спалучыў з новай для Беларусі паэтычнай, характэрнай для лацінскай культуры. І канфесійна Скарына талерантны, адназначна не



вызначаны, а хутчэй надканфесійны, за што пазней яго крытыкавалі прадстаўнікі як праваслаўнага, так і каталіцкага лагераў. Прыклад ягонага культурнага сінтэзу — гэта унікальная з'ява, характэрная для вытокаў новых усходнеславянскіх літаратур. У беларускай культуры яго зварот да мовы свайго народа, гуманізм і патрыятызм выявілі найважнейшыя рысы еўрапейскага Адраджэння. Тагачасная беларуская мова ўзнята Францішкам Скарынам на той жа ўзровень, на якім былі класічныя старажытныя мовы — мовы арыгіналаў і першасных перакладаў Бібліі, а беларуская культура ўзведзена да агульнаеўрапейскіх вяршыняў. У гэтай сувязі варта заўважыць, што феномен Скарыны ўзнік не на пустым месцы: яго кнігавыдавецкая дзейнасць карысталася падтрымкай адукаваных мяшчан Вільні і Полацка, а надрукаваныя ім кнігі мелі падрыхтаванага спажыўца, прадстаўленага таксама пераважна жыхарамі гарадоў.



*Друкаванне кніг у Чэхіі.*
*Гравюра XVI ст.*

Пасля Скарыны кнігадрукаванне ў Беларусі аднавілася ў 1550—60-х г. і было ўжо пастаянным. Пад уплывам Рэфармацыі за кароткі тэрмін з'явіліся друкарні ў Берасці (1553), Нясвіжы (1560), Заблудаве (1569), Лоску (1572), маёнтку Цяпіна пад Лепелем (у 1570-х), а таксама шэраг друкарскіх варштатаў у Вільні (1574), якая стала сапраўдным цэнтрам славянскага кнігадруку. Адной з найбуйнейшых у дзяржаве і першых у сталіцы была друкарня братоў Мамонічаў. Яна існавала прыкладна 50 гадоў, пры гэтым да 1596 г. друкавала літаратуру толькі кірыліцай, і тройчы (у 1576, 1586 і 1593 г.) атрымлівала прывілей вялікага князя на права выдаваць царкоўна–рэлігійную і свецкую літаратуру, у тым ліку Статут 1588 г. Беларускія кніжныя выданні таго часу карысталіся попытам у суседніх краінах. У прыватнасці, кнігі з друкарні Мамонічаў паступалі на маскоўскі рынак.

З заснаваннем кнігадрукавання хутка ўзрастала роля кнігі як важнага фактара культурнага жыцця. У другой палове XVI ст. у Беларусі ўжо існаваў грамадскі попыт на друкаваную кнігу, склаўся своеасаблівы кніжны рынак. Фармаваліся буйныя бібліятэкі — як царкоўна–манастырскія (найбольшыя ў Полацкай Сафіі і ў найбуйнейшым кнігапісным цэнтры Супраслі), гэтак і прыватныя, свецкія. Напрыклад, кнігазборы князёў Алелькавічаў, паноў Радзівілаў, Хадкевічаў, Сапегаў, Зяновічаў, віленскіх купцоў Мамонічаў налічвалі па некалькі тысяч тамоў. У фондах бібліятэк Хадкевічаў, Заслаўскіх і Слуцкіх працаваў Мацей Стрыйкоўскі. Сярод друкаванай літаратуры ў дзяржаве тады яшчэ цалкам дамінавала кірылічная кніга. Карысталіся ёю не толькі «русіны», але і адукаваныя колы літоўскага паходжання. Напрыклад, прыватная бібліятэка канцлера Альбрэхта Гаштаўта на адну трэціну складалася з кніг «рускіх».



*Рыгор Хадкевіч, вялікі гетман літоўскі (1566—1572).*

На мяжы XV — XVI ст. новыя тэндэнцыі выявіліся і ў развіцці асноўных формаў мясцовага дойлідства, у фармаванні гарадской забудовы. Асаблівасцю Беларусі стала тое, што рэнесансавыя рысы мураванай архітэктуры да пачатку XVII ст. спалучаліся тут са старымі элементамі готыкі. Сілуэт беларускага горада ўсё больш вызначалі высокія вежы і стромкія дахі. Многія праваслаўныя храмы ў XVI ст. будаваліся таксама пад гатычны стыль. Пры гэтым яны мелі настолькі адметныя рысы, што шэраг помнікаў можна вылучыць у асобную групу беларускай готыкі. Такімі храмамі з'яўляліся цытадэльныя цэрквы з абарончымі вежамі па кутах у Малым Мажэйкаве, Сынкавічах ды Супраслі. У гэты час на тэрыторыі Беларусі цэрквы істотна адрозніваліся ад архітэктурных канонаў, характэрных для Маскоўскай Русі — цыбулепадобнай галоўкі ды чатырохскатнага даху. Прыкладам, гравюра Міхаіла Цюндта 1568 г. сведчыць, што ў Горадні такіх абрысаў не мела



ніводная царква. Асноўнай формай храмаў тут быў падоўжаны чатырохкутнік, як у касцёлаў, і двухскатны дах, а над уваходам звычайна ўзвышалася вежка з невялікім прадаўгаватым купалам. Гэтыя ж рысы характарызавалі тады і драўляныя цэрквы, якія будаваліся ў вёсках.



*Абарончы храм у Супраслі. Малюнак В. Гразнова. Другая палова XIX ст.*

Трапіўшы ў сферу цывілізацыйных уплываў каталіцкай Еўропы, Беларусь стала рэгіёнам грэка–лацінскага культурнага сінтэзу. Разам з Украінай яна з XVI ст. выконвала ролю «перадатчыцы» заходніх культурных уздзеянняў на Маскоўскую Русь, якая не зведала Адраджэння ў агульнаеўрапейскім сэнсе. У выніку гэтых уплываў, як адзначыў польскі гісторык культуры Станіслаў Кот, ужо праз стагоддзе памежныя слупы заходнееўрапейскай культуры можна было ставіць на Дняпры і Дзвіне, бо тыя ж ідэі і каштоўнасці, якімі жыў Парыж і Рым, сягалі цяпер усходніх межаў Беларусі.

## VI.3. Фармаванне беларускага народа

Этнічная супольнасць беларусаў фармавалася ў складаных, неспрыяльных для кансалідацыі ўмовах малацэнтралізаванай поліэтнічнай і поліканфесійнай дзяржавы. Як лічыць шэраг вучоных, матэрыялы археалогіі, антрапалогіі, этнаграфіі і лінгвістыкі сведчаць, што працэс выдзялення беларусаў з усходнеславянскага

этнічнага комплексу пачаўся яшчэ да ўтварэння Вялікага Княства Літоўскага. Пры гэтым важную ролю ў этнагенэзе беларусаў выканаў этнамоўны субстрат — мясцовае балцкае насельніцтва, завяршэнне славянізацыі якога ў асноўным і супала са з'яўленнем першых прыкметаў асобнай моўна–этнічнай супольнасці, што стала беларускім народам.

Археалагічнымі помнікамі славянізаваных балтаў сталі курганы з пахаваннямі, арыентаванымі на ўсход — паводле балцкай традыцыі (бо славяне хавалі нябожчыкаў галавой на захад). У межах рассялення старажытных балтаў, у Верхнім Падняпроўі і Падзвінні, склаўся і асаблівы антрапалагічны тып людзей, адрозны ад антрапалагічных характарыстык продкаў вялікарусаў і ўкраінцаў. Да X — XIII ст. сягаюць вытокі многіх агульных для літоўцаў і беларусаў рытуалаў, культаў, казачных сюжэтаў, паралеляў у традыцыйнай матэрыяльнай культуры ды шмат іншага.

Важным паказальнікам характару этнічных працэсаў на тэрыторыі Беларусі эпохі ранняга Сярэднявечча стала з'яўленне моўных асаблівасцяў мясцовага насельніцтва. Спецыялісты фіксуюць іх у помніках мясцовага пісьменства прынамсі з XIII ст. Напрыклад, на берасцяной грамаце канца XIII ст., знойдзенай у Віцебску,



*Панарама Вільні. Фрагмент гравюры Т. Макоўскага. Пачатак XVII ст.*

зафіксавана выразнае цоканне, характэрнае для віцебска–смаленскага крывіцкага рэгіёна. Уласцівыя беларускай мове аканне, яканне, дзеканне, цвёрдае «р» і іншыя спецыфічныя рысы заўважаны ў тэксце дамовы Смаленска, Віцебска і Полацка з Рыгай і Гоцкім берагам (1229 г.), у шматлікіх полацкіх граматах XIII—XV ст. ды іншых старабеларускіх помніках пісьменства.



Мовазнаўцы лічаць, што ў перыяд з XIII да XVI ст. з'явіліся практычна ўсе асноўныя фанетычныя і марфалагічныя асаблівасці старабеларускай мовы, гэта значыць, яна ў асноўным сфармавалася. Відаць, і адасабленне «прабеларускіх» дыялектна–этнаграфічных групаў усходнеславянскага насельніцтва (дзякуючы розніцы субстратных асноў) пачалося не пазней чым у XIII ст. (галоўным чынам у басейнах Верхняга Падняпроўя, Панямоння, Віцебска–Полацкага Падзвіння).

Уваходжанне беларускіх зямель у склад Вялікага Княства Літоўскага было бясспрэчна важным для іх этнічнай кансалідацыі. Аднак, хоць на ранніх этапах этнагенэзу палітычнаму фактару належыць першаступенная роля, значэнне дзяржавы ў фармаванні беларусаў не варта перабольшваць, тым больш адводзіць ёй ключавую ролю. Як ужо адзначалася вышэй, многія этнічныя прыкметы беларусаў выявіліся задоўга да ўтварэння Вялікага Княства, а межы іх рассялення цягам стагоддзяў ніяк не супадалі з палітычнымі межамі гэтай дзяржавы. Як на ўсходзе паміж беларусамі і вялікарусамі пралягала шырокая зона пераходных гаворак, так і на поўдні, уздоўж Прыпяці, таксама цягнулася зона змешаных гаворак, якія па–рознаму сумяшчалі беларускія і ўкраінскія дыялектныя асаблівасці. Пры гэтым да XIV ст. на раёны Турава–Пінскай зямлі больш распаўсюджваліся нормы кіеўскіх гаворак.

Галоўным сведчаннем існавання этнічнага аб'яднання і паказальнікам узроўню кансалідацыі народа ў навуцы ўважаецца этнічная самасвядомасць, а таксама эндаэтнонім (саманазва) як знешняя форма яе праяўлення. Але свядомасць народных масаў кожнага традыцыйнага грамадства вызначаецца мноствам лакальных і канфесійных сувязяў, тэрытарыяльна–этнаграфічным рэгіяналізмам. Насельніцтва Беларусі ў Сярэднявеччы складалася з зямляцкіх аб'яднанняў, якія называліся па галоўным горадзе зямлі — «палачане», «віцябляне», «магілёўцы», «случане» і г.д. Пасля ўваходжання беларускіх зямель у склад ВКЛ на іх пашыралася агульная назва — «Літва». Праўда, у пісьмовых крыніцах XIV—XVI ст., як і раней, ужываліся тыя ж зямляцкія назвы («палачане», «віцябляне» і г.д.), якія аб'ядноўвалі жыхароў горада і зямлі незалежна ад веравызнання і этнічнага паходжання. Устойліваму выкарыстанню такіх тэрытарыяльных азначэнняў спрыяла слабая цэнтралізаванасць дзяржавы і аўтаномнае становішча яе земляў.

У Вялікім Княстве Літоўскім асноўнымі формамі самаазначэння насельніцтва Беларусі доўгі час былі дзве назвы — «Русь» і «Літва». Абедзьве яны мала адпавядалі падзелу жыхароў як па этнічнай, так



*Горадня. Фрагмент гравюры XVI ст.*

і па канфесійнай ці моўнай прыкмеце. Ужо ў XIV—XV ст. Літвою называлі не толькі этнічна літоўскія землі, але і некаторыя землі Беларусі, найперш каланізаванае яшчэ ў XI—XII ст. усходнімі славянамі Верхняе Панямонне (Чорную Русь), заходнюю частку Меншчыны ды Браслаўшчыну. У «Спісе рускіх гарадоў», складзеным у канцы XIV — пачатку XV ст., «літоўскімі» гарадамі названы не толькі населеныя пункты Заходняй Беларусі, але таксама Слуцк, Клецк, Друцк, Лукомль, Орша, Барысаў, Менск, Полацк, Віцебск, Крычаў і інш. — практычна ўсе гарады Беларусі, якія знаходзіліся пад уладай вялікага князя літоўскага.

«Русь» лакалізавалася толькі на невялікай частцы тэрыторыі Вялікага Княства, заселенай беларусамі. Межы «Літвы» і «Русі» былі не столькі этнічна–канфесійныя, колькі тэрытарыяльна–палітычныя. Як далёка не кожны русін (беларус) у гэтай дзяржаве мусіў абавязкова быць праваслаўным, так і не ўсе літоўцы з'яўляліся каталікамі. Напрыклад, паводле сведчанняў канцылярыі Нямецкага ордэна, у 1409 г. на аднаго літоўца, які прыняў каталіцызм, прыходзілася яшчэ сотня яго праваслаўных суродзічаў. Шлях беларусаў у касцёл таксама быў адкрыты. У грамаце Вітаўта з 1392 г., пісанай у справе далейшага хрышчэння літоўцаў, спецыяльна адзначалася, што «калі які русін пры гэтым захоча ахрысціцца па сваёй волі — той няхай хрысціцца» (мелася на ўвазе вера лацінская). Відаць, такія перахрышчванні былі не выпадковым здарэннем, калі на гэта спатрэбілася асобная агаворка. Нездарма ў XIV—XV ст. у шэрагу беларускіх гарадоў ужо функцыявалі каталіцкія касцёлы і кляштары. На захадзе краіны ў тыя часы існавала яшчэ не кранутае паланізацыяй этнічна беларускае насельніцтва. З другога боку, каланізуючы землі этнічнай Літвы, продкі беларусаў ужо ў XIV ст. сяліліся ў раёнах Вільні і Трокаў. Ягайлаў прывілей 1387 г. згадвае вёскі «русінаў» на тэрыторыі ўласнай Літвы. Фламандскі падарожнік Жыльбер дэ Лануа адзначыў, што ў 1414 г. у Троках апрача татараў, немцаў і літоўцаў жывуць русіны. А нямецкі храніст Віганд Марбурскі ў канцы XIV ст., пэўна ж, не без падстаў, называў Вільню «рускім горадам».



Завяршэнне інтэграцыі грамадскай эліты Вялікага Княства Літоўскага ў адзін палітычны народ надало назве «ліцвін» шырокі, і найперш палітычны сэнс. У крыніцах пачынаючы з другой паловы XVI ст. гэты тэрмін найчасцей ужо не меў ніякага этнічнага зместу. Звычайна так называлі прадстаўнікоў шляхецкага стану або тубыльцаў ВКЛ нагул. У дакументах XVII ст. можна сустрэць нямала такіх азначэнняў, як «ліцвіны грэцкага закону людзі», або «ліцвіны рускага роду».



*Панарама Берасця. З гравюры XVI ст.*

Паколькі найважнейшым кампанентам этнічнай кансалідацыі ў тыя часы заставалася рэлігія, то ва ўмовах суіснавання розных

веравызнанняў адзінага эндаэтноніма для жыхароў усёй Беларусі і не магло быць. Усходняе хрысціянства, якое ў афіцыйных дакументах фігуравала як «руская» або «грэцкая» вера, да другой паловы XVI ст. заставалася рэлігіяй асноўнай масы насельніцтва ВКЛ, таму для гэтай праваслаўнай большасці галоўным самавызначэннем па–ранейшаму заставалася назва «Русь» і вытворныя ад яе «русін», «рускі», «русіч»,каталікоў жа называлі «ліцвінамі», а часам і «палякамі».

Нягледзячы на этнамоўную і канфесійную роднаснасць, у адносінах паміж насельніцтвам Беларусі і Вялікарасіі з даўніх часоў выяўлялася дыстанцыя. Даўнюю саманазву «Русь» праваслаўныя жыхары Беларусі (як і Украіны) імкнуліся пераносіць толькі




*Панарама Клецка. Гравюра Т. Макоўскага. Пачатак XVII ст.*

на сябе, называючы суседніх вялікарусаў «маскоўцамі», «маскалямі», «Масквою». Дакументальна засведчаны адрозненні ва ўспрыняцці праваслаўных Русі Літоўскай ад Русі Маскоўскай. За перасялянцамі



з Масквы (перабежчыкамі або палоннымі) у Беларусі пакаленнямі замацоўвалася мянушка «маскаль» ці «масквіцін». У Маскве ў XVI—XVII ст. жыхароў Беларусі ўспрымалі як чужых, называючы іх «літоўцамі» ды «палякамі», праваслаўных прадстаўнікоў пасольства не прапускалі ў царкву, а палонных хрысціян усходняга абраду заўсёды прымушалі хрысціцца па–новаму. Старабеларуская мова, якая ў Вялікім Княстве Літоўскім афіцыйна называлася «рускай», у Маскве лічылася «літоўскай», яе там не разумелі і патрабавалі перакладчыка.

Назва «Белая Русь» толькі ў пачатку XVII ст. трывала замацавалася за Беларускім Падзвіннем і Падняпроўем. Пасля прыняцця царкоўнай уніі 1596 г. пачала выкарыстоўвацца і вытворная ад яе



*Заслаўскі замак у XVII ст.*
*Мал. В. Сташчанюка па матэрыялах Ю. Зайца.*

этнанімічная форма «беларусцы» (хоць ужо Мацей Стрыйкоўскі ў сваёй хроніцы назваў праваслаўнае насельніцтва Вялікага Княства «літоўскімі беларусамі»). Яшчэ раней пад уплывам Рэфармацыі старадаўняе азначэнне «Русь», «рускія людзі» пачало губляць канфесійны змест. Так з канца XVI ст. сталі называць не толькі праваслаўных, але і пратэстантаў, уніятаў і нават каталікоў. У разуменні Мялеція Сматрыцкага, існаваў «рускі народ, які спавядае грэцкую веру па–ўсходняму», і «рускі народ, які спавядае рымскую веру па–заходняму ўзору». Новая ж форма «беларусцы» тычылася, праўдападобна, толькі праваслаўных. Тады ж з'явіліся азначэнні «бела

рускія гарады», «беларуская вера», «беларуская мова». «Беларусцамі» звычайна называлі самі сябе жыхары Ўсходняй і Цэнтральнай Беларусі. У маскоўскіх афіцыйных дакументах гэтага часу яны запісваліся як «беларусцы пашанные мужыкі з Літвы», «ліцвіны беларусцы», «родам беларусцы», і г.д.

У складанай ерархіі формаў самавызначэння насельніцтва Вялікага Княства Літоўскага (Францішак Скарына, напрыклад, у залежнасці ад месцазнаходжання называў сябе то «палачанінам», то «русінам», то «ліцвінам») найбольш абагульняльнай у XVI —XVII ст. была назва «ліцвіны». Яна адлюстроўвала самы шырокі ўзровень самасвядомасці, у тым ліку, відаць, і этнічнай. Напрыклад, наваградскі падсудак Хведар Еўлашоўскі, сам «русін» з паходжання, вывучаны «рускай навуцы», апавядаючы пра сойм 1578 г., адзначаў у сваім дзённіку: «маршалковал межи послами наш литвин...». Звонку «ліцвінамі» называлі ўсіх жыхароў Вялікага Княства Літоўскага, незалежна ад іх мовы і рэлігіі.

Суіснаванне розных самаазначэнняў насельніцтва і позняе з’яўленне назвы «Беларусь», «беларусцы» сведчыць пра складанасць і марудлівасць этнакансалідацыйных працэсаў у краіне, невыразнасць этнічнай свядомасці. Адмоўную ролю выканалі разбуральныя войны XVI—XVII ст., канфесійная раздзеленасць, адсутнасць кансалідаванай эліты, якая б апекавалася культурай на «простай» мове. Аднак ёсць і факты, якія сведчаць, што на ўзроўні суб’ектыўнага самаўспрымання жыхароў Беларусь тых часоў усё ж адрознівалася нават ад найбліжэйшых у этнамоўным плане Ўкраіны і Вялікарасіі.

# VII. Шляхецкая дэмакратызацыя

## VII.1. Беларускі элемент «палітычнага народа»

Як ужо адзначалася, прававыя абмежаванні для праваслаўных падданых Вялікага Княства Літоўскага мелі сілу толькі на тэрыторыі Віленскага і Троцкага ваяводстваў, найвышэйшыя ўраднікі якіх і складалі пярэднюю раду гаспадара. Але ўжо пры Свідрыгайлу, калі праваслаўнае баярства брала самы актыўны ўдзел у палітычным жыцці дзяржавы, насуперак пастанове Гарадзельскага з’езду ў гаспадарскую раду трапіла нямала «схізматыкаў» — князі Глінскія, Хадкевічы, Корсакі, Полазавічы, Друцкія ды іншыя праваслаўныя князі. Каб не страчваць манаполіі на ўладу, паны Літвы дамагліся таго, што і пасля Троцкага прывілею 1434 г. заставаўся часткова актуальны 9-ы артыкул Гарадзельскай уніі, які не дапускаў русінаў да высокіх дзяржаўных пасадаў. Праўда, з сярэдзіны XV ст. на практыцы гэтая пастанова ўжо мала вытрымлівалася. Вядома, напрыклад, што пры Казіміру Ягайлавічу ў складзе паноў–рады знаходзіліся князі Гальшанскія, Глінскія, Астрожскія, паны Вяжэвічы, Сапегі, Няміровічы ды іншыя прадстаўнікі праваслаўнай арыстакратыі. Менавіта пры Казіміру адбыўся радыкальны адыход

ад палітыкі захавання каталіцкага складу палітычнага народа. У інтарэсах цэнтралізацыі і ўмацавання дзяржавы вялікі князь стаў свядома дапускаць русінаў да важных урадаў. Як падлічыў польскі гісторык Ежы Сухоцкі, калі ў 1413—1447 г. сярод 56 родаў, якія мелі найбольшае значэнне ў палітычным жыцці дзяржавы, было толькі 11 праваслаўных (каля 20%), дык у 1447—1492 г. іх удзельная вага павялічылася амаль удвая: з 54 самых уплывовых магнацкіх родаў ужо 20 вызнавалі грэцкую веру, гэта значыць 37%.

Пры сынах Казіміра Ягайлавіча вялікіх князях Аляксандру і Жыгімонту ўдзельная вага некаталікоў, якія атрымлівалі вышэйшыя дзяржаўныя пасады, таксама паступова ўзрастала. Яны прызначаліся ўраднікамі нават на тэрыторыі ўласна Літвы. Так, у Вільні кашталянам у 1492—1509 г. быў праваслаўны князь Аляксандр Гальшанскі, а ў 1511—14 г. гэтую пасаду займаў знакаміты абаронца праваслаўных князь Канстанцін Астрожскі. У Троках у 1502 г. ваяводзічам з'яўляўся Аляксандр Хадкевіч, а ў 1522—30 г. урад троцкага ваяводы належаў згаданаму ўжо князю Астрожскаму. Праваслаўны пан Солтан Аляксандравіч у 1482—1493 г. з'яўляўся маршалкам гаспадарскім, а ў 1486—1487 г. — гаспадарскім намеснікам у Навагрудку, дзе ў 1500—01 г. гэты ж урад займаў Сямён Гальшанскі.



*Жыгімонт I Стары. Дрэварыт XVI ст.*

У некаторых гарадах Беларусі, прыкладам, у Віцебску і Менску, грэцкага веравызнання трымалася наогул большасць вялікакняскіх намеснікаў. Падскарбіямі пры Аляксандру былі праваслаўныя Храбтовічы і Солтаны, а пры Жыгімонту Старым — русіны Іван Гарнастай і Богуш Багавіцінавіч. Хоць, вядома ж, у



цэлым па дзяржаве каталікі па-ранейшаму дамінавалі на вышэйшых пасадах.

Рэлігійная прыналежнасць паноў і баярства–шляхты мала залежала ад іх этнічнага паходжання. Тэрмін «русін» у XV—XVI ст.



*Мірскі замак. Рэканструкцыя М.Ткачова. Мастак Я.Кулік.*

быў ідэнтычны азначэнню «грэк», пад якім разумеўся найперш чалавек усходняга веравызнання, і часам не ўтрымліваў ніякага этнічнага зместу. Таму для этнічнай ідэнтыфікацыі таго ці іншага роду важней улічваць не канфесійную прыналежнасць, а генеалагічныя дадзеныя.

Паводле перапісу паспалітага рушання 1528 г. у Вялікім Княстве Літоўскім налічвалася больш за 40 магнацкіх родаў, кожны з якіх меў не менш за 1000 сялянскіх дымоў (тут і далей скарыстоўваем падлікі гісторыка Анатоля Грыцкевіча). Сярод іх было 17 землеўладальнікаў беларускага паходжання (гэта Глябовічы, Корсакі, Зяноўевічы, Багавіцінавічы, Храбтовічы, Сапегі, Ільінічы, Нямiровічы, Касцевічы, Кунцэвічы, Салагубы, Стратовічы, Пецькевічы, Лукамскія, Насілоўскія, князь Мікіціч і Аўрамовіч), 18 — літоўскага, 5 — украінскага і 1 — польскага.

Хоць літоўскія паны і не складалі большасці палітычнага народа Вялікага Княства Літоўскага, памеры іх латыфундый намнога пераўзыходзілі зямельныя ўладанні ўсіх астатніх магнатаў. Прыкладам, род Кезгайлаў выстаўляў на вайну ў 1528 г. большую колькасць ратнікаў, чым уся Полацкая зямля, а Радзівілы — прыкладна столькі ж, колькі Ільінічы, Зяноўевічы, Багавіцінавічы, Лукамскія, Стратовічы, Салагубы і Солтаны разам. Латыфундыя літоўскага магната ў сярэднім была ўдвая большай, чым беларускага.

Уся група магнатаў беларускага паходжання ў першай палове XVI ст. саступала ўласна літоўскай і па колькасці, і тым больш па памерах уладанняў на тэрыторыі Беларусі. Самымі буйнымі тут былі латыфундыі слуцкага князя Алелькавіча, князёў Гальшанскіх, паноў Гаштаўтаў ды Радзівілаў. Асновы гэтых латыфундый закладаліся яшчэ пры Вітаўту. Нават Віленскае біскупства атрымала дзве трэці сваіх уладанняў у Беларусі.




*Пячатка князя Юрыя Юр'евіча Алелькавіча (1584).*

Што да сярэдніх і дробных землеўладальнікаў, дык тут прапорцыі выглядалі інакш. У гэтай групе ў межах Беларусі абсалютную большасць складала шляхта беларускага паходжання. Пры гэтым у заходніх паветах удзельная вага беларускай шляхты часам змяншалася на карысць літоўскай (ад 76 і 86% у Гарадзенскім і Ваўкавыскім паветах да 56 і 61 у Лідскім і Ашмянскім), а ў цэнтры краю, у Падзвінні і Падняпроўі, наадварот, іншаэтнічны элемент сярод шляхты не перавышаў і 5%. Агулам па Беларусі амаль 80% сярэдняй і дробнай шляхты ў сярэдзіне XVI ст. мелі мясцовае паходжанне.

Менавіта структура буйнога землеўладання ў дзяржаве прадвызначала этнічны склад гаспадарскай рады. Паколькі паны літоўскага паходжання ўтваралі аснову арыстакратыі, то яны ж дамінавалі і ў гаспадарскай радзе, бо толькі буйным землеўладальнікам даваліся вышэйшыя дзяржаўныя ўрады (дзяржаўная дзейнасць патрабавала растраты ўласных сродкаў, і малазаможны чалавек проста не мог ёю займацца). Тым не менш, і ўдзел арыстакратыі беларускага паходжання ў гаспадарскай радзе быў даволі значны.

За перыяд з паловы XV да сярэдзіны XVI ст. на вышэйшыя дзяржаўныя пасады Вялікага Княства Літоўскага зафіксавана 90 прызначэнняў. З гэтай колькасці 16 разоў іх атрымлівалі магнаты беларускага паходжання, сярод якіх 14 праваслаўных і 2 каталікі — Глябовічы, Ільінічы, Сапегі, Зяноўевічы, Храбтовічы, Багавіцінавічы, Вяжэвічы, князі Друцкія, Пуцяцічы і Адзінцэвічы, Пецькевічы, Грамыкі, Стратовічы, Саламярэцкія, Копаці і Солтаны (апошнія паходзілі з татарскага роду). Праўда, нават разам з



украінскімі магнатамі (7 праваслаўных і 1 каталік) і 11 землеўладальнікамі, паходжанне якіх дакладна не вызначана, яны не складалі і паловы ўраднікаў, што на працягу стагоддзя ўваходзілі ў гаспадарскую раду. Большую палову вышэйшых дзяржаўных пасадаў трымалі ў сваіх руках літоўцы.



*Герб Жыгімонта Аўгуста (1560).*

На сярэдзіну XVI ст. гэтыя суадносіны мала, але ўсё ж змяніліся на карысць Русі: беларускім і ўкраінскім магнатам належала прыкладна дзве трацiны месцаў у радзе паноў. Так што палітычнае значэнне беларускай грамадскай эліты на працягу XV—XVI ст. паступова ўзрастала. Беларускія прадстаўнікі палітычнага народа хутка зліваліся з літоўскай арыстакратыяй і ўспрымалі Вялікае Княства Літоўскае як сваю дзяржаву. Выхадцы з даўніх праваслаўных родаў усё часцей пераходзілі ў каталіцтва, называлі сябе ліцвінамі (у палітычным сэнсе). У XVI ст. для іх стала звычайным падпісваць акты дзяржаўнага значэння ад імя «nationis Lithwaniae», хоць яны ні мовы літоўскай не ведалі, ні да культуры ўласна літоўскай не належалі. Яскравым прыкладам такіх «ліцвінскіх» родаў можна лічыць Сапегаў, Глябовічаў, Ільінічаў, Солтанаў, Хадкевічаў, Палубінскіх ды сем'і іншых паноў беларуска–украінскага паходжання.

## VII.2. Рэформы і ўзвышэнне шляхты

Палітычная сістэма Вялікага Княства Літоўскага ў першай палове XVI ст. яшчэ мала адрознівалася ад дзяржаўнага ладу Маскоўскай дзяржавы. Рэальнае становішча шляхты тут было непадобнае да той праўнай сітуацыі, у якой знаходзілася рыцарства Кароны Польскай. На землях Літвы і Беларусі сацыяльнае і эканамічнае жыццё кантралявала нешырокае кола вялікіх паноў, якія валодалі вялізнымі латыфундыямі і трымалі ў сваіх руках галоўныя дзяржаўныя ўрады. Засілле алігархаў у Вялікім Княстве

асабліва выразна выявілася ў 1530-х г., калі склаўся так званы «трыумвірат» і ў дзяржаве салідарна панавалі найбуйнейшыя літоўскія магнаты — Юры і Ян Радзівілы (адпаведна віленскі кашталян і жамойцкі стараста) разам з віленскім ваяводам і канцлерам Альбрэхтам Гаштаўтам. «Усё прыбралі да рук гэтыя тры, а з імі — ім адданыя. Бязлітаснае тыранства чыняць яны над іншымі. Крык і енкі далятаюць да нябёсаў, справядлівасць загінула», — пісаў пра ўсяўладдзе паноў у Літве сучаснік.

Інакш было ў суседняй Кароне, дзе яшчэ ў канцы XV — першай палове XVI ст. шляхта дамаглася дэмакратызацыі дзяржаўнага ладу і ўмацавала свае пазіцыі. Ужо ў акце Мельніцкага сойма 1501 г., які кіраваўся ідэяй публічнага дабра і суверэннасці права, была абмежавана судовая ўлада караля, яго прэрагатыва прызначаць урараднікаў, і манарх абавязваўся кіраваць з радай сенатараў. З паслоў шляхецкіх соймікаў утварылася пасольская палата (ізба) кароннага сойма, а канстытуцыя *Nihil novi* (1505) узаконіла яе ролю: згода паслоў шляхты стала абавязковай умовай ухвалення кожнай новай пастановы. Сойм 1504 г. забараніў раздаваць панам ва ўладанне дзяржаўныя землі. У 1520-х г. сярэдняя шляхта Кароны ўключылася ў так званы экзекуцыйны рух, што ставіў на мэце поўную рэалізацыю (спаўненне, экзекуцыю) прынятых пастаноў. Сярод галоўных пастулатаў руху было ўраўнанне правоў і абавязкаў заможных родаў з усім рыцарствам, забарона займаць больш за адзін дзяржаўны ўрад, вяртанне магнатамі раздадзеных каралём уладанняў (каралеўшчын), адміністрацыйная, судовая і вайсковая рэформы, змена падатковай сістэмы ды іншыя пераўтварэнні, якія падрывалі аснову магутнасці вялікіх паноў ды



*Юры Радзівіл, званы "Геркулесам літоўскім" (1480—1541).*





*Жыгімонт Аўгуст. Медзярыт невядомага мастака.*

забяспечвалі справядлівы, дэмакратычны лад.

Дасягненні кароннага рыцарства сталі добрым прыкладам для шляхты ВКЛ. Атрымаўшы палітычны вопыт дзякуючы ўдзелу ў працы соймаў, яна актывізавалася і ў 1540-х г. таксама ўключалася ў рух за свае правы. Калі за колькі гадоў да таго паслы яшчэ сціпла прасілі гаспадара, каб той кіраваў дзяржавай у згодзе з панамі–радаю, дык пачынаючы з Берасцейскага сойма 1544 г., на якім Жыгімонт Стары перадаваў уладу свайму сыну Жыгімонту Аўгусту, шляхта арганізавана перайшла ў наступ.

Найчасцей шляхта прасіла на соймах вызвалення ад падаткаў, змяншэння судовых і канцылярскіх пошлін, стварэння агульнага выбарнага суда (каб пазбавіць арыстакратыю судовага імунітэту), прыцягнення да земскай службы духавенства і мяшчан, а нават і самога вялікага князя. Яе пастаянныя просьбы складалі цэлую праграму, у якой апрача сацыяльных прывілеяў ставілася і чыста палітычная мэта — пераразмеркаванне рэальнай улады ў Вялікім Княстве на карысць усяго «палітычнага народа». Узорам для перайманне і наследавання былі шляхецкія вольнасці Кароны. Польскі вопыт шляхцічы пазнавалі пад час навучання ў Кракаўскім універсітэце, удзелу ў каронных соймах, праз знаёмства з новымі кнігамі і г.д. Важным пасрэднікам перадачы ідэалаў дэмакратызацыі на Беларусь і Літву выступала Падляшша, землі якога, перададзеныя калісь Ягайлам мазавецкаму князю Янушу, а ў XV ст. вернутыя ў склад Вялікага Княства, здаўна карысталіся польскім правам (Драгічынская і Мельніцкая — яшчэ з часоў Аляксандра, а Бельская — з 1547 г.). Менавіта на прыклад Падляшша спасылалася беларуска–літоўскае рыцарства, калі прасіла ўвесці інстытут шляхецкага суда.

Як помнім, хоць сойм Вялікага Княства фармальна ўжо меў заканадаўчыя функцыі, ён уяўляў з сябе хутчэй пашыраны склад гаспадарскай рады, чым орган рэпрэзентацыі "палітычнага народа", бо, згодна з І Статутам, галоўная роля ў ім належала панам. Таму адной з прынцыповых задач шляхты стала дамаганне абавязковага ўдзелу сваіх паслоў у заканадаўстве, для чаго трэба было дапрацаваць Статут. Упершыню просьба шляхты аб «паправе Статута» прагучала ў 1544 г. на Берасцейскім сойме. Жыгімонт Стары прызнаў просьбу слушнай і распарадзіўся стварыць камісію, якая б ужо на наступны сойм вынесла свае прапановы. Аднак кадыфікацыйныя працы доўга не пачыналіся. Яшчэ і ў 1551 г. на Віленскім вальным сойме станы зноў прасілі, «абы Статут права посполитого земского был поправлен а выдрукован». Тады для гэтай працы была створана спецыяльная камісія з 10 асобаў — пароўну «яко з латинского, так и греческого закону». Ад каталікоў у яе ўвайшлі жамойцкі біскуп Ян Даманоўскі, віленскі канонік Станіслаў Габрыловіч, віленскі войт і сакратар гаспадара Аўгусцін Ратундус, віленскі суддзя Павел Астравіцкі і Марцін Валадковіч. Прозвішчы членаў камісіі ад праваслаўных, на жаль, невядомыя.



*Іван IV Жахлівы, вялікі князь (з 1533) і цар маскоўскі (1547—1584).*

Адной з мэтаў «папраўы Статута», або новай кадыфікацыі права, праведзенай ініцыятываю шляхты праз соймы, было наданне аднолькавага прававога статуса ўсяму шляхецкаму стану. Калі пад час працы над ёй распачалася вайна з Маскоўскім царствам, якая ў сваю чаргу вострa паставіла на парадак дня пытанне пра унію з Каронай, аўтары новага кодэкса, імкнучыся стварыць як мага больш дасканалую сістэму права, паклапаціліся і пра тое, каб падвесці законную базу пад самастойнасць сваёй дзяржавы. Усё гэта паўплывала на змест II Статута, распрацаванага на самым высокім на той час узроўні прававой думкі. Новы кодэкс законаў, ухвалены на Віленскім сойме 1565—1566 г., стаў важнай заваёвай шляхты ў яе барацьбе за



дэмакратыю. Другі Статут умацаваў палітычна–прававую суб'ектнасць Вялікага Княства як дзяржавы, дэклараваўшы прынцып яго тэрытарыяльнай цэласнасці і абавязаўшы гаспадара вяртаць землі, страчаныя хоць калі на карысць Кароны, Мазовіі, Прусіі ці Інфлянтаў. Спецыяльным запісам прэрагатыва ўвядзення і змянення законаў перадавалася толькі вальнаму сойму.

Вайна, распачатая ў 1558 г. маскоўскім царом Іванам IV супраць Інфлянцкага ордэна, стала надзвычай важным фактарам, што паўплываў на далейшае развіццё палітычна–прававога ладу Вялікага Княства Літоўскага. Поспехі маскоўскага войска ў Інфлянтах пагражалі поўным разгромам Ордэна і замацаваннем Масквы на Балтыйскім узбярэжжы. Магістр ордэна Готгард Кетлер прасіў дапамогі ў суседніх дзяржаў. Са свайго боку, Вялікае Княства, Данія і Швецыя імкнуліся дыпламатычнымі сродкамі стрымаць заваяванні Івана IV у Прыбалтыцы. У выніку адпаведных перамоў з магістрам у Вільні было падпісана спачатку пагадненне 1559 г., якое паставіла Інфлянты пад «кліентэлу і пратэкцыю» Жыгімонта Аўгуста, а потым дагавор 1561 г., паводле якога ордэнскія ўладанні ў Інфлянтах перайшлі пад уладу ВКЛ (з 1569 г. яны сталі належаць і Кароне). Аднак, насуперак ультыматуму Жыгімонта Аўгуста, цар Іван IV адмовіўся пакідаць захопленыя землі ў Інфлянтах. Згодна з дамовай, іх абарона рабілася абавязкам вялікага князя літоўскага. З Вільні ў Інфлянты было накіравана войска на чале з Мікалаем



*Штурм Полацка маскоўскім войскам. Гравюра з "лятучага лістка" 1563 г.*

Радзівілам Чорным. У адказ маскоўскі бок развязаў вайну супраць Вялікага Княства. У 1562 царскія ваяводы ўварваліся ў Беларусь, спустошылі раёны Мсціслава, Дуброўны, Копысі, Оршы, Шклова і Віцебска. А 15 лютага 1563 г. 60-тысячная маскоўская армія пасля двухтыднёвай аблогі захапіла Полацк. Гэтая падзея прыгняла дзяржаўныя колы ВКЛ ды выклікала значны рэзананс у лацінскай Еўропе. Пра захоп «вялікага горада Полацка», яго абрабаванне і вывад шматлікага палону ў Маскву пісалася тады ў многіх «лятучых лістках», выдаваных у Нюрнбергу, Аўгсбургу, Любеку і іншых нямецкіх гарадах.

Страта Полацка і акупацыя амаль усяго Беларускага Падзвіння паставіла Вялікае Княства ў цяжкае становішча. Масква стала зноў адкрыта выступаць з тэрытарыяльнымі дамаганнямі да дзяржавы Ягайлавічаў, як гэта неаднаразова рабіла пры Івану III і Васілю III. Сітуацыю мала змяніў і ваенны поспех ВКЛ 26 студзеня 1564 г. над ракой Улай — поўны разгром гетманам Мікалаем Радзівілам Рудым арміі царскага ваяводы Пятра Шуйскага. Без знешняй дапамогі цяжка было б стрымаць агрэсію моцнага Маскоўскага царства, не гаворачы пра вызваленне ўжо захопленых ім зямель. Вільня мусіла шукаць саюзніка.



*Царскія ратнікі ў Інфлянтах. Нямецкая гравюра 1579 г.*

Ваенныя цяжкасці актуалізавалі пытанне аб уніі з Каронай Польскай. Шляхецкае рушанне 1562 г., сабранае пад Віцебскам на палявы з’езд, утварыла канфедэрацыю і накіравала Жыгімонту Аўгусту пасланне з просьбай склікаць агульны сойм для заключэння уніі. Даўно папулярная ў колах рыцарства ідэя аб’яднання з Каронай, з якой шляхта звязвала надзею на дэмакратызацыю дзяржаўнага ладу Вялікага Княства паводле польскіх узораў ды на вызваленне ад палітычна–прававога панавання магнатаў, цяпер адпавядала вострай палітычнай патрэбе краіны. Паслы ВКЛ раз за разам прасілі дапамогі ў Кароны, аднак польская шляхта паставіла ўхваленне падаткаў на вайну ў залежнасць ад вырашэння пытання уніі.



Чакаючы падтрымкі з боку рыцарства і сродкаў на абарону Інфлянтаў, Жыгімонт Аўгуст, колькі ні імкнуўся захаваць адасобленасць Вялікага Княства як свайго дзедзічнага ўладання ды захоўваць саюз з магнатамі, у 1562 г. пайшоў насустрач патрабаванням шляхты і ўзяўся рыхтаваць унію. За 1563—1568 г. ён правёў 6 соймаў, кожны з якіх займаўся дзяржаўна–прававымі пытаннямі, звязанымі з рэалізацыяй планаў уніі. На першым жа віленскім сойме 1563 г. былі абраны паслы ад павятовай шляхты, якія павезлі падрыхтаваны праект уніі на вальны сойм у Варшаву. Сярод іх знаходзіліся, у прыватнасці, прадстаўнікі Полаччыны, Віцебшчыны, Смаленшчыны, Мсціслаўшчыны ды іншых беларускіх земляў, што сведчыць пра падтрымку планаў уніі і шляхтай усходніх зямель Беларусі. Супраць аб’яднання Княства з Каронай цвёрда выступалі толькі яснавяльможныя паны, якія трымаліся за самастойнасць сваёй дзяржавы. Напрыклад, віленскі ваявода Мікалай Радзівіл Чорны рэзка крытычна выказваўся пра унію, называючы яе няволяю для Вялікага Княства. Аднак абставіны прымушалі і паноў радных, саступаючы патрабаванням шляхты, ісці на кампрамісы. Падкрэсліўшы выключнае значэнне знешнепалітычнага фактару, беларускі гісторык Мітрафан Доўнар–Запольскі дапускаў, што калі б вайна пайшла паіншаму, то «ўсе запэўніванні літоўскай рады ў братніх пачуццях былі б прыхаваныя да наступных крытычных абставін» і да уніі наўрад ці дайшло б.



*Даспех Жыгімонта Аўгуста. Майстар Кунц Лёхнер, 1555 г.*

Менавіта ў гады Інфлянцкай вайны вялася падрыхтоўка да аб’яднання з Каронай, што прадугледжвала радыкальнае рэфармаванне ўнутранага ладу Вялікага Княства, накіраванае на яго дэмакратызацыю. Галоўным крокам пераменаў стала правядзенне судовай і тэрытарыяльна–адміністрацыйнай рэформы, якая канчаткова зліквідавала адасобленасць земляў і даўніх удзелаў.

Паводле дэкларацыі Варшаўскага сойма 1563—64 г. Жыгімонт Аўгуст адмаўляўся ад свайго спадчыннага права на ВКЛ і перадаваў яго Кароне. Пад націскам шляхты магнаты ў 1564 г. адракліся ад свайго асобнага статуса ў судовых справах і фармальна, згодна з літарай права, прыраўняліся да ўсяго рыцарства. Паводле польскага ўзору ў Княстве ўводзілася новая сістэма судаводства. У 1565 г. Віленскім прывілеем Жыгімонта Аўгуста ўся дзяржава была падзелена на 30 раёнаў — судовых паветаў, у кожным з якіх ўтваралася земскае, гродскае і падкаморскае судаводства. Шляхта кожнага павета была падсудная земскаму суду, які складаўся з суддзі, падсудка і пісара. Усе яны абіраліся на павятовых сойміках. Выбарнасць суддзяў, якая дазваляла судовай сістэме быць незалежнай ад дзяржаўнай улады, стала вялікім дасягненнем «палітычнага народа», дасюль актуальным для многіх дэмакратый. Крымінальныя справы (такія, як наезд на шляхецкі двор, разбой, падпал і г.д.) разбіраў суд замкавы (гродскі), які ўвасаблялі ваявода і судовы староста, а «справы гранічныя і земляныя» — суд падкаморскі, што складаўся з падкаморага і каморніка. Сяляне і мяшчане не падлягалі гэтым судам. Кожны павет меў соймік, які збіраўся ў адміністрацыйным цэнтры судовай акругі і выбіраў 2 па-



*Нясвіжскі замак. Фрагмент гравюры Т.Макоўскага (1604).*



слоў на вальны сойм дзяржавы. У адрозненне ад Кароны, дзе соймік мог аб'ядноўваць шляхту як невялікага раёна, так і цэлага ваяводства, тэрыторыя Вялікага Княства была падзелена на судовыя паветы больш–менш раўнамерна. Але на сойміках тут па-ранейшаму панавалі магнаты, а павятовая шляхта не мела палітычнай самастойнасці. Галоўнай прычынай гэтага можна лічыць непарушнасць латыфундый — матэрыяльнай асновы ўплывовасці вялікіх панскіх родаў. Больш за тое, пасля адмовы Жыгімонта Аўгуста ад спадчыннага права на Вялікае Княства Літоўскае тут паскорыўся працэс фармавання алігархічнага ладу.

У 1566 г. у дадатак да ўжо існаваўшых ваяводстваў было ўтворана 5 новых, у тым ліку 3 на Беларусі — Мсціслаўскае, Менскае і Берасцейскае. Паводле новага адміністрацыйнага падзелу ўся тэрыторыя дзяржавы складалася з 13 ваяводстваў, кожнае з якіх мела ад 1 да 5 паветаў. Беларускія землі ўваходзілі (цалкам ці часткова) у дзевяць ваяводстваў Княства: Берасцейскае (паветы Берасцейскі і Пінскі), Віленскае (паветы Ашмянскі і Браслаўскі), Віцебскае (паветы Аршанскі і Віцебскі), Менскае (паветы Менскі, Рэчыцкі і Мазырскі, які да 1569 г. уваходзіў у Кіеўскае ваяводства), Мсціслаўскае, Наваградскае (паветы Наваградскі, Ваўкавыскі і Слонімскі), Троцкае (паветы Гарадзенскі і Лідскі), а таксама Полацкае і Смаленскае, тэрыторыя якіх у тыя гады знаходзілася пад уладаю маскоўскага цара. Такі адміністрацыйны падзел заставаўся амаль нязменны да канца XVIII ст.



*Гусарскі даспех з нясвіжскай збраёўні. Другая палова XVI ст.*

На чале кожнага ваяводства стаяў ваявода, прызначаны вялікім князем. Толькі ў Віцебскім ды Полацкім ваяводствах, як і ў Жамойці, яго

па-ранейшаму выбіралі на абласным сойміку. Прэрагатывы ваяводаў былі істотна абмежаваныя. У выніку рэформаў у кампетэнцыі іхняй судовай улады засталіся толькі крымінальныя справы ды разбор скаргаў маёмаснага характару. Адміністрацыйныя функцыі ваяводы пашыраліся адно на цэнтральны павет, бо іншымі кіравалі старасты. Адзінства ваяводстваў было захавана толькі ў ваенных адносінах: на чале ўсяго ваяводскага рушання стаяў ваявода, да якога прыводзілі войска з цэнтральнага павета кашталян, а з астатніх — маршалкі. Ваяводы пяці новаўтвораных ваяводстваў наогул не атрымалі адміністрацыйнай і судовай улады. Як і ў Польшчы, яны толькі ўзначальвалі мясцовыя ўзброеныя сілы ды маглі ўваходзіць у склад гаспадарскай рады, а ўсім астатнім займаліся старасты. Што да паветаў, дык імі кіравалі судовыя старасты, у прэрагатывы якіх уваходзілі функцыі і адміністрацыйныя, і судовыя, і чыста гаспадарчыя.



*Праца на агародзе. Дрэварыт сярэдзіны XVI ст.*

На практыцы новы адміністрацыйны падзел не адразу паўсюдна сцвердзіўся. На тэрыторыі Беларусі апрача паветаў шмат дзе яшчэ доўга існавалі каралеўскія эканоміі, дзяржавы, староствы і намесніцтвы. Рагачоўская і Рэчыцкая воласці і ў дакументах пачатку XVII ст. усё яшчэ фігуравалі як асобныя адміністрацыйна–тэрытарыяльныя адзінкі. Там, сярод сялян усходнебеларускіх воласцяў, яшчэ доўга зберагалася патры-



ярхальная традыцыя самакіравання, пры якой найвышэйшым валасным органам улады была капа.

Судова–адміністрацыйныя рэформы 1565—66 г. сталі вырашальнымі ў супрацьборстве шляхты і паноў. Ураўняўшыся ў правах з рыцарствам, арыстакратыя страціла ранейшыя магчымасці кантраляваць палітычнае жыццё дзяржавы. Яе вялікая грамадска–палітычная вага захоўвалася цяпер галоўным чынам дзякуючы буйной зямельнай уласнасці.

На Віленскім сойме 1565—66 г. праца над «папраўай Статута» была цалкам завершана. Прывілеем ад 1 сакавіка 1566 г. Жыгімонт Аўгуст увёў яго ў дзеянне. Новы Статут замацаваў поспехі шляхецкага руху



*Сельскагаспадарчыя працы. Дрэварыт сярэдзіны XVI ст.*

супраць неабмежаванага панавання алігархаў. Менавіта ў гэтым кодэксе сцвердзілася як ідэя шляхецкага «народа» — рыцарства, высакародных землеўладальнікаў, якія служаць дзяржаве, а сродкі на жыццё маюць ад земляробства, так і прынцыпы станавай дзяржаўнасці. Статут унёс карэнныя змены ў аснову дзяржаўна–палітычнага жыцця. Вальны сойм цяпер стаў двухпалатны: да гаспадарскай рады (сената) дадалася палата паслоў, і прадстаўнікі павятовай шляхты займелі настолькі



*Жыгімонт II Аўгуст.*
*Тагачасная гравюра.*

ж важны для прыняцця законаў голас, як і паны.

Падрыхтоўка рэальнай уніі з Польшчай паставіла на парадак дня і пытанне поўнага раўнапраўя рэлігій, што з'яўлялася адным з пастулатаў экзекуцыйнага руху. На практыцы ў XVI ст. заставаўся абмежаваным толькі ўваход праваслаўных у склад пярэдняй, ці тайнай рады, да якой належалі пяць першых дастойнікаў дзяржавы. На галоўныя пасады цэнтральных ваяводстваў і кашталяній (віленскага і троцкага) каталікам яшчэ ўдавалася захоўваць манаполію, хоць, як ужо адзначалася, ваяводамі і кашталянамі і тут часам станавіліся праваслаўныя (згадаем прыклад князя Канстанціна Іванавіча Астрожскага). Каб зліквідаваць усялякія прававыя адрозненні і падставы ўнутранага антаганізму ў грамадстве, што было неабходна для ўтварэння аднаго «палітычнага народа», «адзінай Рэчы паспалітай», Жыгімонт Аўгуст пайшоў на заканадаўчае скасаванне дыскрымінацыйных артыкулаў Гарадзельскага прывілею 1413 г. З боку літоўскіх магнатаў ужо наўрад ці хто мог выступаць супраць гэтага, паколькі найбольш уплывовыя роды пакінулі каталіцтва і сталі пратэстантамі.

Дэкларацыя аб скасаванні старых абмежаванняў па канфесійнай прыкмеце была прынята на Віленскім сойме 1563 г., калі праваслаўная шляхта запатрабавала «слушнага параўнання правоў». Ва ўхвале гаварылася, што цяпер на ўсе дзяржаўныя пасады «не толькі падданыя рымскага касцёла маюць выбірацца, але... усе людзі стану рыцарскага з народа шляхецкага веры хрысціянскай» (г.зн. і праваслаўныя, і пратэстанты). Пазней, на Гарадзенскім сойме 1568 г., калі праваслаўная шляхта зноў папрасіла Жыгімонта Аўгуста пацвердзіць гарантыі сваіх правоў і грамадскага становішча, вялікі князь выдаў новы прывілей аб поўнай роўнасці ўсіх веравызнанняў.



Так напярэдадні уніі была знята апошняя перашкода на шляху інтэграцыі «Літвы» і «Русі». Ураўнанне правоў стала найважнейшым этапам фармавання адзінага палітычнага народа — ліцвіноў (незалежна ад этнічнага паходжання). Хоць гістарычныя вобласці «Літва» і «Русь» яшчэ адрозніваліся, ва ўяўленнях шляхты існавала адзінае «панства Літоўскае» — дзяржава беларускага, літоўскага і ўкраінскага рыцарства, адзінага шляхецкага «палітычнага народа». Кансалідаваная шляхта цэлай дзяржавы мела цяпер супольныя інтарэсы і ў грамадска–палітычным плане выступала як адно цэлае.

## VII.3. Люблінская унія

Дзякуючы рэформам сярэдзіны 1560-х г. і ўвядзенню ў дзеянне II Статута, якім упершыню былі зацверджаны заканадаўчыя



*Жыгімонт Аўгуст на сойме.*
*Дрэварыт з кнігі А.Гвагніна*
*"Апісанне Еўрапейскай Сарматыі" (1578).*

функцыі сойма, палітычна–прававая і адміністрацыйная сістэма Вялікага Княства Літоўскага наблізілася да польскай. Як і польскі кароль, вялікі князь тут выбіраўся «вольным абраннем» усіх станаў. Як і каронны сенат, гаспадарская рада складвалася з біскупаў, ваяводаў, кашталянаў і міністраў, а ніжэйшую палату прадстаўлялі паслы ад павятовай шляхты. Сойм меў функцыі заканадаўчай улады, што было замацавана спецыяльным запісам у Статуце. Уся сістэма цэнтральнага і мясцовага кіравання, ваенная арганізацыя, муніцыпальныя ўстановы былі набліжаны да польскіх узораў. Грамадская структура і прававое становішча станаў таксама мала адрозніваліся, хоць традыцыйная перавага паноў рады ў Княстве захавалася і пасля рэформаў. Усё гэта паставіла справу дзяржаўнай уніі на рэальны грунт.



*Пасяджэнне сената*
*пад час Люблінскага сойма 1569 г.*

У спрэчках аб прынцыпах аб’яднання, што цягнуліся з Варшаўскага сойма 1563 г., польскі бок па-ранейшаму дамагаўся поўнай інкарпарацыі, спасылаючыся на старыя «спісы» уніі, а ўпаўнаважаныя пасольствы Вялікага Княства не прызнавалі іх ды ўпарта стаялі на раўнапраўным саюзе дзвюх самастойных дзяржаў. Паны–рада зацягвалі час, давалі сваім паслам інструкцыі з заведама непрымальнымі для палякаў умовамі, пакідалі агульныя соймы ў Кароне. Тым часам цяжкасці спусташальнай вайны ўсё вастрэй патрабавалі аб’яднання з Каронай. Да найхутчэйшага заключэння уніі падштурхоўвала шляхта, якая ў першую чаргу і цярпела ад вайны. У 1566 г. на Берасцейскім сойме пра яе нагадвалі каралю паслы зваяванага Віцебскага ваяводства. Зімой наступнага года ў абозе пад Лебедзевым і потым на Гарадзенскім сойме шляхта зноў прасіла Жыгімонта Аўгуста неадкладна склікаць агульны сойм для



падпісання акта уніі, што той і паабяцаў зрабіць. Рыцарства ж Берасцейскага павета, накіроўваючы паслоў у Люблін, так і наказвала ім — «не вяртацца дамоў без хоць якой уніі». Пад цяжарам вайны на саступкі вымушаны былі ісці і першыя роды Княства — толькі б адбіцца ад маскоўскага цара!

«Спольны» сойм сенатараў і паслоў ад Кароны і Княства, скліканы на снежань 1568 г. у Люблін, пачаў працу толькі 10 студзеня 1569 г. Ён адразу выявіў ранейшыя прынцыповыя разыходжанні ў разуменні прынцыпаў аб’яднання. Літоўскі бок праводзіў нарады асобна. Партыя Радзівілаў супрацьпаставіла польскаму унітарнаму праекту свой контрпраект з прадугледжанымі для Вялікага Княства асобнымі дзяржаўнымі органамі і сваім соймам. Каронны сенат і пасольская палата запратэставалі, патрабуючы, каб кароль загадаў панам–радзе і паслам ад Княства далучыцца да польскага сойма і прыняць унію. Даведаўшыся пра гэта, апошнія 1 сакавіка пакінулі Люблін.



*Мікалай Радзівіл Руды (1512—1584) і Ян Хадкевіч (1537—1584)*
*на Люблінскім сойме.*
*З накідаў Яна Матэйкі да карціны “Люблінская унія”.*

Ад’езд рады і паслоў ВКЛ абярнуўся іх паражэннем. Польскі сойм, выкарыстоўваючы зручную сітуацыю, прапанаваў далучыць да Кароны шэраг ваяводстваў Княства, і Жыгімонт Аўгуст пагадзіўся. У адсутнасці прадстаўнікоў ВКЛ 5 сакавіка Люблінскі сойм прыняў акт аб інкарпарацыі Падляшша, 27 траўня — Валыні, а потым гэтаксама былі далучаны Кіеўскае і Брацлаўскае ваяводствы.

Шляхта,ураднікі і гарады мусілі прысягаць каралю і Кароне Польскай. Калі шляхта і мяшчане ўспрынялі інкарпарацыю хутчэй станоўча, дык магнаты працівіліся, аднак пад пагрозаю страты пасадаў і ўладанняў папрысягалі і яны. Толькі шляхецкі соймік Мазырскага павета, які ўваходзіў у Кіеўскае ваяводства, не прыняў уключэння ў Карону ды, як усе землі Беларусі, застаўся ў складзе Вялікага Княства.

Такі паварот спраў выклікаў буру пратэстаў у Вільні. Паны–рада рыхтаваліся нават да вайны з Каронай, аднак пад націскам беларускай і літоўскай шляхты, якая правяла з'езд у Вільні, перамовы працягваліся. Знясіленае вайной Вялікае Княства, страціўшы амаль палову тэрыторыі — у асноўным багатыя і густа населеныя землі, цяпер тым больш не магло сваімі сіламі абараніцца ад Маскоўскага царства. Таму 6 чэрвеня паны–рада і шляхецкія паслы ВКЛ зноў прыехалі ў Люблін. Прасілі вярнуць інкарпараваныя ваяводствы, імкнуліся адстаяць гарантыі самастойнасці сваёй дзяржавы, у тым ліку сімвалічны асобны каранацыйны цырыманіял у Вільні. Просячы не губіць Вялікага Княства, Ян Хадкевіч гучна плакаў. Аднак ні каронны сойм, ні Жыгімонт Аўгуст не саступалі. Пагадненне ўсё ж было дасягнута на аснове кампрамісу. Сваёй прысягаю і подпісамі 1 ліпеня 1569 г. акт уніі прынялі ўсе сенатары і паслы.


SEYM VALNY
CORONY POLSKI
ZLOZONY W LU-
BLINIE Y Z VIELKIE
xiestwem litewskie przez
naiasnieisiego pana Sigmu-
nta Augusta z bozei laski
krolia polskiego wielkiego
xiestwa litewskiego Ruskie-
go pruskiego mazowieczskie-
go iflanczkiego zmocz-
kiego podlaskiego Volin-
skiego y kiowskiego. W c-
zwartek pierwszy po s.
Thomassu anno dni 1568
ktori sejm wsitkiem panstwo

*Дыярыуш*
*Люблінскага сойма 1569 г.*
*Першая старонка.*

Акт Люблінскай уніі абвяшчаў, што Карона Польская і Вялікае Княства Літоўскае зліваюцца ў адно «непадзельнае цела» і ўяўляюць цяпер «адну агульную Рэч Паспалітую, якая з дзвюх дзяржаў і народаў у адзін люд і дзяржаву» ператварылася. Узначальвалася яна адным манархам, які адначасова з'яўляўся і каралём польскім, і вялікім князем літоўскім. Соймы мусілі быць агульныя («спольныя», «абодвух народаў»), а месцам іх правядзення прызначалася Варшава (каранацыйныя ж — надалей у Кракаве), знешняя палітыка таксама супольная. Шляхта атрымлівала аднолькавыя правы на тэрыторыі ўсёй аб'яднанай дзяржавы, дзеля чаго касаваліся ранейшыя пастановы, якія забаранялі палякам набываць зямлю ў Беларусі і ў Літве.



Люблінскі сойм прыняў «Парадак Рады Кароннай і Літоўскай», які вызначаў склад сената і паслядоўнасць іх месцаў. У супольны сенат Рэчы Паспалітай, што складаўся з 90—95 асобаў, ад Беларусі і Літвы ўвайшлі два біскупы, дзевяць ваяводаў (віленскі, троцкі, смаленскі, полацкі, навагрудскі, віцебскі, берасцейскі, мсціслаўскі і менскі) і жамойцкі стараста, дзесяць кашталянаў, міністры. У пасольскую палату ад ВКЛ было ўключана 44 паслы: па 2 ад кожнага шляхецкага сойміка і 2 ад Вільні.

Апрача унітарных прынцыпаў акт уніі ўтрымліваў і нормы федэратыўнага аб'яднання. Калі заканадаўчая ўлада новастворанай дзяржавы была супольнай, то выканаўчая, за выняткам асобы манарха, — асобнай. Люблінскі акт пакідаў Вялікаму Княству права захаваць у рамках Рэчы Паспалітай сваю назву і тытул манарха, уласную сістэму дзяржаўных пасадаў, асобныя войска і скарб, біццё сваёй манеты. Агульны сойм прымаў асобныя законы для Кароны, і асобныя — для Вялікага Княства. Заставаўся нават свой звод законаў — Статут 1566 г., які, праўда, неабходна было перапрацаваць, каб наблізіць да польскага заканадаўства, а таксама свая дзяржаўная мова — старабеларуская.

Такім чынам, акт Люблінскай уніі стаў кампрамісным варыянтам пагаднення двух процілеглых лагераў. Яго прэамбула адлюстроўвала праграму польскіх магнатаў і экзекуцыйнага руху шляхты, а далейшы тэкст улічыў імкненні беларуска–літоўскай эліты. Кампрамісным атрымаўся і рэальны саюз дзвюх дзяржаў, які дазволіў і аб'яднанне правесці, і адасобленасць Вялікага Княства захаваць. Дынастычная унія паміж Вялікім Княствам і Каронай (1447—1492 і 1501—1569 г.) цяпер была ператворана ў рэальнае аб'яднанне федэратыўнага характару на аснове прынцыпу роўнасці. Супярэчлівасці, што трапілі ў тэкст пагаднення, мусілі здымацца самім ходам гісторыі, далейшым развіццём саюзу ці ў кірунку унітарнасці, ці, наадварот, федэратыўнасці. Дзякуючы такому характару аб'яднання на практыцы лёгка выяўлялася разбежнасць інтарэсаў дзвюх частак

Рэчы Паспалітай, асабліва ў сферы знешняй палітыкі. З гэтага часу, як трапна адзначыў вядомы польскі гісторык Уладыслаў Канапчынскі, «кожнае пакаленне, кожны кароль, кожны важны сойм нанова пераглядаў праблему стварэння супольнай праграмы навонкі, што знаходзіла адбітак у бюджэце, вайсковасці і войнах, у актах заканадаўчых і ўрадавых, у дыпламатыі і нават у элекцыях».

У адрозненне ад ранейшых уній Кароны і Вялікага Княства, якія мелі персанальную аснову, новаўтвораная Рэч Паспалітая з'ўлялася рэальным дзяржаўным аб'яднаннем, якое трымалася не толькі на агульным манарху, але і на супольным сойме. Апошняе мела найважнейшае значэнне для палітычнай эмансіпацыі беларуска–літоўскай шляхты, для росту яе культурнага ўзроўню, для развіцця гарадоў, гандлю, агульнай еўрапеізацыі краіны. У многім Люблінскі акт прадвызначаў далейшы гістарычны лёс не толькі новага дзяржаўнага ўтварэння, але і чатырох этнічных народаў, якія насялялі Рэч Паспалітую.

«Нельга не аддаваць належнага палітыкам XIV ст., якія задумалі грандыёзны палітычны план, і іх пераемнікам, што з такой настойлівасцю яго праводзілі», — напісаў Мітрафан Доўнар–Запольскі, крытыкуючы расійскіх гісторыкаў за прадузяты падыход да уніі 1569 г. Сапраўды, унія, заключаная добраахвотна, стала вялікім гістарычным актам. Супольная дзяржава, створаная прадстаўнікамі беларускага, літоўскага, польскага і ўкраінскага народаў у Любліне, найперш намаганнямі шляхты ў яе барацьбе за дэмакратыю, праіснавала чатыры стагоддзі і не мела сабе роўных у еўрапейскай гісторыі!

# VIII. У дзяржаве «абодвух народаў»

## VIII.1. Плюсы і мінусы аб'яднання з Каронай

Агульнымі намаганнямі «абодвух народаў» Вялікае Княства змагло ўнікнуць ваеннай катастрофы. Праўда, рэальную дапамогу ў вайне яно атрымала не адразу. Калі ў Кароне экзекуцыйны рух дамогся таго, што на абарону ішла чвэрць даходаў («кварта») з каралеўскіх маёнткаў, адабраных ад магнатаў, і з дзяржанняў высокіх ураднікаў, дык у Княстве гэтага не ўдалося зрабіць. Сенатары і паслы з Літвы і Беларусі, спасылаючыся на дэклараваную «роўнасць», прасілі ўвядзення «аднолькавай абароны». На ваенныя патрэбы стаў паступаць прыбытак ад гаспадарскіх гарадоў, але ў цэлым даходы ў скарб тут былі намнога меншыя.

Новы кароль і вялікі князь Стэфан Баторы (1576—1586), які мабілізаваў сілы абедзвюх дзяржаў, рашуча ўзяўся за працяг вайны ды трыма кампаніямі давёў яе да пераможнага канца. 30 жніўня 1579 г. яго армія ўвайшла ў Полацк, а праз год вызваленне акупаваных земляў Беларусі завяршылася і ваенныя дзеянні перанесліся на тэрыторыю Расіі. Беларускія землі былі вызвалены. Ям–За-

польскі мір 1582 г. зафіксаваў цяжкае паражэнне Маскоўскага царства ды замацаваў у складзе беларуска–літоўскай дзяржавы не толькі вернуты Полацк, але і іншыя этнічна беларускія землі, прыкладам, Невель і Вяліж, страчаны яшчэ ў часе вайны 1500—03 г.



*Войска ВКЛ пад Полацкам у час аблогі горада ў 1579 г.*
*З тагачаснай нямецкай газеты.*

Прадухіліўшы разгром Вялікага Княства, унія, аднак, не зліквідавала самой непазбежнасці наступных войнаў з Маскоўскай дзяржавай. У XVII ст. царства Раманавых ператворыцца ў адну самых магутных дзяржаў Еўропы, тэрыторыя і ваенная сіла якой будуць пастаянна ўзрастаць, і развязка стане пытаннем часу.

Аб’яднанне дзвюх дзяржаў і «абодвух» (палітычных, бо этнічных было прынамсі чатыры) народаў у «спольную» федэрацыю Рэч Паспалітую не правяло да уніфікацыі іх палітычных сістэм. Вельмі хутка заявіла пра сябе несупадзенне інтарэсаў і прыярытэтаў. Выкарыстоўваючы кожную магчымасць, асабліва час бескаралеўя, паны–рада Вялікага Княства імкнуліся ўмацаваць асновы палітычнай суб’ектнасці сваёй дзяржавы ў рамках прынятай уніі.

Ужо праз тры гады пасля Люблінскага сойма, пасля смерці апошняга з Ягайлавічаў, калі дынастычныя сувязі Кароны і Княства перарваліся, паны–рада выступілі з асобнай пазіцыяй па кандыдатуры новага манарха. У 1573 г. сенатары ад ВКЛ запатрабавалі вяртання ўкраінскіх зямель і на з’ездзе ў Вільні, насуперак акту уніі, самастойна прынялі рашэнне, каб даходы з Падляшша і Валыні паранейшаму ішлі ў скарб іх дзяржавы. У парушэнне таго ж Люблінскага акта віленскія палітыкі ўвялі асобную прысягу для манарха і асобнае пацвярджэнне ім правоў Вялікага Княства Літоўскага. Пасля прызнання гэтых новаўвядзенняў першым абраным каралём і вялікім князем Генрыхам Валуа (1573—1574) яны сталі нормай.





*Стэфан Баторы, кароль польскі і вялікі князь літоўскі (1576—1586). Дрэварыт з «Хронікі Еўрапейскай Сарматыі» А.Гвагніна (1611).*

Перад вальным соймам Рэчы Паспалітай сенатары і шляхецкія паслы з усёй дзяржавы збіраліся на свой «генеральны соймік», на якім на аснове інструкцыяў павятовых соймікаў выпрацоўвалася агульная праграма і пазіцыя ВКЛ. Адбываліся яны ў Ваўкавыску, а потым у Слоніме за два тыдні да варшаўскага сойма. Апрача генеральнага сойміка ў 1570-х г. у ВКЛ з’явіўся яшчэ адзін агульнадзяржаўны інстытут парламентарызму — генеральны, або галоўны з’езд, празваны віленскай канвакацыяй (бо першая адбылася ў Вільні). Фактычна гэта была новая іпастась вальнага сойма ВКЛ з далюблінскага часу. Канвакацыю звычайна склікаў манарх, але рабілася гэта па патрабаваннях сенатараў, а разглядаліся на ёй пільныя дзяржаўныя справы, датычныя абароны, фінансаў ды падаткаабкладання. Як надзвычайны заканадаўчы орган віленская канвакацыя праіснавала да канца XVII ст. Праўда, цалкам функцый вялікага вальнага яна не пераняла, бо прыняцце законаў і абкладанне падаткамі заставалася прэрагатывай «спольнага» сойма Рэчы Паспалітай. Месцам правядзення апошняга заставалася Вар-

шава (сойм 1653 г. у Берасці стаў выключэннем), пакуль палітычны народ Вялікага Княства не дамогся таго, каб з 1673 г. кожны трэці з супольных соймаў (апрача элекцыйнага, канвакацыйнага і каранацыйнага) праходзіў на яго тэрыторыі, у Горадні.

Не атрымала Рэч Паспалітая і адзінай судовай сістэмы. Калі ў Кароне Польскай «Трыбунал каронны» быў утвораны ў 1578 г. і кароль страціў прэрагатывы найвышэйшай судовай інстанцыі для шляхты, дык ужо ў 1581 г. такая ж установа ўтварылася ў ВКЛ — «Галоўны трыбунальскі суд», або Галоўны літоўскі трыбунал. Яго склад выбіраўся на сойміках (па два дэпутаты ад павета), а паседжанні праводзіліся ў Вільні, Менску і Навагрудку (па чарзе праз год). Са стварэннем гэтага органа фармаванне сістэмы найвышэйшай улады ў дзяржаве завяршылася.

Асабліва важнай перашкодай на шляху уніфікацыі палітычных сістэм Кароны і Княства стаў новы Статут. Пастанова аб яго падрыхтоўцы прымалася ў Любліне і, што парадаксальна, мела на мэце акурат уніфікацыю заканадаўства. У камісію па падрыхтоўцы новага кодэкса ўваходзілі канцлер Астафі Валовіч і пісар Леў Сапега ад гаспадарскай канцылярыі, віленскі біскуп Валяр'ян Пратасевіч, сакратар караля Аўгустын Ратундус, жамойцкі кашталян Мельхіёр Шэмет ды па адным шляхцічы ад кожнага ваяводства (ад Полацкага быў князь Павел Сакалінскі, ад Віцебскага — Ян Сколка, ад Менскага — МарцінВаладковіч, ад Навагрудскага — Бенядыкт Юрага, ад Берасцейскага — Кірдзей Крычаўскі і г.д.). Распрацаваны праект абмяркоўваўся на павятовых сойміках, пад час сустрэч з панамі–радаю, на генеральных з'ездах, збіраных вялікім князем у 1582 і 1584 г. Можна сказаць, што да яго пад-



*Тытульны аркуш зводу законаў Галоўнага трыбунала (1586).*



рыхтоўкі меў дачыненне ўвесь палітычны народ беларуска–літоўскай дзяржавы.

У Вільні новы кодэкс законаў разглядаўся як прававая гарантыя адасобленасці Вялікага Княства ад Кароны, аснова яго самастойнасці і паўнавартасці як дзяржавы. Не касуючы самога Люблінскага акта, новы Статут фактычна пазбаўляў яго юрыдычнай сілы, паколькі не змяшчаў ніводнай пастановы аб уніі (яна згадвалася толькі ў самым агульным плане).

Ва ўступе да новага Статута падканцлер Леў Сапега змясціў пранікнёныя словы пра свабоду як найважнейшую каштоўнасць грамадства: «Обачывали то усих веков люди мудрые, же в каждой речы посполитой человеку почтивому ничого не маеть быти дорожшого над вольность. А неволею так се маеть гидити, же не только скарбами, але и смертью ее од себе отганяти есть повинен». Згадваючы словы Цыцэрона, ён выразна сфармуляваў галоўную ідэю прававой дзяржавы — падпарадкаванне ўсіх адзінаму праву: «естесмо невольниками прав для того, обысмы вольности уживати могли», і назваў новы кодэкс права «скарбом,... который жадною сумою преплачен быти не можеть». Як лічыў Леў Сапега, сапраўднага гонару заслугоўвала і тое, што Статут быў напісаны на сваёй, старабеларускай мове: «А если которому народу встыд прав своих не умети, поготовю нам, которые не обчым яким языком, але своим власным права списаные маем...».


*Леў Сапега (1557—1633), віленскі ваявода і вялікі гетман.*

Не паўтараючы ніводнага пункта Люблінскага акта аб дзяржаўным адзінстве, Статут наадварот адназначна сцвярджаў, што найважнейшыя знешнепалітычныя пытанні (вайна і мір, скліканне паспалітага рушання і г.д.) меў вырашаць толькі вальны сойм Вялікага Княства Літоўскага. Новы звод адмяніў дэклараванае ў Любліне раўнапраўе каронная шляхты з падданымі Княства на тэрыторыі Літвы і Беларусі. Палякі ў ім трактаваліся як чужаземцы (як і ў Статутах 1529 і 1566 г.). Цяпер яны больш не маглі набываць у Вялікім Княстве зямлю і дзяржаўныя пасады (такое права набываць зямельную ўласнасць у Беларусі і Літве каронная шляхта атрымала ў 1564 г. на Варшаўскім сойме), а на нованабытых тэрыторыях можна было асядаць толькі пры ўмове служэння Вялікаму Княству. Нават дзеля таго, каб правесці польскае войска цераз тэрыторыю беларуска–літоўскай дзяржавы, патрабаваўся дазвол паноў–рады і вялікага князя. Фактычна, новы звод законаў не прызнаваў і ранейшых тэрытарыяльных стратаў на карысць польскай ці якой іншай дзяржавы, бо ў адпаведным артыкуле гаспадар абавязваўся «вяртаць» усе страчаныя землі.



*Тытульны аркуш Статута 1588 г. Выданне друкарні Мамонічаў.*

Шэраг артыкулаў новага Статута, у прыватнасці — смяротнае пакаранне за забойства простага чалавека, прынцып індывідуальнай адказнасці і прэзумпцыі бязвіннасці, абмежаванне нявольніцтва (у якасці нявольнікаў разглядаліся толькі ваеннапалонныя), дэкларацыя рэлігійнай талерантнасці (у кодэкс цалкам увайшоў перакладзены тэкст Варшаўскай канфедэрацыі 1573 г.), першая рэгламентацыя прыродакарыстання і інш., — усё гэта ставіла яго на адно з першых месц у практыцы еўрапейскай законатворчасці і прававой культуры. Даследчыкі назавуць яго вычарпальным і найдасканалейшым для свайго часу.



З прычыны антылюблінскага характару новага зводу польскі бок не збіраўся прымаць яго на супольным сойме. Новы Статут стаў законам толькі дзякуючы збегу абставін. Пасля элекцыі 1587 г., у якой дэлегацыя беларуска–літоўскай дзяржавы не брала ўдзелу, Вялікае Княства выставіла зацвярджэнне Статута як умову прызнання абранага Жыгімонта III Вазы (1587—1634) сваім манархам. У выніку 28 студзеня 1588 г. на каранацыйным сойме Жыгімонт Ваза выдаў прывілей, якім зацвердзіў трэці Статут Вялікага Княства Літоўскага і дазволіў яго друкаваць. На ўкраінскіх землях Кіеўскага, Брацлаўскага і Валынскага ваяводстваў, далучаных у 1569 г. да Кароны, захаваў сілу Статут 1566 г., які зваўся там Валынскім.



*Ніжні замак у Вільні, перабудаваны ў сярэдзіне XVI ст. Малюнак Ф.Смуглевіча (1800).*

Так у Вялікім Княстве набыў сілу галоўнага закону звод новых прававых нормаў, які, па сутнасці, адмаўляў прынцыпы дзяржаўнай уніі з Каронай. Ён быў абавязковы як для ўсяго насельніцтва Княства, так і для чужаземцаў, калі тыя траплялі на тэрыторыю

Беларусі і Літвы. Паколькі Статут 1588 г. уваходзіў у вострую супярэчнасць з праграмай грамадска–палітычнай уніфікацыі Рэчы Паспалітай, каронная шляхта да канца XVI ст. неаднаразова патра-



*Вільня. Гравюра сярэдзіны XVI ст.*

бавала на сваіх сойміках, каб «Статут літоўскі, каторы на сойме не быў узгоднены, скасаваць». «Паправіць» гэты звод імкнуліся і ў XVII ст., але безвынікова.

На беларускіх землях Статут 1588 г. заставаўся асноўным законам да канца існавання Вялікага Княства Літоўскага. У Кароне ў другой палове XVII і ў XVIII ст. яго прымянялі ў судах, у Маскоўскім царстве з яго запазычылі шмат нормаў пры падрыхтоўцы свайго зводу («Соборное уложение» 1649 г.), ён жа стаў асновай праекту кадыфікацыі права на Левабярэжнай Украіне ў першай палове XVIII ст. Сучаснікі лічылі гэты звод дасканалым. Напрыклад, Тэадор Астроўскі ў 1784 г. напісаў, што кароннае заканадаўства «не дараўноўваецца па дасканаласці да літоўскага». У Беларусі III Статут адмяніла толькі імператрыца Кацярына II пасля інкарпарацыі тэрыторыі ВКЛ у склад Расійскай імперыі, але Павел I вярнуў Трэцяму Статуту сілу закону, і ў 1811 г. ён быў надрукаваны яшчэ па–расійску. Канчаткова звод 1588 г. скасаваў толькі Мікалай I (у 1831 г. — ва ўсходніх губернях Беларусі, а ў 1840 г. — у Менскай, Гарадзенскай і Віленскай).



Палітычны лад Вялікага Княства Літоўскага, замацаваны Трэцім Статутам, не адпавядаў таму яго становішчу ў Рэчы Паспалітай, якое вызначыў Люблінскі акт. Фармальна дзве дзяржавы аб’ядноўвалі толькі супольныя манарх і сойм. Асобнымі ж для Вялікага Княства былі скарб і манета, канцылярыя і пячаткі, трыбунал і ўрады, свае войска і законы, а нават такія сімвалічныя рэчы, як элекцыя, прысяга і зацвярджэнне правоў, урэшце — свая дзяржаўная мова. Не існавала фактычна ніводнага агульнага для дзвюх дзяржаў міністра ці кіраўніцтва. Такая палітычная сістэма праіснавала практычна нязменнай да канца XVIII ст.

## VIII.2. Дэмаграфічнае і гаспадарчае развіццё

Нягледзячы на частыя войны, якія спусташалі цэлыя паветы Беларусі, асабліва на ўсходзе, XVI ст. можна лічыць перыядам хуткага дэмаграфічнага поступу краю. Калі ў канцы XV ст. сярэдняя шчыльнасць насельніцтва ў Вялікім Княстве Літоўскім наогул не пераўзыходзіла 5 чалавек на 1 км кв., дык у першай палове XVI ст. яна дасягнула 7, а ў другой — ужо 9 чалавек на тую ж адзінку плошчы. Паводле падлікаў Генрыха Лаўмяньскага, які апрацаваў матэрыялы попісу войска, агульная колькасць жыхароў Вялікага Княства ў 1528 г. магла раўняцца 2,5 млн. чалавек, з якіх на Беларусь і Літву прыходзілася блізу 2 млн. Гусцей заселенымі былі заходнія паветы краіны — Ашмянскі, Навагрудскі, Ваўкавыскі, Берасцейскі. З попісу відаць, што яны выставілі ў 2 — 4 разы больш коннікаў, чым усходнія раёны Беларусі.



*Яўрэі ВКЛ XVII ст. Паводле М. Балабана.*

Менш чым за паўстагоддзя прырост насельніцтва ў Бела-

русі перавысіў 30%. На 1569 г. у межах Вялікага Княства Літоўскага налічвалася ўжо прыкладна 3,5 млн. жыхароў, з іх больш за 1,8 млн. — на землях цяперашняй Беларусі. Да шляхецкага стану адносілася каля 162 тысяч чалавек, г.зн. да 9% насельніцтва.

Зыходзячы з агульнаеўрапейскага маштабу, можна адзначыць, што ў другой палове XVI ст. Рэч Паспалітая «абодвух народаў» па дэмаграфічным патэнцыяле была сярэдняй дзяржавай Еўропы і мела 7,5 млн. жыхароў. Пераўзыходзілі яе Францыя (16 млн.), Нямецкая імперыя (12 млн.), Італія (11 млн.), Маскоўскае царства (11 млн.) ды Іспанія (9 млн.), а ніжэй знаходзіліся Англія (з Ірландыяй — 4 млн.), Нідэрланды (3 млн.), Швецыя (з Фінляндыяй — 1 млн.) і Данія (з Нарвегіяй — 0,8 млн.).

Тэмп дэмаграфічнага развіцця заставаўся высокім і ў наступныя дзесяцігоддзі. Як падлічыў Юзаф Можы, да сярэдзіны XVII ст. (дадзеныя на 1648 г.) у беларускіх паветах Вялікага Княства жыло блізу 2,9 млн. чалавек (у цэлай дзяржаве тады налічвалася 4,5 млн.). З агульнай колькасці насельніцтва прыкладна 75% складаў вясковы люд, блізу 15—17% — жыхары гарадоў і мястэчак (паводле падлікаў Зіновія Капыскага), і да 8—10% — шляхта. Такая ўдзельная вага рыцарства была яшчэ ў Іспаніі, у большасці ж дзяржаў яна не пераўзыходзіла 1% (Францыя, Чэхія, Расія).



*Татарскі ротмістр. Паводле малюнка 1670 г.*

Насельніцтва краю здаўна было поліэтнічным. У гарадах і мястэчках Заходняй і Цэнтральнай Беларусі значную яго частку ўтваралі нацыянальныя меншасці, галоўным чынам яўрэі, татары, палякі, немцы. Яўрэі жылі на беларускай зямлі з часоў існавання старажытных княстваў. Яны трымаліся даволі абасоблена, самастойнымі тэрытарыяльнымі арганізацыямі — кагаламі, кіруючыся ўласнымі правамі і ўстановамі. Найбольшыя іх калоніі ўтварыліся ў Берасці і Горадні, многа іудзеяў было таксама ў Вільні і Троках. У 1388 г. яўрэі Берасця, а ў 1389 г. і Горадні атрымалі прывілей Ягайлы, які дазваляў ім гандляваць і набываць ва ўласнасць зямлю. Праз дваццаць гадоў гэтыя правы былі пацверджаны Вітаўтам. Адзіным прыкладам неталерантнай палітыкі ўладаў стала выгнанне яўрэяў з канфіскацыяй іх маёмасці воляю вялікага князя Аляксандра ў 1495 г., што было зроблена з прыкладу Кароны Польскай. У гаспадарскай пастанове гаварылася: «загадалі мы ўсю жыдаву з нашага Вялікага Княства выбіць» (г.зн. выгнаць). Аднак ужо Жыгімонт Стары ў 1507 г. пацвердзіў берасцейскі прывілей, пашырыўшы яго на ўсіх яўрэяў дзяржавы (нормы гэтага прывілею ўвайшлі і ў Статут 1529 г.). У Горадні і Берасці іудзеям вярнулі іх дамы і пляцы, сінагогі і могілкі. У тыя часы вялікая яўрэйская супольнасць з’явілася таксама ў Пінску. У цэлым на пачатак XVI ст. у Вялікім Княстве Літоўскім магло налічвацца каля 10 тысяч іудзеяў. Іх колькасць значна ўзрасла ў першай палове XVII ст. Згодна з падлікамі спецыялістаў, перад паўстаннем Хмяльніцкага ў гарадах усёй Рэчы Паспалітай знаходзілася ўжо да 500 тысяч яўрэяў.





*Старонка хамаіла XVII ст.*

Татарскія пасяленні з’явіліся ў Беларусі і Літве ў часы Вітаўта. Першая вялікая група татараў прыйшла пад яго апеку ў 1395 г. з ханам Залатой Арды Тахтамышам, войска якога было разгромлена эмірам Цімурам. Праз два гады Вітаўт сам здзейсніў паход супраць Арды і, са слоў Яна Длугаша, «шмат тысяч татараў з жонкамі і дзецьмі ды жывёлаю паланіў і прывёў у Літву». Вялікі князь сяліў іх у сваіх уладаннях, надзяляючы зямлёй на ўмовах вайсковай службы. Шмат было і добраахвотных эмігрантаў, уцекачоў з Арды, дзе часта мяняліся ханы. Значныя перасяленні татараў у ВКЛ не перапыняліся цягам усяго XV ст. Самыя вялікія іх калоніі ўтварыліся ў ваколіцах Трокаў, Горадні, Менска. Кампактнымі групамі жылі татары таксама ў Іўі, Клецку, Маладэчне, Міры ды іншых гарадах і мястэчках Беларусі. Па падліках гісторыкаў, разам у першай пало-

ве XVI ст. ва ўсім Вялікім Княстве налічвалася каля 7 тысяч татараў. Усе яны мелі шляхецтва і «служылі вайною». Шляхта мусульманскага веравызнання не атрымлівала толькі палітычных правоў і не магла валодаць «людзьмі нявольнымі». Трымаючыся сваёй веры, татары хутка славянізаваліся і пераянялі мову карэнных жыхароў. Захаваліся іх «кітабы» — арыгінальныя літаратурныя помнікі XVII—XVIII ст. (хоць, як лічаць вучоныя, стварацца яны маглі і ў XVI ст.), напісаныя арабскім алфавітам па–беларуску, а таксама «хамаілы» (малітоўнікі). Нават вусная народная творчасць татараў Беларусі мала адрозніваецца ад беларускай.

Падкрэслім, аднак, што да сярэдзіны XVII ст. у гарадах і мястэчках Беларусі яшчэ цалкам дамінавала карэннае жыхарства. З даследаванняў Зіновія Капыскага, яно складала да 80% гараджан. Яўрэі, якія ў склад мяшчанства не ўваходзілі, налічвалі тады ад 5 да



*Рамеснікі-збраяры. Гравюра XVI ст.*

8% колькасці ўсіх жыхароў горада. Прыкладам, у Берасці, дзе існавала адна з самых старых і найбольш значных іудзейскіх абшчын, паводле інвентара сярэдзіны XVI ст. яны мелі 90 двароў, утвараючы 8% ад усіх жыхароў горада. Нават у сярэдзіне XVII ст. у маштабах усёй Беларусі яўрэі маглі складаць не больш за 1—2% усяго насельніцтва. Да выразных зменаў этнічнага



складу гарадоў тут дайшло пасля вайны 1654—1667 г., пра што будзе ніжэй.

Адной з самых яркіх асаблівасцяў эканамічнага развіцця Беларусі XVI — першай паловы XVII ст. стаў бурны рост гарадоў і мястэчак. Калі для пачатку гэтага перыяду гісторыкі налічваюць толькі 48 гарадоў і мястэчак, дык у сярэдзіне XVII ст. іх было ўжо 467 (а ў цэлым Вялікім Княстве — 757). Пры гэтым, як зазначае лепшы знаўца пытання Станіслаў Александровіч, абсалютная большасць мястэчак з’явілася да канца XVI ст. У заходніх паветах Беларусі ступень урбанізацыі была вышэйшая, чым у Падняпроўі і Падзвінні. Па колькасці насельніцтва вылучаліся Берасце, Віцебск, Магілёў, Пінск, Полацк, Слуцк. У іх налічвалася прыкладна па 10 тысячаў жыхароў, толькі ў Полацку гэтая лічба сягала значна вышэй. Да 1563 г. гэта быў самы буйны горад у цяперашніх межах Беларусі, называны ў нямецкіх лятучых лістках «вялікім і багатым». І самі палачане лічылі яго «местам славутым», не меншым за Вільню ці Мальбарк. Пасля разбурэння Полацка ў гады Інфлянцкай вайны другім пасля сталіцы местам стаў Магілёў. Большасць жа гарадоў мелі па некалькі тысяч чалавек, а ў мястэчках жыло да паўтары — дзвюх тысяч насельнікаў. Колькасць гарадскога жыхарства ўзрастала галоўным чынам за кошт вольных сялян і ўцекачоў ад прыгону. Калі Статут 1588 г. дазволіў шляхце засноўваць мястэчкі на ўласных землях, паны паспяхова выкарысталі гэтую магчымасць і сталі ўтвараць шматлікія мястэчкі, гандлёва–рамесныя цэнтры, пераважна каля сваіх рэзідэнцый. Вялікая ўдзельная вага прыватнаўладальніцкіх гарадоў можа лічыцца адной з асаблівасцяў Беларусі. Згодна з падлікамі гісторыка Анатоля Грыцкевіча, магнацкім родам, перадусім Радзівілам, Сапегам, Хадкевічам, належала прыкладна 40% гарадоў XVI — XVII ст. Сярод іх можна згадаць Быхаў, Дуброўну, Капыль, Клецк, Лепель, Мір, Нясвіж, Талачын, Чашнікі, Шклоў і інш.



*Ганчар за працай. Гравюра XVI ст.*

XVI — першая палова XVII ст. сталі часам найвышэйшага гаспадарчага развіцця старой Беларусі. Пра небывалы поступ сведчыла, у прыватнасці, узрастанне колькасці рамеснікаў і з’яўленне шэрагу новых рамесніцкіх спецыяльнасцяў. Рамесны люд складаў прыкладна палову і болей насельніцтва горада, а ў мястэчках яго колькасць вагалася ў межах 10 — 25%. У беларускіх гарадах тых часоў працавалі рамеснікі не менш чым 200 спецыяльнасцяў. Найбольшая ўдзельная вага належала спецыяльнасцям, звязаным з апрацоўкай металу (каля 24%), на другім месцы знаходзілася апрацоўка скуры (22%), на трэцім — выраб прадуктаў харчавання (19%), потым ішлі будаўнічыя спецыяльнасці, рамеснікі, занятыя ў вырабе адзення, і г.д. Характэрнай з’явай першай паловы XVII ст. стала хуткае пашырэнне рамесніцкіх цэхаў: у Менску за гэты час іх колькасць павялічылася з 2 да 11, у Магілёве, які стаў найбуйнейшым гандлёва–рамесным цэнтрам Беларусі — з 7 да 17, у Слуцку з 5 да 17, у Берасці — з 2 да 14. У суме да канца XVI ст. на тэрыторыі Беларусі рамеснікаў аб’ядноўвала не менш за сто цэхаў. Праўда, цэхавыя арганізацыі ў беларускіх гарадах не мелі такой класічнай формы рэгламентацыі, як рамесніцкія карпарацыі краін Заходняй Еўропы, і не дамагаліся поўнай манаполіі на рынках. Звычайнай з’явай тут было і пазацэхавае рамяство, асабліва ў прыватнаўладальніцкіх юрысдыках гарадоў.

Як даўно заўважылі даследчыкі, важнай рысай развіцця беларускіх гарадоў заставалася іх цесная сувязь з сельскай гаспадаркай. Спусташэнні ад частых войнаў, эпідэміі, стыхійныя бедствы, а таксама неразвітасць рынка — усё гэта стрымлівала поступ рамёстваў і гандлю, патрабавала ад мяшчан займацца агародніцтвам і гадоўляй свойскай жывёлы. Звычайна гарады мелі па некалькі дзесяткаў, а то і па сто валокаў зямлі. Зрэшты, падобная карціна назіралася і на захадзе Еўропы. У Францыі ды Таскані гарады таксама не парывалі сувязяў з сельскай гаспадаркай.

Поспехі ў развіцці рамяства былі цесна звязаныя з актывізацыяй гандлю ў краіне. Адзіны ўнутраны рынак з прычыны адсутнасці тэрытарыяльнай спецыялізацыі яшчэ не склаўся, функцыявала сістэма лакальных рынкаў, затое ў гандлёвых сувязях беларускіх гарадоў з іншымі краінамі, найперш з суседнімі — Літвой, Польшчай, Украінай, Расіяй, ужо існавала пэўная спецыялізацыя, выкліканая інтарэсамі ўнутранай вытворчасці і абмену.

Гарады Беларусі хутка ўцягваліся ў міжнародны гандаль. Яго развіццю спрыяла стабілізацыя адносін паміж ВКЛ і Нямецкім ордэнам у XV ст., а таксама Кракаўскі дагавор 1525 г. Беларускія купцы, найперш «госці» з Полацка, Магілёва, Пінска, сталі актыўней асвойваць рынкі марскіх гарадоў — Рыгі, Караляўца, Гданьска.





*Праца на фальварку. Дрэварыт XVI ст.*

Імпартаваліся ў асноўным металы, вырабы рамеснай вытворчасці, соль, прыправы і г.д., а з Беларусі на захад вывозілася багацце лясоў (драўніна, смала, футры) і прадукты сельскагаспадарчай вытворчасці — лён, каноплі, а таксама збожжа, вырашчанае на гаспадарскіх і шляхецкіх фальварках. Заўважана, што да сярэдзіны XVI ст. фальваркі з’яўляліся толькі ў басейне рэк Буг, Нёман і Дзвіна, што сведчыць пра іх арыентацыю на рынкі партовых гарадоў Балтыкі. Вялікае значэнне ў XVI ст. набыў і транзітны гандаль, у якім галоўную ролю выконвалі Полацк і Магілёў, што развівалі адносіны з рынкамі Маскоўскай дзяржавы, Інфлянтаў, Прусіі і Кароны. Пасля страты Смаленска (1514) незвычайную кар’еру на транзіце зрабіў Магілёў. Стаўшы цэнтрам транзітных перавозак футраў, тканін і металічных вырабаў, ён за некалькі дзесяцігоддзяў ператварыўся ў адзін з самых вялікіх гарадоў Беларусі.

Уключэнне эканомікі Беларусі (як і ўсёй Рэчы Паспалітай) у міжнародны гандаль прывяло да буйнамаштабнага рэфармавання сельскай гаспадаркі, пашырэння фальваровачна–паншчыннай сістэмы ў Вялікім Княстве. Правядзенне аграрнай рэформы было выклікана

неабходнасцю ўзняць прадукцыйнасць працы земляробаў і павялічыць даходы ад апрацоўкі зямлі. З канца XV да XVII ст. у Еўропе хутка ўзрастаў кошт збожжа. Напрыклад, ад сярэдзіны XVI да пачатку наступнага стагоддзя ён узняўся ў 3 — 5 разоў. Такія цэны і высокі попыт на прадукцыю сельскай гаспадаркі на еўрапейскім рынку актывізавалі гаспадарчую дзейнасць землеўладальнікаў, якія імкнуліся атрымаць большы даход з зямлі. Але старая сістэма эксплуатацыі, заснаваная на павіннасцях пэўнай гаспадарчай адзінкі (службы), для якой нават не вызначалася колькасць душ ці якасць зямлі, тармазіла рост прадукцыйнасці працы. Патрэбна было рэфармаваць яе. У суседніх Польшчы, Прусіі, Інфлянтах даўно выкарыстоўвалася новая арганізацыя сельскай гаспадаркі, пры якой феадальная рэнта залежала ад дакладна вызначанай плошчы ворнай зямлі.



Сенакос. Дрэварыт XVI ст.

У Вялікае Княства Літоўскае аграрная рэформа прыйшла з Падляшша. Упершыню на Беларусі такія мерапрыемствы праводзіла ў сваіх уладаннях каралева Бона Сфорца, аднак у шырокіх маштабах рэфармаваннем сельскай гаспадаркі заняліся ў сярэдзіне XVI ст. Спачатку ім былі ахоплены землі гаспадарскага дамену, а потым — уладанні магнатаў, шляхты, касцёла. Рэформа ўяўляла з сябе цэлы комплекс мерапрыемстваў тэхнічнага, гаспадарчага і грамадскага характару (размеркаванне зямлі, уніфікацыя павіннасцяў, увядзенне трохполля з рэгулярным цыклам севазвароту, рэарганізацыя вёскі і г.д.). Па тытуле галоўнага дакумента «Ўставы на валокі», выдадзенай у 1557 г., рэформа атрымала назву Валочнай памеры. На гаспадарскіх землях дакладна вызначаліся памеры сялянскіх надзелаў, фіксаваліся падаткі і павіннасці. Уся зямля абмервалася і дзялілася на валокі (адна валока — 30 моргаў, або 21,3 гектара), частку якіх дзяржава раздавала сялянам (звычайна адной сям’і —



адна валока ці яе частка), а іншыя пакідала ў гаспадарскім фондзе для фальварачнай гаспадаркі. Адну фальварачную валоку апрацоўвала сем сялянскіх. Як адзначана вышэй, вываз збожжа з фальваркаў на Захад даваў вялікі прыбытак, што ў першую чаргу і стымулявала правядзенне рэформы сельскай гаспадаркі.

На ўсёй тэрыторыі Вялікага Княства, за выняткам Беларускага Падзвіння і Падняпроўя, у гаспадарскім дамене гэтыя пераўтварэнні былі праведзены ў сярэдзіне XVI ст., у гады панавання Жыгімонта Аўгуста. Паколькі ў Кароне такая рэформа праводзілася намнога раней, дык у Беларусі гэты праект даручылі ажыццяўляць палякам Пятру, Станіславу і Францішку Хвальчэўскім, якія мелі адпаведны вопыт. Але потым іх здолелі замяніць мясцовымі спецыялістамі. На пінскім Палессі функцыі Станіслава Хвальчэўскага пераняў Лаўрын Война, а на пасадзе спраўцы двароў і замкаў Пётр Хвальчэўскі быў таксама заменены ліцвіном.



Селянін за касьбой.
Малюнак з інвентара
маёнтка Кобрынскай эканоміі.
Сярэдзіна XVIII ст.

У выніку рэформы на захадзе і ў цэнтры Беларусі сялянская абшчына ўжо ў XVI ст. была фактычна зліквідаваная. Надзелы зямлі сталі аднадворнымі і спадчыннымі. Многія вёскі ўзбуйняліся і набывалі новае аблічча. Яны мелі доўгую вуліцу, па адзін бок якой стаялі жылыя хаты, а па другі — гаспадарчыя пабудовы.

«Устава на валокі» 1557 г. тычылася толькі дзяржаўных уладанняў. На панскіх землях іх уладальнікі пачалі праводзіць рэформу толькі ў другой палове XVI ст., калі сталі відавочныя поспехі ў раней рэфармаваных гаспадарках. Яны таксама выкарыстоўвалі інструкцыі, блізкія да «Ўставы на валокі».

У Падзвінні і Падняпроўі да аграрнай рэформы дайшло толькі напрыканцы XVI — у пачатку XVII ст. У параўнанні з іншымі раёнамі Беларусі буйное землеўладанне тут развівалася слаба, а

шляхта была малалікая. Мясцовае насельніцтва доўга працівілася ўмацаванню эксплуатацыі, і часам не без поспеху, як, напрыклад, у Бабруйску. Толькі ў часы Жыгімонта III (1587—1632), калі адносіны з Масквой на пэўны перыяд палепшыліся, на ўсходзе прыступілі да больш энергічнага рэфармавання сельскай гаспадаркі і скончылі справу да 1639 г. Традыцыйная для Падняпроўя і Падзвіння валасная арганізацыя сялян была канчаткова падарваная, абшчыннае землеўладанне ворнай зямлёй ліквідавалася (хоць выпасы, выганы і лясы па–ранейшаму заставаліся абшчыннымі). Аднак фальварак не стаў тут дамінавальнай формай гаспадарання. Калі на заходніх і цэнтральных землях Беларусі ў XVI—XVIII ст. пераход сельскай гаспадаркі ад натуральнай да таварнай формы вытворчасці адбываўся на аснове развіцця шляхецкага фальварка і пашырэння паншчыны, дык на ўсходзе краю — менш заселеным і адсталым эканамічна, галоўную ролю мела грашовая рэнта. Адной з прычын гэтага з’яўлялася, відаць, спецыялізацыя ўсходніх раёнаў на тэхнічных, а не на збожжавых культурах. Грашовы чынш як асноўная форма рэнты ў спалучэнні з арэнднай сістэмай уладання ператваралі ўсходнюю Беларусь у рэгіён жорсткай эксплуатацыі сялянства, што ў хуткім часе выклікала ў гэтых землях выбухі антыфеадальнай барацьбы. Праўда, і ў многіх іншых раёнах Беларусі акрэсленая «Ўставай» тэндэнцыя да пераходу на адпрацовачную рэнту не змагла сцвердзіцца. Калі даходы ад зямлі былі большыя пры грашовай рэнце, уладальнікі ўводзілі яе. Пад канец XVI ст. грашовая рэнта ўжо выразна панавала, напрыклад, у Кобрыньскай эканоміі.

Дзякуючы ўдасканаленню сістэмы землекарыстання і шэрагу сацыяльна–эканамічных пераўтварэнняў правядзенне аграрнай рэформы стала важным этапам развіцця гаспадаркі Вялікага Княства Літоўскага. Адносіны, якія склаліся ў беларускай вёсцы пасля Валочнай памеры, не ведалі істотных зменаў да другой паловы XIX ст. Аднак у сацыяльным плане былі і адмоўныя наступствы рэфармавання. Прававое становішча сялян у цэлым пагоршылася, прыгон узмацніўся, воласць страціла прававую адасобленасць. Пасля аграрных пераўтварэнняў павіннасці залежных сялян нівеляваліся і сталі прыкладна аднолькавымі ў маштабах цэлай дзяржавы, таму пераход ад аднаго ўладальніка да другога цяпер страціў сэнс. Узмацненне рэжыму прыгоннага права выклікала стыхійны супраціў сялян. З канца XVI ст. усё большы характар пачалі набываць уцёкі сацыяльных нізоў з Беларусі на Ўкраіну — «на Ніз», у Прыдняпроўскі стэп, на вольніцу. Тысячамі ўліваліся яны ў Запарожскую Сеч. Як



вынікае з дакументаў, у многіх Запарожскіх загонах значную частку казакоў складалі жыхары Беларусі. Сярод іх — выхадцы з Пінска, Давыд–Гарадка, Бабруйска, Барысава, Магілёва, Быхава, Смаленска, Крычава, Мсціслава, Слуцка, Наваградка, Койданава, Менска, Астрына ды іншых гарадоў і паветаў. Траплялiся нават людзі з Вільні і Коўны.

Пастаянны адток жыхароў Беларусі на поўдзень, у стэп, пазбаўляў край актыўнай часткі насельніцтва, збядняў яго дэмаграфічны патэнцыял. Пройдзе яшчэ некалькі дзесяцігоддзяў, і выхадцы з Беларусі ў казацкіх загонах і сотнях прынясуць сваёй айчыне бязлітасную вайну, помсцячы найперш шляхце, але не шкадуючы і простага люду.

## VIII.3. Рэфармацыя і контррэфармацыя

У другой чвэрці XVI ст. у Еўропе стаў хутка распаўсюджвацца грамадскі рух за рэфармаванне асноўных дактрын, арганізацыі і практыкі каталіцкага касцёла. Са слоў знаўцы Рэфармацыі польскага гісторыка Януша Тазбіра, фактычна гэта была барацьба за рэлігійнае пераўтварэнне дзяржавы, за пазбаўленне касцёла пазіцый панавальнага веравызнання і звязаных з імі прывілеяў. Рэфармацыйны рух падарваў адзінства каталіцкай Еўропы і прывёў да ўтварэння новых хрысціянскіх веравызнанняў, званых пратэстантызмам.

У другой чвэрці — сярэдзіне XVI ст. ідэі Рэфармацыі сталі пашырацца і ў Беларусі, дзе знаходзілі жывы водгук. Спрыялі гэтаму шчыльныя кантакты з Еўропай. Моладзь з Вялікага Княства Літоўскага, якая пабыла за мяжой, асабліва ў нямецкіх універсітэтах (а студэнты з Беларусі вучыліся ў Ляйпцыгу, Вітэнбергу, Цюбінгене і г.д.) ці пры еўрапейскіх дварах, пасля вяртання распаўсюджвала ў сваёй айчыне ідэі вялікіх рэфарматараў касцёла, найперш Марціна Лютара (1483—1546) і Жана Кальвіна (1509—1564). Рэлігійныя навіны прыносілі ў край і нямецкія мяшчане.

У адрозненне ад дзяржаў Цэнтральнай і Заходняй Еўропы, дзе адной з мэтаў рэфарматараў была секулярызацыя касцёльных зямель, у Вялікім Княстве прывабнасць Рэфармацыі не залежала ад маёмасных інтарэсаў. Калі, напрыклад, у Англіі касцёл валодаў 40% асвоеных зямель, то ў ВКЛ уладанні каталіцкага касцёла і праваслаўнай царквы разам складалі толькі 5% ад плошчы, якая апрацоўвалася. Пашырэнне рэфармацыйных настрояў тут вызначылі па-

літычныя інтарэсы алігархаў, перспектыўнасць Рэфармацыі для ўмацавання дзяржаўнай ідэнтычнасці ВКЛ, а таксама прывабнасць дэмакратычных прынцыпаў арганізацыі кальвінскага касцёла ў вачах шляхты.

Пачатак Рэфармацыі ў Вялікім Княстве паклалі магутныя Радзівілы. Пераломным момантам стаў пераход у 1553 г. з каталіцтва ў пратэстантызм вялікага канцлера і віленскага ваяводы Мікалая Радзівіла Чорнага (1515—1565) і гетмана найвышэйшага Мікалая Радзівіла Рудога (1512—1584), брата пашлюбленай каралём Барбары. За імі адзін за другім сталі пакідаць каталіцкі касцёл і праваслаўную царкву іншыя паны — Кішкі, Сапегі, Хадкевічы, Валовічы, Саламярэцкія, Храбтовічы, Гарнастаі, Корсакі. Услед за віленскім ваяводам, які прыняў кальвінізм, «паўсюдна ідзе ўся шляхта», — адзначыў пазней віленскі біскуп Валяр'ян Пратасевіч. У тым жа 1553 г. Мікалай Радзівіл Чорны заклаў у Берасці першы на тэрыторыі Беларусі кальвінскі збор і заснаваў друкарню. Гэты найбагацейшы магнат стаў галоўным пратэктарам Рэфармацыі ў Літве і Беларусі.



*Мікалай Радзівіл Чорны (1515—1565), вялікі канцлер і віленскі ваявода.*

Новае веравызнанне знаходзіла сваю сацыяльную апору найперш у асяроддзі магнатаў і шляхты. Толькі самае дробнае рыцарства заставалася пры старой веры. Трэцяй вялікай сацыяльнай групай, якая далучылася да рэфармацыйнага руху, стала беларускае мяшчанства, асабліва яго эліты. Самым папулярным на тэрыторыі Беларусі было вучэнне Кальвіна. Пасля Берасця і Вільні ўжо ў 1550—60-х г. кальвінскія абшчыны з'явіліся ў Нясвіжы, Клецку, Віцебску, Менску, Заслаўі, Полацку, Койданаве, Івянцы, Іўі, Беліцы ды іншых гарадах і мястэчках. Магнаты, якія аддалі перавагу новаму веравызнанню, рэфармавалі ў сваіх уладаннях касцёлы, утваралі пратэстанцкія абшчыны, а пры іх — школы, друкарні, шпіталі. На землях паноў–пратэстантаў у новае веравызнанне пераводзіліся і сяляне. Мікалай Радзівіл Чорны закрыў у сваіх уладаннях 187 каталіцкіх храмаў, канфіскаваў іх зямельны фонд і маёмасць, а падданых равеў у пратэстантызм.



Да новай веры пераходзіла і шмат мяшчан, асабліва ў Віцебску, дзе пасля прывілею Жыгімонта Аўгуста на будаўніцтва святыні (1562 г.) кальвінскі збор фундавалі «баяры, шляхта, бурмістры, райцы і мяшчане», а таксама ў Менску і Полацку. Мяшчане таксама былі зацікаўлены ў аслабленні каталіцкага касцёла, праз юрысдыкі якога абмяжоўваліся сацыяльна–эканамічныя правы гарадскога жыхарства.



*Мікалай Радзівіл Руды (1512—1584), гетман найвышэйшы.*

Аб'яднаўшы розныя сацыяльныя слаі, рэфармацыйны рух не мог быць адзіным. У 1562—65 г. прыхільнікі вучэння Кальвіна падзяліліся на два лагеры — кальвіністаў, якія склалі большы збор, і арыянаў, што ўтваралі меншы збор, але з больш радыкальнай праграмай (яна ставіла пад пытанне дагмат Святой Тройцы). Новае адгалінаванне, утворанае пад уплывам італьянскіх гуманістаў, атрымала назву арыянаў, або антытрынітарыяў. Арыяне Беларусі і Літвы зваліся братамі літоўскімі, а Польшчы — польскімі. Іх праграма ўяўляла з сябе сінтэз ідэй італьянскага антытрынітарызму і нямецкага анабаптызму. У сацыяльным плане лідэры арыянаў цвёрда ставілі патрабаванне палепшыць становішча сялян і наогул скасаваць халопства. У 1569 г. літоўскія і польскія браты паспрабавалі стварыць у Ракаве, што ў Сандамірскім ваяводстве, сваю абшчыну, заснаваную на агульнай працы і маёмаснай роўнасці, аднак гэтая спроба не мела поспеху. Найбольшае распаўсюджанне ідэі антытрынітарызму

атрымалі ў Беларусі, найперш у Наваградскім і Берасцейскім ваяводствах, дзе арыянскі рух пашыраўся хутчэй, чым у Кароне.

Лепшыя часы Рэфармацкая царква Беларусі і Літвы перажыла ў 1550—60-х г. Пасля смерці Мікалая Радзівіла Чорнага (1565) і адыходу іншых багатых патронаў пачаўся яе павольны заняпад. На 1591 г. у межах беларуска–літоўскай дзяржавы налічвалася 207 пратэстанцкіх збораў, з іх 189 былі святынямі кальвіністаў. А на тэрыторыі сучаснай Беларусі, па падліках даследчыкаў, з сярэдзіны XVI да сярэдзіны XVII ст. існавала 85 кальвінскіх і 7 арыянскіх збораў. Афіцыйна пратэстанцкая царква ВКЛ з 1570-х г. называлася Літоўскай правінцыяй Евангелічна–Рэфармацкага Адзінства і дзялілася на 6 акругаў, званых дыстрыктамі: Віленскі, Жамойцкі, Завілейскі, Падляшскі, Наваградскі і Рускі (беларускі). Толькі ў другой палове XVII ст. іх колькасць зменшылася да 5. Кожны дыстрыкт узначальваў суперінтэндант, але адзінага кіраўніка ўсёй правінцыі не было.




*Вокладка “Індэксу забароненых кніг”. Выданне сярэдзіны XVIII ст.*

Аб паспяховым пашырэнні Рэфармацыі ў Беларусі сведчылі яе праціўнікі. Напрыклад, віленскі казнадзей Пётр Скарга сцвярджаў, пэўна, перабольшваючы, што ерэтыкі захапілі ў Княстве 650 храмаў, а мітрапаліт Іпаці Пацей пазней напісаў у сваім «Антырызісе», што ў Наваградскім павеце «наўрад ці хоць адзін шляхецкі дом з сотні» застаўся неахоплены духам пратэстантызму. Віленскі біскуп Бенядыкт Война скардзіўся ў Рым, што ў дзяржаве ў выніку дзейнасці пратэстантаў стала не хапаць каталіцкіх храмаў: «Раней тут было прыкладна 600 касцёлаў, а засталося толькі 300», — адзначаў ён.



На поспехі пратэстантаў у Еўропе каталіцкі касцёл адказаў актыўнай барацьбой з рэлігійнай рэфармацыяй і гуманізмам наогул. Галоўнымі крокамі гэтай барацьбы стала стварэнне ордэна езуітаў («Таварыства Ісуса»), выданне афіцыйнага паказніка забароненых кніг і правядзенне спецыяльнага Ўсяленскага сабору. Сабор каталіцкага касцёла, названы па месцы правядзення Трыдзенцкім, праходзіў з перапынкамі з 1545 да 1563 г. Сваімі пастановамі ён узвысіў аўтарытэт папаў, умацаваў уладу біскупаў, захаваў непарушнымі каталіцкія дагматы, а вучэнні пратэстантаў перадаў анафеме. Узмацнялася цэнзура і ўводзіўся новы «Індэкс забароненых кніг». У 1564 г. было складзена «Трыдзенцкае спавяданне», якому мусілі прысягаць усе духоўныя асобы ды універсітэцкая прафесура. Пастановы Трыдзенцкага сабору пасля іх прыняцця Пётркаўскім сінодам 1577 г. пашырыліся і на Рэч Паспалітую.

У 1564 г. езуіты з’явіліся ў Кароне, а ў 1569 па запрашэнні біскупа Валяр’яна Пратасевіча яны прыехалі ў Вільню. З іх усталяваннем і на землях Беларусі пачаўся актыўны наступ контррэфармацыі, або «новай каталіцызацыі» з дэвізам «кожны шляхціч — каталік». Езуіты сталі першым каталіцкім ордэнам, які важнай задачай сваёй дзейнасці лічыў адукацыю і выхаванне моладзі. Барацьбу супраць ідэй пратэстантызму яны вялі ў сферы інтэлектуальнай. Праграма езуіцкіх школ і калегіумаў абапіралася на класічныя мовы, рэлігійны дух і вымагала ад вучняў як ведаў, так і інтэлектуальных здольнасцяў. Пераняўшы гуманістычную сістэму навучання, якая існавала і ў пратэстанцкіх навучальных установах, езуіты стварылі самыя лепшыя на той час школы, у якія аддавалі сваіх дзяцей і многія пратэстанты.




*Сымон Будны (1530—1593).*

Ужо ў 1569 г. езуіты адкрылі ў Вільні сваю двухкласавую школу, а праз год — калегіум з пяці класаў. У 1579 г. булаю папы Грыгора XIII (1572—1585) віленскаму езуіцкаму калегіуму быў нададзены статус акадэміі і ён ураўняўся ў правах з Кракаўскім універсітэтам. Першым рэктарам Віленскай акадэміі стаў таленавіты езуіцкі палеміст Пётр Скарга (1536—1612). Стварыўшы сістэму

вышэйшых школ, езуіцкі ордэн даў магчымасць моладзі атрымліваць добрую адукацыю ў яго установах, не выязджаючы ў універсітэты Еўропы. Кальвіністы ж засталіся без сваёй вышэйшай школы, бо Жыгімонт Аўгуст у 1567 г. адмоўна паставіўся да іх спробы адкрыць пратэстанцкі універсітэт. Смерць апошняга вялікага апекуна Мікалая Радзівіла Рудога (1584) канчаткова аслабіла лагер рэфарматаў Вялікага Княства Літоўскага.

На хвалі рэфармацыйнага руху пасля амаль трыццацігадовага перапынку ў Беларусі аднавілася кнігадрукаванне. Першым варштатам у ВКЛ пасля Скарынавага стала ўжо згаданая пратэстанцкая друкарня ў Берасці, створаная ў 1563 г. на сродкі Мікалая Радзівіла Чорнага. Тут было выпушчана ў свет перакладзенае на польскую мову Святое Пісанне (Стары і Новы Запавет), а потым іншыя выданні — разам каля 40 тытулаў, і ўсе па–польску. У адрозненне ад лютэранаў, якія ў сваёй дзейнасці выкарыстоўвалі нацыянальныя мовы, кальвіністы карысталіся амаль выключна польскай. Пасля Люблінскай уніі польская мова рабілася сродкам міжнародных зносін у Рэчы Паспалітай, выконваючы ролю своеасаблівай *lingua franca* Ўсходняй Еўропы, мовай літаратуры і высокай культуры. Таму з пратэстанцкіх друкарняў Беларусі кнігі выходзілі за рэдкім выключэннем па–польску. Фактычна да сярэдзіны XVII ст. яны выдалі на «простай» мове толькі тры кнігі.

Ініцыятывай і на сродкі пратэстантаў у Беларусі адзін за другім ствараліся прыватныя выдавецкія варштаты. Да канца XVI ст. ім належала 8 з 15 заснаваных друкарняў. Сярод іх варта згадаць друкарні ў Нясвіжы (1562), Заслаўі (1570), Лоску (1570—1580), а таксама невялічкі варштат у маёнтку Цяпіна, што недалёка ад Лепеля. Апошні быў асаблівы тым, што належаў не магнату, а дробнаму шляхцічу–арыяніну. Антытрынітарыі, як і лютэране, пайшлі на выкарыстанне ў рэлігійных выданнях і царкоўнай службе нацыянальнай мовы. Да «простай» мовы як сродку масавай прапаганды штурхала і ідэалагічная барацьба, якую вялі паміж сабой лагер Рэфармацыі і контррэфармацыі. Першым для паспалітага люду на старабеларускай мове яшчэ ў 1562 г. у Нясвіжы выдаў свае кнігі самы вядомы прадстаўнік беларуска–літоўскага антытрынітарызму Сымон Будны (1530—1593). Гэта былі «Катэхізіс» і «Апраўданне грэшнага чалавека перад Богам». Прысвяціўшы Катэхізіс магутным Радзівілам, у звароце да сваіх паноў Будны заклікаў іх шанаваць мову народа, сярод якога тыя жывуць, спрыяць пашырэнню кніг сярод беларускага люду: «абы ваши княжацкие милости того народу



язык миловати рачили». Гэты твор хутка апынуўся ў цэнтры ўвагі ўсходнееўрапейскіх палемістаў. Яго перапісвалі і каментавалі нават у XVIII ст.


*Васіль Цяпінскі (1530—1603).*

Праўдападобна, нясвіжская друкарня выпусціла яшчэ некалькі кірылічных кніг. Яе выданні былі шырока вядомыя ў славянскіх землях. Але сярод беларускага мяшчанства ініцыятыва Сымона Буднага не знайшла падтрымкі, і ўсе наступныя кнігі з яго варштатаў выходзілі ўжо па–польску. Актыўная дзейнасць пратэстанцкага друкара ў 1573—1583 г. перанеслася ў мястэчка Лоск — уладанне Яна Кішкі, якое доўгі час з’яўлялася цэнтрам арыянства ў Беларусі. Сымон Будны быў тут міністрам (прапаведнікам) і друкаваў не толькі свае асноўныя творы («Пра дзве прыроды Хрыста», «Пра асноўныя артыкулы хрысціянскай веры», «Пра свецкую ўладу» і інш.), але і кнігі польскіх рэфарматаў, у тым ліку трактат вядомага прадстаўніка палітычнага мыслення эпохі Адраджэння Анджэя Фрыча Маджэўскага (1503—1572) «Пра выпраўленне Рэчы Паспалітай» (1577), ідэі якога мелі вялізны ўплыў на інтэлектуальныя колы краіны, у тым ліку на стваральнікаў Статута 1588 г.

Выразна нацыянальным характарам вызначалася культурная дзейнасць паплечніка Буднага беларускага шляхціча Васіля Цяпінскага (Амельяновіча) (1530—1603). Упершыню ў усходнеславянскай культуры ён пачаў выдаваць тэксты Святога Пісання паралельна на дзвюх мовах: «славенскай» (царкоўна–славянскай) і «рускай», ці «простай» (старабеларускай). Цяпінскі першы сярод усходніх славянаў стварыў друкаваны пераклад Евангелля. Усхваляваны лёсам свайго народа, крызісам праваслаўя, абыякавасцю заможных родаў да мясцовай культуры, беларускі арыянін выступіў супраць пераймання чужога — захаплення польскай мовай і культурай. Плакаць можна, адзначаў ён, гледзячы, як князі і паны вялікія цураюцца «мовы сваёй слаўнай». Беларускі арыянін выказаў думку, што аднной з прычын паланізацыі моладзі, прывабнасці польскіх школ стала нізкая культура, неадукаванасць праваслаўных святароў, якія нават Слова Божага не ведаюць і не вучацца, «ани школы ку

науце его нигде не мают». У 1570-х г. у рукапіснай прадмове да свайго перакладу Евангелля ён выказаў сапраўднае крэда патрыёта–асветніка, гатовага, «калі яна (айчына) да канца загіне — з ёю загінуць».

Апрача шляхецкага лагеру ў арыянскую плынь уваходзілі мяшчане, якія ўтваралі левае крыло руху. Пад уплывам радыкальных ідэолагаў Пятра з Ганёндза і Марціна Чаховіча яны крытыкавалі ўмераную праграму шляхты, асуджалі грамадскую і дзяржаўную аснову тагачаснага ладу. У выніку барацьбы паміж левымі і правымі Сымон Будны быў спачатку адхілены ад пасады міністра ў Лоску (1582), а праз два гады яго зусім адлучылі ад збору. Але ўмацаванне плебейска–радыкальнага крыла было часовым. З 1580-х г. на тэрыторыі Беларусі пачало шырыцца вучэнне Фаўста Социна, які здолеў заглушыць сацыяльны радыкалізм антытрынітарнага руху і скіраваць яго ў русла рэлігійнага радыкалізму. У пачатку XVII ст., калі сацыяльная дактрына Соцына задамінавала, антытрынітарны рух стаў звацца сацыянізмам. У Беларусі цэнтрам гэтага вучэння быў Навагрудак, а адным з яго вядомых прапаведнікаў — рэктар сацыянскай школы ў Іўі асветнік Ян Ліцыній Намыслоўскі, аўтар папулярных падручнікаў для пратэстанцкіх школ.



*Від віленскіх замкаў. Гравюра Т.Макоўскага. 1604 г.*

Рэфармацкія ідэі ахапілі ў Беларусі і праваслаўную царкву. Ерэтычная плынь у ёй была народжана глыбокім унутраным крызісам усходняй царквы, з аднаго боку, і ўплывам еўрапейскага пратэстантызму, з другога. Пра тое, што пратэстанцкія выданні карысталіся вялікім поспехам і ў праваслаўным асяроддзі, сведчыў пазней уніяцкі мітрапаліт Антоні Сялява (1642—1655). Аднак праваслаўныя ерэтыкі не здолелі стварыць сваіх арганізацыйных структур і на тэрыторыі Беларусі далучаліся да пратэстанцка-



га збору. Маскоўскія ерэтыкі на чале з Хведарам Касым, якія знайшлі прыстанішча ў Віцебску, а потым і ў Полацку, падтрымалі тут арыянскую плынь. У Навагрудскім ваяводстве прыхільнікі вучэння Касога існавалі да пачатку XVII ст. Блізкім да антытрынітарызму быў і рэлігійны рух, узначалены праваслаўнымі дзеячамі братамі Стэфанам і Лаўрэнціем Зізаніямі (Тустаноўскімі).

Увасабленнем рэфармацыйных ідэй у праваслаўі, у прыватнасці, прынцыпу ўдзелу няклірыкаў у кіраванні царквой, сталі царкоўныя брацтвы. Іх з'яўленне было адказам шырокіх грамадскіх колаў, найперш мяшчан, на глыбокі заняпад усходняй царквы ва ўмовах наступу каталіцкага касцёла. Паўставалі праваслаўныя брацтвы пераважна вакол храмаў або манастыроў у буйных гарадах. І калі падобныя аб'яднанні каталікоў ставілі на мэце ўмацаванне пазіцый духавенства, дык праваслаўныя брацтвы дамагаліся кантролю свецкіх людзей над святарамі і нават епіскапамі. Першым у Вялікім Княстве з'явілася Віленскае Свята–Троіцкае брацтва, створанае ў 1584 г. Потым такія ж арганізацыі паўсталі ў Крычаве (1588), Магілёве (1590), Берасці і Горадні (1591), Менску і Оршы (1592) ды ў іншых гарадах. У некаторых з іх існавала па некалькі брацтваў. Напрыклад, у Менску да паловы XVII ст. іх было сем, у Магілёве — не менш за пяць. Маскоўская Русь такой з'явы наогул не ведала. Як падкрэсліў украінскі гісторык Яраслаў Ісаевіч, Беларусь і Ўкраіна сталі адзінымі краінамі Ўсходняй Еўропы, дзе атрымалі шырокае распаўсюджанне брацтвы прыхажан пры праваслаўных цэрквах.



*Акт Варшаўскай канфедэрацыі 1573 г.*

Братчыкамі з'яўляліся галоўным чынам рамеснікі і гандляры, але часам да іх далучаліся і шляхцічы, прадстаўнікі свецкай арыстакратыі і духавенства. Дзейнасць брацтваў была скіравана найперш на дабрачынную дапамогу царкве і кантроль над ёй, на развіццё адукацыі для праваслаўных, на апекаванне хворымі, калекамі і сіротамі. Каб канкураваць з каталіцкім касцёлам, брацтвы пачалі ўтвараць свае школы. Першыя з іх былі заснаваны пры Львоўскім і Віленскім брацтвах (1585), а потым на іх узор паўсталі

брацкія школы ў Берасці (1591), Менску (1592), Магілёве (1592 і 1597) ды іншых беларускіх гарадах. Навучаліся ў іх бясплатна ў асноўным дзеці мяшчан. Галоўнымі прадметамі былі славенская (царкоўнаславянская) і грэцкая мовы (таму такія школы часам называлі славяна–грэцкімі), а ў Вільні ды некаторых іншых гарадах (напрыклад, у Берасці) на ўзор езуіцкіх калегіумаў у праграму ўключылі яшчэ мовы лацінскую і польскую. Наогул, навучальныя праграмы брацкіх школ мелі выразную гуманістычную арыентацыю. Віленскай брацкай школай кіраваў Кірыл Лукарыс, які сам атрымаў адукацыю ў Падуанскім універсітэце.

Пры некаторых школах адкрываліся друкарні, што выпускалі царкоўныя кнігі і дапаможнікі на стараславянскай і старабеларускай мовах. Найбольшай вядомасцю карысталіся друкарні віленскага Святатроіцкага і магілёўскага Багаяўленскага брацтваў. У канцы XVI ст. царкоўныя брацтвы дамагліся найбольшага ўплыву ды кантралявалі амаль усе школы і праваслаўныя друкарні. Аднак брацкія навучальныя ўстановы не дасягалі таго ўзроўню адукацыі, які забяспечвалі езуіцкія школы. Таму да езуітаў нярэдка аддавалі сваіх дзяцей і праваслаўныя сем'і. У Вільні, напрыклад, у канцы XVI ст. сярод студэнтаў езуіцкай акадэміі былі «ерэтыкі і схізматыкі» і нават сыны «князёў праваслаўных».



*Паленне ерэтычных кніг у прысутнасці папы і кардыналаў. Тагачасны дрэварыт.*

Часы развіцця Рэфармацыі сталі самай яркай старонкай рэлігійнай талеранцыі ў Вялікім Княстве Літоўскім, яе «залатым векам». Пазіцыі рыма–каталіцкага касцёла саслаблі, а некаталікі атрымалі шырокае прадстаўніцтва ў органах улады. У 1569 г. у сенаце беларуска–літоўскай дзяржавы з 22 членаў пратэстантамі з'яўлялася 15 (68% ад усяго складу; у Кароне тады ж — 50%). У 1572 г. сярод той сама колькасці сенатараў было 16 пратэстантаў (што складала 73%), а каталікоў і праваслаўных — па 3.



У студзені 1573 г. канвакацыйны сойм у Варшаве прыняў пастанову, якая законна замацавала рэлігійную талеранцыю — знакаміты акт варшаўскай канфедэрацыі, які потым цалкам увайшоў у Статут 1588 г. Ад палітычнага народа Вялікага Княства яго падпісала 17 паслоў. Прынятая пастанова замацавала поўную свабоду веравызнанняў, дэкларавала роўнасць у публічных і прыватных правах прадстаўнікам усіх хрысціянскіх рэлігій і станаў Рэчы Паспалітай. Адметна, што гэта адбылося праз год пасля таго, як у Парыжы за адну Варфаламееўскую ноч тысячы гугенотаў сталі ахвярамі сваіх рэлігійных апанентаў. Варшаўскую канфедэрацыю як хартыю свабоды рэлігійнага сумлення можна па праву лічыць вялікім дасягненнем шляхецкага народа. Нягледзячы на пратэсты каталіцкага духавенства, Стэфан Баторы пазней пацвердзіў яе, і акт варшаўскай канфедэрацыі надоўга стаў юрыдычнай асновай, якая гарантавала рэлігійны мір у краіне.

Пашырэнне ідэй пратэстантызму на землях Беларусі было перапынена ўнутранай інтэграцыяй Рэчы Паспалітай і наступам каталіцкай рэакцыі, узначаленай езуітамі. Менавіта езуіты сцвярджалі зусім нехарактэрную для Вялікага Княства жорсткую палітыку адносна як праваслаўных, так і пратэстантаў. Стаўленне да іншаверцаў хутка мянялася, нарастала напруга. Прыкладам рэлігійнай нецярпімасці стала дзейнасць Мікалая Крыштафа Радзівіла, званага Сіроткам (1549—1616), нашчадка колішняга «слупа» Рэфармацыі — Мікалая Радзівіла Рудога. Перайшоўшы ў каталіцтва пад уплывам езуіта Пятра Скаргі, ён стаў заўзята нішчыць усё, зробленае бацькам: зачыняў пратэстанцкія дамы, паліў кнігі, ліквідаваў друкарні. Так нясвіжская лінія роду Радзівілаў вярнулася да каталіцкага касцёла (кальвіністамі заставаліся Радзівілы біржанскія). Знакамітая берасцейская друкарня ў 1570 г. была зачынена, а яе абсталяванне перавезена ў Вільню, дзе Сіротка адкрыў першае на тэрыторыі Вялікага Княства каталіцкае выдавецтва. Праз год спыніла існаванне пратэстанцкая друкарня ў Нясвіжы,

яшчэ праз год — у Заслаўі, а ў 1580-х г. была ліквідаваная і Лоская друкарня. У 1581 г. на Рынкавай плошчы ў Вільні з санкцыі біскупа Яна Радзівіла запалалі кнігі іншаверцаў, выдадзеныя ў Нясвіжы, Берасці, Заслаўі, а праз дзесяць гадоў езуіты спалілі ў сталіцы кальвінскі збор. У 1598 г. каталікі ўчынілі пагром у віленскім праваслаўным храме Святога Духа. Але найбольш цярпелі кальвіністы, якім у 1611 г. раз'юшаны натоўп фанатыкаў знішчыў збор, бібліятэку і архіў.

Пад націскам контррэфармацыі пачаўся масавы пераход магнатаў у рыма–каталіцкае веравызнанне. Найбольш пацярпела ад гэтага грэцкая царква, якая страціла сваіх патронаў, бо вялікая група былых праваслаўных магнатаў пасля пратэстантызму не вярнулася да старой веры, а прыняла каталіцтва. Толькі Астафі Валовіч (1530—1610) пад канец жыцця зноў стаў праваслаўным. Напрыканцы XVI ст. грэка–візантыйская царква на тэрыторыі Беларусі заставалася практычна без апекуноў. На каронных землях Украіны яе раўніва абараняў кіеўскі ваявода князь Канстанцін Канстанцінавіч Астрожскі (1524—1608). Гэта яго александрыйскі патрыярх Мялеці I (1590—1601) спецыяльна прасіў узяць праваслаўных Рэчы Паспалітай пад сваю апеку. Яшчэ ў 1576 г. для павышэння інтэлектуальнага ўзроўню праваслаўнага духавенства князь Астрожскі заклаў у Астрозе славутую славяна–грэка–лацінскую акадэмію (на ўзор езуіцкага калегіума), якая мела вялікія заслугі ў пашырэнні асветы сярод праваслаўных Украіны і Беларусі. Аднак агульнай сітуацыі грэцкай веры яна не змяніла. Як сведчыў Мялеці Смятрыцкі, да 1596 г. царкву ўсходняга абраду пакінулі князі Слуцкія, Заслаўскія, Сангушкі, Пронскія, Саламярэцкія, Галаўчынскія, Крошынскія, Масальскія, Горскія, Сакалінскія, Лукамскія, Пузыні, а таксама шляхецкія дамы Хадкевічаў, Глябовічаў, Сапегаў, Кішкаў, Валовічаў, Корсакаў, Дарагастайскіх і многіх іншых заможных праваслаўных родаў.

## VIII.4. Берасцейская унія: планы і вынікі

Пад канец XVI ст. праваслаўная царква на ўсходнеславянскіх землях Рэчы Паспалітай перажывала глыбокі заняпад. З дзесяці яе епархій тэрыторыю Беларусі ахаплялі тады Полацкая, Смаленская, Пінская (Тураўская) і Ўладзіміра–Берасцейская. Рэзідэнцыя



мітрапаліта мясцілася не ў Кіеве, а ў Навагрудку ці Вільні. Хоць праваслаўныя цэрквы функцыявалі бадай у кожным горадзе і мястэчку (а ў буйных гарадах іх было шмат, прыкладам, у Пінску ў сярэдзіне XVI ст. было 13 храмаў, у Горадні — 6, у Клецку — 5), парафіяльная сетка заставалася слабаразвітай. У сельскай мясцовасці храмаў не хапала. Напрыклад, у Пінскім старостве на 105 вёсак налічвалася толькі 10 цэркваў. Аднак галоўнай заганай усходняй царквы сталася тое, што яна на той час ужо зусім не задавальняла патрэбаў грамадскага жыцця.

Шматлікія прыклады сведчаць, што праваслаўныя ўладыкі (а паходзілі яны звычайна з небагатай шляхты) не вызначаліся адукаванасцю ды маральнасцю, не мелі высокага грамадскага аўтарытэту. Адзін з тагачасных праваслаўных пісьменнікаў у палеміцы з каталіцкімі аўтарамі сам называў сваіх айцоў «невукамі і прастакамі вялікімі». Ніжэйшае духавенства было наогул цёмнае. І гэта не дзіўна, калі ўлічыць, што да другой паловы XVI ст. на ўсёй тэрыторыі Беларусі і Ўкраіны не было ніводнай вышэйшай школы для праваслаўных, а пачатковыя школкі пры манастырах і цэрквах вучылі толькі пісьму ды царкоўным спевам. Невыпадкова навагрудскі ваявода Хведар Скумін–Тышкевіч напісаў, быццам у Палессі ён нават «такіх святароў спатыкаў, якія па–руску чытаць... не ўмелі». Яшчэ горш было з маральнасцю духавенства. Характэрна, што пастанова Берасцейскага сойма 1591 г. спрабавала ўстрымаць святароў ад п'янства, сварак, разборак, двяжэнства і г.д.

Крызіс праваслаўнай царквы Рэчы Паспалітай дасягнуў свайго апагею ў 1570—80-я г. Да ўнутраных прычынаў яго абвастрэння дадаваўся недахоп апекі з боку дзяржавы, якая пры гэтым адкрыта падтрымлівала лацінскі касцёл, а таксама нестабільнасць самога Царгародскага патрыярхату, сувязі Кіеўскай мітраполіі з якім аслаблі. У такой сітуацыі стала набываць асаблівую папулярнасць даўняя ідэя аб'яднання ўсходняй царквы з заходняй, саюз з Рымам. Канфесійная уніфікацыя падданых заўжды адпавядала інтарэсам каралеўскай улады, але цяпер імкненні дзяржаўных палітыкаў супалі з настроямі тых, хто раней мог быць бескампрамісным праціўнікам уніі. Распуста і бязладдзе выклікалі пратэст лепшай часткі праваслаўнага грамадства, што імкнулася праз рэформы паправіць становішча ў царкве, а калі не — то пакінуць яе.

Важным штуршком да пачатку падрыхтоўкі царкоўнай уніі ў Рэчы Паспалітай стаў прыезд канстанцінопальскага патрыярха Ераміі II (1587—1595) і заснаванне ўласнага патрыярхату ў Маскве

ў 1589 г. Апошняе адкрывала перспектыву падпарадкавання Кіеўскай мітраполіі маскоўскаму патрыярху, а епіскапы Беларусі і Ўкраіны не жадалі гэтага. Галасы аб мэтазгоднасці саюзу з каталіцкім касцёлам загучалі і з боку праваслаўных ерархаў ды свецкіх патронаў праваслаўя. Справу паскорылі і рэформы, пачатыя патрыярхам Ерамíем II у Кіеўскай мітраполіі. Знаходзячыся 4 месяцы ў Беларусі і Ўкраіне, ён зняў з пасадаў тут шэраг епіскапаў, прызначыў экзарха, падтрымаў брацтвы і г.д. Такія дзеянні патрыярха выклікалі незадаволенасць духавенства. Знаўца гісторыі уніі Барыс Гудзяк лічыць, што гэты прыезд Ераміі II толькі паскорыў унійныя пачынанні мясцовага епіскапату. Чатыры епіскапы Кірыла Цярлецкі, Гедэон Балабан, Лявонці Пяльчыцкі і Дзіянісі Збіруйскі ўжо ў 1590 г. на Берасцейскім саборы таемна падпісалі дакумент аб згодзе пайсці на унію з Рымам. На гэтым жа саборы, як і на наступным у 1591 г., духавенства прыняло пастановы аб рэфармаванні царкоўнага жыцця. З іх улікам можна дапускаць, што схільнасць праваслаўных ерархаў да уніі сыходзіла з імкнення пакласці канец бязладдзю царкоўнага жыцця. Відаць, не апошнім было і жаданне духавенства пазбавіцца кантролю брацтваў, якія ўмацавалі свой аўтарытэт, а можа, і чыста прагматычныя інтарэсы. Вядомыя словы аднаго з праваслаўных епіскапаў: «Калі паддамося пад рымскага папу, дык не толькі будзем сядзець на епіскапствах нашых да самай смерці, але і на лавіцы сенатарскай засядзем разам з рымскімі біскупамі, і лягчэй адшукаем маёнткі, адабраныя ў царквы». Але сенатарства не было б адно прыватнай выгодай уладык, яно шмат значыла б для ўсёй царквы, бо ўключэнне епіскапаў у сенат адразу павышала б статус праваслаўнай ерархіі і давала б ёй новыя магчымасці.



*Луцкі епіскап*
*і патрыяршы экзарх*
*Кірыла Цярлецкі.*

Сам князь Канстанцін Астрожскі, найбагацейшы ў Рэчы Паспалітай праваслаўны магнат, шукаў шляхоў да ажыццяўлення рэформаў у



мітраполіі. У 1593 г. ён пісаў уладзімірскаму епіскапу Іпацію Пацею пра неабходнасць глыбокіх унутраных пераменаў і прасіў, заехаўшы ў Рым, «парупіцца пра злучэнне цэркваў». Астрожскі выпрацаваў свой праект універсальнай уніі, паводле якога праваслаўная царква захоўвала абрады і ўладанні, а праваслаўнае духавенства ўраўноўвалася ў правах з каталіцкім, прычым абавязковай умовай такой уніі мусіла быць згода на яе ўсходніх патрыярхаў, маскоўскага цара і малдаўскага гаспадара.



*Уладзімірскі епіскап*
*і уніяцкі мітрапаліт*
*Іпаці Пацей (1541—1613).*

Найбольшая прапаганда ідэі царкоўнай уніі сыходзіла з боку езуітаў, якія старанна рыхтавалі яе ідэалагічную аснову. Яшчэ ў 1574—76 г. езуіцкі паleміст Пётр Скарга прысвячаў свае казані «схізме», у якіх трактаваў праваслаўе як «грэцкае адшчапенства», а ўсялякае адшчапенства, на яго думку, пагражае цэласці і ўнутранаму міру ў дзяржаве. У 1577 г. гэтыя казані выйшлі ў Вільні асобнай кнігай пад тытулам «Аб адзінстве касцёла Божага пад адным пастырам», а ў 1590 г. пабачыла свет другое выданне гэтай жа кнігі. Прапагандзе уніі паслужыла таксама праца канстанцінопальскага патрыярха «Абарона Фларэнційскага Сабору», трактат езуіта Бенядыкта Гэрбста, а таксама іншыя выданні палемічнай літаратуры 1580-х г. Распрацаваны езуітамі праект злучэння цэркваў вызначаўся празмернай радыкальнасцю і прадугледжваў сапраўдную інкарпарацыю праваслаўя.

Да абвастрэння супярэчнасцяў паміж прадстаўнікамі розных веравызнанняў спрычынілася рэформа календара. З-за недакладнасці юліянскай каляндарнай сістэмы яшчэ ў пачатку XVI ст. розніца паміж астранамічным і каляндарным годам дасягала 10 дзён. Пасля падрыхтоўкі адпаведнага праекта папа Грыгоры XIII (1572—1585) булаю ад 24 лютага 1582 г. абвясціў увядзенне новага календара, грыгарыянскага. Згодна з ім, пасля 4 кастрычніка адразу мела быць 15 кастрычніка. Новы каляндар у прызначаны папам тэрмін быў уведзены ў большасці дзяржаў Еўропы, у тым ліку ў Рэчы Паспалі-

тай, аднак тут праваслаўныя ерархі патрактавалі гэта як «бяспраўе лацінікаў». Сам патрыярх Ерамія II заклікаў іх не прымаць рэформы. У многіх гарадах (у Беларусі, у прыватнасці, у Полацку) дайшло да сур’ёзных хваляванняў. Стэфан Баторы мусіў выдаваць шэраг пастаноў, каб утрымаць «згоду і спакой паміж рознымі ў веры і ў набажэнствах», гарантуючы праваслаўным далейшае выкарыстанне старога календара, і пры пасярэдніцтве Канстанціна Астрожскага канфлікт быў залагоджаны.



*Царква св. Мікалая, у якой адбыўся Берасцейскі сабор. Фрагмент гравюры XVIII ст.*

Усё ж у выніку пяцігадовых дыскусій згода была дасягнута і ўладыкі Кіеўскай мітраполіі прынялі 33 артыкулы, якія перадаваліся рымскаму папу і каралю Рэчы Паспалітай. Артыкулы аб умовах заключэння уніі адлюстравалі імкненне беларуска–ўкраінскіх епіскапаў увайсці ў саюз з Рымам на роўных. Яны агаворвалі захаванне ранейшай літургічнай традыцыі і абрадавай практыкі, права на ўласны кнігадрук, адукацыю і г.д.

У Рым да папы Клімента VIII (1592—1605) былі дэлегаваныя гарачыя прыхільнікі уніі епіскап уладзіміра–берасцейскі Іпаці Пацей і выхадзец з пінскай шляхты епіскап луцкі Кірыла Цярлецкі. У Кракаве яны скарэктавалі ўмовы аб’яднання цэркваў, у аснову якіх ляглі фармулёўкі Фларэнційскага сабору. У прыватнасці, праваслаўная царква прызнавала прымат папы і прымала новы каляндар, але абрады, дагматы і літургію захоўвала свае ранейшыя. Уладыкам абяцаліся месцы ў сенаце, усяму духавенству — свабоду ад падаткаў, мяшчанам — роўныя правы з каталікамі. Прыехаўшы ў Рым, Іпаці Пацей і Кірыла Цярлецкі ад імя ўсяго праваслаўнага епіскапату выказалі згоду падпарадкавацца папу на сфармуляваных умовах. Потым, пасля дазволу Жыгімонта III, мітрапаліт Міхаіл Рагоза (1589—1596) абвясціў пра скліканне царкоўнага сабору ў Берасці на 6/16 кастрычніка 1596 г. для ўрачыстага абвяшчэння уніі праваслаўнай Кіеўскай мітраполіі з Апостальскай сталіцай.



Здавалася, планам аб’яднання наканаваны поспех. Яго жадалі не толькі каралеўская ўлада, рымская курыя і каталіцкая ерархія, але і прадстаўнікі процілеглага лагера — праваслаўны епіскапат. Аднак грамадства было расколата і ўзрушана. Князь Канстанцін Астрожскі ў1595 г. выступіў з вострай антыуніяцкай адозвай.

На прызначаны дзень у Берасці, апрача праваслаўных епіскапаў, біскупаў і каталіцкіх тэолагаў, сабраліся прадстаўнікі некаторых ваяводстваў, паветаў, гарадоў і праваслаўных брацтваў. Бальшыня дэлегатаў прыехала з Украіны, дзе шляхта адкрыта выступала супраць уніі. Магнаты і шляхта Вялікага Княства Літоўскага практычна ўхіліліся ад удзелу ў саборы. Прыслалі сваіх прадстаўнікоў праваслаўныя жыхары Вільні, Менска, Слуцка ды Пінска. Лагер праціўнікаў падпарадкавання Рыму меў нават зброю, аднак абышлося без яе.

У першы ж дзень нарадаў дэлегаты падзяліліся на дзве непрымірымыя групы, якія ўтварылі два асобныя саборы. Абаронцаў самастойнасці грэцкай царквы ўзначальвалі колішнія ініцыятары уніі — галоўны свецкі апякун праваслаўных кіеўскі ваявода князь Канстанцін Астрожскі, епіскап львоўскі Гедэон Балабан, епіскап пярэмышльскі Міхаіл Капысценскі, а таксама архімандрыт Кіева–Пячэрскага манастыра, экзарх канстанцінопальскага патрыярха Нічыпар Тур. Усе іншыя епіскапы, у тым ліку ўладыка полацкі Герман, пінскі Іона, уладзіміра–берасцейскі Пацей, выступілі за аб’яднанне цэркваў.



*Жыгімонт III Ваза, кароль польскі і вялікі князь літоўскі (1587—1632). Партрэт з майстэрні П.Рубенса (1624).*

Ніякай згоды паміж двума лагерамі проста не магло быць. Мітрапаліт Міхаіл Рагоза і праваслаўны епіскапат ужо на трэці дзень Сабору на нарадзе ў касцёле святога Мікалая склалі афіцыйны акт

аб прызнанні ўлады рымскага папы і далучэнні да каталіцкага касцёла, які быў урачыста абвешчаны 9/19 кастрычніка 1596 г. Тады ж адбылася экскамунікацыя епіскапаў пярэмышльскага і львоўскага, якія не прызналі уніі. Пасля прыняцця акта уніі Кіеўская мітраполія парывала з Канстанцінопалем і мусіла прызнаваць асноўныя дагматы каталіцкага касцёла. Арганізацыйна–тэрытарыяльная структура заставалася непарушнай, ерархія — тая ж, мова богаслужэнняў — ранейшая (царкоўнаславянская), абрад таксама не змяняўся.

Аднак лагер праціўнікаў аб’яднання са свайго боку выступіў з пратэстам і пачаў дамагацца пазбаўлення годнасці мітрапаліта і епіскапаў, якія далучыліся да лацінян. У выніку Берасцейскі сабор прывёў да расколу царквы і грамадства, стаўшы паваротным момантам у гісторыі праваслаўя. Адбылося раздваенне «рускага народа» (Русі) як этнаканфесійнай супольнасці, якая ахоплівала Беларусь і Украіну. Пастаўленая перад саборам мэта была дасягнута адно напалову: фармальна ён зліквідаваў праваслаўную ерархію (хто не прыняў уніі — апынуўся на нелегальным становішчы), пазбавіў праваслаўе правоў і прывілеяў, якія былі перададзены уніяцкай царкве, але масы праваслаўных вернікаў толькі ўмацаваліся ў «схізме». У суме Берасцейскі сабор толькі ўскладніў унутраныя праблемы Рэчы Паспалітай, бо выклікаў сацыяльную дэстабілізацыю і замяшанне ў рэлігійнай свядомасці самых шырокіх колаў.



*Мялеці Сматрыцкі (1577—1633).*

З сабору канфлікт быў адразу перанесены на грамадскае жыццё. Абодва бакі (хто перайшоў у унію і хто застаўся ў праваслаўі) звярнуліся да вярхоўнай улады Рэчы Паспалітай з просьбай прызнаць іх законнасць. Згодна з актам варшаўскай канфедэрацыі 1573 г., права на існаванне мелі абедзве паловы Берасцейскага сабору. Аднак Жыгімонт III Ваза пацвердзіў законныя правы толькі уніятаў. Праваслаўе апынулася па-за законам. Усё гэта стала падставай для ўмяшання ва ўнутраныя справы Рэчы Паспалітай усходніх патрыярхаў і выклікала рэзкае ўзрастанне рэлігійнага фанатызму, узаемнай міжканфесійнай варожасці. Ад прынятага акта уніі вяла простая дарога і да трагічных падзей сярэдзіны XVII ст., хоць, як слушна калісь заўважыў гісторык Юльян Пелеш, зводзіць прычыну казацкіх войнаў да наступстваў Берасцейскага сабору наўрад ці можна. Бо Беларусь, дзе унія пашыралася найбольш паспяхова, доўга заставалася адносна спакойным краем.



Зазначым, што сам акт аб’яднання цэркваў не быў вынікам гвалту над праваслаўнымі ці падкопам езуітаў, як пра гэта шырока пісалася ў расійскай і савецкай гістарычнай літаратуры. Сабор у Берасці не зведаў аніякага знешняга ўціску. Галоўныя прычыны, якія прывялі да яго склікання, хаваліся найперш ва ўнутраным жыцці праваслаўя. Да нечаканага абвастрэння і паглыблення канфлікту прывяло тое, што, як высветлілася, розныя бакі па–рознаму разумелі саму унію: калі праваслаўны лагер спадзяваўся на аб’яднанне дзвюх цэркваў на аснове кампрамісу, дык каталіцкі глядзеў на яе як на інкарпарацыю, падпарадкаванне схізматыкаў «сапраўднай» царкве.

Першыя 10 гадоў барацьба супраць уніі вялася галоўным чынам на соймах. Адразу ж абвастрылася рэлігійная палеміка ў літаратуры, ажывіўся друк кірыліцай. З’явілася цэлая плынь як друкаваных, гэтак і рукапісных палемічных трактатаў, памфлетаў, пасланняў, казанняў, адкрытых лістоў. Агулам з 1577 да 1666 г. у Вялікім Княстве выйшла больш за 140 выданняў «за» ці «супраць» уніі. Цяжка пераацаніць значэнне ўзнятай літаратурнай палемікі для інтэлектуальнага жыцця. Праблемы дагматыкі саступілі ў ёй месца палітычным і агульнакультурным. У нацыянальным плане асабліва важным стаў зварот да гістарычнага мінулага. У напружаных спрэчках апаненты шукалі аргументы ў летапісах і хроніках. Аўтары з асяроддзя Віленскага праваслаўнага брацтва карысталіся як старажытнарускімі, так і маскоўскімі летапісамі, цытавалі Мацея Стрыйкоўскага, Аляксандра Гвагніна, Марціна Кромэра. У антыуніяцкія выданні ўключаліся гістарычныя дакументы, граматы і прывілеі розных эпох і стагоддзяў. Варта асабліва падкрэсліць, што праваслаўнай шляхце пры гэтым уяўлялася пераемнай і цэльнай гісторыя Русі ад часоў Уладзіміра да Рэчы Паспалітай. Звярта-

ючыся да Жыгімонта III, яна прасіла захаваць вольнасці, якія «ўжо 600 гадоў і больш у народзе нашым рускім трываюць».

Так Берасцейскі сабор і прынятая унія апынуліся ў цэнтры грамадскай увагі. Мяжу ж паміж бакамі, якія варагавалі, цяпер далёка не заўсёды вызначала этнічнае паходжанне. Напрыклад, русін Хведар Скумін–Тышкевіч выступаў на баку уніятаў, а паляк Ян Замойскі абараняў праваслаўных. Сярод арыстакратыі і вольнага рыцарства многія прымалі унію па перакананнях. У зацятай палеміцы праваслаўнаму лагеру адчувальна бракавала людзей з вышэйшай адукацыяй. Бадай толькі дзве асобы — полацкі архіепіскап Мялеці Сматрыцкі (1620—1628) і кіеўскі праваслаўны мітрапаліт Пётр Магіла



*Від Магілёва.*
*З гравюры Васіля Вашчанкі (1702).*

(1633—1647) — былі здольныя весці высокаінтэлектуальную дыскусію з апанентамі. У соймавай барацьбе пачатку XVII ст., калі жылі яшчэ традыцыі верацярпімасці, за «рэлігію грэцкую» неаднаразова ўступалася беларуская шляхта. Дамагаючыся лаяльнасці праваслаўных падданых у складанай для каралеўскага двара сітуацыі, сам Жыгімонт III пайшоў на кампраміс і ў 1607 г. абавязаўся даваць урады і царкоўныя ўладанні «выключна шляхцічам рускага роду і чыстай грэцкай веры», што часова стрымала рост радыкальных настрояў. Аднак ужо тады шырыліся і нелегальныя формы барацьбы супраць уніі.



Найбольшы адпор «новая вера» сустрэла з боку гараджан і ніжэйшага духавенства, а таксама часткі праваслаўнай шляхты. У адрозненне ад Украіны, дзе асноўнай сілай антыуніяцкага руху сталі казакі, у Беларусі такую ролю ўзялі на сябе мяшчане і створаныя імі брацтвы, у якія ўваходзіла і шляхта, і клір. Гэтыя аб'яднанні можна лічыць першай грамадзянскай формай нацыянальнай кансалідацыі, парасткамі культурнага жыцця выразна нацыянальнага характару. Найбольшыя з іх Віленскае і Львоўскае брацтвы сталі сапраўднымі арганізацыйнымі цэнтрамі ўсяго антыуніяцкага руху.

У першыя дзесяцігоддзі пасля заключэння уніі лагер яе праціўнікаў няўхільна пашыраўся. Многія з тых, хто пры захаванні ўсходняга абраду і дагматаў згаджаўся на падпарадкаванне папу, былі адштурхнуты ад уніі перабольшанымі чуткамі пра лацінскі дух новай царквы. Непрымальным для многіх уяўлялася і тое, што уніяцкія святары маглі служыць у касцёлах, а каталіцкія ксяндзы — у цэрквах уніятаў. Барацьбу праваслаўных супраць уніі і каталіцкага касцёла падтрымлівалі пратэстанты, якія да сярэдзіны XVII ст. заставаліся патэнцыяльнымі саюзнікамі дызунітаў. З мэтай утварэння рэлігійнага саюзу для барацьбы за вяртанне юрыдычнай сілы пастановам Варшаўскай канфедэрацыі, што абараняла правы некаталікоў, у 1599 г. праваслаўныя і пратэстанты пад патранатам Радзівілаў правялі ў Вільні супольны з'езд, які, аднак, не прывёў да жаданых вынікаў.

Да абвастрэння антаганізму спрычыняліся і шматлікія палітычныя памылкі цэнтральных уладаў пры пашырэнні уніі, а таксама ўмяшанне ўкраінскіх казакоў, што выступілі абаронцамі праваслаўя. Іх неразборлівасць у сродках і сілавыя метады барацьбы правакавалі ўлады таксама на гвалтоўныя дзеянні. У шэрагу гарадоў унія ўводзілася пад націскам, дызуніты цярпелі ўціск, праваслаўныя храмы сілай закрываліся. У Вільні, прыкладам, для вернікаў усходняга абраду засталася толькі царква Святога Духа. Узмацнялася супрацьстаянне, расла нянавісць паміж мяшчанамі, падзеленымі на розныя канфесійныя групоўкі, а уніяцкіх епіскапаў з Беларусі і Украіны па–ранейшаму не дапускалі ў склад сената. Тым часам маскоўскае духавенства імкнулася раздзьмуць канфлікт, пасылаючы жыхарам Рэчы Паспалітай заклікі з папярэджаннем пра небяспеку адрыву ад праваслаўя і прапануючы прасіць абароны ў цара Міхаіла Раманава.

На тэрыторыі Беларусі галоўнымі асяродкамі супраціву новай веры былі Магілёў, Орша, Віцебск, Полацк і Менск, хоць паступова

хваляванні ахапілі і шэраг іншых гарадоў. Жыхары Слуцка, напрыклад, зусім не прызналі акта уніі, а калі ў горад прыехаў уніяцкі мітрапаліт Міхаіл Рагоза (1596—1599) — закідалі яго камянямі. Прыкладна 30 парафіяў Слуцка і яго ваколіцаў неўзабаве пакінула унію. Адразу пасля Берасцейскага сабору антыуніяцкі рух пачаўся і ў Пінску. На пачатку XVII ст. у гарадах Менск, Горадня, Навагрудак многія святары адкрыта вярнуліся ў праваслаўе. Церпячы насілле, пакрыўджаныя спрабавалі знайсці абарону на сойме і ў Вышэйшым Літоўскім трыбунале. У 1623 г. беларуская і ўкраінская праваслаўная шляхта скардзілася ў сенат на тое, што «Русь грэцкага веравызнання ўсходняга абраду» выключаюць з магістратаў, выганяюць з цэхаў, пазбаўляюць храмаў. Паведамлялася, што гэтакі ўціск праваслаўныя церпяць у Менску, Горадні, Берасці, Навагрудку, Слоніме, Пінску, Мазыры, Быхаве, Шклове, Дуброўне і многіх іншых гарадах усходняй Беларусі. Акурат на захадзе Беларусі унія не сустрэла сур’ёзнага супраціву і не выклікала канфліктаў. Там, у зоне цеснага балта–славянскага сужывання, насельніцтва здавён ведала каталіцкі касцёл.



*Уладыслаў IV Ваза, кароль польскі і вялікі князь літоўскі (1634—1648). Медзярыт П.Понціуса паводле партрэта П.Рубенса.*

Асабліва абвастрала антаганізм гвалтоўнае закрыццё праваслаўных цэркваў. У Беларусі такімі стараннямі ў пашырэнні уніі вызначаўся полацкі уніяцкі архіепіскап Язафат Кунцэвіч (1580—1623), які атрымаў дазвол караля на падпарадкаванне ўсіх цэркваў сваёй епархіі. Праваслаўныя жыхары Віцебска ў святочныя дні мусілі праводзіць набажэнствы ў адкрытым полі. Гвалт прыводзіў да адваротных вынікаў. Мяшчане Магілёва ды Оршы закрывалі перад Кунцэвічам гарадскія брамы, пагражалі забойствам. Нават тыя, што былі раней паслухмяныя архіепіскапу, пачыналі бунтаваць супраць «душахвата», як яго называлі мясцовыя жыхары. У 1622 г. з лістом да Кунцэвіча звярнуўся вялікі канцлер Леў Сапега, які востра раскрытыкаваў метады архіепіскапа. «Ні... кароль, ні сенатары, ні Рэч Паспалітая не з'яўляюцца прычынаю скаргаў схізматыкаў, а выключна злоўжыванні ўладай» самога архіепіскапа Кунцэвіча, пісаў ён, ды папярэджваў, што гэта пагражае краіне «вялікім і апошнім пажарам». Аднак Кунцэвіч не змяніў характару сваіх дзеянняў. У выніку ў 1623 г. ён быў забіты раз’юшаным натоўпам у Віцебску і кінуты ў Дзвіну.





*Язафат Кунцэвіч (1580—1623), полацкі уніяцкі архіепіскап.*

Гэтая нечуваная падзея ўскалыхнула Рэч Паспалітую. Сам папа Урбан VIII (1623—1644) запатрабаваў расправы над горадам. Суд і выкананне прыгавору праводзіліся спешна, за тры дні. Віцебск страціў магдэбургскае права, яго ратуша была разбурана на вачах у жыхароў, а званы, якія білі ў набат, паздымалі з усіх храмаў горада. 20 вінаватых пакаралі смерцю і яшчэ 100 асудзілі на смерць завочна. Тым не менш, ужо праз год пасля забойства Кунцэвіча новы полацкі архіепіскап Антоні Сялява пісаў, што ў Віцебску, Магілёве, Полацку і Вільні зноў гатовыя выбухнуць антыуніяцкія бунты.

Урад Рэчы Паспалітай урэшце мусіў афіцыйна прызнаць скасаваную грэцкую мітраполію. Яшчэ ў 1620 г. ерусалімскі патрыярх Феафан, які вяртаўся з Масквы праз Украіну, па настойлівай просьбе ўкраінскай шляхты, мяшчан і казакоў патаемна аднавіў праваслаўную ерархію на чале з кіеўскім мітрапалітам. З гэтага часу ў Беларусі і Украіне існавалі адначасова уніяцкія і праваслаўныя епіскапы і мітрапаліты. Уладыслаў IV Ваза, які не цярпеў прымусу ў справах веры, зняў ранейшую напругу «Артыкуламі супакаення рэлігіі грэцкай», распрацаванымі камісіяй праваслаўных у 1632 г. і пацверджанымі канстытуцыяй сойма 1633 г. Дзяржава вярнула правы і рэлігійную свабоду праваслаўнай царкве, афіцыйна прызнаўшы яе ерархаў, дазволіўшы будаваць храмы, шпіталі, школы, ствараць

друкарні. Была створана супольная камісія, якая мусіла справядліва падзяліць храмы і ўладанні паміж праваслаўнымі і уніятамі прапарцыянальна колькасці іх вернікаў, але да гэтага не дапусціла апостальская сталіца. Тады Ўладыслаў IV пастанавіў уласным дэкрэтам перадаць «схізматыкам» большасць храмаў і царкоўных земляў, і толькі рашучы супраціў мітрапаліта Іосіфа Руцкага (1614—1637) перашкодзіў гэтаму: праваслаўныя атрымалі толькі частку сваіх ранейшых культавых пабудоў. Праваслаўнай мітраполіі і чатыром яе епархіям на тэрыторыі Беларусі і Ўкраіны (Луцкай, Львоўскай, Пярэмышльскай і Мсціслаўска–Магілёўскай) быў нададзены статус легальных. Антыуніяцкая публіцыстыка пайшла на спад, і ў грамадстве ўсталяваўся адносны спакой.

Шукаючы ацэнкі царкоўнай уніі, якая абярнулася расколам «Русі», трэба не забываць пра яе ўплыў на свядомасць шырокіх колаў грамадства Беларусі. Яна з’явілася тым штуршком, што прымушаў сучаснікаў самавызначацца, паглыбляў ролю рэлігійнага, а з ім і нацыянальна–гістарычнага кампанента ў масавай свядомасці насельніцтва.

## VIII.5. Дзве культуры аднаго народа

*Полска квитнет лациною, Литва квитнет русчизною.*
*Без той в Полсце не пребудешь, Без сей в Литве блазен будеш.*
*Той лацина език дает, Та без Руси не вытрвает.*
*Вездзь же юж Русь, иж тва хвала*
*По всем свете юж дойзрала,*
*Весели ж се ты, Русине, Тва слава нигды не згине.*

Гэты верш Яна Казіміра Пашкевіча, выяўлены ў Вільні на рукапісным тэксце Першага Статута, датаваны 1621 г., відавочна, паходзіў з ранейшай эпохі. Такую высокую грамадска–культурную ролю старабеларуская мова выконвала ў Вялікім Княстве Літоўскім у XVI ст., калі была кніжная і размоўная. Вялікія пераўтварэнні ў палітычным і рэлігійным жыцці, увасобленыя актамі Люблінскай дзяржаўнай і Берасцейскай царкоўнай уніяў, у другой палове XVI — пачатку XVII ст. вызначылі якасныя перамены ў развіцці беларускай культуры. Гэтыя часы можна лічыць пераломнымі ў яе гісторыі. Эпоха, калі Літва (усё Вялікае Княства) «квітнела русчызнаю», засталася ў мінулым. Ужыванне званай тады «русчызнаю» старабеларускай мовы ўсё больш абмяжоўвалася коламі простага люду.



Вядомы з агульнай гісторыі падзел культуры кожнага грамадства на элітарную і народную ў рэаліях беларускай гісторыі меў асаблівую выразнасць, бо набыў і нацыянальныя канатацыі. Калі культура сацыяльных вярхоў дастаткова хутка уніфікавалася, рабілася гамагеннай і ўбіралася ў польскія формы, дык жыццё простага люду па самой сваёй прыродзе было кансерватыўным, трымалася мясцовых традыцый, сваёй старой мовы і веры. Бар’ер паміж гэтымі дзвюма культурамі ў Беларусі, спачатку нязначны, сталі хутка паглыбляць унутрыдзяржаўныя канфлікты XVII ст.

Першыя адчувальныя страты беларуская культура панесла ўжо ў часы Рэфармацыі. Згадаем, што пратэстанцкія друкарні, якія да сярэдзіны XVII ст. складалі палову друкарняў усяго Вялікага Княства Літоўскага, выпускалі кнігі галоўным чынам на польскай мове, а большая частка праваслаўнай грамадскай эліты пакінула сваю царкву. Русіны не здолелі адрадзіць сваіх школ, неабходных для інтэлектуальнага супрацьстаяння пратэстантам і каталікам, што і абумовіла заняпад іх царквы. Наступ каталіцкага касцёла прывёў да яшчэ большых стратаў. Контррэфармацыя карысталася падтрымкай дзяржаўных уладаў, найперш самога караля і вялікага князя Жыгімонта III Вазы, які, у адрозненне ад каранаваных папярэднікаў, не вызначаўся талерантнасцю і адкрыта спрыяў касцёлу палітыкай урадавых прызначэнняў. Некаталікі або наогул не прызначаліся на пасады, або атрымлівалі зусім нязначныя ўрады. Калі на пачатку панавання Жыгімонта III больш за дзве трэці складу сенатараў Вялікага Княства Літоўскага складалі пратэстанты і праваслаўныя, дык пад канец ужо ўсе месцы ў сенаце займалі выключна каталікі.



*Строй русіна*
*Рэчы Паспалітай.*
*Дрэварыт XVII ст.*

Авангардам контррэфармацыі з’яўляўся ордэн езуітаў з яго дасканалай сістэмай школьнай адукацыі. Калегіумы і місіі езуітаў паўставалі ў найважнейшых гарадах усёй Беларусі. Да сярэдзіны XVII ст. апрача Віленскай акадэміі было створана яшчэ дзесяць устаноў, у якіх езуіты навучалі беларускую моладзь: у Полацку (1580), Горадні (1584), Нясвіжы (1586), Оршы (1616), Хойніках (1622), Берасці (1623), Пінску (1638), Наваградку (1645), Віцебску (1648) і Смаленску (1626). Яшчэ праз стагоддзе іх было ўжо семнаццаць.

Пасля прыняцця царкоўнай уніі пытанні рэлігіі набылі востры палітычны характар. Пачалося размежаванне грамадства на царкоўна–канфесійнай аснове. Уніяцка–каталіцкаму лагеру супрацьстаяў праваслаўны, але паколькі грэцкую царкву на пачатак XVII ст. ужо ў асноўным пакінула беларускае магнацтва і заможная шляхта, то гэты падзел меў і сацыяльнае вымярэнне. Каталіцызм як вера грамадскіх вярхоў супрацьстаяў веравызнанню дробнай шляхты, сялян і мяшчан. Беларуская шляхта паступова адыходзіла ад мясцовых традыцый, услед за верай пераймала польскую мову, палітычную культуру і сістэму вартасцяў. Але з яе паланізацыяй беларуская мова не спыніла свайго існавання. Яна працягвала развівацца на мяшчанска–сялянскай сацыяльнай аснове. Паволі культура першага лагеру стала адрознівацца ад культуры другога не толькі веравызнаннем і мовай, але і зместам ды эстэтыкай. Канфесійны раскол выклікаў такія глыбокія перамены, якія вялі да страты народам цэльнага нацыянальнага аблічча, да найбольшага заняпаду беларускай нацыянальнай культуры. Такім чынам, у адрозненне ад першай стадыі каталіцызацыі, якая адбывалася ў часы Рэфармацыі і закранала толькі сацыяльныя вярхі грамадства, у XVII ст. канвертацыя



*Строй шляхціча Рэчы Паспалітай. Дрэварыт XVII ст.*



ў каталіцтва суправаджалася пераходам на польскую мову, а каталіцкая вера пачала атаясамляцца з польскай культурай. Калі на працягу XV і XVI ст. палова дэкрэтаў, ардынацыяў і лістоў вялікага князя была напісана на старабеларускай мове, і толькі 5% па–польску, дык у першай палове XVII ст. склалася амаль адваротная сітуацыя: мова большай паловы прывілеяў была ўжо польская. Такая ж пераарыентацыя адбылася і сярод духавенства: калі ў часы Скарыны нават каталіцкія святары на Беларусі маглі карыстацца старабеларускай мовай, дык пасля царкоўнай уніі і праваслаўныя часцей пераходзілі на польскую. Згодна з даследаваннем французскага гісторыка Антонія Мартэля, калі да 1605 г. у палеміцы вакол уніі пераважала «руская» мова, дык пасля 1626 г. нават антыуніяцкія творы друкаваліся ўжо толькі па–польску. Польская мова стала дамінаваць і ў актавых кнігах беларускіх гарадоў, у якіх звычайна па–старабеларуску пісаўся толькі пачатак і канец дакумента, на яе пераходзіла не толькі шляхта, але і заможнае беларускае мяшчанства. Пашырэнню пальшчызны ў гарадах спрыяла даступнасць і папулярнасць польскамоўных кніг. Як сведчаць дакументы, у XVII ст. польскія выданні трымалі ўжо многія беларускія мяшчане. Мелі іх у сваіх кнігазборах, напрыклад, віленскі бурмістр Сцяпан Лябедзіч, купец Павел Казабуцкі, слуцкі бурмістр Якуб Лапінскі або берасцеец Гурын Федаровіч, які ў тастаменце адпісаў сваёй радні і праваслаўнай царкве «ўсе польскія кніжкі».



*Тытульны аркуш выдання друкарні Віленскага брацтва “Лямант на смерць Лявонція Карповіча” (1620).*

Напружаная царкоўна–рэлігійная барацьба, якая пачалася пасля 1596 г., умацоўвала атаясамленне праваслаўнай веры і грэка–візантыйскага абраду з беларускай і ўкраінскай культурай, з «рускай» (паводле тагачаснай тэрміналогіі) народнасцю. Рэлігійная апазіцыйнасць успрымалася як нацыянальная, канфесійны фактар набываў значэнне нацыянальнага маркера. Між тым праваслаўная, «усходняя» традыцыя з’ўлялася толькі часткай культуры народа, яго сярэдніх і ніжэйшых сацыяльных колаў. Куль-

тура ж грамадскіх вярхоў Беларусі развівалася пераважна ў сферы лацінамоўнай «заходняй» традыцыі. Контррэфармацыя прынесла ў край высокі ўзровень рэгулярнай схаластычнай адукацыі, лацінскую мову і цэлую плынь еўрапейскіх кніжных выданняў. Шляхціч у XVII ст. сутыкаўся з лацінай бадай штодзённа. Яна была мовай школы і навукі, мастацтва і дыпламатыі, касцёльных набажэнстваў і соймавых прамоў.

Галоўнымі асяродкамі заходнееўрапейскай культурнай традыцыі з’яўляліся езуіцкая акадэмія ў Вільні ды калегіумы езуітаў у многіх гарадах і мястэчках краю. Сярод вядомых прафесараў і выпускнікоў гэтых устаноў было і нямала беларусаў з паходжання, такіх, як выхадзец з Полаччыны Саламон Рысінскі (1560—1625), што стаў лацінамоўным пісьменнікам і філосафам, першым збіральнікам беларускіх прымавак і служыў пры двары Радзівілаў. Непасрэдную сувязь з Беларуссю мела і дзейнасць самага славутага ў ВКЛ прамоўцы Казіміра Віюка Каяловіча (1617—1674) — рэктара Віленскай ізуіцкай акадэміі, а потым Полацкага калегіума, а таксама «хрысціянскага Гарацыя» Мацея Казіміра Сарбеўскага (1595—1640), выкладчыка езуіцкіх калегіумаў у Полацку, Нясвіжы і Вільні, аўтара трактара «Пра палітычныя супольнасці людзей» правазнаўцы Аляксандра Алізароўскага (1610—1659), філосафа Казіміра Лышчынскага (1634—1689), напісаўшага згубны для сябе трактат «Аб неіснаванні Бога», і шмат каго іншага. Сваёй вяршыні лацінамоўная літаратура Беларусі дасягнула пазней, у XVIII ст., у творчасці найбуйнейшых паэтаў–лацiністаў беларускага паходжання Міхала Карыцкага (1714—1781) і Францішка Князьніна (1750—1807). Гэтыя вядомыя творцы, як і шэраг іншых, карыстаючыся лацінскай мовай, узбагачалі скарбамі багатай антычнай спадчыны і нацыянальную культуру Беларусі.

Апрача езуіцкіх навучальных устаноў у Беларусі існавалі і пратэстанцкія школы. Асабліва вядомай была евангелісцкая гімназія ў Слуцку, заснаваная тут разам з евангелічным зборам у 1617 г. князем Янушам Радзівілам. Захаваўся статут гэтай школы, надрукаваны ў 1628 г. у Любчы, з якога відаць, што, нягледзячы на поспехі контррэфармацыі, кіраўнікі слуцкай гімназіі трымаліся гуманістычных прынцыпаў адукацыі. Адзначыўшы нарастанне рэлігійнай нецярпімасці, яны дэкларавалі, што для іх установы веравызнанне і станавая прыналежнасць не маюць значэння.

Разам з контррэфармацыяй на ўсход рухалася Барока як сістэма поглядаў, як з’ява духоўнай і эстэтычнай культуры. У Беларусі гэты стыль найлепш выявіўся ў дойлідстве і выяўленчым мастацтве, хоць і тут знайшло адбітак размежаванне на Барока «заходняе», заснаванае на традыцыях заходнееўрапейскай культуры, і «ўсходняе», якое больш засвойвала ўсходнеславянскія рэгіянальныя традыцыі. Найбольш істотныя змены перажывала ў гэтую эпоху літаратура, жывапіс, архітэктура.



Прыняцце Берасцейскай царкоўнай уніі надало асаблівы штуршок літаратурнай творчасці — як арыгінальнай, так і перакладной (у асноўным са старaславянскай на «простую», зразумелую ўсім мову). Стаўшы галоўным сродкам ідэалагічнай барацьбы, літаратура перыяду контррэфармацыі развівалася найперш у жанрах публіцыстыкі. Гэта шматлікія палемічныя трактаты, казанні, пасланні, памфлеты, лісты. Варта асобна адзначыць «Фрынас» Мялеція Сматрыцкага (1572—1630), «Апокрысіс» Хрыстафора Філалета (?—1624), «Казанні» Лявонція Карповіча (1580—1620).

У гэты перыяд літаратура перажывала пераход ад Сярэднявечча да Новага часу, што выявілася ў дэмакратызацыі і індывідуалізацыі мастацкай творчасці ў цэлым, у размыванні яе сярэднявечнага сінкрэтызму, жанравай дыферэнцыяцыі. У Беларусі з’явіліся творы зусім новага жанру — дыярыушы, дзённікі, мемуары. У адрозненне ад ранейшых летапісцаў, іх аўтараў цікавіла не толькі гісторыя дзяржавы і вялікія палітычныя падзеі, але і лёс асобнага чалавека, яго роля ў грамадска–культурным жыцці. У такіх творах справавую мову стала заступаць жывая, народная, насычаная прымаўкамі і параўнаннямі. Сярод першых помнікаў літаратуры гэтага тыпу — «лісты» аршанскага старасты Філона Кміты–Чарнабыльскага (1530—1587), мемуары наваградскага падсудка Хведара Еўлашоўскага (1546—1619), Баркулабаўскі летапіс, дыярыуш наваградскага шляхціча Самуэля Маскевіча (1580—1642), а таксама дыярыуш праваслаўнага манаха Апанаса Філіповіча (1597—1648) і інш.

Характэрна, што выступаючы супраць каталіцтва і уніі, праваслаўныя ідэолагі ўмацоўвалі старыя, візантыйска–славянскія традыцыі, амаль забытую «славенскую» (царкоўнаславянскую) мову, абмяжоўваліся чыста рэлігійнымі праблемамі. Абаронцы праваслаўя, за выняткам хіба Герасіма Сматрыцкага, Лявонція Карповіча, Апанаса Філіповіча, манахаў Супрасльскага манастыра і некаторых іншых пісьменнікаў брацка–плебейскай плыні, пісалі свае творы спачатку па–царкоўнаславянску, а пазней — па–польску. Так што ў сферы пісьмовай культуры старабеларускай мове супрацьстаялі не толькі лацінская і польская, але і царкоўнаславянская. Апошняя, зусім далёкая ад рэальнага жыцця, была

ўжо незразумелая шырокаму грамадству, асабліва яго ніжэйшым колам. Гэтая акалічнасць мела самае непасрэднае значэнне для моўнай пераарыентацыі аўтараў–палемістаў, якая адбылася ў 1620-х г., калі большасць іх арыгінальных твораў пачала выдавацца па–польску.


*Сімяон Полацкі (1629—1680).*

Асаблівай увагі заслугоўвае творчасць першага прафесійнага беларускага паэта XVII ст. Самуіла Емяльянавіча Пятроўскага–Сітніяновіча (1629—1680), больш вядомага пад манаскім імем Сімяона Полацкага. Выпускнік Кіева–Магілянскага калегіума, ён адвучыўся потым у Віленскай езуіцкай акадэміі, затым у полацкіх езуітаў. Пісаў па–старабеларуску, па–польску і па–лацінску (акафісты, трапары, кандакі, праваслаўную літургічную лірыку). Яго вершы сталі адным з першых узораў літаратуры высокага мастацкага гучання. Але пад час вайны 1654—1667 г. Сімяон Полацкі, працуючы ў полацкай брацкай школе, вітаў маскоўскага цара, рыхтаваў для яго публічныя дэкламацыі, і потым, баючыся заставацца ў краі, перасяліўся ў Маскву. З яго ініцыятывы там паўстала так званая Верхняя друкарня, якая амаль не падлягала кантролю царкоўных ерархаў. Адзін з самых адукаваных людзей эпохі, Сімяон Полацкі прынёс у Маскоўскую дзяржаву пачаткі паэзіі, прышчапіў свецкае мастацтва заходніх узораў на глебу расійскай культуры. У Маскве ён выявіў сябе і як таленавіты педагог, стварыўшы там школу «лацінікаў» — прыхільнікаў заходнееўрапейскай адукацыі.

Для беларускамоўнай літаратуры і ўсёй культуры пераход мясцовых заможных родаў на польскую мову быў раўназначны страце сваіх мецэнатаў. У грамадстве не засталося сілаў, зацікаўленых у



яе патранаванні. Такія асобы, як адданы праваслаўю магнат Багдан Статкевіч, дзякуючы апякунству якога з 1630-х г. дзейнічала Куцеінская друкарня, ці Багдан Агінскі, заснавальнік праваслаўнай друкарні ў Іўі, што функцыявала ў 1611—1631 г., засталіся ў Беларусі выключэннем. Таму і так званага «высокага» Барока беларускамоўная літаратура не зведала. Развіваліся толькі школьная драматургія ды панегірычнае вершаскладанне. Элітарызацыі беларускамоўнай літаратуры проста не магло адбыцца, бо яна не развівалася ў элітарнай сферы. З гэтай прычыны старабеларуская мова нават не засвоіла таго багатага запасу адцягненай (абстрактнай) лексікі, які мела царкоўнаславянская, і засталася мовай «простай». Звычайна на ёй распрацоўваліся жанры «нізкага» стылю, ёю карысталіся героі з асяроддзя простага люду, побытавыя персанажы інтэрмедый, камедый і г.д. Такія народныя сцэнкі ставіліся ў батлейках — новай форме тэатральнага мастацтва, што з’явілася ў канцы XVI ст. як вынік сінтэзу сярэднявечных містэрый і народнага лялечнага тэатра (на Ўкраіне гэта вертэп, у Польшчы — шопка). Адным з галоўных герояў інтэрмедый з’яўляўся селянін, які размаўляў па–беларуску і быў супрацьпастаўлены польскамоўнаму пану, чыноўніку ці гандляру.

Адлюстраваннем светагляду сялянства, у пераважнай большасці яшчэ праваслаўнага, заставаўся фальклор. Асаблівасцю вуснапаэтычнай творчасці беларусаў стала тое, што пры неразвітасці гістарычна–гераічнага эпасу беларускі казачны эпас з’яўляецца адным з самых багатых у славянскім свеце. Найбольш характэрныя для яго казкі пра асілкаў–волатаў, якія перамагаюць злых пачвараў. Важнае месца ў беларускім фальклоры займелі таксама гістарычныя песні, у якіх адлюстраваліся даўнія падзеі барацьбы з чужынцамі, набегі крымскіх татараў і войны з Масквой. Татарскія наезды сталі самай значнай тэмай гістарычных баладаў беларускага народа. А вось барацьба з нямецкімі рыцарамі ў фальклоры зусім не адлюстравана. У найбагацейшым цыкле каляндарнай сямейна–абрадавай паэзіі асаблівае месца займаюць валачобныя і вясельныя песні, невядомыя ў фальклорнай спадчыне многіх іншых народаў.

Высокага ўзроўню развіцця ў часы контррэфармацыі дасягнуў беларускі жывапіс. Іканапіс, які заставаўся дамінавальным жанрам выяўленчага мастацтва, перажываў, з аднаго боку, вяртанне візантыйскіх і старажытнарускіх канонаў, з другога — пачатак працэсу фалькларызацыі, што асабліва выразна праявілася пазней, у

XVIII ст. Спецыфічныя рысы мясцовага іконапісання, якія ўпершыню выявіліся яшчэ ў XVI ст., сталі афармляцца ў беларускую традыцыю сакральнага мастацтва. Самым распаўсюджаным абразом у XVII ст. тут быў багародзічны (Дзева Марыя — адзіная заступніца людзей). Сюжэт «Страшнага суда» ў беларускіх абразах цалкам адсутнічаў, а біблейскія падзеі мастак адаптаваў да мясцовага асяроддзя. У свецкім жывапісе з канца XVI ст. і да канца існавання Рэчы Паспалітай галоўным стала партрэтнае мастацтва. Адметныя вобразы «сармацкага» партрэта выразна ўвасобілі драматычную гісторыю гэтай дзяржавы.

Важныя змены ў першай палове XVII ст. адбыліся і ў беларускай архітэктуры. У горадабудаўніцтве пачаўся пераход ад сярэднявечнай радыяльна–кальцавой планіроўкі да рэгулярнай з простакутнымі кварталамі, з ансамблевай забудовай гандлёвых плошчаў. У манументальным дойлідстве дайшло да арганічнага сінтэзу італьянскіх архітэктурна–мастацкіх прыёмаў і мясцовых традыцый. Пасля таго, як у Нясвіжы ў 1584—93 г. выкліканы Мікалаем Радзівілам італьянскі архітэктар Ян Марыя Бернардоні (1641—1605) стварыў першы ў Рэчы Паспалітай і другі ў свеце барочны езуіцкі касцёл паводле ўзору знакамітага храма Эль Джэзу, у ВКЛ пачала фармавацца свая школа барока.

Арыгінальныя дынамічныя ярусныя кампазіцыі, у якіх спалучаліся і рэнесансавыя, і барочныя формы, паўсталі і ў народным драўляным дойлідстве. Пашырэнне эстэтычных прынцыпаў барока на традыцыйнае будаўніцтва прывяло да з’яўлення новага тыпу храма — двухзрубнай базілікі з плоскім фасадам. Значныя змены адбыліся ў арганізацыі інтэр’ера і формы даху такіх храмаў. Захаваныя выявы драўляных цэркваў Віцебшчыны і Палесся сведчаць, што там склаліся цалкам своеасаблівыя архітэктурныя школы. Адметныя формы ў XVII ст. набыло праваслаўнае дойлідства і на Магілёўшчыне, дзе будаваліся цэрквы барочнага тыпу. Элементы ж вялікарускай царкоўнай архітэктуры (какошнікі, цыбулепадобныя галоўкі, закамары ды інш.) былі зусім нехарактэрныя для Беларусі.

# IX. Ад велічы да заняпаду

## IX.1. Дзмітрыяда і барацьба за Смаленск

Першы манарх з дынастыі Вазаў не карыстаўся папулярнасцю сярод палітычнага народа і не пакінуў пасля сябе такой памяці, як Ягайлавічы або Стэфан Баторы. Яго збліжэнне з Габсбургамі, злоўжыванне ўладай, нецярплівасць да іншаверцаў выклікалі недавер шляхты да каралеўскага двара. Амбіцыі Жыгімонта III неўзабаве ўцягнулі Рэч Паспалітую ў новыя войны. Дэтранізаваны ў 1599 г. шведскім парламентам, ён не збіраўся канчаткова губляць шведскую карону і пайшоў на сілавое вырашэнне спрэчак. Каб атрымаць падтрымку шляхты, Жыгімонт III ахвяраваў Рэчы Паспалітай землі Эстоніі, занятай шведамі, што абярнулася вайной са Швецыяй. У 1600 г. шведы ўвялі армію ў Прыбалтыку, занялі шэраг гарадоў і сталі пагражаць Рызе. У цяжкай вайне серыю перамог над імі атрымалі гетманы Крыштаф Радзівіл Пярун (1589—1603) і Ян Кароль Хадкевіч (1605—1621). Апошні 27 верасня 1605 г. бліскуча разграміў вялікую армію Карла IX пад Кірхгольмам (цяпер Саласпілс). Гэты трыумф праславіў імя гетмана на ўсю Еўропу, але радыкальных пераменаў у вайне не адбылося. Беларуска–літоўскія сілы мусілі працягваць дзеянні ў надзвычай цяжкіх умовах, пры недахопе фінансаў і непапулярнасці вайны.



*Жыгімонт III Ваза.*
*Партрэт Я. Лаўруса.*

Супраць палітыкі караля, абвінавачанага ў імкненні да абсалютызму, выступіла моцная апазіцыя, узначаленая гарачым каталіком кракаўскім ваяводам Мікалаем Зебжыдоўскім і лідэрам кальвіністаў падчашым літоўскім Янушам Радзівілам. Дайшло да грамадзянскай вайны паміж рэспубліканцамі і манархістамі, вядомай у гістарыяграфіі як рокаш Зебжыдоўскага (1606—1607). Братазабойчая бітва адбылася 6 ліпеня 1607 г. пад Гузавам. З боку караля на правым крыле супраць Януша Радзівіла выступіў са сваім інфлянцкім войскам герой Кірхгольма гетман Ян Кароль Хадкевіч. Ракашане ўрэшце пацярпелі і ратаваліся ўцёкамі, аднак іх паражэнне не ўмацавала ўладу манарха. У 1608 г. лідэры рокашу папрасілі прабачэння і сойм пачатку наступнага года дэклараваў амністыю ўсім ракашанам. Горкі вопыт сутыкнення крайніх пазіцый паспрыяў умацаванню аўтарытэту сойма і лагеру прыхільнікаў існавалай ураўнаважанай сістэмы ўлады (*monarchia mixta).* Знаўца праблемы гісторык Анджэй Каміньскі называе іх канстытуцыялістамі — у адрозненне ад прыдворных манархістаў і павятовых рэспубліканцаў, першыя з якіх імкнуліся ўмацаваць каралеўскую ўладу, а другія хацелі ўзяць пад свой кантроль і манарха, і сенат, і ўвесь сойм.

Новая вайна пачалася неяк зусім непрыкметна. Увосень 1604 г. з тэрыторыі Украіны на Маскву з 3 тысячамі ахвотнікаў вырушыў як быццам цудам ацалелы царэвіч Дзмітры — сын Івана IV Васілевіча, што, як лічылася, быў забіты ў 1591 г. У карыслівых інтарэсах





*Ян Кароль Хадкевіч, вялікі гетман*
*(1605—1621).*

на папярэдне складзеных умовах яго падтрымалі князі Вішнявецкія ды сандамірскі ваявода Юры Мнішак, а таксама сам Жыгімонт III Ваза, які спадзяваўся шляхам умяшання ва ўнутраныя справы царства прынамсі ўключыць Маскву ў антышведскую кааліцыю. Палітычны народ Рэчы Паспалітай паставіўся да справы Самазванца адмоўна, асабліва ў Беларусі і Літве. На галоўным з'ездзе ў Дзевяткавічах шляхта ВКЛ пастанавіла з Масквой ва ўсім захоўваць мір. У лагеры першага Дзмітрыя Самазванца апынуўся адно невялікі аддзел дробнай шляхты з Беларусі.

Пасля раптоўнай смерці цара Барыса Гадунова (23 красавіка 1605), які рыхтаваў супраць Рэчы Паспалітай міжнародную кааліцыю, плануючы ўключыць у яе Імперыю Габсбургаў, Сяміграддзе і Малдавію, дзякуючы падтрымцы маскоўскага баярства Самазванец увайшоў у Маскву і каранаваўся ў Крамлі. Урад Рэчы Паспалітай паспрабаваў скарыстаць новую сітуацыю і заключыць ваенны саюз з Расіяй. Пасольства Аляксандра Гасеўскага прывезла цару Дзмітрыю праект «вечнага злучэння» дзвюх дзяржаў, асноўныя пункты якога паўтаралі той жа праект уніі, які прадстаўляў у Крамлі ў 1600 г. канцлер Леў Сапега. Але ўжо праз год у Маскве выбухнула паўстанне: фальшывы Дзмітры і сотні яго наймітаў

загінулі, іншыя апынуліся ў палоне. Адносіны з Масквой зноў рэзка абвастрыліся. Шляхта беларускіх паветаў баялася маскоўскай агрэсіі як помсты за авантуру першага Самазванца. Крызіс, выкліканы паўстаннем, даў падставу гаварыць пра знешнюю небяспеку для Рэчы Паспалітай, і праўрадавыя колы выкарысталі сітуацыю для прапаганды прэвентыўнай вайны. Тады і актуалізавалася справа другога Самазванца — Андрэя Нагога, які вясной 1607 г. з'явіўся ў Шклове і абвясціў сябе новым цудам уратаваным «царом Дзмітрыем». Перайшоўшы мяжу, ён апынуўся ў Старадубе і, сабраўшы войска з авантурыстаў, таксама рушыў на Маскоўскае царства. У Вялікім Княстве яго падтрымалі менскі ваявода Ян Пац і ўсвяцкі староста Ян Пётр Сапега, які павёў да Самазванца II аддзел нанятых шляхціча.

Новы царэвіч выклікаў сімпатыі шырокіх колаў у самой Расіі, ахопленай тады сялянскай вайной Івана Балотнікава. Паўстанцы, якія пацярпелі паражэнне ад арміі цара Васіля Шуйскага, спадзяваліся на дапамогу з боку Рэчы Паспалітай і накіравалі пасланца да караля. Не атрымаўшы адказу з Варшавы, яны агітавалі «людзей рыцарскіх» у Мсціславе, Оршы, Менску і іншых беларускіх гарадах, заклікалі падтрымаць «цара Дзмітрыя», абяцаючы за гэта вялікую плату. Аднак беларускае рыцарства не выяўляла вялікай цікавасці да такога заробку. Згаданы Ян Сапега ў сваім дзённіку засведчыў, што вярбоўка ахвотнікаў у Беларусі была цяжкай. Да Дзмітрыя далучаліся ў асноўным аматары прыгодаў і маладыя шляхцічы з бедных сямей, якія спадзяваліся за кошт ваеннай здабычы і рыцарскіх заслугаў паправіць сваё становішча. Як зазначыў аўтар Баркулабаўскага летапісу, гэта быў «люд гулящий, люд свовольный». Але найболей у лагеры самазванага царэвіча сабралася самой «масквы». У пачатку 1608 г. Дзмітры II кантраляваў ужо палову Маскоўскага царства і быў ледзь спынены арміяй Шуйскага перад самай сталіцай, у вёсцы Тушын.

Маскоўскі цар папрасіў дапамогі ў Швецыі і ў сакавіку 1609 г. у Выбаргу заключыў з Карлам IX ваенны саюз, скіраваны супраць Рэчы Паспалітай. Шведскія палкі Дэлагардзі і Горна далучыліся да арміі Міхаіла Скопіна–Шуйскага. У тэксце дамовы цар тытулаваў сябе «князем Полацкім», што сведчыла пра планы адваявання зямель, замацаваных у складзе ВКЛ артыкуламі Ям–Запольскага міру 1582 г. Апраўдваючыся небяспекай маскоўска–шведскага альянсу,





*Аблога Смаленска. Гравюра Г.Келера. 1610 г.*

але больш кіруючыся асабістымі амбіцыямі, Жыгімонт III насуперак волі вальнага сойма распачаў афіцыйную вайну супраць Масквы. У стылі кулуарнай палітыкі першага Вазы рашэнне прымалася на закрытай нарадзе ў сенаце, а шляхецкім паслам засталося толькі прыняць яго да ведама. Увосень 1609 г. праз Беларусь на Смаленск кароль ужо вёў рэгулярную армію.

Аблога першакласнай смаленскай фартэцыі, у якой бараніўся вялікі гарнізон Міхаіла Шэіна, аказалася неспадзявана цяжкай і задоўжылася. І калі з Масквы на дапамогу Смаленску выйшла войска Дзмітрыя Шуйскага, дапоўненае шведскімі сіламі Горна, усё магло скончыцца трагічна. Аднак 4 ліпеня 1610 г. каронны гетман Станіслаў Жулкеўскі бліскуча разграміў гэтую армію пад Клушынам і сам рушыў на Маскву. Маскоўскае баярства звергла цара Васіля Шуйскага. Баярскі ўрад падпісаў з пераможцам папярэдняе пагадненне пра саюз Рэчы Паспалітай з Маскоўскай дзяржавай і пра абранне царом пятнаццацігадовага каралевіча Ўладыслава. Па

настойлівай просьбе баярства гетман увёў свае войска ў Маскву, каб уберагчы яе ад тушынцаў. А праз год штурмам быў здабыты і вернуты ў склад ВКЛ стратэгічны Смаленск, страчаны яшчэ ў 1514 г.

Аднак у 1612 г. у Маскве выбухнула паўстанне супраць інтэрвентаў. Да сталіцы прыйшло расійскае апалчэнне на чале з ніжагародскім старастам Кузьмой Мініным і князем Дзмітрыем Пажарскім. Заціснутая ў Крамлі польская залога пасля доўгай абароны мусіла капітуляваць. Маскоўскія баяры абралі царом Міхаіла Раманава і актывізавалі ваенныя дзеянні, пераймаючы ініцыятыву.

Тым часам вялізныя падаткі і ваенныя спусташэнні давялі краіну да заняпаду. Самым цяжкім было становішча Беларусі, землі якой з'яўляліся плацдармам інтэрвенцыі. Яе запаланілі купы неаплочаных жаўнераў, якія стварылі канфедэрацыі і, дамагаючыся «крывава заганараваных заслугаў», бязлітасна рабавалі насельніцтва, палілі гарады і пагражалі паходам на сталіцу. Леў Сапега яшчэ ў 1610 г. скардзіўся, што ўзбунтаваныя жаўнеры ўвесь край «у нішто абярнулі», аднак у наступныя гады іх разбойная сваволя стала сапраўдным пракляццем. У дадатак з 1613—14 г. землі Беларусі беспакарана ваявалі палкі новага маскоўскага цара і шматтысячныя банды казакоў. Свае ж войска, выйшаўшы з падпарадкавання дзяржаўнай уладзе, нават не спрабавала абараніць край. Востра крытыкуючы палітыку двара, паслы ад паветаў Беларусі і Літвы на вальных соймах неаднаразова патрабавалі выкрыць прозвішчы аўтараў вайны і прыцягнуць іх да адказнасці. Шляхта не жадала падтрымліваць незаконную (распачатую без згоды ўсіх станаў) вайну, але не магла і зусім адмовіцца ад падаткаў на ваенныя патрэбы, каб не пакінуць Рэч Паспалітую безабароннай і не давесці яе да згубы.

«Русь панесла страты, якіх не ведала ўжо 200 гадоў», — адзначалася ў 1613 г. на першым у гісторыі Рэчы Паспалітай надзвычайным сойме, сабраным для выратавання дзяржавы. Лісты сучаснікаў сведчаць, што настроі тых гадоў набліжаліся да апакаліпсічных. Шляхта ўсё больш настойліва патрабавала знайсці і пакараць ініцыятара вайны, а галоўнае — хутчэй скончыць авантуру. Асабліва характэрны па настроі ліст рыцарства Аршанскага павета, падпісаны трыццаццю чалавекамі, сярод якіх — Ян, Геранім і Аляксандр Хадкевічы, Аляксандр Сапега, Мікалай Глябовіч і іншыя вядомыя асобы. Яны заявілі, што пад уладай Жыгімонта III Вялікае Княства Літоўскае дайшло да поўнага разбурэн-



ня, і невядома, ці можна наогул разлічваць на дапамогу і абарону свайго законнага ўладара. Аршанскія шляхцічы спраўна сплочвалі падаткі на ахову межаў дзяржавы, але гэта не гарантавала іх бяспекі. Прычынай усіх бедаў стаў паход караля на Маскоўскае царства, заяўлялі яны, бо ў выніку авантуры межы дзяржавы адкрыліся і вораг пачаў «беспакарана паліць вёскі і гарады, забіваць і выводзіць у палон людзей». Востра крытыкуючы манарха, аршанцы заклікалі яго спаўняць свае абавязкі ў дачыненні да падданых і арганізаваць належную абарону.



*Уладыслаў IV. Партрэт невядомага мастака XVII ст.*

Яшчэ праз некалькі гадоў галоўны з'езд беларуска–літоўскай шляхты сцвердзіў, што «ўжо далей ВКЛ такога цяжару вайны Маскоўскай цярпець не можа!» Каб хутчэй і хоць з якой перамогай скончыць авантуру, у 1617 г. у апошні паход на Маскву павёў войска каралевіч Уладыслаў і вялікі гетман Ян Хадкевіч, да якіх далучыліся і ўкраінскія казакі гетмана Пятра Сагайдачнага. Спробы зноў заняць сталіцу не мелі поспеху, затое падштурхнулі маскоўскі ўрад да перамоў. У пачатку 1619 г. у Дэвуліне бакі падпісалі дамову аб перамір'і на 14 з паловай гадоў, паводле якой у склад Вялікага Княства Літоўскага акрамя Смаленска ўвайшлі Мажайск, Дарагабуж і Вязьма, а да Кароны адышлі землі Чарнігаўская і Северская. Каралевіч Уладыслаў заставаўся з тытулам маскоўскага цара.

Падсумоўваючы вынікі гэтай авантурнай вайны, у 1618 г. многія шляхецкія сoймікі тэрыторыі сучаснай Беларусі ў сваіх ухвалах адзначылі, што яна народу і айчыне «ўсялякае зло прынесла, з дастаткаў яе злупіла і да чужых народаў у ганьбу ўправіла». Горкі вопыт

Дзмітрыяды, як і разгром апазіцыі ў бітве пад Гузавам, пашырыў глыбокі недавер шляхецкіх колаў да ўрада і выклікаў супраціў рыцарства ўсялякім спробам рэфармаваць тагачасны дзяржаўны лад. З гэтага часу шляхта цвёрда адстойвала галоўныя прынцыпы свайго ладу — забарону пачынаць вайну без дазволу ўсяго сойма і захаванне непарушнымі старых правоў і звычаяў Рэчы Паспалітай.

Яшчэ да завяршэння Дзмітрыяды праз рабаўнічыя напады казакоў на турэцкія ўладанні дайшло да трэцяй вайны — адкрытага канфлікту з Асманскай імперыяй. У 1620 г. туркі разграмілі пад Цэцурай сілы славутага кароннага гетмана Станіслава Жулкеўскага і ўварваліся на тэрыторыю Ўкраіны. На наступны год султан Асман II абяцаў спустошыць усю Рэч Паспалітую. Толькі гераізм абаронцаў лагера пад Хацінам на Днястры, дзе злучанымі сіламі да апошняй хвіліны жыцця кіраваў 60–гадовы гетман Ян Кароль Хадкевіч, скаваў велізарную турэцкую армію і дазволіў у кастрычніку 1621 г. заключыць з Портай мір. Падпісаны трактат пакінуў нязменнай ранейшую мяжу па Днястры і памысна вывеў Рэч Паспалітую з небяспечнай вайны.



*Густаў II Адольф, шведскі кароль (1611—1632). Партрэт П.Понціуса.*

Найцяжэйшай заставалася сітуацыя ў Інфлянтах. Пасля замірэння з Масквой шведскі кароль Густаў II Адольф заручыўся саюзам з Нідэрландамі (1614) і Ганзой (1615) ды ў 1617 г. узнавіў вайну за панаванне над Балтыкай. Сілы палявога гетмана Крыштафа Радзівіла, які мусіў трымаць абарону, былі настолькі слабыя, што ён заміры ўся з непрыяцелем на 1618—1620 г. Як толькі замірэнне скончылася, а Рэч Паспалітая канцэнтравала ўсе



сілы для адпору туркам, шведы высадзіліся ў вусці Дзвіны і аблажылі Рыгу. Увосень 1621 г. слабая залога паддалася. Валоданне Рыгай прадвызначала панаванне над усімі Інфлянтамі. Каб уратаваць край ад жудаснага спусташэння, у жніўні 1622 г. гетман Крыштаф Радзівіл без ведама караля падпісаў са шведамі сепаратнае замірэнне. Густаў II Адольф, якога найбольш вабілі багатыя партовыя гарады Прусіі, заняўся тады падрыхтоўкай інтэрвенцыі ў паўночна–нямецкія землі. З ім зблізілася Англія, зацікаўленая ў абароне пратэстантаў, і Францыя, што імкнулася звесці рахункі з Габсбургамі. Для Рэчы Паспалітай гэтая вайна была ўжо не пад сілу. У выніку новай атакі шведы летам 1625 г. аблажылі Дэрпт, занялі Кокенгаўзэн і нават радзівілаўскія Біржы ў Жамойці. Леў Сапега з Крыштафам Радзівілам ледзь паспелі ўратаваць Дынабург.

26 верасня 1629 г. у Альтмарку быў падпісаны некарысны для Рэчы Паспалітай 6–гадовы мір. Швецыя завалодала не толькі тэрыторыяй Інфлянтаў да Дзвіны і Рыгай, праз якую праходзілі галоўныя гандлёвыя трасы з Беларусі і Літвы, але і портамі Прусіі (за выняткам Караляўца і Гданьска). Непапулярная вайна, што два дзесяцігоддзі патрабавала надмерных высілкаў і вялікіх ваенных падбораў, прыносячы краю толькі спусташэнні і беды, прывяла адно да стратаў. Такім сумным стаў вынік упартасці амбітнага Вазы ў яго барацьбе за вяртанне шведскай кароны.

Смерць Жыгімонта III 30 красавіка 1632 г. выклікала трывогу за ўсходнія межы краіны. Дзякуючы добра арганізаванай выведнай службе вялікі гетман Леў Сапега быў паінфармаваны пра падрыхтоўку вайны маскоўскім урадам. Цар Міхаіл Фёдаравіч Раманаў паразумеўся з каралём Густавам Адольфам і ўдар па Рэчы Паспалітай планаваў нанесці супольна са Швецыяй. Альянты прадугледжвалі падзел тэрыторый: цар прэтэндаваў на Севершчыну, Чарнігаўшчыну, Смаленшчыну і ўсю Беларусь, а шведскі кароль хацеў дамагацца польскага трона, або як найменей — Памор'я. Бескаралеўе стала зручным збегам абставін для Масквы, і толькі смерць Густава Адольфа сарвала ўдзел у вайне Швецыі.

Увосень 1632 г. царскія ваяводы занялі Асвею, Друю, Себеж, Невель, Езярышча, Усвяты, Вяліж, Сураж, Белы, Дарагабуж, а таксама Рослаў, Мсціслаў і Крычаў ды шэраг гарадоў на Севершчыне. Былі заатакаваны таксама Полацк і Віцебск. На Полаччыне і ў Беларускім Падняпроўі маскоўскаму войску давялося весці цяжкія баі,



*Крыштаф II Радзівіл, гетман палявы (1615—1635) і вялікі (1635—1640).*

бо захопленыя тут гарады траплялі ў іх рукі толькі пасля штурмаў. 14 лістапада 20–тысячная армія Міхаіла Шэіна аблажыла Смаленск. Вартанне гэтай ключавой фартэцыі і было галоўнай мэтай распачатай вайны. Добра, што ваявода Аляксандр Гасеўскі паспеў паправіць умацаванні, і 2–тысячная залога на чале з Самуэлем Друцкім–Сакалінскім пачала трымаць гераічную абарону.

Палявы гетман Крыштаф Радзівіл, якому 75–гадовы Леў Сапега перадаў усё кіраванне сіламі ВКЛ, меў у распараджэнні толькі крыху больш за 4 тыс. жаўнераў, але дзейнічаў вельмі ўмела. Найперш паспяшаўся на дапамогу Смаленску ды ў лютым 1633 г. змог праз блакаду правесці абаронцам значнае падмацаванне. Паспяховыя аперацыі супраць непрыяцельскіх фармаванняў былі праведзены пад Віцебскам і Мсціславам.

Маскоўская армія Шэіна не здолела выкарыстаць часу, пакуль збіраліся сілы не падрыхтаванай да вайны Рэчы Паспалітай. Смаленск мужна трымаў цяжкую аблогу, рашучай была і пастава іншых беларускіх гарадоў. Мяшчане Віцебска ў 1633 г. самастойна некалькі разоў грамілі ворага, «ратуючы як сам горад, так і межы дзяржавы», а жыхары Магілёва актыўна дапамагалі абараняць ад маскоўскіх ратнікаў Смаленск, дастаўляючы сваёй арміі прадукты і зброю. Праўда, у чэрвені 1633 г. царскія ваяводы ўварваліся ў горад і ніжні замак Полацка, аднак верхняга замка не адолелі. Урэшце 4 верасня пад Смаленск прыйшла армія новаабранага караля і вялікага князя Ўладыслава IV. Яна хутка дамаглася вырашальнай перамогі. Праз месяц была знята блакада горада, і ўжо войска Шэіна апыну-





*Капітуляцыя М.Шэіна пад Смаленскам. Мастак невядомы. XVII ст.*

лася ў атачэнні. 25 лютага 1634 г. уся маскоўская армія капітулявала, што пераможна завяршыла вайну.

Новы дагавор аб «вечным міры» паўнамоцныя бакі падпісалі 27 траўня 1634 г. у Сямлёве, што на рацэ Палянаўка, паміж Вязьмай і Дарагабужам. Трактат пацвердзіў асноўныя ўмовы Дэвулінскага пагаднення. Разлічваючы на саюз Масквы ў вайне са Швецыяй, Уладыслаў IV адмовіўся ад царскага тытула і саступіў Расіі шэраг памежных крэпасцяў, у прыватнасці, горад Сярпейск.

Пасля дзесяцігоддзяў вайны пры Ўладыславе IV насталі больш–менш спакойныя часы. У адрозненне ад папярэдніка на троне, пры якім канфесійныя канфлікты ўпершыню дасягнулі небяспечнай вастрыні, новы манарх імкнуўся зменшыць падставы ўнутраных хваляванняў. Зацвердзіўшы «Артыкулы заспакаення грэцкай веры» і афіцыйна прызнаўшы Кіеўскую праваслаўную мітраполію, ён пастулаваў нават утварэнне патрыярхату ў Кіеве. І дызуніты, і пратэстанты карысталіся фармальнай аўтаноміяй, яшчэ знаходзячы падтрымку сваіх праў на соймах і сойміках. Аднак «залаты спакой», як назвалі перыяд унутранага міру, што ўсталяваўся ў Рэчы Паспалітай напрыканцы панавання Ўладыслава IV (з 1638 г.), аказаўся нядоўгім і падманлівым, пратрываўшы толькі адно дзесяцігоддзе.

# IX.2. Казацка–сялянская вайна

У канцы красавіка 1648 г. на Ўкраіне пачалося казацкае паўстанне на чале з Багданам Хмяльніцкім (1595—1657), абраным за гетмана Запарожскага Войска. Яго фармаванні разграмілі каронную армію ў першых жа бітвах пад Жоўтымі Водамі (15 траўня 1648) і Корсунем (26 траўня 1648), і паўстанне перарасло ў вялікую вызваленчую вайну. Казацкі рух хутка перакінуўся ў беларускія паветы Вялікага Княства Літоўскага. Трыумфальныя перамогі Хмяльніцкага сталі каталізатарам уздыму народных нізоў на барацьбу супраць паноў у басейне Дняпра і Прыпяці. Колькасць удзельнікаў «казацкай вайны» імкліва шырылася. Украінскі гетман і яго казацкая старшына мелі план стварэння сваёй дзяржавы, у межы якой хацелі ўключыць і тэрыторыі паўднёва–ўсходняй Беларусі, прынамсі, Падняпроўе і Палессе, таму былі асабліва зацікаўлены ў пашырэнні руху на гэтыя землі. Пачынаючы дзеянні, Багдан Хмяльніцкі засылаў на поўдзень ВКЛ сваіх людзей з універсаламі, у якіх заклікаў мужыкоў выступаць супраць паноў і ляхаў. Як правіла, з гэтымі пасланнямі выпраўляліся выхадцы з Беларусі, якія добра ведалі людзей і мясцовасць. Следам гетман пасылаў і казацкія загоны, якія распачыналі ваенныя дзеянні. Сфера жаданага ўплыву Хмяльніцкага ў універсалах вызначалася «аж до Борисова и далей, до Бихова теж, Могилева и далей».



*Гетман Багдан Хмяльніцкі (1595—1657).*



Першымі на Беларусь былі выпраўленыя палкоўнікі Максім Гладкі і Ілля Галота, потым — Галавацкі, Крывашапка, Нябаба, Хвеська ды інш. У чэрвені 1648 г. палкоўнік Галавацкі заняў Чарнігаў, Ноўгарад–Северскі і Старадуб, а 4 ліпеня ўвайшоў у Гомель. Тады ж Пінск быў заняты казакамі Гладкага, а на Магілёўшчыне пачаў дзейнічаць Крывашапка.

З'яўленне казацкіх загонаў Галавацкага, Крывашапкі, Мікуліцкага, Гаркушы ды іншых, у складзе якіх было нямала беларусаў (сярод палкоўнікаў Хмяльніцкага многія таксама мелі беларускае паходжанне, прыкладам — Бутрым, Грамыка, Крычэўскі, Ждановіч, Нячай, Сакалоўскі, Хведаровіч), выклікала масавае далучэнне да іх найбяднейшага сялянства і мяшчанства. Ужо летам 1648 г. на поўдні і ўсходзе Беларусі пачалася шырокая ўзброеная барацьба казацка–сялянскіх аддзелаў супраць шляхты, купцоў, магнатаў ды каталіцкага духавенства. Узброіўшыся, сяляне дзейнічалі і самастойна, громячы галоўным чынам маёнткі сваіх паноў, рабуючы двары, знішчаючы падатковыя дакументы і рэестры.

Да восені жыхары гарадоў Гомеля, Мазыра, Лоева, Рэчыцы і Турава «ўсе паказачыліся і пакляліся адзін другому стаяць да апошняга». Казакі авалодалі таксама Брагінам, Бабруйскам і Чэрыкавам, пагражалі Слоніму і Берасцю. Як сведчыў сучаснік падзей Казімір Піліп Абуховіч, «...той агонь, праз гультайства ад купы Хмяльніцкага запушчаны, так далёка заняўся, што паветы Старадуб, Рэчыца, Мазыр, Пінск, Берасце ды іншых замкаў нямала на Белай Русі дашчэнту знішчана». Казацкія загоны сягалі нават пад Магілёў і Оршу. Падканцлер Казімір Леў Сапега ледзь паспеў прысланць жаўнераў і боезапасы ў свой Стары Быхаў, абложаны сіламі Гаркушы і Пабадайлы. Акрыленае поспехамі, казацкае войска паспрабавала нават здабыць горад Слуцк — найбуйнейшую на той час фартэцыю Вялікага Княства. Аднак тут яно само было атакавана і мусіла ратавацца ўцёкамі. Згодна са сведчаннямі хронікі Натана Гановера, слуцкі гарнізон і мяшчане не толькі абераглі яўрэяў мясцовай абшчыны, але і разграмілі казацкі аддзел, высланы на яе знішчэнне.

У ахопленых хваляваннямі раёнах стрыжнёвай і арганізацыйнай сілай узброеных фармаванняў заставаліся казакі, да якіх актыўна далучаліся ці сімпатызавалі ім мясцовыя прыгонныя сяляне ды беднае мяшчанства. Сацыяльныя вярхі грамадства былі ўжо фактычна апалячаныя (прынамсі моўна), таму антышляхецкі рух набыў тут, як і

на Ўкраіне, выразную антыпольскую скіраванасць. Паўсюдна ў занятых казакамі раёнах бязлітасна праследаваліся жыхары як каталіцкага, так і іудзейскага веравызнанняў. Згаданы вышэй Казімір Піліп Абуховіч занатаваў у дыярыушы, што «шляхта — адны трупам ляглі, іншыя выгнанне цяжкае церпяць, па чужых краях туляючыся». Падобна як на тэрыторыі Ўкраіны, у Гомелі, Пінску і іншых гарадах Беларусі ад казакоў загінулі тысячы яўрэяў.



*Януш Радзівіл, гетман палявы (з 1646) і вялікі (1654—1655). Медзярыт В.Хондзіуса.*

Вялікае Княства Літоўскае на момант пачатку казацкай вайны не мела ніякай сталай арміі, а дзяржаўны скарб быў практычна пусты. Многа перапужанай шляхты ратавалася ўцёкамі ўглыб краіны. Састарэлы вялікі гетман Ян Кішка самаўхіліўся ад спраў, і войска пачаў ствараць палявы гетман князь Януш Радзівіл. Сабраць грошы на жаўнераў можна было толькі пасля ўхвалення падаткаў соймікамі і галоўным з'ездам (канвакацыяй), на што патрабаваўся немалы час. Таму з боку вярхоўнай улады Вялікага Княства рэакцыя на паўстанне была запозненай.

Віленская канвакацыя ў чэрвені 1648 г. ухваліла каштарыс на 6–тысячнае войска (потым лічба была зменшана да 5000), але збор харугваў прызначаўся толькі на пачатак верасня, а многія паветы вырашылі не аддаваць сваіх жаўнераў пад булаву гетману, а пакідаць на варце сваіх межаў. Толькі ў ліпені супраць казакоў на паўднёвы захад Беларусі вырушылі першыя фармаванні, нанятыя гетманам на ўласны кошт — харугвы Ўладыслава Халецкага, харужага Яна Паца, пісара Ўладыслава Валовіча і стражніка Грыгора Мірскага. Паспалітае рушанне Аршанскага павета разам з фармаваннямі мяшчан



распачало дзеянні супраць казакоў каля Быхава і Стрэшына. У лістападзе бунтаўнікоў удалося выбіць з Чэрыкава. Аднак харугвы Валовіча каля Рэчыцы, а Мірскага пад Горвалем былі разгромлены казакамі. Дамагліся яны поспехаў і ў іншых сутычках. Так, у Кобрыне атаман Максім Гладкі разбіў драгунаў стольніка Вінцэнта Гасеўскага, а каля Чэрыкава ад Крывашапкі пацярпела харугва полацкай шляхты на чале з князем Лукомскім.

На пачатку восені палявы гетман Януш Радзівіл сабраў пад Глускам нанятае дзяржаўнае войска — 4 тыс. наймітаў і каля 1 тыс. паветовых жаўнераў, чаго было яўна недастаткова для паспяховых дзеянняў. Радзівіл выдаў тут «вайсковыя артыкулы», у якіх патрабаваў ад жаўнераў цярпімасці і спакою, аберагання незамешаных у бунце сялян. Раздзяліўшы наяўныя харугвы на дзве групы, гетман адправіў першую да Старога Быхава, другую — пад Рэчыцу, а сам паспяшаўся на элекцыйны сойм у Варшаву.

У кастрычніку 1648 г. войска стражніка Грыгорыя Мірскага заатакавала Пінск, жыхары якога, баючыся кары, дамовіліся з казакамі бараніцца да апошняга. Абарона горада была настолькі адчайнай, што спатрэбіліся амаль суткі, каб пасля ўварвання канчаткова падпарадкаваць яго. Частка казацкай конніцы, падпаліўшы драўляную забудову места, здолела ўцячы берагам Прыпяці, а для пінчан настаў трагічны час: горад на два дні быў аддадзены «на агонь і рабунак». «Уціхамірванне» палескай сталіцы абярнулася яе вялікай трагедыяй. Нават канцлер Альбрэхт Радзівіл наракаў на братанка–гетмана, што той дазволіў наймітам знішчыць горад і спустошыць усё пінскае староства.

Акрыленыя чарговай гучнай перамогай Хмяльніцкага пад Піляўцамі (23 кастрычніка 1648), казакі ўвосень дзейнічалі ўсё актыўней, што адчувалася і ў Паўднёвай Беларусі. Князь Януш Радзівіл пасля элекцыйнага сойма з'явіўся на пачатку 1649 г. у Берасці, адкуль ужо 20 студзеня павёў армію на ўтаймаванне бунту. Яго 4–тысячная дывізія трыма калонамі рушыла па мяжы з Валыннню на ўсход. У Нобелі да гетмана далучылася войска стражніка Мірскага, і армія пайшла на Давыд–Гарадок і на Тураў. 5 лютага Радзівіл дайшоў да пакінутага паўстанцамі Турава, а 7 лютага ўжо быў пад Мазыром.

Мазыр абараняў казацкі палкоўнік Міхненка, засланы Хмяльніцкім. Прапанову капітуляваць ён адхіліў. Тады гетман кінуў войска на штурм. Першы прыступ быў адбіты, аднак у другім, у якім удзельнічала і спешаная кавалерыя, жаўнеры захапілі шанцы,

знеслі вастракол і выбілі брамы для конніцы. Харугвы ўварваліся ў горад і завязалі бой з абаронцамі, большая частка якіх палегла ў сечы. Штурм, пачаты раніцай, ледзь скончыўся ноччу. На два дні ўзяты Мазыр быў аддадзены на рэквізіцыю войску.

Ад Мазыра Радзівіл павярнуў на поўнач і ўжо ў канцы лютага стаяў пад Бабруйскам, у якім засеў загон атамана Паддубіча. Аблога доўжылася некалькі тыдняў, пакуль бабруйчане праз сваіх парламенцёраў не папрасілі прыняць іх капітуляцыю. Гетман паставіў



*Аблога Бабруйска войскам Я.Радзівіла.*
*Малюнак А. Ван Вестэрфельда. Сярэдзіна XVII ст.*

умовы: каб усе жыхары па адным выйшлі за валы, здалі зброю і ключы ад брамаў, а таксама выдалі кіраўнікоў бунту і ўсіх, хто служыў пад казацкай харугвай. Бабруйчане прынялі гэтыя ўмовы і практычна здалі казакоў у рукі Радзівіла. Пасля капітуляцыі Бабруйска гетман стрымаў слова і не дазволіў жаўнерам рабаваць горад. «Пахолка аднаго за адну хустку, якую быў узяў... загадаў на браме павесіць, хустку пры ім паклаўшы», — адзначыў у мемуарах шляхціч Самуэль Маскевіч. Падазраваных ва ўдзеле ў бунце сурова пакараў: 9 чалавек было пасаджана на палю, 40 — засуджана на смерць, у 270 казакоў загадаў адсекчы правую руку, якая трымала зброю.

Пакінуўшы Рэчыцу і Гомель, паўстанцы адступілі далей на Ўкраіну, куды праз Прыпяць збіраўся пераходзіць і Януш Радзівіл. Акурат тады паміж Багданам Хмяльніцкім і каралём Янам Казімірам было заключана перамір'е, што і завяршыла першую антыказацкую кампанію ў Беларусі.



Хмяльніцкі выкарыстаў перамір'е для мабілізацыі сілаў на далейшую вайну. Украінскаму гетману, які ўзнаўляў ваенныя дзеянні супраць кароннага войска, важна было затрымаць армію Вялікага Княства ў Беларусі, не дапусціць яе да супольных аперацый з палякамі. Таму на заслону Ўкраіны з поўначы Хмяльніцкі выстаўляў значныя сілы. Ужо на пачатку чэрвеня 1649 г. яго казакі спрабавалі авалодаць Гомелем. Палкоўнікі Ліцвіненка, Паповіч і Гаркуша шматразова штурмавалі горад, аднак не здолелі зламаць абарону, чынны ўдзел у якой бралі і мяшчане. Але і Януш Радзівіл усю вясну энергічна рыхтаваўся да вайны. Востра не хапала грошай не толькі для найму новых харугваў, але і для выплаты жолду старым, што знаходзіліся ў абозе. Тым часам жаўнеры пагражалі, што, не атрымаўшы заслужанай платы, кінуць службу. Кароль жа патрабаваў ад Радзівіла прыслаць палову войска ВКЛ у Карону. Падтрыманы сваімі сенатарамі, князь адмовіўся падпарадкавацца волі манарха, бо падзел арміі і вывад яе з краіны супярэчыў прававым нормам ВКЛ.

На лета 1649 г. гетман сабраў каля 6 тыс. войска пад Рэчыцай. Сам з'явіўся ў абозе на пачатку ліпеня і стаў рыхтаваць марш на Ўкраіну. Каб затрымаць Радзівіла ў Беларусі, у чэрвені Хмяльніцкі накіраваў на Палессе 3–тысячны загон Іллі Галоты, сілы якога папаўнялі сяляне, а следам прыслаў палкоўніка Галавацкага. Галота сходу заатакаваў харугвы Валовіча, што стаялі ў Загаллі. Але хоць сілы казакоў нашмат пераўзыходзілі загальскі абоз, яны пацярпелі паразу, а сам Галота загінуў у сечы. Галавацкі са сваім аддзелам натрапіў на засаду пад Рэчыцай і быў схоплены Мірскім.



*Кіеўскі палкоўнік Міхаіл Крычэўскі.*
*Пасмяротная маска.*

Каб паправіць становішча, Хмяльніцкі спешна паслаў 12 тысяч на чале з палкоўнікам Пабадайлам для блакавання пераправы за ўпадзеннем Сажа ў Дняпро, а потым яшчэ палкоўніка Міхаіла Крычэўскага, у фармаваннях якога было да 15 тыс. казакоў, да якіх далучыліся тысячы чэлядзі і мясцовага сялянства, так што разам налічвалася каля 30 тыс. Князь Радзівіл збіраўся пачаць марш на Кіеў і стаў канцэнтраваць сілы для пераправы пад Лоевам. Пра набліжэнне Крычэўскага ён даведаўся 25 ліпеня і змяніў план дзеянняў. Але Крычэўскі дзейнічаў настолькі імкліва, што з'явіўся пад Лоевам нечакана і 31 ліпеня сходу ўдарыў на абоз непрыяцеля. Радзівіл здолеў адбіць націск загонаў Крычэўскага і кінуў харугвы ў контратаку, прымусіўшы казакоў спачатку схавацца ў лесе, а потым ратавацца ўцёкамі. 5–тысячная армія Радзівіла цалкам разграміла прынамсі ўтрая большыя сілы славутага палкоўніка: казацкае войска перастала існаваць, табары былі захопленыя, а сам Крычэўскі, паранены, памёр у абозе гетмана. Гэты лоеўскі трыумф князя Радзівіла потым услаўляўся мастакамі на карцінах і шпалерах, пра што парупіўся сам Януш.

Аднак і Радзівіл пасля Лоева не рушыў далей на Ўкраіну, хоць гэтага зноў запатрабаваў кароль. У бітве зусім растраціліся боезапасы, а край вакол быў настолькі спустошаны, што жаўнер не мог здабыць ніякай жыўнасці. Вайну нечакана перапыніў Збораўскі мір. Згодна з яго ўмовамі, казакі мусілі пакінуць нават тыя замкі ВКЛ, у якіх яшчэ мелі свае залогі. І ўвесь наступны 1650 г. на Беларусі прайшоў без істотных ваенных сутычак. Подыхам казацкай вайны сталі летнія хваляванні сялян, але яны былі хутка ўтаймаваныя.

Рыхтуючыся да наступнага этапу вайны, украінскі гетман сканцэнтраваў вясною 1651 г. у Чарнігаве і Чарнобылі каля 50 тысячаў казакоў. Камандуючы гэтай групоўкі палкоўнік Марцін Нябаба мусіў узяць на сябе войска ВКЛ, не прапускаючы яго на Ўкраіну. Як і раней, Ян Казімір у 1651 г. зноў запатрабаваў ад Януша Радзівіла прыслаць войска ВКЛ пад камандаванне караля для дзеянняў на Ўкраіне, але гетман чарговы раз не падпарадкаваўся каралю і рыхтаваў свой марш на Кіеў.

Ваенныя дзеянні ўзнавіліся ў траўні 1651 г. наступленнем кароннай арміі на чале з Янам Казімірам. Багдан Хмяльніцкі, зноў клапоцячыся пра бяспеку паўночных межаў, выслаў супраць Радзівіла Марціна Нябабу. Сямітысячны загон казакоў на чале з Забелам рушыў на Гомель, а чатырохтысячны Шохава —



на Рослаў і Крычаў. Аднак фартуна адвярнулася ад іх. Калі Рослаў казакам хутка ўдалося заняць, дык Крычаў паспяхова адбіўся. Палкоўнік Забела марна спрабаваў здабыць Гомель, які разам з гарнізонам актыўна абаранялі мяшчане. 6 ліпеня пад Лоевам былі разгромлены галоўныя сілы на чале з палкоўнікам Марцінам Нябабам. Украіна засталася адкрытая, але Радзівіл не спяшаўся наступаць. Толькі ў канцы ліпеня 1651 г., пасля цяжкай паразы ўкраінскіх казакоў пад Берасцечкам 10 ліпеня 1651 г., дзе Хмяльніцкі страціў палову сваёй арміі, ён распачаў марш на Кіеў. З жніўня армія ВКЛ стаяла пад сценамі самага старажытнага горада Русі, а ўжо на наступны дзень увайшла ў Кіеў — без бітвы! Кіяўляне папрасілі сваіх палкоўнікаў адразу вывесці войска, каб у бітве не руйнаваць горада. Потым армія ВКЛ злучылася з польскай, рыхтуючыся да генеральнай бітвы з казакамі. Аднак абышлося без яе, паколькі Берасцечка карэнным чынам змяніла сітуацыю. У цяжкіх для Ўкраіны ўмовах Хмяльніцкі мусіў пагадзіцца на чарговае замірэнне. Белацаркоўскі трактат аб перамір'і, падпісаны 18 верасня 1651 г., патрабаваў вывесці ўсе казацкія фармаванні з Беларусі. Рэалізацыя гэтай умовы пакінула беларускіх сялян без арганізацыйнай ваеннай сілы, што само па сабе абумовіла супакаенне краю.



*Ян Казімір Ваза, кароль і вялікі князь (1648—1668).*

У выніку ваенных дзеянняў вялізныя абшары паўднёва–ўсходняй Беларусі былі спустошаныя і выпаленыя. Асабліва пацярпелі Мазырскі, Пінскі, Рэчыцкі паветы, а таксама Берасцейшчына. Зважаючы на цяжкі эканамічны стан гэтых зямель, сойм Рэчы Паспалітай яшчэ ў 1649 г. зменшыў падаткі або зусім

звольніў ад іх шэраг паўднёвых паветаў Беларусі. Антыфеадальная па сваёй сутнасці казацка–сялянская вайна 1648—51 г. у Беларусі (хоць разам з рэгулярным войскам на баку гетмана Радзівіла супраць паўстанцаў вяло барацьбу і фармаванне мяшчан ды дробнай праваслаўнай шляхты) была складовай часткай вызваленчай вайны на Ўкраіне. Тут яна не мела такіх дзейных сілаў, такога маштабу і дынамікі развіцця, як на Кароннай Русі, ды з'яўлялася хутчэй серыяй лакальных паўстанняў. У Беларусі не было мясцовага казацтва — арганізаванай ваеннай сілы як галоўнага суб'екта згаданай вайны. Мясцовыя паказачаныя сяляне не маглі мець ні каардынацыі дзеянняў, ні свайго арганізацыйнага цэнтра. Таму казацка–сялянскую вайну 1648—1651 г. немагчыма разглядаць як самастойную з'яву беларускай гісторыі. Аднак па маштабах яна была, несумненна, самай масавай у гісторыі Беларусі адкрытай узброенай барацьбой ніжэйшых слаёў народа супраць сацыяльнага прыгнёту.

## IX.3. Маскоўскае нашэсце

За казацкай вайной на Ўкраіне ўважліва сачыў маскоўскі ўрад, які паступова мяняў свае адносіны да яе. Калі ў 1648 г. цар Аляксей Міхайлавіч загадваў сваім ваяводам дзейнічаць супраць казакоў, дык пасля бітвы пад Батогам, дзе казакі 2 чэрвеня 1652 г. узялі рэванш за Берасцечка і разбілі лепшыя польскія сілы, яго стаўленне да падзей на Ўкраіне адкрыта змянілася. Цар стаў разглядаць Хмяльніцкага як саюзніка. Вайна ўкраінскіх казакоў з Каронай зацягвалася і знясільвала апошнюю, што стварала зручную сітуацыю для ўмяшання і нанясення вырашальнага ўдару па Рэчы Паспалітай.

Пачынаючы з сакавіка 1653 г. Маскоўскае царства пачало актыўна рыхтавацца да вайны. У еўрапейскіх дзяржавах закуплялася зброя, наймаліся афіцэры, вялася дыпламатычная прапаганда. Пасля Пераяслаўскай Рады, якая 8 (18) студзеня 1654 г. прыняла рашэнне пра пераход Украіны пад царскую «высокую руку», вайна Масквы з Рэччу Паспалітай стала непазбежнай.

Галоўны ўдар цар вырашыў нанесці па землях Беларусі. У траўні 1654 г. тры вялікія групоўкі ягонай арміі — з Вялікіх Лукаў, Вязьмы і Бранска — уварваліся ў межы Вялікага Княства. На дапамогу ім з поўдня ў Беларусь вырушылі высланыя Хмяльніцкім 20 тыс.



украінскіх казакоў на чале з наказным гетманам Іванам Залатарэнкам. Разам у фармаваннях, якія ўварваліся у Беларусь, налічвалася блізу 100 тыс. чалавек.

Вялікае Княства Літоўскае зусім не падрыхтавалася да вайны. Памежныя гарады і замкі на Дзвіне і Дняпры засталіся непадпраўленыя, а іх залогі — непавялічаныя. Да лета 1654 г. дзяржава не мела нават вялікага гетмана, бо кароль марудзіў з прызначэннем на гэтую пасаду Януша Радзівіла. Усё войска, сабранае ўрэшце Янушам Радзівілам для абароны краю, не перавышала 10—12 тыс. Пры такой дыспрапорцыі сілаў цяжка было спадзявацца на поспех.



*Цар Аляксей Міхайлавіч (1645—1676) перад брамай Масквы. Медзярыт другой паловы XVII ст.*

Маскоўскі ўрад імкнуўся выкарыстаць у вайне канфесійную праблему і нейтралізаваць або нават схіліць на свой бок праваслаўнае жыхарства Беларусі. Дзеля гэтага ў край пасылаліся царскія граматы, якія даводзілі, што Аляксей Міхайлавіч пачынае вайну ў імя абароны «святой восточной церкви греческого закона», і заклікалі праваслаўных выступаць разам з царскім войскам супраць «проклятых ляхов». Ігумен полацкага манастыра Афінаген Крыжаноўскі стараўся запэўніць маскоўскія ўлады, што як толькі цар прыйдзе з арміяй, дык «белорусцы де, сколько их есть, все в те поры восстанут на ляхов заодно». У некаторых месцах прапаганда такі дасягнула пэўнага поспеху, асабліва на самым пачатку вайны. Але ў цэлым цар не атрымаў ад насельніцтва Беларусі чаканай падтрымкі.

Выступіўшы насустрач галоўнай маскоўскай арміі на ўсход Беларусі, вялікі гетман Януш Радзівіл у жніўні 1654 г. выйграў першую бітву пад Шкловам, але потым быў зацiснуты каля Цяцерына на Друцi і разгромлены. У пакінутым без абароны краі царскія вая-

воды займалі горад за горадам. За першы год вайны яны авалодалі абшарамі па Дняпро на ўсходзе і па Дзвіну — на поўначы Беларусі. Шэраг беларускіх гарадоў на пачатку вайны капітуляваў. Гэта Магілёў, Новы Быхаў, Шклоў, Крычаў, Невель, Чавусы, а таксама Полацк, у якім мужна абаранялася толькі залога замка. Некаторыя здаліся пад уплывам прапаганды Канстанціна Паклонскага — беларускага шляхціча, які перайшоў на бок цара, стварыў мясцовы казацкі полк і меў даручэнне схіляць гарады да здачы маскоўскаму войску. На рахунку Паклонскага былі капітуляцыі Магілёва, Гораў, Горак і Шклова. Аднак большасць гарадоў упарта адбівалася. Асабліва паказальнай была абарона Віцебска, якую трымала ў асноўным мяшчанства, а таксама Дуброўны, Гомеля і Смаленска. А Стары Быхаў так і застаўся няскораны. Цар жа загадваў ваяводам бязлітасна караць тыя гарады, якія не паддаюцца ім адразу — у навучанне іншым. І калі ваявода Аляксей Трубяцкой захапіў Мсціслаў штурмам, ён пабіў ці вывеў у палон амаль усіх, хто хаваўся ў замку, а горад знішчыў. Калі Дуброўна пачала абараняцца, а потым, не маючы падмогі, капітулявала, — усіх яе жыхароў забралі ў няволю, горад спалілі, нават валы скапалі.



*Таварыш гусарскай харугвы. Малюнак–рэканструкцыя.*

Зімою 1654/55 г. Януш Радзівіл паспрабаваў вярнуць страчаныя землі і арганізаваў контрнаступ. Харугвы Вялікага Княства вызвалілі некалькі гарадоў у Падняпроўі, аднак галоўнай дняпроўскай цвярдыняй Магілёвам так і не авалодалі. Вясной жа пачаўся другі паход царскіх ваяводаў. Не маючы іншай магчымасці ўратаваць Вялікае Княства, вялікі гетман разам з стрыечным братам Багуслаўам Радзівілам звязаўся з каралём Швецыі Карлам X Густавам (1654—1660) і папрасіў яго пратэкцыі. Першае пагадненне аб шведскай апецы было заключана ў жніўні, але яго ўмовы не задаволілі большасць паноў і шляхты. Тады з удзелам шведскага генерала Габрыэля Магнуса Дэлагардзі ў Кейданах быў падрыхтаваны новы праект пагаднення, якое дэкларавала ўступленне ВКЛ у раўнапраўную унію са Швецыяй і прызнанне шведскага караля вялікім князем літоўскім. У кастрычніку акт Кейданскай уніі, які фактычна разрываў Люблінскую унію з Каронай, падпісала больш за тысячу чалавек, аднак большасць шляхты і войска ВКЛ захавалі вернасць каралю Яну Казіміру.



Тым часам маскоўскае войска і ўкраінскія казакі 3 ліпеня 1655 г. занялі Менск і рушылі проста на Вільню. 8 жніўня амаль безабаронная сталіца дзяржавы была захопленая, абрабаваная і выпаленая. Толькі ўвосень, пасля спусташальнага рэйду Залатарэнкі і Трубяцкога цераз Беларускае Панямонне, ваенныя дзеянні прыпыніліся. Аляксей Міхайлавіч планаваў яшчэ павесці войска з Вільні на Варшаву, але ў Карону ўжо ўступілі шведы, якія ў чэрвені таго ж года пачалі вайну супраць Яна Казіміра Вазы.

Так амаль уся тэрыторыя Беларусі (за выняткам раёнаў Палесся, Берасцейшчыны і Панямоння) ужо на другі год вайны апынулася пад акупацыяй. На занятай тэрыторыі непакорнымі заставаліся некалькі фартэцый, у прыватнасці, Слуцк, Ляхавічы, Стары Быхаў. Увосень 1655 г. 20–тысячная армія Трубяцкога зацята штурмавала слуцкую цвержу, потым яе спрабавалі здабыць казакі Залатарэнкі — і марна! Гарадскія сцены аднолькава мужна і суладна баранілі праваслаўныя і уніяты, іудзеі і пратэстанты. Такое адзінства жыхароў Беларусі незалежна ад іх этнічнага паходжання і канфесійнай прыналежнасці, прадэманстраванае ў той вайне (прыклады Віцебска, Дуброўны, Слуцка, Старога Быхава), было супольнай абаронай сваёй дзяржавы і выявіла грамадзянскасць нашых далёкіх продкаў.

Пасля захопу Вільні,палічыўшы ліквідацыю Вялікага Княства Літоўскага як дзяржавы і анексію яго земель справай вырашанай, маскоўскі ўрад пайшоў на часовае замірэнне з Каронай Польскай для вядзення супольнай вайны супраць Швецыі. Паміж Масквой і Варшавай пачаліся перамовы, якія скончыліся 3 лістапада 1656 г. падпісаннем двухгадовага перамір’я ў Немежы, што пад Вільняй.

Беларускія землі, занятыя царскім войскам, адразу ж ператвараліся ў правінцыю Маскоўскай дзяржавы. У Маскве для кіравання імі спецыяльна быў створаны Прыказ Вялікага Княства Літоўскага. Акупацыйную ўладу ў Беларусі ўвасаблялі ваяводы. Каб выклікаць лаяльнасць мясцовага насельніцтва, цар пакідаў гарадам магдэбургскае права, раздаваў ахоўныя граматы, якія мусілі аберагаць іх ад маскоўскіх жа ратнікаў, усяляк падтрымліваў лаяльную да яго шляхту. У канфесійнай палітыцы акупацыйныя ўлады кіраваліся прынцыпамі: «жидам в Белой Руси не быть и жития никакого не имети», «униатам не быть», «костелам не быть, а петь в домех». Так што поўнае права на існаванне ў падкантрольных маскоўскім уладам раёнах мела толькі праваслаўная царква. Цар усяляк імкнууся ўмацаваць і пашырыць яе, аддаючы будынкі і маёмасць уніятаў ды каталікоў. Такім чынам, унія апынулася па–за законам, каталіцкі культ абмяжоўваўся да прыватных дамоў шляхты і мяшчанства, а праваслаўе насаджвалася. Усе жыхары занятых раёнаў пераводзіліся ў праваслаўе або на месцы, у Беларусі, або перахрышчваліся ў палоне, у Маскоўскім царстве. Аднак нават прыналежнасць да праваслаўнай царквы не магла ўберагчы насельніцтва ад марадзёрства і гвалту маскоўскіх ваяўнікоў. Тыя рабавалі, забіралі ў няволю ўсіх без разбору. Здаралася, нішчылі і праваслаўныя храмы, забівалі праваслаўных папоў. Да цара з першых месяцаў вайны пайшлі шматлікія скаргі ад адзінавернага яму духавенства Беларусі, але спыніць гвалт, які чыніла маскоўскае войска, было немагчыма нават самому Аляксею Міхайлавічу.



*Палкоўнік. Паводле Яна Норбліна.*



Хоць праваслаўная царква ў Беларусі актыўна супрацоўнічала з новымі ўладамі, царская адміністрацыя трымала яе пад пільным наглядам. Дзеля большай надзейнасці сюды прысылалі святароў з Маскоўскай дзяржавы. Урад Аляксея Міхайлавіча ставіў на мэце перападпарадкаваць праваслаўную епархію Беларусі свайму патрыярхату. Гэтай задачай у гады вайны займаўся нават Прыказ тайных справаў.

Асобнай задачай акупацыйных уладаў быў вывад мясцовага насельніцтва ў Маскоўскае царства. Паводле сведчанняў патрыярха Нікана, Аляксей Міхайлавіч планаваў вывесці і пасяліць у сваіх землях не менш за 300 000 беларусаў. Паляванне на людзей ды іх вывад у царства набылі характар дзяржаўнай праграмы. Кожны маскоўскі памешчык ці нават мешчанін мог прыехаць у Беларусь да царскага войска і купіць тут у ратнікаў патрэбную колькасць палонных за мізэрную плату — па 3—5 рублёў за чалавека. Права валодаць нявольнікам як прыватнай уласнасцю афармлялася простай рэгістрацыяй у паланянічнай кнізе ці ў халопскім прыказе. Яшчэ прасцей гэта дасягалася простым перахрышчваннем палоннага ў праваслаўе. Запісы ў паланянічных кнігах сведчаць, што ў няволю браліся пераважна маладыя жанчыны і дзеці ва ўзросце ад 10 да 16 гадоў, а часта — цэлыя сем'і. Асобнай групай палонных былі рамеснікі, якіх вышуквалі спецыяльна. Іх пераманьвалі высокім заробкам або забіралі сілай. Калі горад здабывалі штурмам, то рамеснікаў выводзілі ў палон у першую чаргу. Такім шляхам у Маскве апынуліся высокакваліфікаваныя кавалі, збройнікі, замочнікі ды іншыя майстры з самых розных гарадоў Беларусі, а на Валдаі — кафляры з Дуброўны, Мсціслава і Шклова і інш. Адначасова з масавым вывадам карэннага насельніцтва ў Маскоўскую дзяржаву цар спрабаваў сяліць у беларускіх гарадах сваіх ратнікаў на сталае жыхарства. У Полацку і Віцебску, напрыклад, ім адводзіліся спецыяльныя пляцы пад слабоды, а з казны вызначаліся грошы на будаўніцтва двароў.

У выніку баявых дзеянняў і гаспадарання чужога войска акупаваныя землі Беларусі былі ператвораны ў пустэчу. Праехаўшы дарогамі Панямоння, каралеўскі сакратар Стэфан Мядэкша яшчэ ў 1655 г. адзначыў у сваім дыярыушы, што там «трупаў па дарогах поўна, вёскі, мястэчкі, сядзібы папаленыя, беднай хаткі цяжка пабачыць цэлай». Сведкі пісалі пра цэлыя паветы як пра «пустыя і выпаленыя». А расстаўленыя ў Беларусі царскія залогі нават пад час замірэння наязджалі на маёнткі і вёскі, чынілі гвалт і рабавалі жыхароў.

Ад мноства непахаваных трупаў людзей і жывёл пачалася эпідэмія чумы. Яна суправаджалася страшным голадам, выкліканым ваеннымі спусташэннямі. Людзі елі сабак і кошак, месцамі даходзіла нават да канібалізма. Слуцкі шляхціч Ян Цадроўскі, які перажыў тыя падзеі, пісаў у дыярыушы, што памерлыя проста ляжалі паўз дарог, іх нават не было каму пахаваць.

Акупаваны беларускі край перажываў ці не самыя трагічныя часы сваёй гісторыі. «Навошта столькі крыўды, крадзяжу, пакутаў і забойстваў у гарадах і вёсках, у лясах і на палях, за што ў кожным месцы чуецца плач і ліюцца слёзы?» — адчайна пытаўся ў маскоўскіх ваяводаў праваслаўны ўладыка, епіскап полацкі і віцебскі Каліст.

## IX.4. Рух народнага супраціву

Спусташэнні і голад, гвалт і масавы вывад людзей у няволю — усё гэта выклікала на беларускай зямлі шырокі рух народнага супраціву. Ён пачаўся адразу пасля з'яўлення маскоўскага войска ва ўсходніх паветах дзяржавы. Ужо ў ліпені 1654 г. там сталі ўтварацца сялянскія аддзелы самаабароны, якія ўзяліся ахоўваць свае вёскі і мястэчкі, перашкаджаць акупантам выводзіць у палон мясцовае насельніцтва. У дакументах царскай адміністрацыі супраціўленцаў называлі «шышамі». На пачатку вайны найбольш актыўны партызанскі рух разгортваўся на Смаленшчыне і каля Мсціслава, а таксама ў раёнах Магілёва, Віцебска і Полацка. Некаторыя лясныя фарміраванні ўяўлялі з сябе даволі значную сілу і налічвалі па некалькі тысячаў чалавек, што дазваляла весці актыўныя ваенныя дзеянні. Прыкладам, 3–тысячны аддзел сялян з Калеснікаўскай воласці Мсціслаўскага павета ажыццявіў напад на



*Напад сялян на конніка. Гравюра XVII ст.*



армію ваяводы Трубяцкога, калі тая аблажыла Мсціслаў, і прычыніў ёй сур'ёзныя страты. Мужыкі Полаччыны таксама ўступалі ў адкрыты бой з рэгулярным маскоўскім войскам. Нездарма цар ужо ў жніўні 1654 г. папярэджваў сваіх ваявод пра небяспеку раптоўных нападаў беларускіх партызан.

Зімою 1654/55 г., пад час наступальнай кампаніі Януша Радзівіла, народны рух супраціву на захопленых землях Беларусі актывізаваўся. Паўсталі валасныя сяляне Аршаншчыны, Віцебшчыны, Мсціслаўшчыны і Смаленшчыны. Сышоўшы ў лясы, яны рабілі засады на дарогах, нападалі на дробныя аддзелы маскоўскіх ратнікаў, бралі ў палон ваявод і перадавалі іх гетману. Цэнтрам самага актыўнага партызанскага руху на Мсціслаўшчыне была Калеснікаўская, а на Смаленшчыне — Любавіцкая і Мікулінская воласці. Зброяй партызанам служылі бердышы, косы ды вілы, радзей — стрэльбы. Колькасна аснову такіх лясных аддзелаў складалі сяляне, аднак уваходзіла ў іх і шляхта. Шляхцічаў, якія выконвалі ролю камандзіраў, часам прысылаў вялікі гетман. Некаторымі ж аддзеламі кіравалі сяляне, як, прыкладам, Якім Патапавіч на Мсціслаўшчыне. Партызаны Патапавіча вялі барацьбу не толькі з маскоўскім войскам, але нападалі і на шляхту, што прысягнула цару, хадзілі ваяваць тыя вёскі, якія перайшлі на бок Масквы.

Зімою 1655 г. цар Аляксей Міхайлавіч мусіў накіраваць на ўтаймаванне партызанаў усходнебеларускіх паветаў спецыяльнае карнае войска. Спайманых сялян білі пугамі і вешалі, іншым — адразалі насы і вушы ды адпускалі хадзіць па вёсках, каб застрашыць астатніх. Аднак рух не перапыняўся. Увесну 1656 г. барацьба мясцовага насельніцтва супраць царскай адміністрацыі і прысяжнай шляхты зноў актывізавалася. Яна ахапіла раёны Менска і Барысава, потым перакінулася на Наваградчыну, а ў 1657 г. партызанскай вайной занялiся і ўсходнія ды паўночныя землі Беларусі. Уздыму антымаскоўскага руху ў Менскім ваяводстве ды ў Падняпроўі садзейнічала прысутнасць казацкіх аддзелаў Івана Нячая. Назваўшыся «беларускім палкоўнікам», яго сотнік Дзяніс Мурашка набраў у сваё войска мясцовых сялян ды ўзначаліў сапраўдную вайну супраць прысяжнай шляхты. Застрашаная шляхта вагалася і часам пераходзіла назад на бок Рэчы Паспалітай, што здаралася, прынамсі, ва ўсходніх раёнах Беларусі.

Узросшыя сілы дазволілі партызанскім аддзелам ужо ў 1657 г. перайсці да больш маштабных дзеянняў. Яны ўзялі пад кантроль усю Магілёўшчыну. Праз год, калі ў лясы масава пайшла мясцовая шляхта, якая раней прысягала цару, і ўзнавіліся шырокамаштабныя ваенныя дзеянні паміж арміямі Маскоўскай дзяржавы і Рэчы Паспалітай, народна–вызваленчы рух у Беларусі дасягнуў вышэйшага, якасна новага этапу. Ідэя вызвалення ад тыраніі часова кансалідавала ў Беларусі прадстаўнікоў розных станаў — сялян, мяшчан і шляхту. З далучэннем да руху шляхты, якая мела ваенны вопыт, партызанскія фармаванні актыўней пераходзілі да наступальных аперацый. Напрыклад, менская шляхта, аб'яднаўшыся з сялянамі, спрабавала авалодаць Менскам, партызаны Віцебшчыны вызвалілі Бешанковічы, Лукамль, Глыбокае. Віцебск быў цалкам заблакаваны аддзеламі сялян і шляхты. Мяшчане Мсціслава і Крычава пры падтрымцы казакоў Івана Нячая самастойна зліквідавалі ў сябе царскія залогі.



*Шляхціч. Паводле гравюры XVII ст.*

Каб ачысціць беларускае Падняпроўе ад казакоў Нячая і мужыцкіх аддзелаў, цар у 1658 г. накіраваў туды буйныя сілы рэгулярнага войска з артылерыяй. Спецыяльная вайсковая экспедыцыя была выслана і на партызанаў Віцебшчыны. Маскоўскія ратнікі цалкам спальвалі вёскі ў партызанскіх зонах і бязлітасна распраўляліся са злоўленымі, аднак рух не перапыняўся. У шэрагу выпадкаў, як, прыкладам, у баі ў Бешанковічах, партызаны дамагаліся перамогі ў адкрытых сутычках з царскай арміяй.



Пасля падпісання Гадзяцкай дамовы 1658 г., трапна названай Наталляй Якавенка спробай казацкай Украіны «вярнуцца ў нармальны свет», па ўмовах якой гетманская Ўкраіна аддзялялася ад Масквы і далучалася да Кароны Польскай і ВКЛ як Вялікае Княства Рускае — трэці член Рэчы Паспалітай, расквартараваныя ў Беларускім Падняпроўі казацкія загоны Івана Нячая сталі адкрыта ваяваць супраць расійскага войска. І мясцовыя жыхары з канца 1650–х г. актыўней далучаліся да харугваў рэгулярнага войска Вялікага Княства Літоўскага. Менавіта вясковыя мужыкі складалі большую частку ў палку Гальяша Сурына, палову войска некаторых іншых палкоўнікаў.

Для канчатковага падпарадкавання Беларусі маскоўскі цар накіраваў сюды ўвосень 1659 г. вялікую армію на чале з князем Іванам Хаванскім. Бязлітасна ваюючы зямлю сваіх далёкіх продкаў, гэты нашчадак Гедымінавічаў дайшоў да Горадні і захапіў Берасце. Ягоныя ратнікі выпальвалі на сваім шляху ўсе гарадкі і вёскі, забівалі або забіралі ў палон жыхароў. Абараніць іх не было каму, бо армія Вялікага Княства дапамагала палякам ваяваць са шведамі. Толькі пасля падпісання Аліўскага міру са Швецыяй у 1660 г., які дазволіў Рэчы Паспалітай засяродзіць сілы на барацьбе з Масквой, у Беларусь былі вернуты дывізіі ВКЛ, а на дапамогу ім прыйшла каронная дывізія Стэфана Чарнецкага. Разам яны дазвання разграмілі войска Хаванскага ў 1660 г. у бітве каля Палонкі і ў 1661 г. пад Кушлікамі. Гэтыя перамогі змянілі ход вайны і адкрылі магчымасць перанесці дзеянні на тэрыторыю Маскоўскай дзяржавы. Аптымізм перадаваўся і простаму насельніцтву Беларусі. Полацкія сяляне ў 1661 г. па закліку наваградскага кашталяна Мікалая Юдзіцкага ўтварылі баявыя аддзелы і самастойна хадзілі ваяваць тэрыторыю Маскоўскай дзяржавы. Вясковы люд заўзята дабіваў рассеяныя пасля вялікіх бітваў рэшткі непрыяцельскага войска, помсцячы за рабункі і гвалт, як гэта было пасля бітвы пад Кушлікамі на Полаччыне ў 1661 г.

Імкненне пазбавіцца ўлады акупантаў ахапіла практычна ўсе сацыяльныя слаі, кансалідаваўшы грамадства вакол ідэі вызвалення і вяртання ранейшага ладу. Найбольш ярка гэта выявілася ў серыі антымаскоўскіх паўстанняў у беларускіх гарадах. У Магілёве мяшчане змовіліся і 1 лютага 1661 г. са зброяй у руках выступілі супраць маскоўскага гарнізона. Яны знішчылі ўвесь яго склад (2 тысячы чалавек), а ваяводаў перадалі каралю. Па прыкладзе Магілёва

самастойна зліквідавалі царскія залогі таксама жыхары Дзісны, Мсціслава, Себежа, Шклова, Гомеля, а ў 1664 г. — і Старога Быхава. Накінутая сілай на Беларусь царская ўлада гэтак жа сілай і скідалася пры актыўным удзеле мясцовага насельніцтва. Як адзначыў імператарскі дыпламат Аўгусцін Маерберг, які праязджаў тады землямі Беларусі, здзекі і гвалт масквіцян так адвярнулі ад іх сэрцы гэтага народа, што ён «выганяў іх са сваіх зямель з такой жа нянавісцю, з якім даверам калісьці прымаў».

Калі на пачатку вайны дзякуючы шырокай прапагандзе і ўдаламу выкарыстанню канфесійных супярэчнасцяў у Вялікім Княстве маскоўскі ўрад здолеў шмат у якіх месцах Беларусі нейтралізаваць праваслаўнае насельніцтва ці нават схіліць яго на свой бок, дык для часоў акупацыі стала больш характэрнай масавая барацьба мясцовага жыхарства супраць царскіх уладаў. Па прычынах і формах гэты рух быў блізкі да антышведскага паўстання 1656 г. у Жамойці, да партызанскай вайны польскага народа супраць шведаў у 1655—60 г., аднак ён застаецца пакуль малавядомы цяперашнім беларусам.

## IX.5. Андрусава: вынікі вайны

Пасля працяглых і цяжкіх перамоў 20 студзеня 1667 г. у вёсцы Андрусава, што на ўсходзе Беларусі, на Смаленшчыне (цяпер тэрыторыя Расіі), камісары Рэчы Паспалітай і паслы Маскоўскай дзяржавы падпісалі дагавор аб міры на 13 гадоў і 6 месяцаў. Згодна з умовамі пагаднення ўсё Смаленскае і Чарнігаўскае ваяводствы, а таксама Старадубскі павет і ўкраінскія землі па левы бераг Дняпра адыходзілі да Маскоўскага царства. Паўночныя абшары Беларусі — Віцебшчына і Полаччына, а таксама Дынабург, Інфлянты і Правабярэжная Ўкраіна (Кіеў трэба было перадаць праз 2 гады, але царскі ўрад не выканаў гэтай умовы) вярталіся ў склад Рэчы Паспалітай. Тэрыторыя Вялікага Княства Літоўскага паменшылася з 370 да 312 тысяч кв. км. Пазней, згодна з дамовай 1678 г., маскоўскі ўрад вярнуў заселеныя пераважна беларусамі Невель, Себеж і Вяліж, і сфармаваная такім чынам мяжа паміж Расіяй і Вялікім Княствам Літоўскім заставалася амаль нязменнай да канца XVIII ст.

Тэкст Андрусаўскага замірэння прадугледжваў вяртанне палонных і культурных каштоўнасцяў, што масава вывозіліся ў гады вай-



ны з акупаваных тэрыторый, найперш з Беларусі. Аднак права вярнуцца на айчыну фармальна атрымлівала толькі невялікая частка палонных — духавенства, шляхта, жаўнеры, казакі, татары ды яўрэі. Асноўная ж маса выведзеных з Беларусі людзей (сяляне і мяшчане) заставалася ў Маскоўскай дзяржаве на ўсе гады замірэння. У чарговым трактаце, падпісаным у 1672 г., асобныя пункты агаворвалі вяртанне шляхты і вызваленне мяшчан, купцоў і рамеснікаў, але ні словам не згадвалі сялян. Ды нават і шляхцічы, якім фармальна дазвалялася выехаць дамоў, далёка не заўсёды маглі выкарыстаць гэтае права. Такім шляхам пасля вайны Маскоўская дзяржава пакінула сабе сотні тысячаў палонных і вывезеных каштоўнасці, у тым ліку кнігі, царкоўныя ўпрыгажэнні, званы, гарматы і інш.



*Танец смерці.*
*Выява з бернардынскага касцёла ў Кракаве.*
*Другая палова XVII ст.*

Разасланыя па ўсім царстве, беларускія шляхцічы і мяшчане неслі службу ў самых далёкіх астрогах Сібіры. У некаторых гарадках, як, прыкладам, у Табольску ці ў Кузнецку, шляхта «літоўскага спісу» складала значную частку цэлай залогі (ад 10% да 30%). А выведзеным з Беларусі сялянам, якіх, дарэчы, у Маскоўскай дзяржаве называлі «літвой», «палякамі»,«іншаземцамі» ды «панамі», і ліку не вялося. Іх сялілі ў малалюдныя раёны і пераводзілі ў халопства. Адзін толькі баярын Барыс Марозаў вывеў у свае вотчыны пад Маскву тысячы беларускіх мужыкоў з сем'ямі, робячы іх халопамі ўласных халопаў. У такое падвойнае халопства беларусы траплялі і ў іншых баярскіх вотчынах вялізнага царства.

Мноства паспалітага люду з Беларусі назаўсёды засталося ў шматлікіх гарадах і манастырах Маскоўскай дзяржавы. Найбольш жа выхадцаў з беларускіх зямель апынулася ў самой Маскве, дзе ў 1670–х г. яны складалі 10% ад усяго пасадскага насельніцтва. Гэта былі галоўным чынам высокакваліфікаваныя рамеснікі — кавалі, сярэбранікі, краўцы, скурнікі, ганчары, збройнікі, шабельнікі ды інш. У адной толькі Збройнай палаце Крамля яшчэ пад час вайны, у 1660 г., ужо працавала 68 полацкіх і віцебскіх майстроў. Менавіта выведзеныя з Беларусі кафляры аздаблялі мноства маскоўскіх храмаў, Крамлёўскі палац ды Каломенскую рэзідэнцыю цара Аляксея Міхайлавіча. Затое ў беларускіх гарадах рамесная вытворчасць была настолькі падарваная, што даваеннага ўзроўню яе развіцця больш ніколі ўжо не ўдалося дасягнуць.



Пакалечаны вайной.
З гравюры XVII ст.

Для беларускага краю трынаццацігадовая вайна абярнулася самымі цяжкімі наступствамі. Ваенныя дзеянні і акупацыя давялі да катастрафічнага стану яго насельніцтва і гаспадарку. У межах прыкладна цяперашняй тэрыторыі Беларусі, паводле падлікаў польскага гісторыка Юзафа Можы, колькасць жыхароў зменшылася больш чым на палову: калі ў 1648 г. яно складала 2 млн. 900 тыс., дык у 1667 г. — 1 млн. 350 тыс. чалавек. Асабліва пацярпелі ўсходнія ды паўночныя паветы, у якіх не засталося і адной трэці даваеннага насельніцтва. Мястэчкі і вёскі былі папаленыя, гарады — абрабаваныя і пабураныя. Для аднаўлення гаспадаркі не хапала людзей, асабліва рамеснікаў, амаль зусім не засталося рабочай жывёлы. Каб хоць неяк паспрыяць аднаўленню зруйнаваных местаў, сойм Рэчы Паспалітай вызваліў 20 гарадоў ад падаткаў і розных цяжараў. У самым глыбокім занядпадзе апынулася і сельская гаспадарка. Пасля вайны большая палова ранейшых плошчаў ворыўнай зямлі не апрацоўвалася, а ў найбольш пацярпелых раёнах доўгі час пусткаю ляжала амаль усё поле. Прыкладам, у Віцебскай эканоміі ў 1667 г. некранутымі засталіся 74% зямлі, у цэлым Мсціслаўскім ваяводстве — да 70%. І праз дзесяць паваенных гадоў становішча мала палепшылася. Напрыклад, у Дубровенскім графстве, Прапойскім і Крычаўскім староствах у запусценні былі блізу дзвюх трэцяў сялянскіх гаспадарак. Засталіся бязлюднымі вёскі, колішняе ворыва зарастала хмызамі ды лесам. «У наваколлях галота, у некаторых вёсках няма ніводнага селяніна, валок не аруць. Сярод люду, што застаўся, пануе страшэнная галеча», — пісаў адміністратар маёнтка Смалявічы свайму гаспадару Радзівілу. Каб не памерці з голаду, сяляне часам і пасля вайны пакідалі свае абжытыя мясціны ды кіраваліся ў іншы край.





Бітва з туркамі пад Хацінам у 1673 г.

Без спецыяльных даследаванняў цяжка сказаць, калі Беларусь пераадолела наступствы той ваеннай катастрофы, калі выйшла з крызісу і ці пераадолела яго наогул. Цэлае стагоддзе ніяк не магло колькасна аднавіцца насельніцтва. Якасныя ж страты дэмаграфічнага патэнцыялу засталіся непапраўныя. Пазбаўленыя свайго вышэйшага стану і мяшчанства (гэтыя групы жыхарства пацярпелі больш за ўсіх),

беларусы ўжо тады сталі народам з няпоўнай сацыяльнай структурай, народам амаль наскрозь сялянскім.

Андрусаўскае пагадненне, што вяршыла самую знішчальную для Беларусі вайну, было своеасаблівым кампрамісам абодвух абяссіленых бакоў, патрэбным ім перад пагрозай асманскай агрэсіі. Некалькі артыкулаў трактата тычыліся непасрэдна ваеннага блоку Масквы і Варшавы супраць Турцыі і Крымскага ханства. Перасцярогі былі недарэмныя, бо ўжо ў 1672 г. пачалася вайна з Портай, што адразу прывяло да цяжкіх паражэнняў і стратаў. У 1673 г. іх ледзь кампенсавала бліскучая перамога вялікага гетмана Яна Сабескага пад Хацінам, дзе супольныя сілы Вялікага Княства і Кароны штурмам здабылі лагер турэцкай арміі. Вострая патрэба ў саюзніку па антытурэцкай кааліцыі пасля выратавання Вены ад туркаў (1683) і стварэння Святой Лігі стала адной з прычынаў падпісання «вечнага міру» паміж Масквой і Варшавай у 1686 г., вядомага як трактат Гжымултоўскага (па прозвішчы познанскага ваяводы Крыштафа Гжымултоўскага, які кіраваў пасольствам). За ўступленне Маскоўскага царства ў антыасманскую кааліцыю спатрэбілася прызнаць пастаянным усё тое, што ў Андрусаве лічылася часовым і кампрамісным. У выніку трактат Гжымултоўскага зафіксаваў буйную дыпламатычную паразу Варшавы і Вільні. З–за слабасці Рэчы Паспалітай, выяўленай яшчэ ў Андрусаве, Расія ў 1668 г. узаконіла свае заваёвы і замацавала новы баланс сілаў у Цэнтральна–Ўсходняй Еўропе.

## IX.6. Поспехі каталіцызму і паланізацыя

Выкліканая вайной татальная дэструкцыя змяніла літаральна ўсё — ад матэрыяльных умоў жыцця народа да моўна–культурнай і канфесійнай сітуацыі. Канчаткова і незваротна адышлі ў мінулае часы былой рэлігійнай талеранцыі. Калі раней, нават у часы панавання выхаванага езуітамі Яна II Казіміра, праваслаўныя падданыя Рэчы Паспалітай яшчэ мелі пэўныя гарантыі свабодаў, іх прадстаўнікі ўваходзілі ў сенат, а шляхта на сойміках магла патрабаваць роўнасці ўсіх рэлігій (як у Слоніме ў 1662 г.), дык цяпер прававое становішча некаталікоў пачало хутка пагаршацца. Яшчэ ў цяжкі час вайны сойм 1658 г. прыняў канстытуцыю аб арыянах, якая абавязала тых змяніць веру або пакінуць межы дзяржавы. Пасля вайны дайшла чарга і да праваслаўных. Казацтва, што было апораю грэцкай царквы, аслабла, рэшта беларускай шляхты перайшла ў каталіцтва, а дзяржаўная адміністрацыя і магнаты да праваслаўнай царквы ставіліся варожа. Апошняе ў значнай ступені абумовіла палітыка самой Масквы. За гады акупацыі большасць жыхароў Беларусі была пераведзена ў праваслаўе — адзінае веравызнанне, якое прызнавалі і падтрымлівалі царскія ўлады. Праваслаўнае духавенства часта адкрыта супрацоўнічала з царскай адміністрацыяй, чым яшчэ больш скампраметавала царкву ў вачах шляхты. А Масква і ў гады вайны спрабавала падпарадкаваць праваслаўныя епархіі Беларусі і Ўкраіны свайму патрыярхату, і пасля Андрусава настойліва дамагалася апекі над імі. У тэксце дагавора 1678 г. паміж Масквой і Варшавай асобны параграф патрабаваў, каб падданым грэцкага веравызнання ў Рэчы Паспалітай «ніякага ўціску, прымушэння да рымскай веры і уніі не было».



*Ян III Сабескі,*
*кароль і вялікі князь (1674—1696).*
*Англійская мініяцюра 1684 г.*



У сярэдзіне 1680–х г. маскоўскі ўрад нарэшце дамогся сваёй мэты: уся Кіеўская мітраполія афіцыйна пераводзілася пад юрысдыкцыю Маскоўскага патрыярхата. Мітрапаліт Гедэон Чацьвярцінскі, здаўна адданы Маскве, у 1685 г. упершыню прысягнуў на вернасць маскоўскаму патрыярху, а праз год цараградскі патрыярх адрокся ад сваіх праў на Кіеўскую мітраполію ды зацвердзіў яе падпарадка-



*Панарама Магілёва. Гравюра XVIII ст.*

ванне маскоўскаму патрыярхату. У тым жа 1686 г. у падпісаным «вечным міры» IX артыкул абавязаў урад Рэчы Паспалітай аднавіць былыя праваслаўныя епархіі ды гарантаваць ім «усялякія свабоды і вольнасці царкоўныя». Гарантам правоў усіх праваслаўных Рэчы Паспалітай прызнаваўся кіеўскі мітрапаліт, з якім магла свабодна кантактаваць яго паства з Кароны і ВКЛ. Уключэнне такога пункта ў трактат стала вялікай памылкай Крыштафа Гжымултоўскага. Кіеў ужо знаходзіўся ў складзе Маскоўскага царства. Цяпер праваслаўныя Беларусі і Украіны атрымлівалі сваю ерархію не ад караля, а ад маскоўскага цара, які займеў права апекавацца праваслаўнымі Беларусі і Правабярэжнай Украіны. Фактычна, IX артыкул даваў царскаму ўраду мноства падстаў на ўмяшанне ва ўнутраныя справы Вялікага Княства і Кароны. Хоць кароль Ян III Сабескі (1674—1696) спахапіўся і не дапусціў да ратыфікацыі пагаднення (і так было да 1712 г.), расійскі бок лічыў свае прэтэнзіі законнымі.

Аднак імкненне Масквы ўступацца за праваслаўных падданых Рэчы Паспалітай вяло адно да пагаршэння становішча апошніх. Для Беларусі менавіта паваенныя часы сталі перыядам асабліва хуткага заняпаду праваслаўя, пашырэння уніі, нарастання рэлігійнай нецярпімасці. Як адзначыў у 1665 г. апостальскі нунцый, «лагер прыхільнікаў уніі цяпер складаюць толькі сяляне і мяшчане». Сімвалічна, што калі на пачатку XVII ст. у сенаце засядалі яшчэ такія патроны праваслаўя, як



Агінскія і Стэткевічы, дык пасля вайны ўжо ніхто не мог абараняць іх у вышэйшым дзяржаўным органе. У 1667 г. памёр апошні дызуніт (акурат у тыя гады гэтае пеяратыўнае азначэнне праваслаўных стала ўжывацца на соймах), які ўваходзіў у склад сената — праваслаўны троцкі кашталян Аляксандр Агінскі, а крыху раней не стала і апошняга сенатара–кальвініста — полацкага кашталяна Яна Сасноўскага. Цяпер сенат прадстаўлялі выключна каталікі. І калі ў першай палове XVII ст. соймы нярэдка станавіліся на абарону правоў грэцкай царквы, дык цяпер упершыню сталі прымацца дыскрымінацыйныя пастановы. Ужо ў 1673 г. праваслаўных пазбавілі права атрымліваць шляхецтва, у 1676 г. праваслаўныя брацтвы страцілі ранейшыя прывілеі, а ўсё праваслаўнае насельніцтва — права выезду за мяжу (тлумачылася гэта неабходнасцю перакрыць небяспечныя для Рэчы Паспалітай кантакты праваслаўных з цараградскім патрыярхам ды з Турцыяй). У 1699 г. у іх адабралі і права займаць выбарныя магістрацкія пасады ў гарадах каралеўскай юрысдыкцыі. З таго моманту, як у 1717 г. шляхецкія парламентарысты выгналі з пасольскай палаты дысідэнта Пятроўскага, палітычныя правы рабіліся прывілеяй толькі каталікоў. У 1717 і 1733 г. іншаверцы былі пазбаўлены права ўдзельнічаць у соймах. І ў наступныя дзесяцігоддзі беларуская і літоўская шляхта неаднаразова выступала на сваіх павятовых сойміках супраць надання дызунітам палітычных правоў, дазволу мець афіцэрскія чыны ў войску і г.д. На талеранцыю цяпер некаталікі маглі разлічваць адно ў межах цывільнага жыцця.

Справай надзвычайнай палітычнай важнасці і для Масквы, і для Варшавы стала царкоўная унія, паколькі для першай яна з'яўлялася перашкодай у «збіранні рускіх зямель», а для другой — наадварот, пэўнай легітымацыяй іх валодання. Таму абодва бакі выкарыстоўвалі любыя сродкі для дасягнення мэты, першы — для яе скасавання, другі — для ўмацавання. Напрыклад, пасля смерці беларускага праваслаўнага епіскапа Хведара Васілевіча (1678) кафедра Мсціслаўска–Магілёўскай епархіі ажно дзесяць гадоў заставалася вольнай толькі па той прычыне, што кароль і вялікі князь Ян III Сабескі хацеў падабраць на гэтую пасаду прыхільніка уніі, які б падрыхтаваў да пераходу пад вяршэнства папы ўсю епархію. Кароль закрываў вочы на парушэнні правоў праваслаўнай царквы, што чынілі мітрапаліт Габрыэль Календа ці епіскап Якуб Суша. Пры прававой дыскрымінацыі праваслаўя і ціску на яго як дзяржаўных

уладаў, так і землеуладальнікаў унія карысталася адкрытай падтрымкай найбагацейшых колаў грамадства, што і забяспечвала хуткі рост яе матэрыяльнай і сацыяльнай асновы. Пашырэнню уніі спрыяў таксама разлад у самой праваслаўнай царкве і аслабленне ролі казацтва (у1699 г. сойм прыняў пастанову пра яго роспуск). Не апошнім фактарам, які схіляў да грэка–каталіцтва, мог быць вопыт перажытай маскоўскай акупацыі. У кожным разе канверсія ў унію ў апошняй трэці XVII ст. аказалася самай значнай за ўсю гісторыю яе існавання. У 1691 г. у грэка–каталіцкую веру перайшоў епіскап пярэмышльскі, у 1700 г. — львоўскі, а праз два гады — і луцкі. Так што з чатырох праваслаўных епархій, якія былі ў Рэчы Паспалітай пасля Андрусаўскага пагаднення, на пачатак XVIII ст. засталася толькі адна — Мсціслаўска–Магілёўская, якую называлі Беларускай. Утвораная пры Ўладыславе IV, яна так ніколі і не падпарадкавалася грэка–каталіцкім ерархам.

Землі Беларусі ўваходзілі ў склад Полацкай, Пінска–Тураўскай і часткова Ўладзіміра–Берасцейскай епархій Кіеўскай уніяцкай мітраполіі, рэзідэнцыя якой мясцілася ў Вільні. Колькасць яе прыходаў і храмаў памнажалася як дзякуючы будаўніцтву новых цэркваў за кошт фундушаў магнатаў і шляхты, так і шляхам ператварэння праваслаўных храмаў у грэка–каталіцкія. Дызуніты цярпелі сапраўдны пераслед: многіх папоў пазбаўлялі парафіяў, вернікаў гвалтам перахрышчвалі, сілай адбіралі іхнія храмы. Так, яшчэ ў часы Яна Сабескага дамініканцы занялі Ўваскрасенскі манастыр у Барысаве. У 1722 г. у Пінску група каталікоў на чале з уніяцкім біскупам Гадэбскім здзекавалася з праваслаўных манахаў, прымушаючы іх пераходзіць у грэка–каталіцкую веру. У 1724 г. у Мсціславе намаганнямі смаленскага уніяцкага арцыбіскупа Сакалінскага была сілай адабраная і перададзеная уніятам царква святога Іллі. У Крычаве ў 1740–х г. праваслаўны святар Цітовіч сам прыняў грэка–каталіцкую веру і прымушаў да пераходу ў яе сваіх прыхаджанаў. У Вільні дызуніты не дапускаліся да пасадаў у гарадскім і цэхавым кіраўніцтве. Вядомы таксама факты іх пераследу ў Менску, Шклове, Полацку, Любавічах.

Хоць трактат Гжымултоўскага, як ужо адзначалася, яшчэ не быў ратыфікаваны соймам, расійскі ўрад паспяхова выкарыстоўваў прыклады дыскрымінацыі праваслаўнага насельніцтва ў Беларусі ва ўласных інтарэсах — для ўмяшання ва ўнутраныя справы Рэчы



Паспалітай. Масква адкрыта заявіла пра свой пратэктарат над праваслаўнымі і ўзняла шумную кампанію аб несвабодзе сумлення ў Вялікім Княстве і Кароне. Як прыклад была скарыстана справа Адорскага — выкрытага тайнага уніята, які прызначаўся каралём на пасаду епіскапа беларускага. Аднак далёка не ўсе прыклады ўціску дызунітаў, якія прыводзіліся ў прапагандзе расійскім бокам, адпавядалі сапраўднасці. Так, у першай грамаце цара Пятра I да караля Аўгуста II, у якой цар як пратэктар праваслаўных адкрыта выявіў сваю варожасць да уніятаў (што потым неаднаразова дэманстраваў, калі прыйшоў з войскам у Беларусь), фігураваў адзіны выпадак гвалтоўнай перадачы уніятам Цяперскага праваслаўнага манастыра ў Пінскім павеце, у сапраўднасці ж пастанову аб пераходзе ў унію ў 1696 г. прынялі самі манахі.



*Андрэй Баболя, езуіцкі мучанік, забіты казакамі ў Пінску. Медзярыт 1755 г.*

У першай палове XVIII ст. царкоўная унія таксама няспынна пашыралася. Перад падзеламі Рэчы Паспалітай праваслаўных прыходаў у Беларусі заставалася зусім мала, і канцэнтраваліся яны на ўсходзе краю. У Ашмянскім, Браслаўскім, Берасцейскім, Лідскім і Слонімскіх паветах іх ужо наогул не існавала ў 1780–х г. Кампактныя выспы праваслаўнага насельніцтва захоўваліся толькі ў Навагрудскім, Пінскім, Ваўкавыскім і Мазырскім паветах. Разам жа ў 14 паветах Беларусі пасля першага падзелу Рэчы Паспалітай налічвалася 1199 уніяцкіх і 283 каталіцкіх прыходаў з 199 кляштарамі, а праваслаўных толькі 143. У межах Рэчы Паспалітай перад Вялікім соймам праваслаўных заставалася каля 3,5% ад усяго насельніцтва.

Яшчэ горшым было становішча пратэстанаў. Кальвінскі збор так і не змог аправіцца ад стратаў, панесеных у вайне Аляксея Міхайла-

віча. Супраць іншаверцаў бязлітасна змагаліся то царскія ўлады, то контррэфармацыя, якая асабліва актывізавалася пасля Андрусаўскага замірэння. Калі ў 1655 г. на тэрыторыі Вялікага Княства Літоўскага было 110 збораў, дык на 1696 г. застаўся толькі 51. Канцэнтраваліся яны галоўным чынам на Жамойці ды ў некаторых раёнах Заходняй Беларусі. У Цэнтральнай Беларусі, прыкладам, у Шацку, Уздзе, Свіслачы ды іншых гарадах і мястэчках, заняпалыя кальвінскія зборы больш ужо не аднаўляліся. У другой палове XVIII ст. іх тут заставалася ўсяго 16.

Паводле падлікаў польскага гісторыка Ўладыслава Вяльгорскага, больш за 80% жыхароў Беларусі напрыканцы існавання Рэчы Паспалітай ужо вызнавала унію. Нават на ўсходзе Беларусі, на Магілёўшчыне, у 1777 г. грэка–каталікам належала 68% усіх цэркваў і манастыроў, а праваслаўным і рыма–каталікам адпаведна толькі 22% і 10% храмаў.

Поруч з каталіцкай верай крочыла паланізацыя грамадства. Але не царкоўная унія была мастком да паланізацыі, як гэта часта сцвярджалася ў беларускай і расійскай гістарыяграфіі. Стаўшы рэлігіяй сацыяльных нізоў, бо абсалютную большасць прыхаджанаў грэка–каталіцкіх парафіяў складалі сяляне і мяшчане, яна аб'ектыўна выконвала ролю своеасаблівага бар'ера, які стрымліваў перавод простага люду ў лацінскі касцёл.

Поспехі паланізацыі, якая пачалася яшчэ да Берасцейскага сабору, былі абумоўлены найперш грамадскім прэстыжам шляхецтва, прывабнасцю яго прывілеяў, «залатых вольнасцяў». Сармацкая ідэалогія рыцарства з характэрнай для яе канцэпцыяй грамадзянскіх свабодаў і вяршэнства шляхты над манархам, які за тыранства мог быць пазбаўлены каралеўскага пасаду, мела велізарную прыцягальнасць. Шляхецтва ж, сцвярджае польскі гісторык Януш Тазбір, якога дамагаліся амбітныя мяшчане і прадпрымальныя сяляне, вяло да пераходу на польскую мову. Уся шляхта Рэчы Паспалітай інтэгравалася ў адзіны «народ» на аснове сармацкай свядомасці, міфу пра адзінае паходжанне. Кожны шляхціч імкнуўся карыстацца «сармацкай» мовай, палітычная дактрына шляхты фармулявалася па–польску або на латыні. Менавіта XVII ст. стала часам найбольшай распаўсюджанасці і прэстыжу польскай мовы. Паказальны факт: калі ў 1696 г. шляхта Беларусі і Літвы правяла на канфедэрацыйным сойме свой праект канчатковага ўраўнання яе правоў з





*Калегіум езуітаў у Полацку. Гравюра канца XVIII ст.*

правамі кароннай шляхты (так званай «каэквацыі станаў»), то уключыла ў яго пункт аб замене афіцыйнай старабеларускай («рускай») мовы на польскую. Праз год сойм, на якім каранаваўся Аўгуст II, зацвердзіў гэтую пастанову. Прынятая канстытуцыя сцвярджала, што «пісар земскага ваяводскага суда... па–польску, а не па–руску пісаць» павінен. Усе дэкрэты дзяржаўнага справаводства цяпер мусілі выдавацца па–польску. Але і акты, пісаныя раней на старабеларускай мове, захоўвалі прававую моц, так што гэта не была забарона ранейшай дзяржаўнай мовы ВКЛ.

Фактычна, канстытуцыя сойму 1697 г. толькі фармальна замацавала поспехі паланізацыі. На працягу XVII ст. адбылася моўная пераарыентацыя адукаваных колаў грамадства. Праз нейкіх сто гадоў пасля Францішка Скарыны нават праваслаўныя беларусы ўжо карысталіся лацінскім шрыфтам часцей, чым іх адукаваныя землякі каталіцкага веравызнання ў гады жыцця першадрукара. А пасля жудаснай вайны XVII ст. польскай мовай ужо нярэдка карысталася і праваслаўнае духавенства. Пры перапісванні старых кірылічных

тэкстаў мясцовыя перапісчыкі выкарыстоўвалі польскую графіку, ўсё больш забываючы кірылічнае пісьмо.

Чаму ўсё так змянілася за стагоддзе? Адной з галоўных прычынаў, якія забяспечылі такі поспех распаўсюджвання каталіцкай веры і паланізацыі, з'яўлялася перавага ў адукацыі. Школьніцтва заўжды было слабым месцам праваслаўнай царквы. У другой палове XVII ст. у сферы адукацыі ўжо непадзельна панавалі лацінскія ордэны, і найперш езуіцкі, які стварыў найлепшыя навучальныя ўстановы. Пры гэтым больш за дзве траціны ўсіх езуіцкіх школ ВКЛ працавала ў гарадах Беларусі. Праваслаўныя ды іншаверцы, думаючы пра добрую адукацыю і кар'еру дзяцей, аддавалі іх таксама ў каталіцкія навучальныя ўстановы, да езуітаў. У Віленскай езуіцкай акадэміі адвучылася нямала праваслаўных і пратэстантаў. Не дзіўна, што пасля езуіцкіх школ нашчадкі некаталікоў звычайна пераходзілі ў каталіцтва. Па колькасці вучняў, сярод якіх апрача шляхцічаў было нямала дзяцей мяшчанскага і сялянскага паходжання (бо езуіты вучылі бясплатна), менавіта езуіцкія навучальныя ўстановы трымалі першынства. Напрыклад, у Смаленскім калегіуме ў 1646 г. займалася 700 вучняў, а школа Пінскага калегіума на прачатку XVIII ст. была наогул адной з самых буйных у Вялікім Княстве Літоўскім. Праз дыспуты і тэатральныя пастаноўкі езуіты ахаплялі сваёй прапагандай не толькі вучняў, але і шырокія грамадскія колы.




*Экслібрыс радзівілаўскай бібліятэкі ў Нясвіжы. Пачатак XVIII ст.*

Дамінуючы ў галіне адукацыі, езуіты фармавалі грамадскую свядомасць пакаленняў. Менавіта іх праца ў школах забяспечвала уніфікацыю шляхецкай культуры па польскай мадэлі ў межах цэлай Рэчы Паспалітай. Езуіцкую арганізацыю школ і сістэму выкладання перанялі і школы базыльянаў. Заснаваны яшчэ ў IV ст. і рэарганізаваны ў 1617 г. мітрапалітам Язэпам Руцкім для сцвярджэння справы уніі, Ордэн базыльянаў рабіў шмат аб'ектыўна карыснага для краю. Праз школы і друкарні ён імкнуўся ўзняць уніяцкую царкву да ўзроўню лацінскай, і ў гэтай сферы яго дзейнасць была надзвычай плённай. У школьнай праграме ордэна асаблівы націск рабіўся на народную («рускую») мову. Сам Язэп Руцкі ў 1621 г. запэўніваў, што базыльяне «заўсёды заклікаюць прамаўляць казані на рускай мове і патрабуюць рабіць на ёй усе публічныя выступы». «Мы настойліва патрабуем, каб айцы і браты прамаўлялі слова Божае не інакш, як па–руску», — значылася ў рашэннях VI Генеральнай кангрэгацыі базыльянаў з 1636 г. Валодаючы беларускай і ўкраінскай мовамі ды шырока выкарыстоўваючы іх у місіянерскай дзейнасці і прыходскай катэхізацыі, базыльяне спрыялі глыбейшай хрысціянізацыі простага люду, па–свойму ўплываючы на развіццё «нізавой» культуры ў Беларусі.





*Пячатка Ордэна базыльянаў.*

Пасля Паўночнай вайны (1700—1721) свае школы ў гарадах і мястэчках Беларусі адкрывалі і піяры. У іх бясплатна навучаліся дзеці найбяднейшых слаёў насельніцтва, галоўным чынам сялянства. Дзейнічалі таксама навучальныя ўстановы іншых каталіцкіх ордэнаў — дамініканцаў, якія валодалі найбольшай колькасцю кляштараў у Беларусі (у Горадні, Наваградку, Ушачах, Валынцах, Быхаве і інш.), кармелітаў (у Мсціславе, Радамлі, Ружанах, Лідзе і інш.), і г.д. Такім чынам, з сярэдзіны XVII ст. практычна ўся адукацыя была ў руках каталіцкага духавенства.

Адказам на дзейнасць езуітаў у Беларусі і Ўкраіне стала стварэнне здольных да канкуравання з імі навучальных устаноў для праваслаўных — славяна–грэцкіх, ці славяна–грэка–лацінскіх школ, у якіх вывучаліся тры сакральныя мовы, чым падкрэслівалася арыентацыя на сінтэз традыцыйнай культуры з заходняй. Самай знакамітай была Кіеўская брацкая школа, якую Пётр Магіла (1596—1647), кіеўскі мітрапаліт з 1632 г., рэфармаваў па ўзоры езуіцкіх калегіумаў. У гонар яго ўстанова называлася Кіева–Магілянскім калегіумам, які больш вядомы як акадэмія, бо стаў першай вышэйшай навучальнай установай для праваслаўных у

Рэчы Паспалітай. У супрацьстаянні Віленскай езуіцкай акадэміі яна да канца XVIII ст. заставалася цэнтрам «усходняй» адукацыі і асветы як для Ўкраіны, так і для Беларусі. Сістэма яе арганізацыі і адукацыйная праграма з'яўляліся ўзорам для пераймання ў іншых школах краю. Вядомымі цэнтрамі для навучання праваслаўных Беларусі былі брацкія школы ў Вільні, Магілёве і Полацку. Аднак істотнага супраціву польска–каталіцкім адукацыйным установам яны ўжо не стваралі.

У канцы XVII ст. у глыбокім заняпадзе апынулася і беларускае кірылічнае кнігадрукаванне, яшчэ векам раней такое багатае . Колькасць брацкіх друкарняў і выдадзеных імі кніг імкліва скарачалася. Часова, дзякуючы дзейнасці беларускага гравёра і друкара Максіма Вашчанкі, ажыла толькі друкарня магілёўскага Багаяўленскага манастыра, аднак з яго адыходам і яна хутка заняпала. Затое актыўна функцыявалі выдавецтвы каталіцкіх ордэнаў у Горадні, Менску, Слоніме, Пінску, Полацку, а таксама біскупскае ў Магілёве ды магнацкія ў Нясвіжы і Горадні. Са старадаўніх беларускіх друкарняў найдаўжэй трымалася адна толькі Супрасльская. Там, у самым заходнім беларускім рэлігійна–культурным цэнтры, кнігі па–ранейшаму выдаваліся і перапісваліся на мовах старaславянскай і старабеларускай. Але іх танюткі струменьчык не мяняў агульнай сітуацыі. У краі даўно панавала польскае і лацінскае друкаванае слова.

## IX.7. Ад шляхецкай дэмакратыі да алігархіі

Палітычны лад дзяржавы «абодвух (а фактычна многіх) народаў» развіваўся асаблівым шляхам. Калі ў краінах Заходняй Еўропы, перадусім у Францыі, Іспаніі, Англіі з XVI ст. станава–прадстаўнічыя манархіі ператвараліся ў абсалютысцкія дзяржавы з адной дынастыяй на чале, дык у Рэчы Паспалітай сцвердзілася рэспубліканская сістэма ўлады з інстытутам слабога манарха, які з 1573 г. свабодна абіраўся. Сітуацыя свабодных выбараў, калі невядомая асоба электара будзіла трывогу за іх вынікі, спарадзіла новы механізм захавання сфармаванага ладу. Паміж шляхтай і кожным новым каралём перад яго элекцыяй заключалася спецыяльная дамова — так званая *pacta conventa*, якая вызначала канкрэтныя абавязкі новаабранага манарха і была своеасаблівым індывідуаль-



ным кантрактам. Але разам з першай *pacta conventa* былі складзены і «Генрыхавы артыкулы» (назва ад імя першага элекцыйнага караля Генрыха Валуа), у якіх выкладаліся падставовыя прынцыпы шляхецкай дзяржаўнасці. Яны абавязалі караля і вялікага князя прызнаваць вольную элекцыю, захоўваць рэлігійны мір, не вырашаць пытанняў вайны і міру без сената і сойма, не праводзіць выбараў наступніка пры сваім жыцці (*vivente rege*), склікаць звычайны сойм кожныя два гады, апрача таго прадугледжвалі магчымасць правядзення пазачарговых, надзвычайных з'ездаў шляхты. Цяпер шматгадовае панаванне манарха без удзелу станаў было немагчымае. Для кантролю над каралём парламент прыставіў да яго раду ў выглядзе сенатараў–рэзідэнтаў. Так былі ўведзены законныя, канстытуцыйныя абмежаванні каралеўскай улады. Карануючыся, манарх прысягаў над Генрыхавымі артыкуламі і калі не выконваў прынятых абавязкаў, то шляхта вызвалялася ад падпарадкавання першай асобе дзяржавы. Валодаючы правам супраціву, яна магла законна са зброяй у руках выступаць супраць караля, які парушаў асноўныя прынцыпы дзяржаўнага ладу.



*Сойм — алегорыя Рэчы Паспалітай. Франтыспіс твора Анджэя М. Фрэдры (1652).*

У выніку абмежавання прэрагатыў караля і ўключэння яго ў парламент у Рэчы Паспалітай сцвердзілася сістэма так званай «мяша-

най», або збалансаванай улады (*monarchia mixta*), якая стварыла альтэрнатыву манархіі абсалютнай. Гэта была найбольш спелая форма станава–прадстаўнічай дзяржавы, у якой дасягалася пэўная раўнавага паміж уладай і грамадствам. Такой мадэлі дзяржаўнасці адпавядала і своеасаблівая ідэалогія, светапогляд усяго палітычнага народа — шляхты.

У канцы XVI ст. комплекс прывілеяў шляхты Рэчы Паспалітай стаў асновай афармлення ідэалагічнай дактрыны «залатой вольнасці» — культу павагі да свабод кожнага індывіда шляхецкага стану. Галоўнымі з гэтых вольнасцяў з'яўляліся роўнасць ўсіх шляхцічаў перад законам (*aequalitas*), права на свабодную элекцыю караля (па



*Агульны від Горадні. З 1673 г. тут адбываліся соймы. Гравюра 1659 г.*

прынцыпу *viritum*), права кожнага шляхціча на свабоду голасу (*libera vox*), права на пратэст (*ius vetandi*), а таксама недатыкальнасць асобы шляхціча і яго маёнтка (з 1588 г. шляхецкія сядзібы былі абаронены ад усялякіх рэвізій). Тэарэтычна шляхта мела права ледзь не на ўсё. Яе вольнасці маглі абмежаваць толькі пастановы соймаў і соймікаў, аднак яны прымаліся той самай шляхтай. А вось без згоды шляхецкіх паслоў кароль і вялікі князь не меў права ні накладаць падаткі, ні збіраць паспалітае рушанне ці пачынаць вайну, ні выдаваць якія–небудзь іншыя уставы, што тычыліся б шляхты.

Падобны дэмакратызм дзяржаўнага ладу Рэчы Паспалітай стаў зусім нетыповай з'явай для новачаснага свету. Трэба ўлічваць, што тут удзельная вага шляхты ў сацыяльнай структуры грамадства была адной з найбольшых у Еўропе. У сэнсе сцеражэння правоў асобы, абароны яе годнасці і барацьбы з дэспатызмам шляхецкая рэспубліка моцна апярэдзіла практыку іншых еўрапейскіх краін. Аднак у шляхецкіх вольнасцях таіліся і адмоўныя, проста згубныя для дзяржавы наступствы.



У XVII ст., асабліва пасля знішчальных войнаў 1650—60–х г., сярод шляхты пашырылася перакананне аб выключнасці і непаўторнасці дзяржаўнага ладу Рэчы Паспалітай. Тагачасная сістэма ўяўлялася самай дасканалай, і кожная спроба нешта змяніць успрымалася як імкненне да дыктатуры. Самым вядомым ідэолагам «залатой вольнасці» стаў львоўскі кашталян Анджэй Максімільян



*Віленская ратуша. Малюнак невядомага мастака канца XVII ст.*

Фрэдра (1620—1679), які ў 1660–х г. выступіў з таленавітымі трактатамі ў яе абарону. У прыватнасці, абгрунтоўваючы перавагі традыцыйнага для Рэчы Паспалітай адзінагалоснага прыняцця пастаноў (*liberum veto*), ён пісаў, што ў адваротным выпадку, калі б рашэнні прымаліся большасцю галасоў, «мноства горшых перавconfigured жыла б над меншасцю лепшых», і краіна зазнала б яшчэ большыя шкоды. У гістарычнай драме Фрыдрыха Шылера «Дзмітры» і мудры Леў Сапега, апраўдваючы згаданы прынцып, сцвярджаў:«Большасць — гэта глупства! Розум заўсёды толькі ў меншасці».

Абсалютызаваныя «залатыя вольнасці» сталі трактавацца як аснова ўсіх унутрыдзяржаўных адносін, перадусім паміж шляхтаю і манархам. Усялякая спроба рэфармаваць усталяваны лад уяўлялася

шляхце замахам на яе прывілеі і блакавалася. Баючыся зменаў, рыцарства лічыла, што сойм мусіць не столькі праводзіць уласную палітыку, колькі стрымліваць новаўвядзенні з боку караля. Словам, небяспека бачылася толькі ў прыняцці новых, шкодных для тагачаснага ладу пастаноў. На практыцы найлепшым спосабам іх прадухілення стала спыненне соймавай нарады праз *liberum veto* («вольнае не дазваляю»). Права аднаго пасла сарваць працу сойма ў часе нарады зрабілася сімвалам шляхецкай свабоды. Пачынаючы з 1652 г., калі гэтае права скарыстаў троцкі пасол Уладыслаў Сіцынскі (хоць зрывы соймаў здараліся і раней — у 1605, 1615, 1637 г.), і да канца панавання Сасаў (1763 г.) больш за палову адкрытых соймаў (фактычна 37 з 73) было сарвана. Менавіта зрывы соймаў выявілі цяжкую хваробу шляхецкага парламентарызму. Але паслы тады не бачылі ў гэтым нічога кепскага. Вольналюбівы шляхціч Рэчы Паспалітай, які яшчэ нядаўна з гонарам лічыў сябе самым свабодным грамадзянінам у Еўропе — і меў на гэта поўнае права,ператварыўся ў баязлівага фаната старых парадкаў. Жывучы гларыфікацыяй існавалага стану рэчаў, хваліў адно «залатыя вольнасці» і не давяраў усяму новаму, іншаземнаму.



*Сімвал найшчаслівейшага дзяржаўнага ладу. Медзярыт 1794 г.*



Права «вольнае не дазваляю» вельмі хутка зрабілася грознай зброяй магнатаў, якія пры аслабелай цэнтральнай уладзе імкнуліся да гегемоніі. Аднак ніводнай іх групоўцы не хапала сілаў, каб узяць усю ўладу ў свае рукі. Таму яны аб'ядноўваліся са шляхтай, імкнуліся захаваць раўнавагу сілаў праз *liberum veto* як тормаз, як спосаб блакавання непажаданых пастаноў. Стан раўнавагі сілаў акурат і спрыяў ідэалізацыі ўсталяванага ладу, імкненню захаваць яго нязменным.

Не менш важным для партыйнай барацьбы ўнутры дзяржавы было права на стварэнне канфедэрацый. Не прызнаная каралём канфедэрацыя называлася рокашам і з'яўлялася афіцыйнай формай узброенай барацьбы супраць дзяржаўнай улады. На працягу XVII ст. канфедэрацыі паўставалі ў Рэчы Паспалітай дзесяткі разоў — ці то для бунту супраць манарха і дасягнення сваіх патрабаванняў, ці для яго падтрымкі. Дамагаючыся сваіх палітычных мэтаў, канфедэрацыі ўцягвалі ў дзяржаўнае жыццё шырокія колы шляхты і войска. А яснавяльможныя паны апрача мноства служылай шляхты мелі прыватныя вайсковыя фармаванні, што часам былі мацнейшыя за дзяржаўную армію. Прыкладам, слуцкі князь Геранім Фларыян Радзівіл (1715—1760) трымаў 6 тысячаў рэгулярнага войска і столькі ж казакоў ды стралкоў. У мэтах падрыхтоўкі афіцэрскіх кадраў для сваёй арміі Радзівілы адкрылі ў сваіх рэзідэнцыях Слуцку і Нясвіжы спецыяльныя кадэцкія



*Міхаіл Казімір Пац, вялікі гетман (1667—1682).*

карпусы, а брат згаданага Геранiма Фларыяна гетман Міхаіл Казімір заснаваў у Нясвіжы ўласную вайсковую акадэмію. Наяўнасць такой сілы ў амбітных алігархаў вяла да дэцэнтралізацыі ўлады і небяспечнага паглыблення палітычнай анархіі ў Рэчы Паспалітай.

У сярэдзіне XVII ст. шляхецкая дэмакратыя настолькі дэфармавалася, што стала ператварацца ў магнацкую алігархію. Групоўкі магнатаў з іх шляхецкай кліентэлай дамагаліся ўсё большай ролі ў кіраванні Рэччу Паспалітай. Калі ў першай палове XVII ст. Жыгімонт III Ваза і яго пераемнік Уладыслаў IV яшчэ мелі поўную свабоду ў прызначэнні ўрадаў (самі падбіралі сабе кадры на найважнейшыя дзяржаўныя пасады такім чынам, каб мець неабходную падтрымку ад іх), а ў складанай сітуацыі маглі не падпарадкавацца волі большасці ў сенаце і склікаць так званы «малы сенат» толькі з прыхільнікаў моцнай цэнтральнай улады, дык у экстрэмальных умовах часоў Патопу і Маскоўскай вайны манарх страціў і гэтыя магчымасці. Асаблівая сітуацыя склалася ў Вялікім Княстве Літоўскім, дзе алігархі традыцыйна панавалі над беларуска–літоўскай шляхтай і заўжды складалі апазіцыю Кароне.



*Казімір Ян Сапега,*
*вялікі гетман (1682—1703).*

У аслабленай дзяржаве першыя роды Літвы і Беларусі вялі зацятую барацьбу за гегемонію ў краіне. Кожны з іх быў супраць цэнтралізацыі і ўмацавання ўлады манарха, бо уніфікацыя палітычнай сістэмы Княства паводле кароннага ўзору азначала б дэмакратызацыю парадкаў і страту магнатамі іх ранейшай улады. Палічынаючы з Яна Казіміра Вазы, каралі выстаўлялі супраць «дыктатара Літвы» які–небудзь іншы магнацкі род. Апошні з Вазаў у супрацьстаянні з магутнымі Радзівіламі падтрымліваў Гасеўскіх, а потым Пацаў. Калі ж да гегемоніі прыйшлі Пацы, дык Ян III Сабескі выставіў супраць іх Сапегаў. Але кожны вялікі род, падтрыманы манархам, пасля дасягнення ўлады сам станавіўся ў апазіцыю да караля і вялікага князя.



У 1690–х г. абсалютнага панавання ў ВКЛ дамагліся Сапегі. Яны заручыліся падтрымкай Аўстрыі ды Брандэнбургіі і адважваліся адкрыта выступаць супраць улады самога караля. Праз карупцыю, застрашванне, увядзенне войска ў зямлю суперніка Сапегі засяродзілі ў сваіх руках амаль усе важныя дзяржаўныя пасады: Казімір Ян быў віленскім ваяводам і гетманам (1682—1703), яго брат Бенядыкт — падскарбіем, а сынам гетмана належалі ўрады вялікага маршалка, стольніка і канюшага. Супраць гегемонаў, якія заслужылі агульную нянавісць шляхты, доўга не адважваліся выступіць ні Радзівілы, ні Пацеі з Агінскімі. Сучаснікі пісалі, што Сапегі мелі план разрыву дзяржаўнай уніі з Каронай і ўзвядзення на вялікакняскі пасад аднаго з прадстаўнікоў свайго роду. У барацьбе з імі навучаны вопытам Ян III Сабескі паставіў ужо не на магнатаў, а на шырокія колы шляхты, аднак памёр, не паспеўшы зламаць алігархіі ў Вялікім Княстве.

Пасля смерці Сабескага ў часе працяглага бескаралеўя (1696—1697) у Беларусі і Літве запанавала нябачнае раней бязладдзе, рэзка абвастрылася барацьба паміж гегемонамі, якія спяшаліся скарыстаць момант для ўмацавання сваіх пазіцый, і лагерам іх праціўнікаў. Да шляхты далучыліся Радзівілы, Пацеі, Вішнявецкія, Агінскія ды іншыя магнаты, і супрацьстаянне перарасло ў грамадзянскую вайну. На элекцыйным сойме ў 1696 г. шляхта Вялікага Княства выставіла згаданы вышэй праект так званай «каэквацыі станаў» (*coequatio jurium*), скіраванай менавіта супраць усяўладдзя дыктатараў, бо шэраг яе пунктаў істотна абмежаваў уладу вялікага гетмана Казіміра Яна Сапегі. Прынятая соймам ухвала стала важным поспехам шляхецкага экзекуцыйнага руху, бо канчаткова ўраўноўвала правы беларуска–літоўскага рыцарства з правамі польскай брацці, а таксама чарговым этапам уніфікацыі ладу Вялікага Княства паводле кароннай мадэлі.

Вынікі каранацыйнага сойма 1697 г., на якім быў узведзены на пасад саксонскі курфюрст Аўгуст II Моцны (1697—1706, 1709—1733),

Каронай, прынеслі паразу Сапегам. Але праз год іх войска ў бітвах каля Невяжы і пад Юрбаркам разграміла шляхту. Пераможцы ўзяліся пустошыць уладанні сваіх праціўнікаў. Пасля прыходу караля і вялікага князя Аўгуста Моцнага з саскім войскам паміж процілеглымі бакамі было падпісана пагадненне, на падставе якога значна скарачаліся ўзброеныя сілы Вялікага Княства. Аднак грамадзянская вайна неўзабаве ўзнавілася і дасягнула апагею. У 1700 г. гетман Казімір Ян Сапега сабраў харугвы наймітаў, а шляхта мабілізавала паспалітае рушанне. 18 лістапада адбылася крывавая бітва пад Алькенікамі, у якой невялікае войска Сапегаў пацярпела поўную паразу ад аб'яднаных сілаў шляхты, узначаленай харужым Грыгорыем Антоніем Агінскім. Тром Сапегам удалося ўцячы, а чацвёртага Міхаіла, канюшага літоўскага, раз'юшаныя пераможцы захапілі і рассеклі шаблямі. Разграміўшы ненавісных гегемонаў, шляхта ўтварыла канфедэрацыю і прыняла пастановы, на моцы якіх Сапегі страчвалі ўсе дзяржаўныя ўрады і свае ўладанні ў Беларусі і Літве.

Каэквацыя і Алькенікі сталі першым трыумфам беларуска–літоўскай шляхты над алігархамі за ўсю гісторыю Вялікага Княства. Аднак толькі часовым. Шэраг шляхецкіх патрабаванняў (увядзенне коннага сойма, урада генерала ВКЛ, адказнасць міністраў перад соймам ды інш.) застаўся не рэалізаваны. Разбітыя гегемоны шукалі дапамогі ў шведаў, а іхнія праціўнікі — у расійскага цара Пятра I. З абодвух бакоў утвараліся канфедэрацыі, і ў краіне яшчэ больш займаўся агонь грамадзянскай вайны.

# X. Цень расійскай гегемоніі

## X.1. Паміж Швецыяй і Расіяй

У апошнія гады XVII ст. балтыйскія дзяржавы выступілі з планам падзелу заморскіх уладанняў Швецыі. Ядро антышведскай кааліцыі ўтварылі дацкі кароль Фрыдрых IV і саксонскі курфюрст Аўгуст II Моцны, каранаваны ў 1697 г. на Вавелі. Да іх прыстаў лідэр інфлянцкай шляхты Ян Райнгольд Паткуль. Дамагаючыся выхаду да Балтыйскага мора, праз год да ваеннага саюзу далучыўся і расійскі цар Пётр I (1682—1725).

Аўгуст Моцны пачынаў вайну без дазволу сойма, плануючы спачатку дзейнічаць толькі саксонскім войскам, а потым уцягнуць у канфлікт і Рэч Паспалітую. Беларуская і літоўская шляхта паабяцала яму дапамагчы ў барацьбе за Рыгу, якая мела ключавое значэнне для гандлю ВКЛ з еўрапейскімі дзяржавамі, але была страчаная ў 1621 г. Выкарыстаўшы ўнутраны палітычны крызіс у Вялікім Княстве як падставу, кароль увёў туды саксонскае войска і ў 1700 г. паспрабаваў захапіць Рыгу, а Пётр I аблажыў Нарву. Данія тым часам увайшла ў Гальштынію. Але малады шведскі кароль Карл XII (1697—1718) імклівымі ўдарамі разграміў Данію, якая пакінула саюзнікаў і першай выйшла з вайны, потым бліскуча паканаў Аўгуста II пад Рыгай і Пятра I пад Нарвай. За 1701 г. ён авалодаў усімі інфлянцкімі крэпасцямі, у якіх сядзелі гарнізоны Рэчы Паспалітай.

Ваенныя дзеянні перакінуліся на тэрыторыю Вялікага Княства Літоўскага, а пазней і Кароны Польскай. Шведы неўзабаве занялі Коўну, Вільню, Горадню, а ў траўні 1702 г. увайшлі ў Варшаву і пазней у Кракаў. Армія Аўгуста II была цалкам разгромленая Карлам XII пад Клішавам (19 ліпеня 1702).

Пераможаныя пад Алькенікамі і пазбаўленыя маёмасці Сапегі адкрыта займалі бок Швецыі, а шведскае войска аберагала іх маёнткі. З дапамогай шведаў былыя дыктатары Літвы цяпер зводзілі рахункі з праціўнікам, пустошылі іх уладанні. Вакол Казіміра Сапегі аб'ядналася і шляхта, якая арыентавалася на саюз са Швецыяй. Аднак большая частка рыцарства ВКЛ, узначаленая новапрызначаным гетманам Міхаілам Вішнявецкім і Грыгорыем Агінскім, выступала за збліжэнне з Расіяй. Пётр I выкарыстаў іх настроі і хутка дамовіўся з прадстаўнікамі гэтага лагера. Канфедэрацыя шляхты Беларусі і Літвы на чале з гетманамі звярнулася па дапамогу да Расіі і папрасіла ў цара 36 тыс. жаўнераў і 40 тыс. рублёў грошай. Пётр I прыняў просьбу, бо імкнуўся ўмацаваць свой уплыў на ўнутраныя справы ВКЛ, але ўзамен запатрабаваў перадачы некалькіх сапежынскіх фартэцый, што знаходзіліся на мяжы з Расіяй. У красавіку 1702 г. паміж шляхтай і царом была падпісана дамова, паводле якой Пётр I за дапамогу атрымліваў у заклад Друю і Стары Быхаў, у якім сядзеў моцны сапежынскі гарнізон. Займеўшы такога саюзніка, цяпер ужо шляхта Вялікага Княства ўзялася актыўней рабаваць і нішчыць уладанні Сапегаў. У падтрымку ёй для захопу Старога Быхава цар накіраваў з Украіны 12 тысяч казакоў гетмана Івана Мазепы. Камендант Біздзюкевіч пасля некалькіх месяцаў абароны мусіў капітуляваць, і быхаўскі гарнізон прысягнуў расійскаму саюзніку Аўгусту II.



*Аўгуст II Моцны, кароль і вялікі князь у 1697—1704 і 1709—1733 г. Партрэт 1733 г.*

Пачатак вайны са шведамі супаў з буйнымі сялянскімі хваляваннямі ў Беларускім Падняпроўі. Сапегі змаглі ўдала выкарыстаць мужыцкі рух. Падтрыманыя імі, шматтысячныя аддзелы паўстанцаў зацята ваявалі супраць шляхты каля Галоўчына, Дуброўны, Быхава. Становішча канфедэратаў пагаршалася, бо разбіты пад Клішавам і пазбаўлены арміі Аўгуст II бяздзейнічаў. Абароны ад Сапегаў і шведаў яны зноў сталі шукаць у цара. На віленскім з'ездзе шляхты ў 1703 г. утварылася новая канфедэрацыя, якая падтрымала Аўгуста II і выслала прадстаўнікоў да царскага ўраду для заключэння яшчэ больш цеснага саюзу з Расіяй. У падпісаным пагадненні 9 ліпеня 1703 г. канфедэрацыя абавязалася ваяваць на расійскім баку пры любых умовах, незалежна ад пазіцый Кароны Польскай, а цар браўся павялічыць ім ваенную і фінансавую дапамогу, але пры ўмове ўступлення ў вайну ўсёй Рэчы Паспалітай. Як і ў 1702 г., гэты дагавор падпісваўся без удзелу Кароны, у парушэнне прынцыпаў Люблінскага акта, у чым чарговы раз выявіўся крызіс дзяржаўнай уніі. План канфедэратаў прадугледжваў нават адрыў Беларусі і Літвы ад Польшчы ды ўсталяванне іх васальных адносінаў з Расіяй. Гісторыі вядома і віленская пастанова 1701 г., якая таксама адкрыта дэкларавала разрыў уніі з Каронай і абвяшчэнне Вялікага Княства Літоўскага як спадчыннай манархіі Аўгуста II Моцнага, аднак гэты дакумент выклікаў на сойме такое абурэнне, што нават аўтары адракліся ад свайго праекта.



Тым часам у Кароне арганізаваная Карлам XII прашведскі настроеная шляхта пазбавіла кароны Аўгуста II і на Варшаўскім сойме 12 чэрвеня 1704 г. абвясціла каралём познаньскага ваяводу і маршалка варшаўскай канфедэрацыі Станіслава Ляшчынскага (1704—1709). Паводле дамовы Карла XII з Ляшчынскім, Літва павінна была стаць правінцыяй Швецыі.

Пасля згаданага сойма ў Рэчы Паспалітай заіснавалі два каралі, якія мелі кожны сваіх гетманаў і прымасаў. Аднак рабаўніцтва і кантрыбуцыі шведскага камандавання ўзнялі на барацьбу супраць акупацыі і польскую шляхту. Пакуль галоўныя сілы шведаў знаходзіліся ў Польшчы, расійскі цар заняў Інфлянты. Вясной 1704 г. створаная раней Сандамірская канфедэрацыя, што аб'яднала прыхільнікаў Саса з Каронай і ВКЛ, ад імя ўсёй Рэчы Паспалітай пайшла на саюз з Расіяй. Цяпер і Рэч Паспалітая абавязалася ваяваць супраць Швецыі, а царскі ўрад паабяцаў субсідыі і 12 тыс. войска. Два варожыя лагеры патрыётаў рэспублікі сышліся ў смяротным супрацьборстве: Сапегі і іх прыхільнікі — на баку Швецыі, а большасць шляхты з лідэрам антысапежынскай партыі палявым гетманам Грыгорыем Агінскім — на баку Расіі.

Баючыся страціць трон, на цесны саюз з Расіяй пайшоў і кароль Аўгуст II. У 1704 г. пад Нарвай ён падпісаў з Пятром I ваенную канвенцыю, накіраваную супраць Швецыі. Гэтая дамова афіцыйна дазволіла цару весці ваенныя дзеянні на тэрыторыі Рэчы Паспалітай. Ужо восенню таго ж года яго армія заняла Вільню. Вялізнае расійскае войска — да 60 тыс. прыйшло на тэрыторыю Беларусі. Для Пятра I важна было выкарыстаць магчымасць падпарадкавання Аўгуста II сваёй палітыцы, трымаючы на чужой тэрыторыі сваю армію і падтрымліваючы антыкаралеўскі рух, які паралізоўваў шляхецкую рэспубліку.



*Пётр I (1672—1725),*
*расійскі цар з 1682 і імператар з 1721 г.*

Галоўныя сілы Расіі доўгі час стаялі пад Полацкам. У чэрвені 1705 г. туды прыехаў і цар. Паколькі элекцыя шведскага стаўленіка Станіслава Ляшчынскага, якая выклікала новае абвастрэнне грамадзянскай вайны ў краіне, ужо адбылася, дбаючы пра саюзнікаў, Пётр I выдаваў сябе за абаронцу Рэчы Паспалітай і каталіцтва ад «ерэтыкоў» шведаў. Яго універсал, выдадзены ў Полацку, дэклараваў прыязнасць цара да ўсіх грамадзянаў Вялікага Княства і Кароны, а войску забараняў крыўдзіць мясцовае насельніцтва. Аднак у хуткім часе сам расійскі манарх першы ж парушыў гэтыя дэкларацыі, учыніўшы нечуванае злачынства.

11 ліпеня 1705 г. Пётр I прыйшоў у Сафійскі сабор, які на той час ужо паўстагоддзя належаў полацкім уніятам, ды, разгневаўшыся на абраз Язафата Кунцэвіча, накінуўся на манаха і проста ў храме забіў яго. Афіцэры, што суправаджалі цара, пасеклі шаблямі яшчэ некалькі базыльянаў, а двух манахаў павесілі. Пасля гэтага Пётр I выдаў загад аб арышце ўсіх чарняцоў Полацкага базыльянскага манастыра. Зняволіўшы, іх 4 месяцы трымалі ў замку, а Сафійскі сабор



пятроўскія салдаты абрабавалі і ператварылі ў вайсковы склад. Неўзабаве выбух складаванага пораху моцна пашкодзіў святыню.

Забойства, учыненае Пятром I на тэрыторыі сваіх саюзнікаў, атрымала шырокі розгалас. Нягледзячы на нядаўні полацкі універсал, уніяты панічна баяліся новых расправаў. Гаварылася, што расійскі цар аддаў загад «лавіць уніяцкіх ерархаў». Перапужаныя, тыя шмат дзе ў Беларусі пакідалі манастыры і ратаваліся ўцёкамі. Каб хоць неяк апраўдаць свае дзеянні, Пётр I абвінавачваў полацкіх базыльянаў у сувязях са шведамі ды Сапегамі, у варожасці да царскага войска. У гэтых жа мэтах неўзабаве быў абвешчаны талерантны універсал расійскага цара, які гарантаваў свабоду і недатыкальнасць уніяцкага духавенства, а потым і асобны універсал для вызваленых



*Элекцыя Станіслава Ляшчынскага ў 1704 г.*

полацкіх базыльянаў, што звальняў іх ад «усялякіх паслугаў і салдацкіх цяжараў».

Ад Полацка расійская армія пайшла на Менск і Гародню, дзе адбылася сустрэча цара з Аўгустам II. У адказ на гэта Карл XII накіраваў свае войска з Кароны на тэрыторыю Беларусі і на пачатку 1706 г. заблакаваў у Гародні частку царскіх сілаў, якія ледзь вырваліся з атачэння ды адступілі на Украіну, а потым заняў Вільню. На землях Беларусі цяпер гаспадарылі шведы і аддзелы саюзных

ім магнатаў. Зноў мэтанакіравана спусташаліся ўладанні праціўнікаў, найперш — Радзівілаў і Вішнявецкіх. Вясною 1706 г. шведы абрабавалі і спустошылі Докшыцы, Карэлічы, Клецк, Ляхавічы, Пінск, спалілі замак у Міры, на Слуцк наклалі кантрыбуцыю. А найбольш даставалася радзівілаўскаму Нясвіжу, які ў 1706 г. быў амаль цалкам знішчаны, а потым некалькі гадоў сістэматычна рабаваўся. Пад ціскам шведаў гарады Наваградак, Ваўкавыск, Ліда, Слонім і сталіца Вільня далучыліся да Варшаўскай канфедэрацыі.

Увёўшы сваю армію ва ўладанні Аўгуста II, Карл XII прымусіў яго ў тым жа 1706 г. пайсці на сепаратны Альтранштацкі мір, адмовіцца ад саюзу з Расіяй і ад кароны на карысць шведскага стаўленіка Станіслава Ляшчынскага. Вялікія роды — Радзівілы, Пацы, Вішнявецкія і Чартарыйскія — таксама перайшлі на бок новага караля. Аднак Сандамірская канфедэрацыя, а за ёй і канфедэраты Вялікага Княства на чале з гетманам Грыгорыем Агінскім, падтрыманыя Расіяй, не прызналі ўмоў пагаднення, і вайна працягвалася.

На вясну 1708 г. у Беларусі паміж Улай, Віцебскам і Дуброўнай засяродзілася самая вялікая групоўка расійскага войска — больш за 70 тыс. Іх пастой суправаджаўся насіллямі і марадзёрствам. Без аніякай прычыны былі спаленыя Віцебск, Орша, Дуброўна, Мсціслаў і Магілёў. Калі ж Карл XII пачаў рух на ўсход, плануючы ўварвацца ў Расію, пятроўскія палкі сталі адступаць. Каля Галоўчына яны паспрабавалі затрымаць шведаў, але 3 ліпеня пацярпелі паразу і адступілі за Дняпро. А Карл XII увайшоў у Магілёў. Пётр I не адважваўся на генеральную бітву і адводзіў сілы на Ўкраіну, дзе спадзяваўся на дапамогу гетмана Івана Мазепы. У Полацку і Старым Быхаве цар пакінуў гарнізоны, якія рассылалі сваю казацка-калмыцкую конніцу ледзь не па ўсёй Беларусі. Адмовіўшыся ад планаванага паходу на Смаленск, шведскі кароль таксама накіраваў галоўныя сілы на Ўкраіну.

У час, калі тэатр галоўных дзеянняў пераносіўся на ўкраінскія прасторы, у лясістай Беларусі дайшло да першай значнай перамогі рэфармаванай царскай арміі над шведамі. Каля вёскі Лясная, што пад цяперашнім Слаўгарадам, на рацэ Сож расіяне здолелі пераняць і 28 верасня (10 кастрычніка) 1708 г. разграміць корпус Адама Левенгаўпта з вялізным абозам харчавання і зброі, які рухаўся з Рыгі на поўдзень, да караля. Паводле інфармацыі з царскага лагера, шведы страцілі тут да 8 тыс. жаўнераў і ўвесь абоз, аднак шведскія крыніцы падалі іншую версію бітвы. «Ці Левенгаўпт толькі 5 тысячаў прывёў пасля бітвы да свайго караля, як таго хочуць маскавіты, ці болей — адзін ён сам лепш ведае», — разважыў Філіп фон Шутц, сучаснік падзеі і выдавец спецыяльных нумароў нямецкай газеты, прысвечаных гэтай баталіі.



Несумненна, «маці палтаўскай баталіі», як потым называў перамогу пад Лясной цар, аслабіла пазіцыі Карла XII. 27 чэрвеня 1709 г. шведская армія пацярпела паражэнне ў генеральнай бітве пад Палтавай. Пасля гэтай перамогі Пятра I характар вайны істотна змяніўся. Калі да Палтавы Рэч Паспалітая і Расія разам бараніліся ад Швецыі, дык цяпер шляхецкая рэспубліка трапіла пад нарастальны ўціск усходняй імперыі. Расійскае войска і канфедэраты хутка выгналі шведаў ды сапежынцаў з усёй тэрыторыі Рэчы Паспалітай і ў 1709 г. каралём зноў стаў Аўгуст II Моцны. Аднак армія Пятра I надалей заставалася на тэрыторыі Беларусі, хоць на гэта не было ніякай ваеннай неабходнасці. Калі Аўгуст II паспрабаваў умацаваць сваю ўладу ў дзяржаве, абапіраючыся на саскае войска, унутраная барацьба разгарэлася з новай сілай. У Кароне Польскай рэспубліканцы стварылі ў 1715 г. Тарнагродскую канфедэрацыю, якая ставіла на мэце вызваленне Рэчы Паспалітай ад Сасаў. Яе падтрымала і шляхта з Беларусі ды Літвы. У ВКЛ на чале абаронцаў шляхецкай «залатой вольнасці», што баяліся ўсталявання абсалютызму, быў прыяцель расійскага цара вялікі гетман Людвік Пацей (1709—1730), тады як прыхільнікамі караля кіраваў палявы гетман Станіслаў Дэнгоф (1708—1728). Вялікага гетмана падтрымалі Агінскія ды іншыя магнаты. Створаная ў 1716 г. у Вільні канфедэрацыя беларускай і літоўскай шляхты таксама выступіла супраць умацавання ўлады Аўгуста II. Аднак за караля ўступаліся Прусія і Расія. Унутраная барацьба зноў ахапіла тэрыторыю ўсёй дзяржавы.



*Спалучэнне гербаў Саксоніі, Кароны і Вялікага Княства на талерцы з каралеўскага сервіза. Каля 1733 г. Кракаў.*

Выкарыстоўваючы сітуацыю, Расія ўмяшалася ва ўнутраныя справы Рэчы Паспалітай — павялічвала там свае сілы і падтрымала на гэты раз не караля, а шляхту. Пры пасярэдніцтве Пятра I дайшло да замірэння варожых бакоў. У 1716 г. у Варшаве царскі пасол Грыгоры Далгарукі падрыхтаваў невыгодныя для Рэчы Паспалітай умовы міру паміж Аўгустам II і канфедэратамі: кароль мусіў вывесці саксонскае войска з дзяржавы, пакінуўшы нязначныя сілы, а шляхта павінна была адмовіцца ад канфедэрацый, армія ж скарачалася да 6 тысяч у Вялікім Княстве і да 18 — у Кароне. Варшаўскі сойм 1717 г. моўчкі прыняў навязаныя ўмовы, таму ўвайшоў у гісторыю як «нямы».

Так Расія дамаглася сваёй ваеннай прысутнасці ў Рэчы Паспалітай і ўзяла на сябе ролю гаранта выканання рашэнняў сойма. Сам Далгарукі абавязаўся сачыць за тым, каб умовы замірэння не парушаліся, а гэта стварала дадатковыя падставы для ўмяшання ва ўнутраныя справы суверэннай дзяржавы і рабіла Рэч Паспалітую фактычна безабароннай. Тады ж Пётр I дамовіўся з прускім каралём Фрыдрыхам Вільгельмам I (1713—1740) аб супольнай ахове старых парадкаў у Рэчы Паспалітай.

Выйграўшы вайну са Швецыяй, Расія на ўмовах Ніштацкага міру 1721 г. завалодала Інфлянтамі, Эстоніяй, часткай Карэліі і яшчэ больш умацавала сваю гегемонію над Рэччу Паспалітай. Перад элекцыйным соймам 1733 г. пецярбургскі двор адкрыта заявіў, што не дапусціць да трону Станіслава Ляшчынскага. Так і сталася: хоць абсалютнай большасцю галасоў новым каралём сойм абраў менавіта Ляшчынскага, сіла расійскага і аўстрыйскага войска ўзвяла на трон Аўгуста III Саса (1733—1763), сына першага караля саксонскай дынастыі Ветынаў, за якога аддалі галасы не больш за тысячу шляхціцаў.

Для Беларусі,ператворанай у тэатр ваенных дзеянняў, Паўночная вайна мела асабліва трагічныя наступствы. Расійскае войска пакінула край толькі ў 1719 г. Практычна два дзесяцігоддзі доўжыліся пастоі, кантрыбуцыі, ваенныя знішчэнні. Народ аднолькава цярпеў што ад шведаў, што ад расіянаў. Апошнія, прыкладам, ужо ў 1708 г. без аніякай патрэбы зруйнавалі і спалілі Віцебск і Магілёў, разрабавалі і выпалілі Горадню. У дадатак у краі ў 1710—1711 г. лютавала эпідэмія чумы. У Нясвіжы, Навагрaдку, Вільні памерлі тысячы людзей. Агульная колькасць жыхароў Беларусі за час вайны скарацілася амаль на трэцюю частку: калі ў 1700 г. яно складала прыкладна 2 млн. 200 тыс., дык на 1717 г. у беларускіх ваяводствах і паветах ВКЛ засталося не больш за 1 млн. 500 тыс. чалавек. Сельская гаспадарка, рамёствы, гандаль Беларусі — усё зноў апынулася ў глыбокім заняпадзе. Зноў дзічэлі і зарасталі лесам вёскі, чарнелі пажарышчамі гарады, і доўга яшчэ пусткаю стаялі сялянскія палеткі.



## X.2. Агонія дэмакратыі

Пасля Паўночнай вайны Рэч Паспалітая стала спаўзаць да поўнай анархіі і зусім страчваць палітычную самастойнасць. Кароль больш не кантраляваў сітуацыі ў дзяржаве. Фактычна яму заставалася толькі камандаваць войскам ды раздаваць пасады. Другі прадстаўнік дынастыі Ветынаў на троне Рэчы Паспалітай Аўгуст III Моцны наогул мала цікавіўся ўнутранымі справамі, праводзячы найбольш часу ў Саксоніі ды ў падарожжах па розных еўрапейскіх краінах. Гісторыкі падлічылі, што за 30 гадоў панавання ён і году не прабыў бы ў межах шляхецкай рэспублікі, калі б Сямігадовая вайна (1756—1763) не перасяліла яго з Дрэздэна ў Варшаву. Рэальная ўлада ў Рэчы Паспалітай, асабліва ў Вялікім Княстве, належала самым вялікім родам — некаранаваным удзельным каралям і князям.



*Аўгуст III, кароль і вялікі князь (1733—1763).*

У Беларусі і Літве ў сярэдзіне XVIII ст. зноў сталі дамінаваць Радзівілы, якія зводзілі рахункі з сваімі праціўнікамі — Агінскімі, Пацеямі, Сапегамі. Не лічачыся з дзяржаўнымі інтарэсамі, развязваючы сапраўдныя войны паміж сабою, магнацкія групоўкі імкнуліся ажыццяўляць уласныя палітычныя праграмы. «Узброены Радзівілаў натоўп у пры-

ступе шаленства ці на загад князя не раз нападаў на шляхецкія дамы, на абывацельскіх сойміках у Вільні, Менску і Лідзе не раз даходзіла да крывавых сцэнаў...», — пісаў пра тыя часы Юзаф Грайнэрт. Сапраўды, нарады вальных соймаў зрываліся праз *liberum veto* апазіцыйнымі дэпутатамі (прыкладам, на працягу 1734—1762 г. былі сарваны літаральна ўсе соймы), а на павятовых сойміках усё часцей учыняліся бойкі, узброеныя сутычкі, забіваліся палітычныя апаненты. Грубым ціскам і тэрорам алігархі дамагаліся падпарадкавання соймікаў уласным мэтам, ператвараючы галасы шляхты ў сваю зброю для барацьбы за гегемонію ў краіне.

Бязладдзе паралізавала дзяржаву, абыякавасць працяглага панавання Сасаў дэмаралізавала шляхту. Абдораная ўсемагчымымі прывілеямі, пануючы над усім грамадствам, сама шляхта як стан перажывала апатыю і выраджалася. Да агульнага ўнутранага бязладдзя дадаваўся нанова абуджаны партыкулярызм, які паралізоўваў і без таго слабую Рэч Паспалітую. Вялізная шматнацыянальная дзяржава адно вонкава здавалася яшчэ адзінай. Яе даўно падточвалі ўнутраныя антаганізмы, а памылкі палітыкаў толькі паглыблялі іх. Паводле вобразнага выказвання Станіслава Ляшчынскага, магутная каліс Рэч Паспалітая, быццам стары гмах, паволі валілася ад уласнага цяжару.


*Міхаіл Чартарыйскі, вялікі канцлер літоўскі (1752—1775).*

А суседнія імперыі імкнуліся яшчэ больш дэстабілізаваць жыццё ў аслабленай Рэчы Паспалітай ды ўмацаваць над ёй сваю гегемонію. Іх войскі амаль бесперапынна знаходзіліся на яе тэрыторыі, гатовыя ўмяшацца ва ўнутраныя справы суверэннай дзяржавы. Пераходы царскага войска суправаджаліся незаконнымі рэквізіцыямі і рабаваннем жыхароў, і ніякія пратэсты не спынялі такога бяспраўя, калі не ставала сілы. Але разрозненых алігархаў не хвалявалі дзяржаўныя інтарэсы. Яны не думалі, як супольна ратавацца ад усходняе імперыі, а наадварот, імкнуліся выкарыстаць расійскія штыкі для звядзення рахункаў з супернікам і ўмацавання сваіх пазіцый. Прыкладам, Міхаіл Казімір Радзівіл, званы «Рыбанькам», гэты «найбагацейшы з Радзівілаў», у 1734 г. дапамагаў палкам царскага генерала Льва Ізмайлава разганяць па Беларусі шляхецкія аддзелы прыхільнікаў кандыдата на трон Станіслава Ляшчынскага і праціўнікаў саюзу з Расіяй. Верны каралю, ён як вялікі гетман (1744—1762) толькі ў 1756 г. змяніў арыентацыю і паспрабаваў стварыць у ВКЛ моцную антырасійскую партыю, уклаўшы ў справу вялікія грошы, аднак планы так і не ажыццявіліся.


*Міхаіл Казімір Радзівіл «Рыбанька», вялікі гетман (1744—1762).*

Галоўнай апорай нарасталых расійскіх уплываў у Рэчы Паспалітай з сярэдзіны XVIII ст. стаў княскі род Чартарыйскіх, узначалены вялікім канцлерам літоўскім Міхаілам (1652—1775). Чартарыйскія разам з пароднененым з імі Станіславам Панятоўскім утваралі моцны палітычны лагер, які звалі «Фаміліяй». Маладыя асвечаныя патрыёты мелі праграму дзяржаўных рэформаў, найперш умацавання выканаўчай улады і ваеннай сілы. Стары Аўгуст III спачатку прыслухаўся да рэфарматараў, але потым аддаў перавагу манархістам. З яго нечаканай смерці ў Дрэздэне ў 1763 г. пачалася барацьба новых прэтэндэнтаў на трон, дырыжорамі якой сталі моцныя суседзі — Расія і Прусія. Яшчэ ў 1762 г. сакрэтны артыкул расійска-прускага саюзнага дагавора прадугледжваў узвядзенне на трон Рэчы Паспалітай «такой особы, которая его императорскому величеству всероссийскому угодна будет». Імператрыца Кацярына II (1762—1796) накіравала паслом у Варшаву Германа Кайзерлінга, якому сакрэтным рэскрыптам даручыла «рабіць» каралём літоўскага стольніка графа Станіслава Панятоўскага, «о преданности которого к нашей империи

мы известны и для утверждения его на польском престоле употребим все способы и от Бога дарованные нам силы». У лістападзе 1763 г. паслы таемна пазнаёмілі Панятоўскага з умовамі, на якіх Расія можа падтрымаць яго абранне. Кацярына II у сакрэтнай інструкцыі адкрыта патрабавала, што ён павінен «во все время своего государствования интересы нашей империи собственными почитать, их остерегать и им всеми силами по возможности поспешствовать». Прыняўшы гэтыя ўмовы, кандыдат на карону прадвызначыў сваю трагедыю і гібель Рэчы Паспалітай.

У супрацьстаянні з Радзівіламі, якія падтрымалі саксонскую партыю, Чартарыйскія і Панятоўскі ў 1764 г. адважыліся адкрыта папрасіць дапамогі ў Пецярбурга. Кацярына II скарысталася просьбай Чартарыйскіх і ўвяла ў межы Рэчы Паспалітай сваю армію. На тэрыторыі Беларусі пачаліся ваенныя дзеянні, пад час якіх расійскае войска дапамагала канфедэратам ВКЛ. Рэальны ўзброены супраціў інтэрвенты атрымалі толькі ад князя Кароля Радзівіла, вядомага як «Пане Каханку» (такімі словамі ён звяртаўся да суразмоўцаў). За самым каларытным з нясвіжскай галерэі Радзівілаў, якога Станіслаў Панятоўскі называў «Чынгіс–ханам», здаецца, зусім незаслужана замацаваўся выключна адмоўны вобраз вычварэнца і свавольніка. Між тым «Пане Каханку» быў грамадзянінам, які «палаў любоўю да айчыны» (Ю.Нямцэвіч). Ён меў значныя сілы (да 10 тысяч) і выступіў супраць непрыяцеля, але пакуль рухаўся з Белай Падляскай на дапамогу сваім фартэцыям, канфедэраты з расіянамі здабылі Нясвіж, а потым паддаўся і Слуцк. У бітве над Шчарай, каля Слоніма, яго корпус пацярпеў паразу, і князь праз пінскія балоты адступіў на Валынь, да Алыкі, а потым тры гады правёў за мяжой.



*Станіслаў Аўгуст, кароль і вялікі князь (1764—1795).*



Канцлер Міхаіл Чартарыйскі ўсё яшчэ спадзяваўся ажыццявіць змены дзяржаўнага ладу Рэчы Паспалітай пры падтрымцы Расіі. Праграма рэформаў была прапанавана на канвакацыйным сойме ў 1764 г. Паводле гэтага дакумента, колькасць войска мусіла павялічыцца з 24 да 50 тысяч, пры вырашэнні эканамічных пытанняў касавалася *liberum veto*, уводзіліся генеральныя мытныя зборы, дэпутаты вызваляліся ад абавязковых інструкцый соймікаў, і інш. Але ў красавіку таго ж года незадаволеныя рэформамі ў Рэчы Паспалітай Расійская імперыя і Прусія абавязаліся разам захоўваць *status quo* гэтай дзяржавы. У Пецярбургу Кацярына II і прускі кароль Фрыдрых II (1740—1786) падпісалі дамову з сакрэтным артыкулам, у якім бакі абавязаліся нават сілай зброі зберагаць у Рэчы Паспалітай тагачасны лад, не дапускаючы да пераўтварэння выбарнага каралеўства ў спадчыннае і правядзення іншых радыкальных рэформаў, а таксама разам выступіць за вяртанне дысідэнтам правоў і свабодаў. «Сусветная гісторыя не ведае іншага акта падобнай подласці! — напісаў пазней пра дамову 1764 г. Карл Маркс. — Дзве дзяржавы заключаюць саюз, каб перашкодзіць трэцяй дзяржаве вылечыць яе ўнутраныя язвы і такім шляхам, у выпадку неабходнасці з дапамогай узброенай сілы, асудзіць яе на разлажэнне».



*Медальён прускага караля Фрыдрыха II (1740—1786).*

Дзякуючы захадам Расіі 7 верасня 1764 г. каралём і вялікім князем адзінагалосна быў абраны былы каханак царыцы і яе фаварыт Станіслаў Антоні Панятоўскі (1764—1795), які пры каранацыі ўзяў імя Аўгуст. Адной з галоўных ліній палітыкі Станіслава Аўгуста было імкненне супрацоўнічаць з Расіяй і захаваць давер імператрыцы. Панятоўскі лічыў, што пратэктарат Расіі дапаможа яму правесці неабходныя рэформы ўнутранага ладу дзяржавы, утаймаваць магнацкую алігархію і выратаваць Рэч Паспалітую ад галоўнага, на яго думку, ворага — Прускага каралеўства. Але пецярбургскі двор пераследаваў у гэтай гульні выключна свае прагматычныя інтарэсы.

Спасылаючыся на правы абараняць праваслаўных, прадугледжанае ўмовамі «вечнага міру» 1686 г., Кацярына II хутка выкарыстала даўнюю праблему дысідэнтаў, уключаную ў згаданую сакрэтную канвенцыю Пецярбурга і Берліна (1764). Праваслаўныя праз архіепіскапа беларускага Георгія Каніскага звярнуліся да яе з просьбай апекі. У ліпені 1765 г. у Варшаве царскім паслом быў афішаваны мемарыял Каніскага, у якім пералічваліся ўціскі іншаверцам і патрабавалася вярнуць ім раўнапраўе. Каралю перадалі таксама ліст імператрыцы з патрабаваннем ураўняць правы праваслаўных і пратэстантаў з правамі каталікоў. Шэф расійскай дыпламатыі Мікіта Панін падрыхтаваў праект, які быў перададзены на разгляд сойма 1766 г. Ім прадугледжваўся допуск дысідэнтаў да ўдзелу ў соймах, пашырэнне на іх іншых публічных правоў, аднак за рыма–каталіцкім веравызнаннем усё роўна захоўвалася роля панавальнай рэлігіі. У інструкцыі расійскаму паслу Мікалаю Рэпніну сам граф Мікіта Панін прызнаваўся, што радыкальнае паляпшэнне становішча пратэстантаў і праваслаўных у Рэчы Паспалітай было б з кожнага боку некарыснае для Расіі. У праватнасці, развіццё праваслаўнай царквы павялічыла б уцёкі сялян з Расіі ў Беларусь і Украіну. Панін, такім чынам, сам пацвердзіў, што дысідэнцкая праблема з'яўляецца толькі інструментам расійскай палітыкі, скіраванай на стварэнне прарасійскай партыі ў Рэчы Паспалітай.



*Кароль Станіслаў Радзівіл („Пане Каханку”), віленскі ваявода (1762—1790).*

На сойме 1766 г., на якім Мікалай Рэпнін упарта дамагаўся вырашэння дысідэнцкага пытання, Станіслаў Аўгуст і Чартарыйскія паспрабавалі абмежаваць *liberum veto*, вызваліўшы ад абавязковай



аднагалоснасці ўхваленне новых падаткаў. Але іх праект сутыкнуўся з крытыкай тых, хто бярог «свабоды і вольнасці». Расійскі пасол адкрыта заявіў, што яго дзяржава зацікаўленая ў тым, «каб форма тутэйшага ўрадавання не падлягала зменам», і падтрымаў праціўнікаў рэформы. Узгоднены з Рэпніным і пададзены валынскім паслом Міхалам Вяльгорскім праект канстытуцыі «Аб забеспячэнні вольнага голасу» прадпісваў, каб *liberum veto* як «зрэнка свабоды» «ніякай абыякавасцю слоў у ніякім прававым запісе не аслаблялася». Прыняўшы пад пагрозамі Рэпніна гэтую канстытуцыю, сойм, аднак, так і не ўхваліў праекта аб ураўнанні правоў дысідэнтаў. Тады расійскаму паслу была перададзена інструкцыя націснуць на апанентаў канфедэрацыямі іншаверцаў.

Праз год стараннямі Мікалая Рэпніна, які адшукаў праваслаўных шляхцічаў, гатовых дамагацца сваіх правоў, у Слуцку была ўтворана канфедэрацыя праваслаўных. Акт канфедэрацыі падпісалі 248 чалавек, сярод якіх быў і магілёўскі архіепіскап Георгі Каніскі, а таксама 22 кальвіністы і лютэране Вялікага Княства. Хоць колькасць слуцкіх канфедэратаў была зусім нязначнай, Кацярына II адразу ўзяла іх пад сваю апеку ды ўвяла дзеля абароны канфедэрацыі праваслаўных 40-тысячнае расійскае войска. На тэрыторыі Кароны ў Торуні паўстала пратэстанцкая канфедэрацыя, якую падтрымала Прусія. З праціўнікаў Панятоўскага ў мэтах «абароны веры і вольнасці» пачалі ўтварацца лакальныя каталіцкія канфедэрацыі, якія ў Радаме аб'ядналіся. Узначаліць генеральную канфедэрацыю каталікоў, што налічвала дзесяткі тысячаў, было прапанавана выгнанцу Каралю Радзівілу «Пане Каханку», якому дзеля гэтага Кацярына II дазволіла вярнуцца з



*Георгі Каніскі, епіскап магілёўскі (беларускі) (1755—1795).*

Дрэздэна ў Рэч Паспалітую. Іроніяй лёсу той самы князь, які ў 1764 г. выступіў супраць расійскага войска і, разбіты, ратаваўся ад яго ўцёкамі, цяпер вяртаўся, каб стаць на чале «рэспубліканцаў», якія разам з расіянамі змагаліся супраць рэфарматараў і свайго законнага караля. Моцная каталіцкая канфедэрацыя накіравала ў Пецярбург сваю дэлегацыю, просячы імператрыцу гарантаваць захаванасць палітычнай сістэмы Рэчы Паспалітай. Цяпер Кацярына II выступала ў ролі пратэктаркі шляхецкай рэспублікі.

Сойм 1767 г. выразна прадэманстраваў метады, якімі пецярбургская дыпламатыя бралася гарантаваць унутраны мір і спакой Рэчы Паспалітай. Загадам Мікалая Рэпніна былі арыштаваныя найбольш уплывовыя апаненты, якіх пад канвоем адправілі ў Калугу. Паўнамоцтвы сойма, маршалкам якога стаў Кароль Радзівіл, перадаваліся ўтворанай з яго складу дэлегацыі, што пры ўзгадненні з расійскім паслом мусіла выпрацаваць прымальныя канстытуцыі. Усе падстававыя прынцыпы старога ладу былі названы «кардынальнымі правамі» і заставаліся некранутымі (выбарнасць караля, манаполія шляхты на ўрады і валоданне зямлёй, права на супраціў, шляхецкая роўнасць, *liberum veto*). Дысідэнты атрымлівалі поўныя палітычныя правы, у тым ліку доступ да сенатарскіх і міністэрскіх пасадаў. Ва ўмовах палітычнага ціску, калі ў Варшаве стаяла расійскае войска, сойм у сакавіку 1768 г. зацвердзіў гэтыя пастановы. Так былі захаваныя «вечнымі і нязменнымі» тыя асновы дзяржаўнага ладу Рэчы Паспалітай, якія даўно падточвалі яе.

З гэтага часу ўнутраны лад Рэчы Паспалітай нельга ніяк было мяняць без згоды Расіі і Прусіі, бо Кацярына II станавілася гарантам непарушнасці «кардынальных правоў». Так Расія дамаглася нават фармальных прававых падставаў для сваёй гегемоніі над шляхецкай рэспублікай.

Праціўнікі расійскай гегемоніі і ўраўнання правоў іншаверцаў з каталікамі аб'ядналіся і ў лютым 1768 г. утварылі сваю канфедэрацыю, якую па месцы яе падпісання (гарадок Бар на Ўкраіне, цяпер Вінніцкая вобласць) назвалі Барскай. Да барскіх канфедэратаў хутка далучыліся значныя сілы беларускай і літоўскай шляхты, а таксама мяшчан і сялянства. Партызанская барацьба ахапіла Берасцейскае, Полацкае, Мсціслаўскае ваяводствы, Ашмянскі, Браслаўскі і Ваўкавыскі паветы, а таксама раёны Гомеля і Рагачова і інш. Антырасійскі рух набыў масавы характар. Называючы партызанаў «мятежниками», «шайками», расійскія ўлады прызнавалі, што ў Беларусі іх падтрымлівае мясцовы люд. Канфедэраты спадзяваліся на



дапамогу заходніх краін. Францыя жыва зацікавілася падзеямі ў Рэчы Паспалітай і прыслала паўстанцам сваіх ваенных інструктараў, з увагай да іх паставілася і Аўстрыя. Турцыя абвясціла Расіі вайну і запатрабавала вывесці з шляхецкай рэспублікі царскую армію. Усё гэта спрыяла руху, але рэальнай падтрымкі з–за мяжы не было, і канфедэраты самастойна працягвалі няроўную барацьбу з расійскім войскам і вернымі каралю Панятоўскаму фармаваннямі. У 1769 г. яны правялі пераможныя бітвы пад Бераставіцай, Слонімам і Мышшу. Пад Менскам, Радашкавічамі, Мядзелам асабліва актыўна дзейнічаў аддзел ковенскага падчашага Сымона Касакоўскага. Падтрыманы мясцовай шляхтай, ён ажыццяўляў рэйды нават на расійскую тэрыторыю. Вядомымі былі таксама фармаванні Зіберга, Штэйна, Юдзіцкага, Шалухі.



*Міхаіл Казімір Агінскі, вялікі гетман (1768—1792).*

Вялікай ваеннай сілай дыспанаваў князь Кароль Радзівіл, але і ён марудзіў, доўга балансаваў паміж канфедэратамі, каралём і паслом Рэпніным. Калі «Пане Каханку» заняў бок патрыётаў, Нясвіж стаў беларускім «Барам», сюды збіраліся партызанскія сілы. Каб адрэзаць яго ад барскага руху краіны, восенню 1768 г. Рэпнін накіраваў на Нясвіж расійскае войска генерала Льва Ізмайлава. У вёсцы Лань радзівілаўская міліцыя і ашмянскія канфедэраты паспелі разбіць кампанію князя Мяшчэрскага, але першы ж штурм Нясвіжа напужаў Радзівіла, і ён пайшоў на капітуляцыю: здаў Нясвіж, Слуцк, ваенны рыштунак, распусціў міліцыю, адно што не выдаў ніводнага камандзіра канфедэратаў, а сам перабраўся ў Белую Падляскую. Расійскае войска не пакідала Радзівілавай рэзідэнцыі цэлае дзесяцігоддзе.

У кастрычніку 1771 г. да барскіх канфедэратаў далучыўся вялікі гетман Міхаіл Казімір Агінскі (1768—1792) са сваім войскам і адра-

зу ж здабыў перамогу над расіянамі пад Бездзежам. Аднак гэта была яго адзіная перамога. Гетмана, які страціў пільнасць, пад Сталовічамі, недалёка ад Баранавічаў, неўзабаве разграміў Аляксандр Сувораў. Пасля гэтай падзеі, як калісь пасля капітуляцыі Нясвіжа, барацьба стала затухаць, аддзелы канфедэратаў рассыпаліся па лясах. Апошні партызанскі аддзел у Рэчыцкім павеце быў раззброены ў сакавіку 1772 г. Настаў час распраў. Тысячы канфедэратаў, дзве трэці якіх складалі сяляне, пайшлі на катаргу ў Сібір.

Гісторыя Барскай канфедэрацыі — гэта сумная гісторыя нявыкарыстаных магчымасцяў. З прычыны разладу, унутраных разборак рух ад пачатку пераследавалі няўдачы. Як вобразна пісаў гісторык Уладыслаў Канапчынскі, Бар "вёў сваіх жаўнераў ад паразы да паразы, а сваіх палітыкаў — ад памылкі да памылкі, і скончыў у поўнай дэпрэсіі духу". Затое моцныя суседзі выкарысталі яго як падставу для адкрытай анексіі тэрыторый Рэчы Паспалітай.

## X.3. Першая анексія

Падзелы шляхецкай рэспублікі былі запраграмаваны яшчэ ў 1768 г. — у момант, калі, з аднаго боку, Расія атрымала права кантролю над дзяржаўным ладам Рэчы Паспалітай (Кацярына II распаўсюджвала гарантыі на выкананне рашэнняў сойма 1767—68 г., які ўраўняў правы дысідэнтаў з каталікамі), у выніку чаго апошняя нават фармальна стала васалкай усходняй імперыі, а з другога, Барская канфедэрацыя распачала барацьбу супраць Расіі і яе саюзніка караля Станіслава Аўгуста Панятоўскага. У дзяржаве разгарэлася грамадзянская вайна, пад лозунгам утаймавання якой суседзі адкрыта ўмяшаліся ў справы рэспублікі. У 1770 г. Прусія стварыла «санітарны кардон» на суседніх з ёй каронных землях, а Расія ўвяла кардон на Дзвіне. Ужо тады ўрад Кацярыны II планаваў злучыць Дзвіну з Дняпром санітарнай мяжой, выціснуць адтуль канфедэратаў і далучыць занятую тэрыторыю да імперыі. На ўмацаванне гэтай мяжы планавалася задзейнічаць 50–тысячнае войска. Марудзілі, пакуль займаліся вайной супраць Турцыі. Але як толькі Турцыя была разгромлена, Расія непасрэдна прыступіла да гэтак званых «польскіх спраў».

Прусія баялася, што расійская імперыя сама анексуе ўсю Рэч Паспалітую, і кароль Фрыдрых II Вялікі (1740—1786) выступіў з ініцыятываю падзелу шляхецкай рэспублікі. Кацярына II прыняла



прапанову. Пазней да іх далучылася Аўстрыя. 5 жніўня 1772 г. у Пецярбургу яны падпісалі тайную канвенцыю аб падзеле часткі тэрыторыі Рэчы Паспалітай. Усходнія землі Беларусі — Полацкае ваяводства па правы бераг Дзвіны, амаль усё Віцебскае, усё Мсціслаўскае ды ўсходняя частка Менскага ваяводства, а таксама Інфлянты — разам 92 тысячы кв. км з насельніцтвам 1 300 тысяч чалавек — уключыла ў свой склад Расія. Аўстрыя атрымала паўднёвыя раёны Польшчы і частку Заходняй Украіны (адпаведна 83 тысячы кв. км і 2 650 тысяч чалавек), а Прусія — Памор'е і заходне–прускія землі (36 тысяч кв. км і 580 тысяч чалавек).



*Сафійскі сабор у Полацку. Літаграфія з гравюры Н.Орды (1875).*

У красавіку 1773 г. для прыняцця акта падзелу ў Горадні быў сабраны сойм Рэчы Паспалітай. Пасол з Наваградскага ваяводства Тадэвуш Рэйтан і полацкі падчашы Самуэль Корсак рашуча выступілі з пратэстам, хацелі сарваць згодніцкія намеры створанай перад соймам канфедэрацыі, каб не дапусціць ухвалення разбойніцкай акцыі падзелу. Кульмінацыя гэтага пратэсту наступіла ў апошні дзень сойма, калі Рэйтан, спрабуючы не прапусціць паслоў да пасольскай ізбы, лёг перад імі ў дзвярах на падлогу. Разлічаны на маральнае ўздзеянне, гэты ўчынак не змяніў пазіцыі канфармісцкай большасці. Справа была ўжо вырашанай, і сойм ратыфікаваў першы падзел.

Так амаль трэцяя частка тэрыторыі Беларусі з насельніцтвам больш за 1 млн. чалавек апынулася ў складзе Расійскай імперыі. Калегіі замежных спраў дзяржаў–удзельніц першага падзелу спяшаліся выдаць спецыяльныя брашуры, у якіх даказвалася «гістарычнае права» на атрыманыя землі. Расійская дыпламатыя тады яшчэ ніяк не выкарыстоўвала тэзіс пра «збіранне рускіх зямель»,



*Шляхецкі соймік перад касцёлам. Карціна Яна Норбліна.*

апраўдваючы сваю ініцыятыву толькі тым, што Польшча быццам пастаянна парушала мяжу.

На нованабытых тэрыторыях ранейшыя ваяводствы і паветы касаваліся і ўводзіўся трохступенны адміністрацыйны падзел, як і ў Расіі: губерня — правінцыя — павет, але ўжо праз 3 гады засталіся толькі губерня і павет. Анексаваныя землі ўвайшлі ў губерні Магілёўскую і Пскоўскую. У 1776 г. беларускія і латгальскія паветы былі вылучаны з Пскоўскай губерні і з іх утварылі Полацкую. Выканаўчая ўлада перадавалася губернатару, намеснікам, утвараліся структуры мясцовага кіравання. Ад насельніцтва патрабавалася на працягу месяца прыняць прысягу на вернасць Расіі. За гэта новыя ўлады абяцалі станам захаваць іх маёмасныя правы. Нязгодныя мусілі за тры месяцы выехаць за мяжу, а іх уласнасць падлягала канфіскацыі. Большасць шляхты, баючыся страціць свае ўладанні, прысягнула імператрыцы і выявіла лаяльнасць да новай улады.



Кацярына II імкнулася выклікаць сімпатыі і прыхільнасць мясцовай грамадскай эліты. Паказальнымі тут можна лічыць адносіны да езуітаў. Пасля таго, як у 1773 г. булай папы Клімента XIV Ордэн езуітаў быў скасаваны, анексаваныя землі Беларусі засталіся адзіным месцам, дзе езуіты працягвалі сваю дзейнасць. Прадэманстраваўшы сваю вернасць новым уладам, яны атрымалі апеку імператрыцы. Нават пасля таго, як у Варшаве на сойме ліквідацыя ордэна была ўхвалена, Кацярына II пакінула езуітаў у Беларусі, каб яны і надалей «займаліся выхаваннем моладзі». І тыя шчодра плацілі сваёй пратэктарцы ўзаемнасцю, услаўляючы яе ў одах і віншаваннях, ладзячы пышнае святкаванне імянін царыцы ў сваёй полацкай рэзідэнцыі. Ордэн, зліквідаваны ва ўсім свеце, у Беларусі надалей захоўваў свае пазіцыі: у канцы XVIII ст. езуіты мелі тут 6 калегіумаў (у Віцебску, Оршы, Магілёве, Мсціславе, Полацку і Юравічах), 2 навіцыяты і 10 рэзідэнцый.

Ідучы на ўступкі мясцовым землеўладальнікам, надаючы шляхце правы расійскага дваранства, імператрыца нават дэкларавала верацярпімасць: у 1774 г. выдала грамату аб свабодзе каталіцкай веры, недатыкальнасці касцёльнай маёмасці і аб заснаванні Беларускай каталіцкай епархіі з цэнтрам у Магілёве. Каталіцкаму духавенству адно што строга забаранялася схіляць праваслаўных у сваю веру. Хоць уся афіцыйная перапіска вялася цяпер па–расійску, у судаводстве, справаводстве, навучанні па–ранейшаму засталася мова польская.

Калі інтарэсы мясцовай шляхты напачатку былі новай уладай улічаныя, дык становішча асноўнай масы насельніцтва анексаваных беларускіх зямель не палепшылася, а наадварот, пагоршылася. Паводле распаўсюджанай на Беларусь расійскай падаткавай сістэмы, з усіх жыхароў цяпер збіраўся падушны падатак, што ў некалькі разоў пераўзыходзіў ранейшыя грашовыя зборы. Самавольныя пераходы абкладзенага падаткамі насельніцтва былі забаронены, уведзена «пашпартная» сістэма рэгістрацыі, рэвізскія спісы абвешчаны актамі па замацаванні сялян за ўладальнікамі. Мноства раней свабодных сялян, баяраў і зямян сталі прыгоннымі. Шырока практыкавалася здача сялян у лік рэкрутаў і вываз іх у іншыя губерні. Калі ў першыя гады пасля падзелу амаль палову беларускіх сялян расійскі ўрад перавёў у катэгорыю казённых, дык потым імператрыца Кацярына II пачала перадаваць іх новым уладальнікам — вайсковым або цывільным расійскімураднікам, а таксама адданым ёй мясцовым панам. За 10 гадоў пасля першага падзелу ў прыватныя рукі трапіла амаль 200 тысяч рэвізскіх душ дзяржаўнага

сялянства, большую палову з якіх перадала імператрыца. А новыя гаспадары, пераводзячы мужыкоў на паншчыну, яшчэ больш узмацнялі прыгнёт. Шляхам раздачы сялян царскія ўлады закладалі ў Беларусі асновы расійскай зямельнай уласнасці. У 1783—85 г. яны правялі генеральнае межаванне на тэрыторыі, далучанай па першым падзеле, у выніку чаго папярэднія зямельныя акты гублялі прававую сілу. Так насаджанае расійскае землеўладанне адразу атрымала роўныя правы з даўнім, мясцовым.

Нічога добрага не дачакаліся ад новых уладаў і мяшчане. Яны былі таксама абкладзены падушным падаткам і прыраўняны да сялян у ваеннай павіннасці. Адразу пасля першага падзелу магдэбургскае права ўключаных у склад імперыі гарадоў касавалася. А ў 1785 г. указам імператрыцы беларускія гарады былі прыраўняны ў правах да расійскіх. Цяпер вольныя раней месты кіраваліся па тых жа прынцыпах, што і царскія. Баючыся народных хваляванняў у новых правінцыях, Кацярына II адно загадвала губернатарам найперш дбаць «аб захаванні цішыні і спакою» ў новаздабытых землях.

Тым часам на беларускія землі Рэчы Паспалітай у пошуках лепшай долі масава перабягалі сяляне расійскіх губерняў. Перасяленцы, напрыклад, толькі ў Гарадзенскай эканоміі ў 1782—88 г. заснавалі восем вёсак. Для вяртання ўцекачоў расійскае войска шматразова пераходзіла мяжу, але не столькі лавіла сялян, колькі пустошыла гаспадаркі ды збірала з паноў грашовы выкуп. У справе ўцёкаў расійскіх сялян на тэрыторыю Беларусі Пецярбург высылаў афіцыйныя ноты Варшаве. А сяляне беглі, бо ў межах Рэчы Паспалітай маглі ўратавацца ад той жорсткай эксплуатацыі, асабліва рэкрутчыны, якая была ў Расійскай ім-



*Мундзіры шляхты Ашмянскага павета. Другая палова XVIII ст.*



перыі. Нездарма ў 1794 г. расійскі канцлер князь Аляксандр Безбародка пісаў у лісце да Мікалая Рэпніна, што на землях шляхецкай рэспублікі “вольнасць сялян і падобныя да таго з’явы могуць раздражняць нашых валасцян”, ды адзначаў, што гэта і з’яўляецца адным з матываў падзелу Рэчы Паспалітай.

## X.4. Рэформы і спадзяванні

З сярэдзіны XVIII ст. на тэрыторыі Беларусі, як і ў іншых землях Рэчы Паспалітай, назіралася агульнае ажыўленне эканомікі і ўзрастанне дынамікі яе развіцця. Гэта выразна праяўлялася як у сельскай гаспадарцы, так і ў развіцці гарадоў, рамеснай вытворчасці ды ўвядзенні мануфактураў. Эканамічны ўздым пасля доўгага застою мог быць абумоўлены прыходам новага пакалення — людзей эпохі Асветніцтва. Гэта былі групы патрыятычна настроенай шляхты з наватарскім мысленнем, што верыла ў вялікую ролю рэформаў, імкнулася да асветы і навукі. Для з'яўлення людзей з такім светаглядам важнае значэнне мелі сувязі з больш развітымі еўрапейскімі краінамі, а таксама з калоніямі Паўночнай Амерыкі, якія змагаліся за сваю незалежнасць.

Даследчыкі беларускай вёскі зазначаюць, што ў земляробстве гэтага перыяду пашыраліся ворыўныя плошчы, уздымаліся старыя і асвойваліся новыя землі. Напрыклад, калі пасля Паўночнай вайны ў Крычаўскім старостве было 73% пакінутых валок, дык у сярэдзіне XVIII ст. іх ужо зусім не засталося — уся зямля зноў апрацоўвалася. Пра ажыўленне гаспадаркі сведчыў і паступовы рост экспарту сельскагаспадарчых тавараў з тэрыторыі Беларусі. Вёска паступова звязвалася з рынкам, з найманай працай. Праўда, згодна з падлікамі гісторыка Дзмітрыя Пахілевіча, каля 70% усяго вясковага насельніцтва Беларусі тады было



*Дзяўчына з кветкамі. Выява на кафлі XVIII ст.*

панскім. Асноўнымі павіннасцямі сялян па–ранейшаму заставаліся паншчына (адпрацоўка) і дзякла (натуральны аброк), але дзякуючы развіццю таварна–грашовых адносін значна павялічылася роля чыншу (грашовага аброку), асабліва на ўсходзе краю, хоць у цэлым для ўсёй Беларусі другой паловы XVIII ст. была характэрнай змяшаная рэнта. Магнаты (а ў іхніх уладаннях жыло блізу 30% усяго насельніцтва Беларусі) інтэнсіфікавалі фальварачную гаспадарку, пераводзілі сялян на чынш, уводзілі механізацыю і рацыяналізацыю працы. Праўда, гэта больш рабілася ў заходніх паветах краю, адкуль вялі зручныя шляхі на еўрапейскія рынкі. Развіццём гандлю асабліва стымулявалася вырошчванне збожжа. У Гданьску і Караляўцы



*На шклянай мануфактуры (гуце). Малюнак Д. Хадавецкага.*

цэны на жыта з 1750 па 1795 г. узраслі ў 4,5 – 5 разоў, а на пшаніцу — у 3—4 разы.

Беларусь мела горшыя ўмовы для развіцця чыншавай гаспадаркі, чым, прыкладам, Жамойць, з якой было лягчэй вывозіць тавары ў Рыгу, Каралявец ды гарады Курляндыі. Тым не менш і на беларускіх землях гандаль з Захадам актывізаваўся. Пэўныя захады для развіцця гаспадаркі і гандлю прымаў урад. У 1766 г. былі ўведзены



адзіныя для ВКЛ меры вагі, аб'ёму і даўжыні, абмежаваны даўгавы працэнт, у 1764 і 1775 г. прынята адзіная дзяржаўная пошліна і інш. Будаваліся дарогі і масты, ачышчаліся рэкі. На сродкі як дзяржаўнага скарбу, так і землеўладальнікаў праз пінскія балоты пракладаліся пінска–слонімскі і пінска–валынскі тракты.

У экспарце з Беларусі, як і з Літвы, галоўную пазіцыю займалі прадукты земляробства ды лясных промыслаў. Дрэва і паташ з Берасцейскага і Гарадзенскага ваяводстваў вывозіліся не толькі ў Каралявец ды Клайпеду, але і ў Гданьск, Эльбланг. Сярод імпарту ж галоўнымі былі гатовыя вырабы прамысловасці. Займаючыся замежным гандлем, магнаты Чартарыйскія, Агінскія, Пацы, Радзівілы, Сапегі, Тышкевічы ўсё больш інтэграваліся ў еўрапейскае грамадства, адкрывалі сабе ў Варшаве ці паблізу яе ўласныя рэзідэнцыі. У мэтах стварэння зручнага шляху для сплаву збожжа з Беларусі ў балтыйскія парты ў 1765 г. з ініцыятывы і на сродкі вялікага гетмана Міхала Казіміра Агінскага было распачата будаўніцтва судаходнага канала (скончана ў 1784 г.), які праз Шчару і Ясельду злучыў рэкі Дняпроўскага басейна з Нёманам і Балтыкай. Тады ж паміж



*Каралеўскі замак у Горадні. Малюнак XVIII ст.*

Пінай і Мухаўцом пачалі пракладку Днепра–Бугскага, або Каралеўскага канала (скончаны ў 1848 г.). Названыя водныя магістралі, пракладзеныя па беларускай зямлі, у гідратэхнічным плане сталі выключнай з'явай у гісторыі першай Рэчы Паспалітай.

Рост ураджайнасці, пашырэнне плошчы ворных зямель, павелічэнне пагалоўя жывёлы, развіццё рыначных сувязяў ды ўзрастанне колькасці самога вясковага насельніцтва (да канца XVIII ст. яно ўпершыню пераўзышло паказчык 1648 г.) — усё гэта сведчыць пра паступовы ўздым сельскай гаспадаркі ў Беларусі. З іншага боку, развіццё таварна–грашовых адносін абярнулася ўзмацненнем эксплуатацыі сялянства і масавым жабрацтвам, што не магло не

выклікаць абвастрэнне сацыяльнай барацьбы ў вёсцы. Яна праяўлялася як у няўзброеным змаганні — скаргах сялян на ўладальніка, адмаўленні выконваць павіннасці, уцёках, так і ў адкрыта ўзброеных выступах, нападах на шляхецкія маёнткі, на панскую адміністрацыю, у сутычках з войскам. Буйное паўстанне сялян выбухнула ў Крычаўскім старостве ў 1740 г. Паўстанцы выгналі арандатараў і чатыры гады кіравалі староствам самі, пакуль іх не разграміла найманае войска Гераніма Радзівіла. Амаль цэлае дзесяцігоддзе доўжыліся сялянскія хваляванні ў Каменьшчыне, што ў Мазырскім павеце, якія ў 1754—56 г. таксама перараслі ў адкрытую вайну з уладальнікамі. Сацыяльная барацьба дасягнула формы адкрытага выступлення сялян і ў многіх іншых месцах Беларусі, праўда, у меншых маштабах.



*На пасяджэнні сойма.*
*Гравюра Д.Хадавецкага, 1789 г.*

Характэрнай з'явай другой паловы XVIII ст. стала актыўнае ўвядзенне мануфактурнай вытворчасці. Цагельныя і гарбарныя «заводы» з найманымі работнікамі з'яўляліся ў многіх гарадах і мястэчках краю. Магнаты стваралі мануфактуры ў сваіх уладаннях, таму яны абслугоўваліся пераважна прыгоннымі. Першынства ў гэтай справе трымалі Радзівілы, якія мелі ў сваіх землях 23 мануфактуры. Да найбольш вядомых належала суконная мануфактура Міхала Казіміра Радзівіла «Рыбанькі», закладзеная ў 1752 г. у Нясвіжы і праз 5 гадоў рэарганізаваная ў «пярсярню» (прадпрыемства па вырабу персідскай тканіны). Сыравіну (бавоўну) для гэтага першага буйнога прадпрыемства ў Вялікім Княстве Літоўскім прывозілі з іншых уладанняў Радзівілаў у Беларусі і Ўкраіне. З Нясвіжа мануфактуру перанеслі ў Слуцк, дзе яна праславіла край слуцкімі паясамі. Па ўсёй Рэчы Паспалітай ведалі таксама шкляныя гуты ў Налібоках і Ўрэччы (дзе Радзівілы наладзілі і адліўку гармат), мануфактуры габеленаў у Міры і Альбуцi, фаянсавую мануфактуру ў Свержані.



Сярод іншых прадпрыемстваў найбуйнейшымі былі жалезная «фабрыка» падканцлера Яўхіма Храбтовіча ў Вішневе і падобная ў вёсцы Рудня, пад Берасцем, фаянсавая мануфактура Агінскіх у Целяханах Пінскага павета. У цэлым у другой палове XVIII ст. у межах Беларусі існавала 53 мануфактуры, на якіх разам працавала блізу 2,5 тысяч рабочых. Большасць іх складалі прыгонныя сяляне, што само па сабе пярэчыла сутнасці новых прадпрыемстваў і прадвызначала іх блізкі канец. Некаторыя з гэтых мануфактур функцыявалі і пасля падзелаў, прыкладам, мануфактура шаўковых паясоў у Слуцку і шкляная гута ў Налібоках, іншыя ж ад недахопу сыравіны, недастатковага рынку збыту ці з іншых прычынаў (ініцыятары такіх навацый не мелі аніякага вопыту) адразу занепадалі. Паказальным быў лёс мануфактур, заснаваных у Гарадзенскай эканоміі падскарбіем літоўскім Антоніем Тызенгаўзам (1733—1785). Пачаўшы ў 1768 г., ён заснаваў там 20 «фабрык» па вырабу зброі, адзення, хустак, капелюшоў, гузікаў, карэт і г.д., выпісаў спецыялістаў з–за мяжы (хоць імкнуўся падрыхтаваць і мясцовых), аднак ужо ў 1780–х г. усе яго прадпрыемствы былі закрытыя як стратныя. Да апошніх падзелаў Рэчы Паспалітай дажыла толькі адна суконная мануфактура.

Ажыўленне сельскай гаспадаркі, з'яўленне на тэрыторыі краю новых важных шляхоў зносін, развіццё вотчыннай прамысловасці і агульны дэмаграфічны прагрэс паспрыялі эканамічнаму ўздыму гарадоў. У канцы XVIII ст. на тэрыторыі сучаснай Беларусі было 39 гарадоў і 350 мястэчак, у якіх жыло 250 тысяч чалавек (або 11% ад усіх жыхароў, што ніжэй за працэнт гарадскога насельніцтва на 1648 г.). У вялікіх гарадах прыкладна 20—30% жыхароў складалі яўрэі (на ўсходзе Беларусі — 15—20%). Большасць гарадоў ужо выйшла са скрайняга заняпаду і спусташэння. Іх развіццю садзейнічалі некаторыя захады цэнтральнай улады. Сойм 1775 г. адмяніў даўнюю пастанову, якая пазбаўляла шляхціча станавых правоў за пасялен-

не ў горадзе і занятак гандлем. Мяшчанам было дазволена набываць зямлю за межамі горада. Праўда, палітыка вярхоўнай улады ў дачыненні да гарадоў была непаслядоўнай. Так, згодна з пастанову варшаўскага сойма 1776 г., невялікія гарады і мястэчкі Беларусі і Літвы (якія не налічвалі 300 двароў) страцілі магдэбургскае права. Самакіраванне было пакінута толькі для 11 буйных гарадоў, у прыватнасці, для Ліды, Наваградка, Ваўкавыска, Пінска, Менска, Мазыра, Берасця і Горадні. Незадаволеная рашэннем варшаўскага сойма, частка мяшчан выехала ў суседнія краіны. Толькі прыватныя уладальнікі маглі захоўваць магдэбургскае права сваім местам, бо пастанова тычылася толькі гарадоў каралеўскай юрысдыкцыі. Але і пазбаўленыя яго гарады ў тарыфах падымнага абкладання ў 1790—91 г. былі названы магдэбургскімі, а значыць, нейкія элементы самакіравання, прынамсі, ранейшыя суды, у іх заставаліся. Праўдападобна, буйныя гарады Беларусі ўсё ж не зведалі адмоўнага ўплыву пастановы 1776 г. У Магілёве, Менску, Горадні параўнальна высокага ўзроўню зноў дасягнулі рамяство і гандаль, адным з паказальнікаў чаго быў хуткі колькасны рост рамеснікаў. Менск, у прыватнасці, па эканамічным развіцці ў 1770-х г. нарэшце пераўзышоў узровень першай паловы XVII ст.

У гады эканамічнага ажыўлення дайшло да важных зменаў і ў галіне адукацыі. Калі ў 1773 г. рашэннем папы Клімента XIV быў скасаваны Ордэн езуітаў, сойм утварыў Камісію нацыянальнай адукацыі, якой перадавалася маёмасць ордэна. Гэтая камісія — фактычна першае ў Еўропе міністэрства асветы — пачала займацца справамі адукацыі і выхавання моладзі ў межах усёй дзяржавы. Яна заснавала свецкія школы — сярэднія і пачатковыя, зрэфармавала праграму навучання, якое вызваліла ад тэалогіі ды схаластыкі, і ўвяла прыродазнаўчыя прадметы, а таксама распрацавала агульны статут для ўсіх школ і ўзялася пастаянна кантраляваць школьную справу праз сваіх візітатараў. Галоўнай мэтай новай сістэмы адукацыі і выхавання з'яўлялася падрыхтоўка адукаваных і карысных для Рэчы Паспалітай людзей, найперш грамадзян–патрыётаў.

Тэрыторыя Беларусі ўвайшла ў Літоўскую правінцыю Адукацыйнай камісіі, у якой вышэйшай навучальнай установай была Галоўная школа — рэфармаваная ранейшая Віленская езуіцкая акадэмія. У Берасці, Горадні, Менску, Пінску, Наваградку існавалі школы ваяводскія. Для простых людзей стваралася сетка пачатковых школ. Аднак сродкаў і кваліфікаваных кадраў бракавала, таму Адукацыйная камісія выкарыстоўвала дапамогу базыльянаў, у руках якіх заставаліся уніяцкія школкі. Манахі рэфармаванага ў першай палове XVII ст. Ордэна святога Васіля



Вялікага яшчэ да першага падзелу валодалі добра развітай сістэмай ордэнскіх і публічных школ, спаборнічалі ў галіне адукацыі з езуітамі. Цяпер яны актыўна вялі навучанне моладзі па прынцыпах, распрацаваных Камісіяй нацыянальнай адукацыі. Ордэн валодаў таксама буйнымі друкарнямі ў Вільні, Супраслі, Менску, Пачаеве, якія трэцюю частку сваіх кніг выдавалі на царкоўнаславянскай мове.



*Друкарня XVIII ст. Гравюра Д. Хадавецкага.*

Дваццацігадовая дзейнасць Адукацыйнай камісіі мела свой плён. У 1780-х г. у беларускіх паветах (без тэрыторыі, уключанай у 1772 г. у склад Расіі) дзейнічала 20 сярэдніх і блізу 200 пачатковых школ. У пачатковых, у прыватнасці, навучалася 2500 вучняў, пры гэтым амаль трэцюю частку іх складалі дзеці сялян. Сярод настаўнікаў гэтых школ нямала было і асобаў мясцовага паходжання.

Як бачым, у другой палове XVIII ст., калі Рэч Паспалітая паціху пераадольвала зацяжны крызіс, калі адбываліся відавочныя перамены да лепшага ці не ва ўсіх сферах жыцця, гэтыя працэсы ў роўнай меры ахаплялі і Беларусь. Традыцыйнае сцвярджэнне старой гістарыяграфіі, быццам цэлае XVIII стагоддзе — ажно да падзелаў — Рэч Паспалітая знаходзілася ў павольным эканамічным заняпадзе, у грамадска–палітычным тупіку, не адпавядае сапраўднасці.

# X.5. Абарона рэспублікі і канец Рэчы Паспалітай

Пасля першага падзелу ў Рэчы Паспалітай пачалі праводзіцца і рэформы ўнутранага ладу. Пераўтварэнням паспрыяла тое, што ў 1780 г. Расія нарэшце вывела сваю армію, штыкамі якой утрымлівала пратэктарат над шляхецкай рэспублікай. Для кантролю над дзейнасцю дзяржаўных органаў улады ў 1775 г. была ўведзена Пастаянная Рада, агульная для Вялікага Княства і Кароны, якая складалася з 18 сенатараў і 18 паслоў сойма ды мела пяць дэпартаментаў — ваенны, бюджэтны, знешняй палітыкі, паліцыі і юстыцыі. Праўда, з–за згодніцтва з Пецярбургам патрыёты называлі яе «Пастаяннай Здрадай». Пачалося парадкаванне падаткаў, уніфікацыі сістэмы мер і вагі. А ў 1788 г., калі Расія занялася чарговай вайной з Турцыяй, у Варшаве быў склікан вальны сойм, названы пазней «Вялікім», ці «Чатырохгадовым» (бо разам збіраліся паслы дзвюх кадэнцый — 1788 і 1790 г.), які пачаў працу над цэлай праграмай дзяржаўных рэформаў. На самым пачатку пасяджэнняў паслы ўтварылі канфедэрацыю ў мэтах «найдакладнейшага гарантавання бяспекі і паляпшэння нашай Айчыны». Дзякуючы таму, што большасць удзельнікаў з'езду абіралася пасламі ўпершыню і не была абцяжарана канфармізмам (да ліку найбольш вядомых удзельнікаў сойма належалі, у прыватнасці, адміністратар уладанняў гетмана Міхаіла Казіміра Агінскага на беларускім Палессі Мацей Бутрымовіч і падканцлер Яўхім Храбтовіч), сойм працаваў эфектыўна і прымаў радыкальныя пастановы.



*Казімір Нестар Сапега (1757—1798), маршалак канфедэрацыі літоўскай на Вялікім сойме.*



Ён, сярод іншага, у 1789 г. увёў рэкрутчыну, арганізаваную па тэрытарыяльным прынцыпе, павялічыў колькасць войска (у Вялікім Княстве — з 5 да 10 тысяч), стварыў агульную для ўсёй Рэчы Паспалітай Ваенную камісію, часткова ўраўняў правы мяшчан са шляхтаю. У прыватнасці, ім было дазволена набываць зямлю, 24 прадстаўнікі гарадоў былі ўведзены ў склад Пастаяннай Рады, а шляхце дазволілі займацца рамяством і гандлем. Невялікім гарадам, пазбаўленым самакіравання ў 1776 г., ухвалай 1791 г. вярталася іх магдэбургскае права (праўда, праціўнікі рэформаў у 1792 г. пацвердзяць рашэнне сойма 1776 г.). У тым жа годзе ў Пінску Вялікім соймам была склікана праваслаўная Генеральная кангрэгацыя, якая выпрацавала праект усталявання праваслаўнае царквы Рэчы Паспалітай на асновах незалежнасці ад замежнай духоўнай улады, на традыцыйных пачатках саборнасці і выбарнасці. Планавалася стварыць незалежны ад Расійскай імперыі Найвышэйшы Кансістар грэка–ўсходняга абраду Каралеўства Польскага і Вялікага Княства Літоўскага. Мітрапаліту грэка–каталіцкай царквы была дадзена сенатарская годнасць. Нарэшце 3 траўня 1791 г. Вялікі сойм большасцю галасоў прыняў новую канстытуцыю, або, як яна называлася афіцыйна, — Урадавую ўставу.



*Мацей Бутрымовіч (1745—1814), пасол на Вялікі сойм ад Пінскага павета.*

Канстытуцыя 1791 г., падрыхтаваная канстытуцыйнай камісіяй, што працавала з верасня 1789 г., стала кампрамісам радыкалаў і кансерватараў. Яна адмяняла выбарнасць караля, *liberum veto* і канфедэрацыі, выканаўчую ўладу перадавала каралю і радзе міністраў, названай «Вартай законаў», а таксама прадугледжвала шэраг іншых важных пераўтварэнняў. У тэксце Канстытуцыі зусім не згадвалася Вялікае Княства Літоўскае, зрэшты, як і Рэч Паспа-



Ухваленне Канстытуцыі 3 траўня.

літая: дзяржава азначалася тэрмінам «Польшча». На гэтай падставе ў гістарыяграфіі раней часта сцвярджалася, што новы закон стаў трыумфам уніфікацыйнай тэндэнцыі рэфарматараў, бо касаваў унію і закладаў адзіную, унітарную дзяржаву. Аднак, як падкрэслівае вядомы гісторык права Юліуш Бардах, Канстытуцыя 3 траўня не касавала дзяржаўна–прававой адасобленасці Вялікага Княства Літоўскага, — яна проста не кранала самой праблемы. Гэта быў камп-



раміс, які дазволіў дэлегатам ВКЛ захаваць палітычную суб'ектнасць сваёй дзяржавы. Яны кіраваліся інструкцыямі павятовых соймікаў (вядомы інструкцыі гарадзенскага, лідскага, віленскага і іншых соймікаў), што патрабавалі пакінуць унію за аснову ўзаемных дачыненняў, а Статут 1588 г. — як абавязковае права, захаваць для Княства асобную Скарбавую камісію, праводзіць кожны трэці вальны сойм у Горадні ці Вільні, і інш. Уже 20 кастрычніка сенатары і паслы ад Вялікага Княства правялі праз Вялікі сойм асобную ўхвалу — «Узаемнае Заручэнне Абодвух Народаў», якое замацавала федэрацыйную аснову Рэчы Паспалітай, яе палітычны дуалізм. Прыняты дакумент сцвердзіў, што Вялікае Княства Літоўскае павінна мець «такую ж колькасць міністраў і нацыянальных пасадаў ды з такімі ж тытуламі і паўнамоцтвамі, як і Карона». Было захавана роўнае прадстаўніцтва Княства ў цэнтральных органах кіравання супольнай дзяржавы, у Вайсковай і Скарбавай камісіях.



Алегорыя Канстытуцыі 3 траўня.

Паводле ўставы сойма аб новым адміністрацыйным падзеле, прынятай 2 лістапада 1791 г., агульную дзяржаву ўтваралі тры правінцыі — Малапольшча, Вялікапольшча і Літва, ці Вялікае Княства Літоўскае, якое ў сваю чаргу складалася з ваяводстваў Віленскага, Троцкага, Полацкага, Берасцейскага, Менскага, Смаленскага (экстэрытарыяльна), а таксама Жамойцкага і Інфлянцкага княстваў.

Такім чынам, пастановы Чатырохгадовага сойма зусім не касавалі федэратыўнай асновы Рэчы Паспалітай, а толькі надавалі ёй новую, больш сціслую форму. Больш за тое, яны спрыялі ўмацаванню ў асяроддзі шляхты Беларусі і Літвы пачуцця асобнасці Вялікага

Княства, яго роўнасці з Каронай Польскай. У выніку поспех вальнага сойма, які прыняў новы закон, азначаў і дасягненне сваёй мэты пасламі беларуска–літоўскай дэлегацыі, якая адразу ж арганізавала ўрачысты прыём у Радзівілавым палацы ў Варшаве. Каментуючы гэты поспех, гісторык Юліуш Бардах справядліва звярнуў спецыяльную ўвагу на «палітычную мудрасць і разважлівасць» тагачасных парламентарыяў, якія добра ўмелі знаходзіць тонкія кампрамісы ў самых складаных палітычных сітуацыях.

Большасць беларускай і літоўскай шляхты прыязна ўспрыняла Канстытуцыю 3 траўня. Зімою 1792 г. на сесіях 27 з 34 павятовых соймікаў усе 11 артыкулаў асноўнага закона былі цалкам ухвалены. Аднак кансерватыўныя колы магнатаў і шляхты выступілі супраць рашэнняў Вялікага сойма. Іх раздражняла ўмацаванне выканаўчай улады і ўвядзенне спадчыннасці трона. Канстытуцыя выклікала асаблівую незадаволенасць царскага ўрада, які падрыхтаваў для інтэрвенцыі 60–тысячную армію. Яна перакрэсліла надзеі пецярбургскага двара на тое, што Рэч Паспалітая добраахвотна вернецца пад расійскі пратэктарат. Для фармальнага апраўдання пераходу мяжы Рэчы Паспалітай патрабавалася толькі просьба незадаволенай апазіцыі. У Пецярбургу пад наглядам Кацярыны II адразу ж быў складзены акт канфедэрацыі праціўнікаў новай канстытуцыі. Ужо ў красавіку 1792 г. генералы Міхаіл Кахоўскі і Міхаіл Крачэтнікаў падрыхтавалі армію для ўварвання ў Рэч Паспалітую. Кахоўскі атрымаў інструкцыю весці галоўныя сілы на Ўкраіну, а Крачэтнікаў — у Беларусь. Разам з інструкцыяй імператрыца перадала яму спіс вышэйшыхураднікаў ВКЛ — верных прыхільнікаў Расіі. Сярод іх апынуліся былы герой барскай вайны вялікі гетман Сымон Касакоўскі (1793—1794), канцлер Аляксандр Сапега (1775—1793), віленскі біскуп Ігнацій Масальскі (1762—1794) і інш. На ўсходняй мяжы Рэчы Паспалітай сканцэнтравалася вялікае расійскае войска, перакінутае з турэцкай вайны. Кацярына II звярнулася да Пастаяннай Рады з нотай, у якой запатрабавала скасаваць Канстытуцыю 3 траўня. Прускі кароль Фрыдрых Вільгельм II (1786—1797), з якім у 1790 г. Станіслаў Аўгуст падпісаў абарончы саюз, пакінуў Рэч Паспалітую ў адзіноце, бо ўжо патаемна дамовіўся з Пецярбургам аб новым супольным падзеле сваёй нядаўняй саюзніцы.

14 траўня 1792 г. пасля пераходу расійскімі палкамі дзяржаўнай мяжы Рэчы Паспалітай ва ўкраінскім мястэчку Таргавіца (адсюль і назва канфедэрацыі) праціўнікі Канстытуцыі апублікавалі свой акт, складзены ў Пецярбургу. Яны дэкларавалі, што пад апекай Расіі выступаюць у абарону парушаных правоў шляхты, каталіцтва, ранейшых парадкаў кіравання дзяржавай і яе цэласнасці. Такая ж канфедэрацыя паўстала ў Вялікім Княстве Літоўскім, дзе яна таксама аб'яднала радыкальных рэспубліканцаў. Летам прыведзенае ў Беларусь расійскае войска разам з канфедэратамі лёгка перамагло патрыятычныя сілы Вялікага Княства Літоўскага. Асабліва актыўным быў абазнаны ў мясцовасці Сымон Касакоўскі. Пра тое, што рабіў гэты «патрыёт» на сваёй зямлі, напісаў сучаснік тых страшных падзеяў: «Маскоўскі генерал Касакоўскі гарцаваў па Літве, палячы агнём, рабуючы і пустошачы прыяцеляў Канстытуцыі і сваіх асабістых непрыяцеляў, гарады і вёскі. Казакі і салдаты маскоўскія паўсюль ганьбілі нявестаў… Увесь край там, дзе вялася вайна, ад масквы і сваіх стаў дашчэнту спустошаны, так што засталіся толькі неба і зямля». Хутка былі заняты гарады Браслаў, Бабруйск, Глуск, Менск, Нясвіж, Навагрудак, Слонім, Горадня. Пасля капітуляцыі Вільні 14 і Берасця 23 чэрвеня царская армія рушыла ў Польшчу. Кароль Станіслаў Аўгуст Панятоўскі, а за ім асобныя ваяводствы і войска далучыліся да Таргавіцкай канфедэрацыі. Канстытуцыя 1791 г. і прынятыя Вялікім соймам рэформы адмяняліся. Канфедэраты ўзялі ў свае рукі ўладу на месцах. Пакорлівыя перад урадамі Расіі і Прусіі, яны працягвалі рабаваць і тэрарызаваць насельніцтва свайго краю.



На пачатку 1793 г. у Польшчу ўвайшло і прускае войска. Кацярына II выступіла з ініцыятывай новага падзелу Рэчы Паспалітай. Расійска–пруская дамова, падпісаная ў Пецярбургу 23 студзеня 1793 г., перадавала ў склад Расіі Менскае, частку Берасцейскага і Віленскага ваяводстваў з беларускім насельніцтвам, а таксама ўсходнюю Валынь, Кіеўскае, Браслаўскае і Падольскае ваяводствы — разам 250 тысяч кв. км. Прусія атрымала заходнія землі Польшчы (58 тысяч кв. км). Аўстрыю ж саюзнікі паабяцалі ўзнагародзіць за кошт тэрыторыі Францыі.

СклікаIны на лета таго ж года ў Горадні вальны сойм, які цягнуўся да 23 лістапада, быў збайкатаваны патрыятычнай грамадскасцю і не мог адлюстроўваць сапраўдных настрояў народа. Да таго ж, ён праводзіўся пад націскам расійскага пасла Якава Сіверса, які акружыў месца паседжанняў войскам, арыштаваў і вывез з Горадні найбольш упартых паслоў. Тым не менш яго рашэнні аказаліся фармальна правамоцнымі. Галасамі застрашаных і скарумпаваных паслоў апошні сойм Рэчы Паспалітай узаконіў чарговы захоп зямель Расіяй і Прусіяй, афіцыйна адмяніў Канстытуцыю 3 траўня і пры-

няў сваю. Урад абрэзанай з усіх бакоў Рэчы Паспалітай мог мець толькі 15 тысяч войска і страціў магчымасць праводзіць самастойную знешнюю палітыку.

Рэакцыяй на другі падзел стала нацыянальна–вызвольнае паўстанне, пачатае ў Кракаве 24 сакавіка 1794 г. Абвешчаным у гэты дзень актам паўстання дыктатарская ўлада ў краіне перадавалася генералу Тадэвушу Касцюшку (1746—1817), нараджэнцу Беларусі (паходзіў з дробнай шляхты Берасцейскага ваяводства), герою вайны Паўночнаамерыканскіх штатаў за незалежнасць. На мэце барацьбы ставіліся вызваленне краіны ад акупантаў, поўны суверэнітэт і цэласнасць Рэчы Паспалітай у межах 1772 г.



*Якуб Ясінскі (1761—1794).*

Праз месяц паўстанне пачалося ў Літве і Беларусі, дзе яго арганізатарам і кіраўніком стаў палкоўнік Якуб Ясінскі (1761—1794), званы за радыкалізм «якабінцам». Разбіўшы расійскі гарнізон у Вільні, паўстанцы ў ноч з 22 на 23 красавіка авалодалі сталіцай і стварылі «Найвышэйшую Літоўскую Раду» — выканаўчы орган паўстання ў Вялікім Княстве Літоўскім. Адным з першых актаў стала помста гетману Касакоўскаму: асуджаны крымінальным судом, здраднік быў павешаны на Ратушнай плошчы.

На канец красавіка вызваленчы рух ахапіў практычна ўсю тэрыторыю Рэчы Паспалітай у межах 1793 г. Ад 4 траўня да 6 жніўня ў Вільні двойчы на тыдзень выходзіла «Віленская нацыянальная газета», рэдагаваная ксяндзом–піярам Піліпам Галанскім. Яна з'яўлялася органам Найвышэйшай Літоўскай Рады і друкавала матэрыялы «якабінскага» характару. Пазіцыі гэтай Рады былі ад пачатку паўстання больш радыкальныя, чым у польскага кіраўніцтва. «Акт паўстання народа літоўскага» заклікаў не толькі да «вольнасці», але і да «грамадзянскай роўнасці». «Якабінская» плынь паўстанцаў у Літве і Беларусі, узначаленая Якубам Ясінскім, прымала ідэалы Французскай рэвалюцыі і выступала за адмену паншчыны, за раўнапраўе мяшчан, рэспубліканскі дзяржаўны лад. Гэтую праграму не маглі прыняць магнаты і заможная шляхта з кансерватыўнага лагера. Пад іх націскам Касцюшка ў чэрвені адхіліў Ясінскага ад кіраўніцтва паўстаннем у Вялікім Княстве і прызначыў замест яго польскага генерала Міхала Вяльгорскага.



У траўні — чэрвені ў Беларусі актыўней дзейнічалі паўстанцы, а расійскае войска адступала. Генерал–губернатар Туталмін умацоўваў Нясвіжскую фартэцыю і патрабаваў дадатковых фармаванняў. У заходніх паветах Беларусі вялася антырасійская агітацыя, збіралася зброя, прычым займаліся гэтым нават мясцовыя сяляне. Рух меў у пэўнай ступені і рэлігійны характар. Хоць вышэйшыя ерархі касцёла спужаліся радыкалізму паўстання, духавенства брала ў ім самы актыўны ўдзел — калі не далучалася непасрэдна да ваенных дзеянняў, дык падтрымлівала іх сваімі казанямі з амбона. І не толькі каталіцкае. Касцюшка імкнуўся ўцягнуць у рух і праваслаўны люд, дзеля чаго выдаў шэраг адозваў. Прыкладам, у звароце да праваслаўнага духавенства ад 7 траўня найвышэйшы начальнік заклікаў святароў адкрываць вочы сваёй пастве на ўціск і няволю, актыўней супрацоўнічаць з палякамі. Касцюшка ўрачыста абяцаў узнавіць праваслаўную ерархію, поўнасцю ўраўняць правы праваслаўнага духавенства з рыма–каталіцкім, тлумачыў, што розніца веравызнанняў не перашкодзіць палякам ставіцца да праваслаўных як да братоў і суграмадзянаў. Палякі да таго часу не складуць зброі, пакуль і праваслаўныя Рэчы Паспалітай не стануць свабодныя і шчаслівыя, — гаварылася ў яго Паланецкай адозве, выдадзенай 7 траўня 1794 г.



*Пячатка Найвышэйшай Рады ВКЛ. 1794 г.*

У святле дакументаў выглядае, што Касцюшка сапраўды праводзіў палітыку ўраўнання правоў праваслаўных з каталікамі. У цэнтральны орган улады Найвышэйшую Нацыянальную Раду ў якасці аднаго з намеснікаў ім быў прызначаны праваслаўны вілен-

